Оцифровка по сравнению с микрофильмированием дает нам такое важное преимущество, как возможность исправить полученные по каким-то причинам недостатки. Поэтому все пропущенные кадры мы отсканировали с пленки. Те кадры, которые были пропущены при съемке и отсутствовали на микрофотокопии, были изготовлены с оригинала на планшетном сканере EPSON 10000 XL с такими же параметрами, как и на сканере микроформ. При необходимости к делу составлялся файл-примечание, в котором указывались пустые листы, отмечались ошибки в нумерации, особенности подшивки (иногда часть листов может быть подшита не по порядку или в перевернутом виде и т. д.), отмечались листы, которые нечитабельны в оригинале (чтобы не создавалось впечатления, что это просто плохая копия, а в оригинале — хороший текст). Т. е. исключались все вопросы, которые могут возникнуть при использовании этой копии.

На завершающем этапе работы все файлы были объединены из отдельных частей в одну папку, переименованы согласно рекомендациям БелНИЦЭД. Затем записаны на внешние носители и составлены описания изготовленных копий.

Какие еще отличия от традиционного фонда пользования мы заметили во время выполнения этой работы? Во-первых, очевидна разница в размере носителей, содержащих одно и то же количество информации, что является также немаловажным фактором в архивной работе.

Например:




*Илл. 2.* Эти 10 дел вместились на 2 роликах 3668 и 3711, на 1 DVD-диске

Низкой является стоимость самих носителей, что приводит к абсолютно безболезненному для бюджета архива тиражированию информации.

Но главными преимуществами цифровых копий являются следующие. Во-первых, при хранении в цифровом виде изображения не ухудшаются при очередном копировании (микрофильм теряет приблизительно 10% своей информативности с каждой новой копией), что предоставляет неограниченные возможности для тиражирования. Во-вторых, цифровой документ не деградирует при его неоднократном использовании в отличие от бумажного документа, пленки или магнитной ленты. Также привлекательна возможность получения бумажных репродукций непосредственно с цифровых изображений и обеспечение многоразового доступа к цифровой копии документа, в том числе через сеть Интернет.

Это означает, что мы получаем практически неисчерпаемый источник информации, многократное обращение к которому никак не уменьшает хранимый запас данных.

Все эти возможности позволили поднять на новый уровень межархивное сотрудничество. Так, по взаимной договоренности Департамента по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь и Главного архивного управления Республики Польша 28 ноября 2007 г. состоялся обмен микрофотокопиями документов между НИАБ и Главным архивом древних актов (АГАД) в Варшаве, в результате которого архив получил более 160 000 кадров микропленки с хранящейся в АГАД части фамильного фонда князей Радзивиллов, а в Польшу было отправлено столько же кадров фонда вышеупомянутого Бранского гродского суда. Директор АГАД Хуберт Вайс говорил о возможности в скором времени увидеть копии этих документов в открытом доступе в сети Интернет.

С начала 2008 г. в читальном зале НИАБ в распоряжение пользователей был предоставлен компьютер, в который были загружены многие БД (базы данных) архива, а также организована возможность просмотра цифровых копий. В настоящее время оцифрованных дел — чуть более 400. Все копии изготовлены собственными силами архива.

Важным является то, что среди оцифрованных дел имеются практически целые комплексы. В этом году заканчивается работа по оцифровыванию микрофильмов вышеупомянутого фонда 1708 (т. е. все дела, на которые был создан страховой фонд, будут иметь дополнительную копию и в цифровом формате). Также в текущем году будет завершена оцифровка документов фонда 1636 «Еленские, помещики» в количестве 206 дел за 1610–1904 гг. Это документы, содержащие биографические материалы, материалы служебной и общественной деятельности, имущественно-хозяйственные документы, а также обширная переписка с разными лицами. На конвертах имеются многочисленные печати, зачастую в очень хорошем состоянии. Дела этого фонда несброшюрованы, поэтому из-за своего физического состояния в читальный зал не выдавались. Их копии изготовлены с использованием планшетного сканера EPSON 10000 XL.

В данном случае речь идет не просто о получении новой копии в другом формате, а о введении в научный оборот ранее недоступных документов.

На илл. 3 видно, что текст документа хорошо читается благодаря цветному изображению и физическому состоянию документа. Однако материалы очень разнообразны, и нам не всегда удается изготовить качественные копии на весь документ или на отдельные его фрагменты.



*Илл. 3.* Письмо кн. Радзивилла, канцлера ВКЛ, судье земскому мозырскому Еленскому. 1673 г.
Ф. 1636. Оп. 1. Д. 176. Л. 26.

Например, при подготовке копий печатей нам необходима помощь специалистов. На илл. 4 видна одна и та же печать, изготовленная с разных страниц документа. Часто изображение печати получается с бликами, т. е. засвечиваются некоторые ее элементы. Таким образом, необходима разработка специальной технологии для качественных копий печатей.

Есть и другие трудности, например, угасающие тексты и др. Поэтому работа, которая ведется в БелНИЦЭД по апробации различного оборудования, очень востребована. Задача архивов — предоставить в распоряжение специалистов как можно больше разнообразных комплексов документов, чтобы в будущем получить ответы на максимальное количество возникающих вопросов и рецептов для решения конкретных задач.



*Илл. 4.*

Печать Горвата.
Ф. 1636. Оп. 1.
Д. 191. Л. 18 об.

Печать Горвата.
Ф. 1636. Оп. 1.
Д. 191. Л. 16 об.

# Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў

*В. В. Гарбачова*

## Дзейнасць Ігнацыя Дамейкі ў Таварыстве навуковай дапамогі ў Францыі

Першыя гады знаходжання былых паўстанцаў 1831 г. у эміграцыі ў Францыі адзначаюцца шматбаковай актыўнасцю яе дзеячаў. У гэты перыяд яскрава назіраецца зварот да ідэй французскага Асветніцтва з увагай да праблем адукацыі, літаратурнай, філасофскай і навуковай дзейнасці. Пад гэтым уплывам пачынаюць стварацца арганізацыі, якія мелі на мэце аднаўленне традыцый культурнай, інтэлектуальнай, мецэнацкай дзейнасці. Яны сфармаваліся ў XVIII – першай чвэрці XIX ст. на землях Рэчы Паспалітай і ўспрымаліся як сродак сацыяльна-культурнага прагрэсу. Адной з такіх арганізацый стала Таварыства навуковай дапамогі [1].

Таварыства навуковай дапамогі, заснаванае ў Парыжы 29 снежня 1832 г., у якасці сваёй асноўнай мэты вызначыла садзеянне эмігранцкай моладзі ў паступленні ў французскія навучальныя ўстановы і далейшае яе ўладкаванне на працы [2]. Для дасягнення гэтага таварыства дапамагала эмігрантам атрымліваць дазвол французскага ўрада на пераезд у

---

[1] У разглядаемы перыяд культурна-асветніцкія, навуковыя і дабрачынныя аспекты ўваходзілі таксама ў праграмныя дакументы Таварыства Літоўскага і Рускіх Зямель, Страсбургскага навуковага таварыства, Таварыства ўзаемнай асветы ў Безансоне, Таварыства сяброў літаратуры ў Леўру, Літаратурнага таварыства ў Парыжы і інш.

[2] Biblioteka Polska w Paryżu (далей — BPP), rkps 482. Akt utworzenia Instytutu Naukowej Pomocy. S. 1855–1858.

патрэбны для працягу навучання ці працы горад, а таксама аказвала ім разавую і доўгатэрміновую фінансавую дапамогу падчас атрымання адукацыі. У першыя гады эміграцыі надзеі на ўзнаўленне паўстання і хуткае трыумфальнае вяртанне на радзіму былі настолькі трывалыя, што шматлікія таварыствы і суполкі, створаныя ў гэты час, па большасці фармавалі свае мэты, зыходзячы з надзённых патрабаванняў сваёй краіны. Таварыства навуковай дапамогі не з'яўлялася ў гэтым сэнсе выключэннем. Арганізацыйная і фінансавая дапамога здольнай, у асноўным ліцвінскай, моладзі накіроўвалася з мэтай, што ў далейшым яна сваімі ведамі будзе «карысна служыць краіне ў аднаўленай Айчыне» [3].

Структурна таварыства складалася з рады, прадстаўнікі якой уваходзілі ў склад двух асобных аддзелаў — аддзела фундушоў і навуковага і сяброў [4]. Старшынёй таварыства з'яўляўся Адам Чартарыйскі, функцыі сакратара выконваў Аляксандр Ялавіцкі. У склад рады ўваходзілі такія знаныя дзеячы эміграцыі, як генералы Караль Князевіч і Людвік Пац, Банавентура Немаеўскі, Адам Міцкевіч [5], Людвік і Цэзарый Плятары, Юльян Нямцэвіч і інш. [6]

Адным з актыўнейшых дзеячаў таварыства з самага пачатку яго заснавання і да свайго ад'езду ў Чылі з'яўляўся Ігнацій Дамейка [7]. Пачаткова ён уваходзіў у склад сяброў таварыства, а пачынаючы з 1834 г. разам з Феліксам Вратноўскім становіцца членам рады [8].

Прасачыць дзейнасць І. Дамейкі ў Таварыстве навуковай дапамогі дазваляюць не толькі яго ўласныя ўспаміны, але і ягоны архіў, які захаваў карэспандэнцыю шэрагу эмігрантаў, звязаных з таварыствам. Гэтыя матэрыялы з'яўляюцца не толькі каштоўнейшай крыніцай па

---

[3] Straszewska M. Życie literackie Wielkiej Emigracji we Francji (1831–1840). Warszawa, 1971. S. 108.

[4] Pierwsze zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. Paryż, 1832/1833. S. 13–14.

[5] Для папулярызацыі дзейнасці таварыства А. Міцкевічам была напісана адозва «Паведамленне аб Таварыстве навуковай дапамогі», перакладзеная на французскую мову. Гл.: Straszewska M. Życie literackie Wielkiej Emigracji… S. 108.

[6] У адпаведнасці са справаздачай таварыства за першы год існавання рада складалася з дзесяці чалавек, а васемнаццаць дзейнічала ў статусе сяброў. Па выніках другога года рада налічвала ўжо пятнаццаць чалавек, а колькасць сяброў складала шаснаццаць. Гл.: Pierwsze zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 13–14; Drugie zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. Paryż, 1834/1835. S. 20–21.

[7] Domeyko I. Moje podróże. Pamiętniki wygnańca / Wyd. E. Nieciowa. T. 1. Wrocław, 1962. S. 144; Wójcik Z. Ignacy Domeyko. Litwa-Francja-Chile. Warszawa; Wrocław, 1995. S. 211.

[8] Pierwsze zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 14; Drugie zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 20-21.

дзейнасці пазначанай структуры, а таксама даюць уяўленне па сістэме адукацыі ў французскіх навучальных установах, пашыраюць гісторыю паўсядзённасці эмігрантаў. Сярод лістоў, датаваных 1832–1835 гг., можна назваць лісты Яна Бранта, Гіпаліта Клімашэўскага, Марціна Жылінскага, Антонія Занеўскага і інш. [9] У перыяд свайго знаходжання ў Францыі Дамейка атрымліваў значную карэспандэнцыю. Гэта былі просьбы па аказанню разнастайнай дапамогі былым сябрам-ліцвінам, знаёмым і проста суайчыннікам. Так, Марцін Жылінскі [10] просіць дапамагчы літаратурай, неабходнай для арганізацыі жаночых матэматычных курсаў [11]. Антоній Занеўскі [12] у сваім лісце ад 29 жніўня 1835 г. з Сант-Эцьена просіць даслаць сродкі для вырабу агнястрэльнай зброі [13]. Ян Брант [14] просіць пасадзейнічаць у паступленні ў Цэнтральную школу

---

[9] BPP, rkps 457/2. Papiery, które Domeyko wyjeżdżają do Chili 1838 stycznia 30 odesłał do archiwum Towarzystwa Pomocy Naukowej. 1832–1835 r.

[10] Жылінскі Марцін (12.11.1796–27.01.1881), шляхціч Мінскай губерні. Скончыў Віленскі універсітэт, прафесар матэматыкі, памочнік астранамічнай абсерваторыі ліцэя ў Вільні. У паўстанні 1831 г. дзейнічаў з 6 чэрвеня 1831 г., меў чын падпаручніка артылерыі. Эміграваў у Францыю ў 1832 г., у снежні гэтага года знаходзіўся ў закладзе ў Безансоне, з'яўляўся сакратаром мясцовай рады, затым перабраўся ў Швейцарыю. У перыяд з 20 сакавіка па 17 верасня 1834 г. выкладаў матэматыку ў пачатковай школе ў г. Каньяк, з 1 лістапада 1835 г. па 1 красавіка 1837 г. выкладаў фізіку і матэматыку ў мясцовым Каралеўскім ліцэі. 20 жніўня 1838 г. пачаў працаваць у корпусе дарог і мастоў інструктарам 3 класа з заробкам 1000 франкаў у год у дэпартаменце Мэн і Луар. 7 мая 1856 г. намінаваны інструктарам 2 класа. З красавіка 1857 г. жыў у г. Анжэр. 1 жніўня 1868 г. выйшаў на пенсію, атрымоўваючы ў год 1007 франкаў. 7 лістапада 1859 г. атрымаў дазвол на сталае жыхарства, а 20 лістапада 1872 г. — французскае грамадзянства. Памёр у Джувісі (прадмесце Парыжа). Гл.: Гарбачова В. В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гадоў на Беларусі: біябібліяграфічны слоўнік. Другое выданне. Мн., 2006. С. 141; Konarska B. Emigranci polscy we Francji po powstaniu listopadowym, ktorży otrzymali obywatelstwo francuskie // Akta Towarzystwa Historyczno-Literackiego w Paryżu. T. III. Paryż, 1996. S. 1–57.

[11] BPP, rkps 457/2. List M. Żylińskiego z 23.08.1835. S. 1665–1667.

[12] Занеўскі Антоній, паходзіў з Гродзенскай губерні. У паўстанні 1831 г. служыў вахмістрам 4 палка конных стралкоў. Эміграваў у Францыю, куды прыбыў 4 жніўня 1832 г. на караблі «Lachs». Гл.: Bielecki R. Zarys rozproszenia Wielkiej Emigracji we Francji 1831–1837. S. 156; Krawiec L. Lista członków Towarzystwa Demokratycznego Polskiego z lat 1832–1851 // Materiały do biografii, genealogii i heraldyki polskiej. T. l. Buenos Aires, 1963. S. 63.

[13] BPP, rkps 457/2. List A. Zaniewskiego z 29.08.1835. S. 1671.

[14] Брант Ян, з Лідскага павета Гродзенскай губерні, студэнт Віленскага універсітэта. У паўстанні 1831 г. падпаручнік артылерыі. Эміграваў у Францыю, у снежні 1832 г. знаходзіўся ў закладзе ў Безансоне. Наведваў матэматычныя курсы, у 1847 г. здаў экзамен на інструктара дарог і мастоў. З 1856 г. жыў у Дзюнкерку. Гл.: Гарбачова В. В.

мастацтваў і рамёстваў [15]. Часам людзі звярталіся да яго з просьбай аказаць пратэкцыю не непасрэдна, а праз вядомых яму асоб. Так, за былога прафесара, выкладчыка старажытнай літаратуры Віленскай гімназіі Герарда Гранастайскага просіць у сваім лісце Гіпаліт Клімашэўскі [16]. Для першага патрабаваліся сродкі для пераезду на вучобу ў Арлеан [17]. Юзаф Залескі хадайнічае перад Дамейкай за шляхціча з Вількамірскага павета Адольфа Барткевіча, якому патрабаваліся сродкі для заканчэння медыцынскай адукацыі ў Манпелье [18].

За перыяд сваёй дзейнасці ў Таварыстве навуковай дапамогі І. Дамейка выконваў шэраг функцый. Па-першае, ён выконваў абавязкі касіра, які штомесячна ці асабіста, ці шляхам рассылкі выдаваў эмігрантам-навучэнцам па 15 франкаў, суму, вызначаную таварыствам у якасці падтрымкі. Пазначаную дапамогу атрымлівалі студэнты Цэнтральнай школы мастацтваў і рамёстваў, Гандлёвай школы, Школы дарог і мастоў, Горнай школы, навучэнцам якой з 1834 г. з'яўляўся сам

---

Удзельнікі паўстання… С. 60; Pezda J. Uzupełnienia i sprostowania biograficzne do książki B. Konarskiej «Polskie drogi emigracyjne» // Akta Towarzystwa Historyczno-Literackiego w Paryżu. T. 1. Paryż, 1991. S. 117–185.

[15] BPP, rkps 457/2. List Jana Brandta do kapitana Janusza Czetwertyńskiego z 22.02.1835. S. 1609–1612.

[16] Клімашэўскі Гіпаліт (19.01.1802–18.12.1875), з Мазырскага павета Мінскай губерні, паэт, грамадскі дзеяч. З 1820 г. вывучаў філалогію ў Віленскім універсітэце, меў стасункі з філаматамі. Пісаў вершы і песні, рэдактар віленскага «Noworocznika litewskiego na rok 1831», збіраўся выдаць знойдзеную ў прыватнай бібліятэцы «Хроніку Быхаўца». 11 мая 1831 г. далучыўся да паўстанцаў, кіраваў адным з атрадаў акадэмічнай моладзі, затым знаходзіўся ў корпусе Антонія Гелгуда, быў паранены, трапіў у палон, утрымліваўся ў Вільні. Палявы аўдытарыят вынес яму смяротны прыгавор, які пазней быў заменены на ссылку ў Сібір на пасяленне. У лютым 1832 г. уцёк з астрога і перабраўся ў Прусію. У маі 1832 г. прыбыў у Францыю, абаснаваўся ў Парыжы. З 1 лістапада 1832 г. член Таварыства Літоўскіх і Рускіх Зямель. У 1841 г. разам з А. Астроўскім, В. Звяркоўскім і інш. заснаваў Версальска-Віленскую бібліятэку. У 1847–1852 гг. з'яўляўся дырэктарам Баціньёльскай школы, дзе выкладаў польскую мову і гісторыю. Аўтар некалькіх падручнікаў. У 1854 г. выехаў у Марсэль. Каля 1860 г. ажаніўся з француженкай. Спрабаваў вярнуцца на сталае месцажыхарства, аднак не атрымаў дазволу. Памёр у дэпартаменце Гард. Гл.: Гарбачова В. В. Удзельнікі паўстання… С. 185; B. Czart., Teki emigrantów; BPP, rkps 457/2, 1376; Zmarli na wychodztwie od 1873 do 1878 roku // Rocznik Towarzystwa Historyczno-Literackiego w Paryżu. Rok 1873–1878. Poznań, 1878. T. 2. S. 347; Iwaszkiewicz J. Z pamiętników Hipolita Klimaszewskiego. Wilno, 1929; Pezda J. Uzupełnienia i sprostowania.

[17] BPP, rkps 457/2. List H. Klimaszewskiego z 1834 r. S. 1601–1603.

[18] Ibid. List J. Zaleskiego do I. Domeyko z 06.08.1835. S. 1683.

Дамейка, і некаторых іншых [19]. Па-другое, Дамейка падтрымліваў кантакты з Таварыствам дабрачыннасці польскіх жанчын, для якога штомесяц перадаваў па 5 франкаў на дзяцей эмігрантаў [20].

Як член Таварыства навуковай дапамогі, Дамейка меў, а дакладней кажучы, добраахвотна выконваў яшчэ адзін абавязак — збор ахвяраванняў. На канец 1833 г. грашовыя сродкі таварыства за вылікам выдаткаў на штомесячную і аднаразовую дапамогу студэнтам, а таксама арганізацыю польскіх курсаў у Парыжы, Буржэ, Безансоне, Дзіжоне, Авіньёне, Шатору і Кагоры па гісторыі, ваенных навуках, геаграфіі, статыстыцы і літаратуры налічвалі ўжо 19 855 франкаў [21]. На канец другога года фундуш таварыства складаў усяго 10 373 франка [22]. Гэтых сродкаў было недастаткова, каб павялічваць сумы штомесячных выплат, а таксама колькасць студэнтаў, якія атрымлівалі дапамогу. У рэальнасці сума дапамогі магла складаць 10 і нават 5 франкаў [23]. У існуючых абставінах Дамейку вельмі ўразіў учынак, здзейснены адным з арганізатараў таварыства — Каралем Марцінкоўскім. Гэты вядомы ўрач адзначыўся сваімі дзеяннямі па прыпыненню халеры ў Парыжы, за што ў лістападзе 1833 г. быў узнагароджаны медалём Парыжскай медыцынскай школы. У адказ на прызнанне яго паслуг Марцінкоўскі прапанаваў Медыцынскай школе выдаць замест медаля яго намінальны кошт, які складаў 1000 франкаў, з мэтай ахвяры гэтых сродкаў у фундуш таварыства для падтрымкі навучэнцаў-медыкаў [24].

У 1834 г. Дамейка абіраецца членам рады і пачынае дзейнічаць у навуковым аддзеле таварыства. З гэтага часу на яго ўскладваюцца абавязкі, звязаныя з арганізацыяй працэсу навучання студэнтаў-эмігрантаў. Члены навуковага аддзела займаліся адборам прэтэндэнтаў на атрыманне пасобій, пошукам настаўнікаў для заснаваных таварыствам школ і вучэбных курсаў, а таксама наладжваннем кантактаў з вучэбнымі ўстановамі [25]. У рэальнасці пазначаныя пытанні турбавалі Дамейку

---

[19] У 1833–1835 гг. штомесячную дапамогу таварыства атрымлівалі ад 30 да 33 студэнтаў, якія навучаліся на выбраных таварыствам пятнаццаці спецыяльнасцях. 90 эмігрантаў-навучэнцаў атрымалі разавую дапамогу. Гл.: Drugie zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 6, 14.

[20] Domeyko I. Pamiętniki (1831–1838) / Wyd. J. Tretiak. Kraków, 1908. S. 160; BPP, rkps 457/2. List A. Rogińskiego i S. Sobolewskiego do J. Czetwertińskiego. S. 1597.

[21] Pierwsze zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 6–7.

[22] Drugie zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 11.

[23] Witkowska A. Cześć i skandale. O emigracyjnym doświadczeniu Polaków. Gdańsk, 1997. S. 133–134.

[24] Domeyko I. Pamiętniki (1831–1838). S. 163.

[25] Drugie zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 21.

яшчэ да абрання яго ў склад рады, пацвярджэннем чаго можа служыць ягоны праект, распрацаваны ў сакавіку 1833 г.

Трэба пазначыць, што ў гэтым накірунку Дамейка не з'яўляўся наватарам. Зацікаўленасць лёсам вучнёўскай моладзі прасочваецца на працягу ўсёй дзейнасці Таварыства Літоўскага і Рускіх Зямель. Так, на 37-ым пасяджэнні гэтага таварыства, якое адбылося 20 жніўня 1832 г., быў вынесены на абмеркаванне праект адозвы, адрасаванай былым студэнтам: «Да вучняў, маючых жаданне працягнуць навучанне з мажлівасцю звароту за дапамогай да Таварыства Літоўскага і Рускіх Зямель». У далейшым пытанне аб арганізацыі дапамогі студэнтам падымалася на пасяджэннях гэтага таварыства неаднаразова [26].

Таксама свае меркаванні па пытанню адукацыі эміграцкай моладзі выказаў Ксаверый Гадзебскі [27]. Пры адкрыцці курсаў польскай гісторыі і статыстыкі ў Буржэ дзеяч выразна падкрэсліў, што вучоба павінна выконваць функцыю адаптацыі моладзі да цывільнага жыцця ў эміграцыі, а адначасова з гэтым станоўча ўплываць на паўсядзённыя звычкі моладзі. Ён з'яўляўся адным з тых дзеячаў, якіх сур'ёзна непакоіла прыхільнасць маладых эмігрантаў да гульні ў карты, п'янства, распусты, якія вынікалі з доўгатэрміновай бяздзейнасці апошніх [28].

Пэўны акцэнт месцу адукацыі ў жыцці моладзі надаецца Генрыкам Накваскім [29]. Ён падкрэслівае, што адукацыя здолее адцягнуць гэтую групу эмігрантаў ад пустога палітыканства, а таксама «баламутнага жыцця». Важным, на яго погляд, з'яўляецца і сам вынік. Накваскім

[26] Biblioteka Narodowa, rkps II. 7871, к. 139; Горбачева О. Молодежь белорусско-литовских земель в эмиграции во Франции (1830–40 гг.) // Kobiety i młodzież w migracjach. Migracji i społeczeństwo 10. Warszawa, 2005. S. 130–131.

[27] Гадзебскі Францішак Ксаверый Караль (1801–17.05.1869), нарадзіўся ў Манака. У траўні 1831 г. выступіў адным з арганізатараў паўстання на Валыні, дзейнічаў у чыне маёра, узнагароджаны сярэбраным крыжам. У лістападзе 1832 г. прыбыў у Францыю, пачаткова належаў да заклада ў Буржэ. У 1832 г. становіцца членам Таварыства Літоўскіх і Рускіх Зямель, з 25 красавіка 1835 г. ганаровым членам Палітэхнічнага таварыства. У лістападзе 1839 г. перабраўся ў Версаль, дзе выконваў абавязкі захавальніка Каралеўскай бібліятэкі. У 1841 г. становіцца адным з арганізатараў Баціньёльскай школы, у 1853–1858 гг. выкладаў там польскую літаратуру. У 1858 г. вярнуўся з эміграцыі, асеў у Львове. Пахаваны на Лычакоўскіх могілках. Гл.: Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. Warszawa, 1996. T. 2. S. 86.

[28] Godziebski K. Otwarcie kursu historii i statystyki Polski w szkole artylerii Zakładu Polaków w Bourges w dniu 7 marca 1833. Bourges, 1833. S. 4.

[29] Накваскі Генрык Міраслаў (1800–1876), палітычны дзеяч. У паўстанні 1830–31 гг. абіраўся паслом на сейм. Пасля паражэння паўстання эміграваў, жыў у Прусіі, Францыі, Швейцарыі.

падкрэсліваецца думка, якая знаходзіць працяг у праекце Дамейкі, што адукаваная моладзь патрэбна будучай незалежнай айчыне [30].

Адным з канкрэтных дзеянняў Таварыства навуковай дапамогі становіцца правядзенне своеасаблівага анкетавання моладзі. У эміgranцкіх закладах пачынае збірацца інфармацыя, звязаная з адукацыйнымі пажаданнямі эмігрантаў. У снежні 1832 г. таварыства атрымала ліст з пажаданнямі 38 чалавек з Шатору, а 5 лютага 1833 г. датуецца ліст афіцэраў і падафіцэраў, жадаючых працягнуць навучанне ў Буржэ. 28 сакавіка 1833 г. свае пажаданні выказалі эмігранты Ле Пюі, а 31 сакавіка — Авіньёна. 28 лістапада 1833 г. датуецца інфармацыя з Тулузы [31]. Да лістапада 1833 г. таварыства атрымала адпаведныя просьбы ад 560 эмігрантаў [32]. На падставе гэтых дадзеных становіцца вядома, што Аляксандр Рыпінскі, які знаходзіўся ў закладзе Авіньёна і наведваў курсы малюнка ў публічнай школе, марыў аб навучанні на аддзяленні мастацтва ў Парыжы [33]. А Напалеон Орда ў снежні 1833 г. вагаўся паміж Школай галоўнага штаба і кансерваторыяй [34].

Зацікаўленасць эмігрантаў пэўнымі спецыяльнасцямі ў многім абумоўлівалася іх папярэдняй адукацыяй. Таксама прывабнымі былі прафесіі, запатрабаваныя ў Францыі, што гарантавала далейшае бязбеднае існаванне. Найбольшай папулярнасцю сярод беларуска-літоўскай моладзі карысталася медыцынская адукацыя [35], што было характэрна ў цэлым для лістападаўскай эміграцыі [36]. Прывабнасць медыцыны была ў тым, што ў навучальны перыяд медыкі знаходзіліся ў самых лепшых фінансавых умовах. Яны штоквартальна атрымлівалі ад французскіх уладаў дапамогу ў памеры 100 франкаў на пакупку прэпаратаў і іншых прадметаў, неабходных для навучальнага працэсу [37]. Акрамя медыцыны

---

[30] [Nakwaski H.] Uwagi o użyciu najkorzystniejszym czasu w emigracji z projektem ogólnego stowarzyszenia się wychodźców polskich przez jednego z posłów. Paryż, 1833. S. 3.

[31] BPP, rkps 612. Cz. 2. Archiwum Towarzystwa Pomocy naukowej.

[32] Pierwsze zdanie sprawy stowarzyszenia Naukowej Pomocy. S. 5.

[33] BPP, rkps 612. Cz. 2. Archiwum Towarzystwa Pomocy naukowej. S. 322–323.

[34] Ibid. S. 796–797.

[35] Вывучаць медыцыну выказвалі жаданне былыя студэнты Віленскага універсітэта шляхцічы Мінскай губ. Юрый Клімовіч і Ксаверый Брынк, шляхцічы Гродзенскай губ. Станіслаў Забела, Францішак Мілеўскі, Ануфрый Длускі і інш. Гл.: BPP, rkps 612. Cz. 2; Гарбачова В.В. Удзельнікі паўстання… С. 63, 130, 143, 186, 238.

[36] Барбара Канарская падлічыла, што за перыяд 1832–1848 гг. медыцынскую адукацыю выбралі 440 эмігрантаў. Гл.: Konarska B. Polskie drogi emigracyjne. Emigranci polscy na studiach we Francji 1832–1848. Warszawa, 1986. S. 219–453.

[37] Witkowska A. Cześć i skandale. S. 129.

попытам традыцыйна карысталася права [38]. Юрыдычная адукацыя прываблівала эмігрантаў тым, што для яе атрымання не патрабавалася здача ўступных экзаменаў і аплата за навучанне. Адзіным патрабаваннем з’яўлялася прадстаўленне дакумента аб сярэдняй адукацыі, які ў выпадку яго адсутнасці мажліва было пацвердзіць з дапамогай сведкаў [39].

Атрыманне адукацыі па інжынерна-тэхнічных і сельскагаспадарчых спецыяльнасцях, нягледзячы на іх прывабнасць, ускладнялася шэрагам абставінаў. Па-першае, наяўнасцю ўступнага экзамену і неабходнасцю аплаты за навучанне. Па-другое, будучыя інжынеры мелі значныя фінансавыя выдаткі, якія паўставалі са спецыфікі навучання на гэтых спецыяльнасцях. Так, навучальным планам Горнай школы Сант-Эцьен прадугледжвалася складанне планаў на мясцовасці з выкарыстаннем розных спецыяльных інструментаў, якія набываліся на сродкі студэнтаў. Акрамя гэтага перад заканчэннем школы неабходна было здзейсніць навуковае падарожжа па такіх дысцыплінах, як геалогія, металургія і механіка, на што таксама патрабаваліся ўласныя сродкі [40]. Адначасова з пералічаным студэнты павінны былі самастойна набываць падручнікі. Чарговая грашовая праблема паўставала падчас атрымання дыплома, кошт якога складаў каля 300 франкаў [41]. Гэта, зразумела, яшчэ болей ускладняла сітуацыю з магчымасцю навучання па інжынерных спецыяльнасцях. І тым не менш, жадаючыя знаходзіліся. У адпаведнасці з праведзеным па закладах анкетаваннем вывучаць тэхнічныя і агранамічныя навукі жадалі шляхцічы Мінскай губерні — Віктар Зянковіч, Феліцыян і Юзаф Грос; шляхцічы Гродзенскай губерні — Станіслаў Пілецкі і Томаш Нелюбовіч; шляхціч Магілёўскай губерні Томаш Мянчынскі; навагрудскі мешчанін Міхал Хадаровіч і інш. [42]

У абставінах, якія склаліся вясной 1833 г., Ігнацій Дамейка выказаў свой погляд на праблему ўрэгулявання сітуацыі з тэхнічнай адукацыяй. Ім быў складзены праект па аказанню дапамогі дзесяці былым студэнтам Віленскага універсітэта з эмігранцкага заклада ў Шатору для навучання ў Цэнтральнай школе мастацтваў і рамёстваў. Менавіта гэтая парыжская ўстанова рыхтавала высокакласных спецыялістаў

---

[38] Вывучаць права жадалі шляхцічы Гродзенскай губерні Аляксандр Дамейка, Жыгімонт Бергель, Павел Грыневіч, шляхцічы Мінскай губерні Уладзіслаў Лясковіч і інш. Гл.: BPP, rkps 612. Cz. 2; Гарбачова В. В. Удзельнікі паўстання… С. 56, 117, 122.

[39] Konarska B. Polskie drogi emigracyjne. S. 103.

[40] BPP, rkps 457/2. List A. Rogińskiego i S. Sobolewskiego do TNP z 12.05.1835. S. 1621–1622.

[41] Witkowska A. Cześć i skandale. S. 129.

[42] BPP, rkps 612. Cz. 2; Гарбачова В.В. Удзельнікі паўстання… С. 115, 153, 247, 253, 272, 342.

інжынерна-тэхнічнага профілю. Разумеючы ўсю складанасць паступлення на прыродазнаўчыя факультэты, Дамейка прапаноўвае свой варыянт падтрымкі здольных студэнтаў. У якасці асноўнага палажэння, якое, на погляд аўтара праекта, дапаможа яго рэалізацыі, выступае наладжванне непасрэдных кантактаў з самой школай. Акрамя гэтага, таварыства мусіла забяспечыць эмігрантаў афіцыйным дазволам на пражыванне ў Парыжы, што з'яўлялася ледзь не самым складаным. Важнае месца аўтар надае падрыхтоўцы да ўступнага экзамена, у сувязі з чым прапаноўваецца забяспечыць эмігрантаў неабходнай літаратурай. Не абмінае Дамейка і надзённыя праблемы моладзі. У гэтым плане ім прапаноўваецца забеспячэнне студэнтаў агульным жыллём, а таксама выдзяленне ім дадатковай грашовай дапамогі, неабходнай для выканання ўсіх умоў навучальнага працэсу, які дзейнічае ў Францыі на тэхнічных факультэтах. Звяртае Дамейка таксама ўвагу і на праблему ўладкавання выпускнікоў на працу. Ён добра разумее, што эмігранты павінны выкарыстаць у сваіх інтарэсах сітуацыю, што склалася зараз, і атрымаць адукацыю ў лепшых еўрапейскіх навучальных установах. Выбар жа аўтарам праекта менавіта гэтай школы і ўвогуле тэхнічных накірункаў абумоўліваецца ім вострай неабходнасцю спецыялістаў адпаведнага кшталту на радзіме.

Праект І. Дамейкі знойдзены намі ў фондах Польскай бібліятэкі ў Парыжы сярод матэрыялаў архіва Таварыства навуковай дапамогі пад нумарам 72 па рэестру дакументаў [43]. Да сённяшняга часу гэты дакумент не друкаваўся [44]. У археаграфічным плане рукапіс складаецца з чатырох аркушаў і прадстаўляе сабой здвоены ліст паперы з няроўнымі краямі памерам 17,8×23 см. Польскамоўны тэкст запісаны з двух бакоў аркуша. Поле з левага боку складае каля 2 см. Тэкст выкананы чорным атрамантам на дзевятнаццацівекавай паперы шэрага колеру. Моўныя і лексічныя асаблівасці тэксту падаюцца адпаведна арыгіналу з захаваннем аўтарскіх асаблівасцяў. Што тычыцца нехарактэрнага для сучаснай польскай мовы напісання, то такія выпадкі пазначаюцца ў спасылках.

## Дадатак

Праект Ігнація Дамейкі па навучанню эмігрантаў у Парыжскай Цэнтральнай школе мастацтваў і рамёстваў, 14 сакавіка 1833 г.

[43] BPP, rkps 612/72. Archiwum Towarzystwa Pomocy naukowej. Projekt Domejki. 14.03.1833. S. 299-302.

[44] Упершыню звярнула ўвагу на гэты дакумент Аліна Віткоўская. Гл.: Witkowska A. Cześć i skandale. S. 124.

**Projekt Domejki**

[s. 299] Dyrekcja szkoły centralnej sztuk i rzemiosł oświadczyła przeszłej jesieni, że się obowiązuje przyjąć bezpłatnie kilku polaków do swojej szkoły, pod warunkiem, że ci którzy się szczerze chcą oddać naukom, zdadzę przy wejsciu do szkoły examin z nauk przygotowawczych (dla tego do tąd niemasz nikogo z Polaków w tej szkołe że nikt z naszych tułaczów niechciał zdać examin, jakiego dyrekcja wymaga) [45a]. W zakładzie w Chatouroux, najuboższym co do szkoł i pomocy naukowych, najwięcej jest młodzieży z Uniwersytetu Wileńskiego, zdatnej, obeznanej z naukami fiziczno-matematycznemi, najmłodszej wiekiem [46b-b] potrzebującej zajęcia się, i najwięcej ochoty do nauk mającej. Kraj nasz pozbawiony jest inżynierów cywilnych; usiłowanie tu pojedyńcze niektórych tułaczów, zrucanie się niepewnie do rozmaitych prac i nauk bez pewnej całości i systematu, staranie nawet dotychczasowe towarzystwa naukowej pomocy [47c] nieodpowiedzę tej potrzebie, jeżeli od razu niewynajdziemy kilkunastu młodych ukształconych, niezrażonych jeszcze pracą tułaczów i jeżli [s. 300] ich niepostawiemy w możności uczenie się nauk, sztuk i rzemiosł sposobem i drogą, jakiej się tu trzymają we Francji na ukształceniu inżynierów cywilnych, dyrektorów fabryk, dyrektorów górnictwa i t. p.

To mię powoduje do podania towarzystwu naukowej pomocy następującego projektu:

Wejść w stosunki z dyrekcją szkoły centralnej sztuk i rzemiosł, uprosić ją o przyjęcie na rok następny do swojej szkoły dziesięciu polaków.

Wysłać do Chatouroux propozycja, aby uczniowie Uniwersytetu Wileńskiego wybrali 10ciu z [48d] pomiędzy sobie mających uczone stopnie, lub takich, co już odbyli na Uniwersytecie kurca nauk fiziczno-matematycznych i chcą nadal oddać się zupełnie zastosowaniu tych nauk do sztuk i rzemiosł. Tacy natychmiast mają się przygotować do zdania examinu z początkowej matematyki (geometryi i algebry do 2go stopnia) na co im postanie bydź powinny książki Legendre: geometrie, Lacroix aritmetique i Bourdon algebre.

[s. 301] Wyrobić u ministra wewnętrznych interesów pozwolenie dla tych 10ciu, jako przyszłych uczniów szkoły centralnej pozwolenie na pobyt w Paryżu z pobieraniem tu ich cywilnej gaży.

Tak wybranie uczniowie mają tu bydź sprowadzeni pod koniec sierpnia, i dla nich wspolna [49e] kwatera zgodzona bydź powinna niedaleko szkoły. Do gaży jaką pobierać będą, jeżeli im towarzystwo da [50f] 25 franków na miesiąc każdemu, wygodnie się tu utrzymują a korzyść wielka, pewna, niezaprzeczona.

---

[45a] Тэкст у дужках афармлены І. Дамейкай у выглядзе спасылкі ў канцы старонкі.

[46b-b] Закрэслена фраза a może naj.

[47c] Падкрэсліванні па тэксту тут і далей выкананы самім І. Дамейкай.

[48d] Устаўлена над радком.

[49e] У сучаснай польскай мове выкарыстоўваецца варыянт напісання слова wspólna.

[50f] Слова напісана над радком замест закрэсленага nie da więcej nad.

Oprócz wewnętrznej ochoty i zapału do nauk, samo położenie w tej szkole każdego zniewoli do pracy; bo co rok szkoła wymaga examinów, a któby ich niezdał, któby nawet rególarnie na lekcye niechodził, byłby zastąpionym [51g] przez kogo drugiego, a straciłby prawo do pomocy towarzystwa.

Po dwóletnich kursach, ci uczniowie rozebraliby między siebie rozmaite galerie sztuk i rzemiosł, fabryk i górniczych zakładów, a trzeciego roku pod dyrekcyą professorów oddaliby się specialnym pracom (jak o tem programa tejże szkoły wspomina).

[s. 302] Tym sposobem za lat trzy, kosztem trzech tysiący franków na rok, mielibyśmy dziesięciu usposobionych do przeniesienia, w każdym razie i przy każdym pomyślnym wypadku dla kraju, na ziemię polską, wyższych nauk i zastosowanie ich do ważniejszych sztuk i rzemiosł. A jako dyrektorom fabryk, inżynierom i wszelkim przedsiębiercom, trudno jest co począć bez rzemieślników niższego rządu, bez wyrobników specialnych do każdego [?] kunsztu; dla tego towarzystwo powinnoby w tym przeciągu czasu starać się umieszczać po ważniejszych fabrykach tak wojskowych jak cywilnych we Francji, pewną liczbę żołnierzy naszych mających ochotę poświęcić się wyłącznie fabrykom i rzemiosłom.

## Пераклад

**Праект Дамейкі**

[арк. 299] Дырэкцыя Цэнтральнай школы мастацтваў і рамёстваў мінулай восенню паведаміла, што можа прыняць без аплаты за навучанне некалькі палякаў з умовай, што тыя, хто шчыра выкажа жаданне вучыцца, павінны пры паступленні ў школу здаць экзамен па прыродазнаўчых дысцыплінах (да гэтага часу мы не маем нікога з палякаў у гэтай школе па прычыне таго, што ніхто з нашых эмігрантаў не пажадаў здаць экзамен, якога патрабуе дырэкцыя). У закладзе ў Шатору [52], які з'яўляецца найбяднейшым па наяўнасці там школ і навуковай дапамогі, наадварот знаходзіцца болей усяго прыдатнай, дасведчанай у фізіка-матэматычных навуках моладзі з Віленскага універсітэта, яшчэ зусім маладой па ўзросту, якой патрабуецца праца і якая мае найбольш ахвоты да заняткаў навукамі. [Сёння. — *В. Г.*] наша айчына пазбаўлена цывільных інжынераў. Адзіночныя намаганні [у гэтым

[51g] Слова напісана замест закрэсленага od.

[52] Заклад (Установа. — *Рэд.*) Шатору, размешчаны ў дэпартаменце Індр, быў заснаваны ў лістападзе 1831 г. і з'яўляўся па вызначэнню французскага ўрада месцам для размяшчэння цывільных эмігрантаў. Большасць з членаў гэтага заклада складалі студэнты Віленскага, Варшаўскага, Кракаўскага універсітэтаў і іншых навучальных устаноў. Восенню 1832 г. многіх эмігрантаў заклада перамясцілі ў іншыя населеныя пункты дэпартамента Індр. А былыя студэнты атрымалі магчымасць працягваць адукацыю ў навучальных установах Францыі.

накірунку. — *В. Г.*] некаторых нашых эмігрантаў, выпадковае іх звяртанне да розных прац і навук без пэўнага ўяўлення і сістэмы, а таксама нават тыя намаганні, якія рабіліся да гэтага часу Таварыствам навуковай дапамогі, не будуць адпавядаць нашым патрэбам у тым выпадку, калі мы адразу не знойдзем дзесяць маладых, адукаваных, не страціўшых яшчэ ахвоты да працы выгнанцаў і калі [арк. 300] не прадаставім ім мажлівасці атрымання адукацыі ў галіне мастацтваў і рамёстваў адпаведна той сістэме, якая існуе ў Францыі для падрыхтоўкі цывільных інжынераў, дырэктараў фабрык, кіраўнікоў у горнай прамысловасці і г. д.

Гэта паўплывала на прадстаўленне мной у Таварыства навуковай дапамогі наступнага праекта:

Увайсці ў кантакт з дырэкцыяй Цэнтральнай школы мастацтваў і рамёстваў і прасіць яе прыняць на наступны год у гэтую школу дзесяць палякаў.

Выслаць у Шатору прапанову, каб навучэнцы Віленскага універсітэта выбралі са свайго асяроддзя 10 [чалавек. — *В. Г.*], якія маюць навуковыя ступені, ці тых, хто скончыў універсітэт па курсу фізіка-матэматычных навук і мае жаданне ў далейшым прысвяціць сябе поўнасцю ўжыванню гэтых навук у мастацтвах і рамёствах. Неадкладна яны павінны падрыхтавацца да здачы экзамену па курсу асноў матэматыкі (геаметрыі і алгебры 2-ой ступені), для чаго ім будуць патрэбны кнігі па геаметрыі Лежандра [53], па арыфметыцы Лакруа [54] і па алгебры Бурдона [55].

[Арк. 301] Атрымаць у міністра ўнутраных спраў дазвол на побыт для гэтых 10-ці будучых вучняў Цэнтральнай школы з мажлівасцю атрымання імі тут грашовай дапамогі, [якая прызначаецца. — *В. Г.*] для цывільных.

Выбраныя такім чынам вучні павінны прыбыць сюды ў канцы жніўня, і для іх павінна быць знята недалёка ад школы агульная кватэра. Ім будзе выгодна тут жыць, калі да пасобія, якое яны будуць атрымліваць, таварыства будзе дадаваць кожнаму з іх па 25 франкаў штомесяц, а [ад гэтага ў сваю чаргу. — *В. Г.*] будзе вялікая, пэўная, бясспрэчная карысць.

Акрамя асабістага жадання і зацікаўленасці навукамі, само знаходжанне ў гэтай школе прымусіць кожнага да працы па прычыне таго, што школа патрабуе кожны год здаваць экзамены. У выпадку, калі хтосьці іх не здасць і на-

---

[53] Лежандр Адрыян (1752–1833), французскі матэматык, прафесар Палітэхнічнай школы, член Парыжскай Акадэміі навук. Аўтар прац па праблемах эліптычных інтэгралаў спосабам вызначэння арбіт камет.

[54] Лакруа Сільвестр Франсуа (28.04.1765–25.05.1843), французскі матэматык, з 1799 г. — член Парыжскай Акадэміі навук, з 1815 г. — прафесар Парыжскага універсітэта. Аўтар прац па матэматычнаму аналізу, тэорыі верагоднасцей і падручнікаў.

[55] Бурдон, французскі матэматык, аўтар двухтомнага падручніка «Курс алгебры», па якім вучыліся ў Парыжскім універсітэце.

ват нерэгулярна будзе наведваць заняткі, ён будзе заменены на каго-небудзь іншага і страціць права на атрыманне дапамогі ад таварыства.

Пасля прахаджэння двухгадовага курса гэтыя вучні разбяруць паміж сабой розныя накірункі мастацтваў і рамёстваў, фабрык і горных прадпрыемстваў, і пачынаючы з трэцяга [навучальнага. — *В. Г.*] года, пад кіраўніцтвам прафесараў зоймуцца спецыяльнымі працамі (як пазначана ў праграме гэтай школы).

[арк. 302] Такім чынам праз тры гады, кoштам 3 тысячы франкаў штогод, мы б мелі дзесяць падрыхтаваных [асоб. — *В. Г.*] для высылання, у кожным разе і пры кожнай спрыяльнай сітуацыі для краіны, на польскую зямлю, вышэйшых навук і прымяненне іх для важнейшых галін мастацтва і рамёстваў. А паколькі дырэктарам фабрык, інжынерам і ўсялякім прадпрымальнікам цяжка што зрабіць без рамеснікаў ніжэйшай кваліфікацыі, без спецыяльных падзёншчыкаў для кожнага рамяства; таму таварыства павінна было б у гэтым часе імкнуцца размяшчаць па важнейшых фабрыках у Францыі як ваенных, так і цывільных асоб, пэўную лічбу нашых вайскоўцаў, маючых ахвоту прысвяціць сябе выключна фабрыкам і рамёствам.

*В. М. Корсак*

## Публікацыя тэстамента Яна Серакоўскага, стольніка гастыньскага

У актавай кнізе Мінскага земскага суда за 1710–1763 гг., якая захоўваецца ў НГАБ (г. Мінск), намі выяўлены тэстамент Яна Серакоўскага 1771 г. [5, арк. 772].

Ён з'яўляецца дакументам, у якім змешчаны распараджэнні па падзелу маёмасці, рэлігійныя погляды, пачуцці да жонак, мужоў, дзяцей і сваякоў. Акты апошняй волі — гэта крыніца інфармацыі для даследаванняў маёмаснай сітуацыі, гаспадарчай дзейнасці, сацыяльных адносін, моўнай сітуацыі XVIII ст. на Беларусі [3, с. 4–15].

У тэстаменце прысутнічаюць лацінскія адміністрацыйна-юрыдычныя тэрміны:

Coram actis — coram «у прысутнасці, на вачах, перад, пры, «тварам у твар, асабіста, публічна, сам»; comparendo — ад дзеяслова compareo «прысутнічаць, праяўляцца, быць прыкметным»; personaliter — «асабіста, у асабістым плане»; utriusq sexus (скажона пісарам) — дакладна utriusque sexus «абодвух палоў»; successive — ад successivus «наступны»; ad acta — acta «пратаколы, дзённік пасяджэнняў», regent — ад regens «кіраўнік»; testament — ад testamentum «завяшчанне, запавет»;

dyspozycyą — ад dispositio «расстаноўка, размяшчэнне, размяркоўваць, прыводзіць у парадак»; substancya — ад substantia «сутнасць, маёмасць, сродкі харчавання»; sukcessor — ад successor «спадчыннік, пераемнік»; regestr — ад register, registrum «спісы, пералік»; testator — ад testator «завяшчальнік»; назоўнік attynencyami — ад лацінскага дзеяслова attineo «моцна трымаць, распасцірацца»; назоўнік pertynencyami — ад лацінскага дзеяслова pertineo «распасцірацца, датычыцца, належаць» (напрыклад, res ad luxuriam pertinentes — «прадметы раскошы»); назоўнік aktykacya — ад лацінскага acta, actio «нарада, судзебнае пасяджэнне, слуханне справы».

Асобную групу складаюць словы і словазлучэнні тэрміналагічнага характару славянскага паходжання: urząd, województwo, stolnik, majętność; przy zupełnych zmysłach, pozycie małzenskie, ustnie y oczewisto proszony, wyz wyrazoną osobą / od osoby w gorze wyrazoney, własną ręką moią podpisuię, этыкетная формула Iegomość.

Варта спыніцца таксама на некаторых арфаграфічных асаблівасцях рукапісу тэстамента Яна Серакоўскага.

У тэксце выкарыстоўваюцца наступныя скароты: s. p. — świętej pamięci, ziem. — ziemskiego, czeszn. — czesznik.

Трэба адзначыць, што з вялікай літары ў рукапісе пісаліся не толькі ўласныя імёны: Heronimem z Skalnik Soroką, Grzegorz Zwanski, Jan Sierakowski, але таксама і словы рэлігійнай тэматыкі: w Troycy Swiętey Iedynego Boga y Pana moiego, Chrystusa Pana, Maryi Panny Bogarodzicy Swiętych Aniołów, W imie Oyca y Syna Ducha swiętego Amen, назва сваяцкіх сувязей: Dobrodzieiu Oycu, некаторыя назвы ўрадаў: Stolnika Gostynskiego, этыкетныя формулы: Iegomości Pana, Ieymoscią Panią, Ichmosciach Panach, іншыя словы: Ciało, Pieczętarzach.

Спынімся на абазначэнні гука [i] у дакуменце. У сярэдзіне слова «і» выступае паміж галоснымі (woiewodztwa, znaiąc, zyiący, zostaię, swoiey), пасля зычных, акрамя z, c, s, перад галоснымі (parafialnym, Iulii) і на пачатку слова перад галоснай (ieszcze, Iozef, Iegomość); у іншых выпадках — «у»: на канцы слова (Swiętey, zmiłuy się), пасля галоснай перад зычнай у сярэдзіне слова (Oyca, przenayswiętszą, Troycy), пасля «c» перад галоснай (dyspozycyą, substancyi, attynencyami).

У тэксце дакумента ў асноўным паслядоўна ўжываюцца літары «ę» і «ą»: tysiąc, rąk, maiętnosc, swą, pieczętarz, przyięty, аднак назіраем таксама выпадак раскладання насавога галоснага «ą» на два гукі «ом» у формах somsiadom, somsiadow.

Што датычыцца ўжывання спецыфічных польскіх літар «ś», «ć», «ż», то яно непаслядоўнае: Iegomość, karać, każdy, też і poniewaz, kosciele, przenayswiętszą, umrzec, zyiący. Літара «ó» у даным тэксце не ўжываецца.

Мяккасць [n] у тэксце перад зычнымі не абазначаецца: Gostynską, panskim, Gostynskiego.

**Тэстамент Яна Серакоўскага, стольніка гастыньскага, 16.08.1771 г.**

Aktykacya testamentu ziem [skiego] Iegomości Pana Jana Sierakowskiego Stolnika Gostynskiego.

Roku tysiąc siedmset siedmdziesiątego pierwszego miesiąca augusta szesnastego dnia.

[Арк. 772]. *Coram actis* urzędu ziem [skiego] woiewodztwa Minskiego y przede mną Heronimem z Skalnik Soroką, przysięgłym ziemskim regentem *comparendo personaliter* Iegomość Pan Iozef Szaniawski rotmistr lidzki testament s [więtej] p [pamięci] Iegomości Pana Iana Sierakowskiego Stolnika Gostynskiego *ad acta* podał ktorego wyraz takowy. W imie Oyca y Syna Ducha swiętego Amen. Ia Ian Sierakowski Stolnik Gostynski znaiąc się bydz człowiekiem smiertelnym podległym ogolnemu dekretowi boskiemu podług ktorego każdy człowiek zyiący koniecznie umrzec musi a będąc chorobą ciezką y niebespieczną od Boga nawiedzony dopoki ieszcze przy zupełnych zmysłach zostaię takową czynię ostatniey woli swoiey dyspozycyą. Nasam przod duszę moią grzeszną przenayswiętszą krwią y niewinną męką Chrystusa Pana odkupioną za przyczyną Maryi Panny Bogarodzicy Swiętych Aniołow strozow y wszystkich swiętych w ręce y miłosierdzie w Troycy Swiętey Iedynego Boga y Pana moiego poruczam wołaiąc z psalmistą panskim nie racz m [n] ię karać Panie podług wielkosci grzechow moich ale według nieprzebranego miłosierdzia twego zmiłuy się nademną. Ciało zaś moie za staraniem Syna moiego ma bydz przyzwoicie obrzędem rzymsko katolickim pogrzebione przy kosciele parafialnym przy mszach swiętych y innych ofiarach na co przeznaczam złotych polskich osmdziesiąt a osobny na dzwony swiatło y na ubogie złotych dwadziescia. Co się zas tycze substancyi moiey a mianowicie maiętnosci Lucynka nazwaney w woiewodztwie Minskim lezącey poniewaz innych posobie sukcessorow niezostawuię iedno syna moiego Franciszka Urbana Tadeusza Antoniego Sierakowskiego w pozyciu małzenskim z Ieymoscią Panią Anielą Bieniewską Ianową Sierakowską Stolnikową Gostynską spłodzonego przeto tez maiętnosc Lucynkę po Dobrodzieiu Oycu moim zeszłym w Bogu Iegomości Panu Alexandrze Sierakowskim *successive* na mnie spadłą z gruntami sianozęciami lasami rzekami stawem młynem y karczmą z poddanemi ludzmi *utriusq sexus* ich siedzibami dobytkiem y powinnosciami owo zgoła ze wszystkiemi attynencyami y pertynencyami pomienionemu synowi moiemu miłemu Franciszkowi Urbanowi Tadeuszowi Antoniemu Sierakowskiemu zapisuię. Długow znacznych ani po sobie niezostawuię ani też na nikim niemam procz kilku kercow zboza pozyczonych somsiadom to tego osobliwy regestr spisany. Na ostatek zegnam syna moiego miłego oraz wszystkich krewnych przyiacioł moich somsiadow niezapominam tez sług czeladki y poddanych moich ktorych proszę o przebaczenie ieslim się komu z nich w czym naprzykrzył s takową moią ostateczną dyspozycyą

przy uproszonych odemnie Ichmosciach Panach Pieczętarzach własną ręką moią podpisuię Pisan w Lucynce Roku tysiąc siedmset siedmdziesiątego pierwszego miesiąca Iulii czwartego dnia. U tego testamentu podpisy rąk tak samego testatora iako y Ichmosciow Panow Pieczętarzy takowe. Jan Sierakowski Stolnik Gostynski ustnie y oczewisto proszony Pieczętarz od Iegomosci pana Jana Sierakowskiego Stolnika Gostynskiego do tego testamentowego rozporządzenia przez ktore maiętnosc swą Lucynkę zapisuie synowi swemu Iegomosci panu Franciszkowi Urbanowi Tadeuszowi Antoniemu Sierakowskiemu Stolnikowi Gostynskiemu podpisuię się Antoni Obrąpalski czeszn [nik] […]. Od osoby w gorze wyrazoney proszony za pieczętarza do tey Testamentowey dyspozycyi podpisuię się Michał Czaplic m [ieysce] p [odpisu] od wyz wyrazoney osoby proszony pieczętarz do tego testamentu podpisuię się Grzegorz Zwanski m [ieysce] p [odpisu] takowy to testament za podaniem onego wyz wyrazoną osobą iest do Xiąg ziemskich woiewodztwa Minskiego przyięty y wpisany.

*Ant [oni] Swiąhrzecki*

*Pisarz ziemski woiewodztwa Minskiego.*

## Пераклад

Актыкацыя тэстамента зям [скага] Яго мосці Пана Яна Серакоўскага, стольніка гастыньскага, тысяча семсот семдзесят першага года, месяца жніўня шаснаццатага дня.

[Арк. 772]. Перад урадам зем [скім] Мінскага ваяводства і перада мной, Геранімам са Скальнік Сарокай, рэгентам земскай канцылярыі, прысягнуўшы, стаў асабіста, Яго мосць Пан Юзэф Шаняўскі, лідскі ротмістр, тэстамент [святой памяці] Яго мосці Пана Яна Серакоўскага, стольніка гастыньскага, падаў да актаў якога наступны змест. У імя Айца і Сына і Духа Святага. Амінь. Я, Ян Серакоўскі, стольнік гастыньскі, ведаючы, што я чалавек смяротны, падпарадкаваны агульнаму Божаму загаду, згодна з якім кожны жывы чалавек непазбежна памерці павінен, а знаходзячыся ў цяжкай і небяспечнай хваробе, ад Бога напатканай, пакуль яшчэ пры здаровым розуме застаюся, такое раблю апошняй волі сваёй распараджэнне. На самым пачатку душу маю грэшную, найсвяцейшай і нявіннай пакутаю Хрыста Пана збаўленую, за заступніцтвам Багародзіцы Дзевы Марыі, Святых Анёлаў Ахоўнікаў і ўсіх Святых, у рукі і міласэрнасць у Тройцы Святой Аднаго Бога і Пана майго аддаю, просячы з Божым псаломшчыкам: зрабі ласку, не карай мяне, Божа, паводле велічыні грахоў маіх, але ў адпаведнасці з неабмежаванай літасцю Тваёй, змілуйся нада мной. Цела ж маё стараннем Сына майго павінна быць прыстойна абрадам рымска-каталіцкім, пахавана пры касцёле парафіяльным з імшамі святымі і іншымі ахвяраваннямі, на што прызначаю злотых польскіх восемдзесят, а асобна на званы, свечкі і на бедных злотых дваццаць. Што датычыцца маёй маёмасці,

Скаргі, звязаныя з дзейнасцю рымска-каталіцкага святарства, якія разглядаліся кансісторыяй, з'яўляюцца цікавай крыніцай па асабістаму складу духавенства. Яны характарызуюць дзейнасць ксяндзоў і іх асобныя рысы. Скаргі можна падзяліць на фінансава-маёмасныя, адміністрацыйныя і асабістыя. Першыя з іх прадстаўлены пераважна спрэчкамі паміж святарамі розных касцёлаў, а таксама паміж імі і прыватнымі асобамі. Яны тычыліся размежавання касцёльных уладанняў, грашовых фундушоў і пазык, узятых святарамі на будаўніцтва або рамонт канфесіянальных будынкаў. Адміністрацыйныя скаргі часта цесна перапляталіся з палітычнымі справамі супраць рымска-каталіцкага духавенства. Цікавым прыкладам з'яўляецца справа супраць Паланецкага адміністратара кс. С. Казлоўскага, які 23 лютага 1865 г. выдаў селяніну Восіпу Мелясевічу выпіс з метрычнай кнігі аб нараджэнні на польскай мове без перакладу на рускую. Падчас разгляду высветлілася, што згаданы ксёндз 1 сакавіка 1864 г. выдаў аналагічны выпіс і атрымаў спагнанне ў памеры 10 руб. Таму на гэты раз пробашч узяў за выпіс 20 руб., каб пакрыць расходы па спагнанню. Па рашэнню часовага мінскага ваеннага губернатара У. І. Заблоцкага кс. Казлоўскі павінен быў выплаціць 100 руб. і быць выдаленым на пасаду вікарыя ў аддаленую парафію [27, арк. 20–21]. Акрамя таго шэраг спраў тычылася міжканфесіянальных спрэчак аб разборы прыхаджан і маёмасцях. Яны таксама адносяцца да адміністрацыйных, таму што мелі палітычнае значэнне для каталіцкай царквы і вырашаліся кансісторыяй пад кантролем дзяржавы. У першую чаргу асабістыя скаргі на рымска-каталіцкае святарства тычыліся маральнасці паводзін яго прадстаўнікоў, як абвінавачванне кс. Ю. Кунцэвіча ў блудным жыцці [29]. Як правіла, прысудам было перамяшчэнне на службу ў іншую парафію, выдаленне ў кляштар або грашовае спагнанне. Пазбаўленне сану амаль не выкарыстоўвалася. Пры гэтым асабістыя скаргі найгорш адбіваліся на далейшым лёсе святара, таму што ён знаходзіўся пад пастаянным кантролем духоўнага кіраўніцтва нават пасля заканчэння тэрміну выпрабавання. Так, кс. Тамашэўскі, які займаў пасаду пробашча Лазавіцкай парафіі, па падазрэнні ў антыўрадавых настроях, быў пераведзены на пасаду вікарыя Міласлаўскага касцёла і выплаціў спагнанне ў 100 руб. [32].

Значная колькасць спраў па асабістаму складу духавенства архіўнага фонду «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» тычыцца маёмасці, якая засталася пасля смерці святароў. Як правіла, ва ўладанні ксяндзоў значных сродкаў не было, таму што пры ўступленні ў сан уся іх маёмасць пераходзіла ва ўласнасць рымска-каталіцкай царквы. Нягледзячы на гэта, многія з іх эканомілі са свайго ўтрымання або атрымлівалі спадчыну,

якой павінны былі распарадзіцца. Да маёмасці ксяндзоў таксама можна аднесці каштоўныя ўзнагароды. Часта яны пісалі тэстамэнты, у якіх размяркоўвалі сродкі. Напрыклад, біскуп П. Рава сярод іншага прызначыў сваю срэбраную чашу Мінскаму катэдральнаму касцёлу і па 3000 руб. серабром сваім сёстрам Ганне Руткоўскай і Вікторыі Врачынскай [16, арк. 2–3]. Калі тэстаменту не было, то на пасяджэнні кансісторыі вырашалася, як іх выкарыстаць. Так, пасля смерці кс. К. Любяшоўскага ў 1869 г. яго асабістыя рэчы былі апісаны паліцыяй і затым кансісторыя вырашала, каму іх перадаць [33, k. 53–56].

Дакументацыя камунікацый па розных пытаннях паміж ніжэйшым і вышэйшым клірам прадстаўлена рапартамі і прашэннямі з аднаго боку і цыркулярамі або загадамі — з другога. Прашэнні святароў, як правіла, далучаліся да спраў, з якімі былі звязаныя. Іх службовая дзейнасць адлюстравалася ў іх рапартах у кансісторыю, да якой яны адміністрацыйна належалі. Рапарты можна падзяліць на два кірункі: асабістыя і службовыя. Першыя тычыліся перамяшчэнняў у іншыя парафіі, камандзіраванняў, хвароб і смерці ксяндзоў. Напісанне службовых рапартаў з’яўлялася адзіным спосабам сувязі з вышэйшым рымска-каталіцкім клірам, таму імі закраналіся пытанні канфесіянальнай палітыкі дзяржаўнага кіраўніцтва, а таксама зносін з прадстаўнікамі іншых веравызнанняў і прыватнымі асобамі. Так, падчас і пасля паўстання 1863–1864 гг. многія прадстаўнікі рымска-каталіцкага духавенства знаходзіліся пад падазрэннем у спачуванні паўстанцам, таму адным з мерапрыемстваў дзяржаўных улад для пацвярджэння іх лаяльнасці быў пошук трох паручыцеляў, якія б сведчылі аб благанадзейнасці кожнага ксяндза. Сярод іншых у архіўным фондзе «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» захоўваецца паручыцельства за пробашча Усялюбскага касцёла Н. Чапрацкага, прадстаўленае Вільгельмам Пратасовічам, графамі Аляксандрам і Мікалаем О’Руркамі [38, арк. 1–2]. Да ліку абавязкаў пробашчаў адносілася падрыхтоўка да выдачы метрычных выпісаў і дакументальнае афармленне пераходаў у іншыя веравызнанні. Яны выступалі ў якасці сведкаў пры разглядзе кансісторыяй спраў, належачых юрысдыкцыі духоўнага суда (скасаванні шлюбаў, накладанні эпітымій і інш.), і ўдзельнічалі ў працы свецкіх арганізацый, што адлюстравалася ў адпаведных дакументах. Напрыклад, пры арганізацыі губернскіх статыстычных камітэтаў было вырашана прыцягваць да іх дзейнасці духавенства розных веравызнанняў адпаведна іх прадстаўленасці на тэрыторыі асобнай губерні. У сувязі з гэтым у 1861 г. з 38 губерняў, якія ўваходзілі ў склад Магілёўскай архідыяцэзіі, рымска-каталіцкія святары былі ўключаны ў Віцебскі, Ліфляндскі, Чарнігаўскі, Пскоўскі, Маскоўскі, Наўгародскі, Іркуцкі, Арэнбургскі і Томскі камітэты [37, арк. 18–18 адв.].

Адваротная сувязь паміж вышэйшым і ніжэйшым каталіцкім кліpам была арганізавана праз цыркуляры і інструкцыі, якія пасылаліся абагуленаму адрасату. Асобныя загады кансісторыі, якія пераважна тычыліся ўнясення правак у метрычныя кнігі, што захоўваліся ў касцёлах, складаліся на імя пробашча. Загадамі афармляліся прызначэнні, перамяшчэнні, узнагароджванні і інш. Гэта фіксіравалася ў журналах кансісторыі, а выпісы далучаліся да асабістых спраў святароў.

Такім чынам, у архіўным фондзе «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» захоўваецца комплекс крыніц па асабістаму складу духавенства ў XIX ст. Яны прадстаўлены разнастайнымі відамі дакументаў. Паводле інфарматыўнасці іх можна падзяліць на тры групы. Найбольш інфарматыўнымі з'яўляюцца фармулярныя спісы і асабістыя справы кліра, якія захаваліся ў рэпрэзентатыўным аб'ёме за ўвесь перыяд існавання кансісторыі. Яны дапаўняюцца календарамі, у якіх друкаваліся спісы духавенства. Значныя звесткі дадаюцца дакументамі аб навучанні ў семінарыі, прызначэнні, пераводзе, узнагароджванні святарства і яго спадчыне, а таксама скаргамі на яго дзейнасць. Матэрыялы камунікацыі паміж вышэйшым каталіцкім кліpам і ніжэйшым дазваляюць дэталізаваць звесткі аб асобных святарах, але іх прыцягванне патрабуе выяўлення азначаных крыніц з аб'ёмнага комплексу справаводства кансісторый. Нягледзячы на невялікія працэнтныя суадносіны крыніц па асабістаму складу духавенства да ўсяго разглядаемага дакументальнага комплексу, можна сцвярджаць, што яны прадстаўлены рэпрэзентатыўна і дазваляюць характарызаваць каталіцкі клір падчас дзейнасці Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі.

## Крыніцы і літаратура


1. Указ о бытии в России для исповедующих Римскую веру шести диоцезиям // Полное собрание законов Российской Империи с 1649 г. Санкт-Петербург: типография II отделения Собственной Его Императорского Величества Канцелярии, 1830 г. (Далее — ПСЗРИ). Т. XXV. С. 222–224.
2. Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. Мн., 2002; Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. / Е. Н. Филатова. Мн.: Бел. наука, 2006; Ганчарук І. Палітыка рускага самадзяржаўя ў адносінах да каталіцкага касцёла 1772–1830 гг. / І. Ганчарук // Наша вера. 2001. № 3 (17); Рыбчонок С. А. Анализ сохранности комплекса метрических книг в Национальном историческом архиве Беларуси / С. А. Рыбчонок // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: Матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіўн. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь. (Мінск, 12 красавіка 2007 г.) / Складальнікі В. С. Пазднякоў, П. П. Журкевіч. Мн.: БелНДІДАС, 2007; Zieliński Z. Kościół i naród w niewoli / Z. Zieliński. Lublin: wyd-wo KUL,

1995; Kumor B. Historia Kościoła: t. IV: Casy nowożytne. Kościół w okresie absolutyzmu i oświecenia / B. Kumor. Lublin: wydawnictwo KUL, 2003; Grygajtis K. Kościoł katolicki w Rosji i w ZSSR w XIX i XX wieku. Doktrynalne uwarunkowania jego działalności // Krakowskie studia międzynarodowe: Konkordaty pomiędzy Stolica Apostolską a Polską. Stosunki Państwo – Kościoł. / Pod red. I. Staszkowa. #3. Kraków: księgarnia Akademicka, 2006. S. 155–200; і інш.

3. Niebelski E. «Na Bóg żywy, Bracia, nie zasypiajmy sprawy!» Rzecz o ks. Stanisławie Brzósce (1834–1865). Lublin, 1995. 194 s; і інш.
4. Фонды Национального исторического архива Беларуси: справочник / Сост. Г. Е. Акулович [и др.]. Мн.: БелНИИДАД, 2006. С. 196–197.
5. Пушкін І. Магілёўская духоўная семінарыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн.: БелЭн, 1999. С. 20.
6. Указ Александра II Сенату об упразднении Минской римско-католической епархии // ПСЗРИ Т. XLIV. 1873 г. № 47 307. С. 760; LVIA. F. 694. Ap. 1. B. 3260. Справа аб далучэнні Мінскай дыяцэзіі да Віленскай, 1869 г.
7. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 42; Сёння справы, якія тычацца Мінскай духоўнай семінарыі, знаходзяцца: Ф. 1781. Воп. 6.
8. Там жа. Воп. 10. Спр. 147, 151.
9. Там жа. Воп. 32. Спр. 154.
10. Directorium horarum, canonicarum et missarum Pro Dioecesi Minscensi in Annum Domini MDCCCXIX. 1828; Directorium officii divini ac missarum Pro Dioecesi Minscensi in Annum Domini MDCCCXLIV Sub Regimine illustrissimi Reverendissimi Domini Pauli Rava nominati episcopi administrantis dioecesim minscensem S. Teologiae et SS. CC. Doctoris, Ord. S. Vlodimiri III et S. Annae II Cl. Equities. Sede vacante cum adprobatione impressum. Minsci: Typis I. Stefanowicz C., S. 1843, 1848, 1850, 1858.
11. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 6. Спр. 4.
12. Там жа. Спр. 120.
13. Там жа. Воп. 25. Спр. 199.
14. Biblioteka xiążąt Czartoryjskich. Rkp. 5327.
15. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 33. Спр. 91.
16. Там жа. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 3.
17. Там жа. Спр. 308.
18. Там жа. Спр. 12.
19. Там жа. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 52–73.
20. Там жа. Спр. 74–144, 155–173.
21. Там жа. Спр. 174–301.
22. Там жа. Спр. 146.
23. Там жа. Спр. 150.
24. Там жа. Спр. 149.
25. Там жа. Воп. 32. Спр. 132.
26. Рожинцев А. Андреевский кавалер — первый председательствующий Римско–католической духовной коллегии в России, Митрополит

Могилевский Станислав Иоанн [Электронный ресурс]. Отечество. Режим доступа: http://otechestvo.org.ua. Дата доступа: 04.12.2008.
27. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 32. Спр. 144.
28. Directorium officii divini et missarum Generale pro utroque clero archdioecesis Mohilevensis in Annun Domini MDCCCXXI. Mohilevie: typis palatii metropolitani Rom. Cathol., 1820.
29. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 24. Спр. 14 163.
30. Там жа. Воп. 25. Спр. 145–153.
31. Там жа. Спр. 151.
32. Там жа. Воп. 2. Спр. 5628.
33. Biblioteka Naukowa PAU i PAN w Krakowie. Rkp. 2415.
34. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 24. Спр. 15 808.
35. Грыгор’ева В. В., Філатава А. М. Магілёўская рымска-каталіцкая епархія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн.: БелЭн, 1999. С. 22–23.
36. Царкоўная іерархія. КЭ. Т. 2. С. 70–75.
37. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 2. Спр. 5427.
38. Там жа. Воп. 32. Спр. 142.

*В. У. Галубовіч*

## Пастулаты менскай шляхты на Сойм 1646 г.

Апошні звычайны сойм пры жыцці другога караля польскага і вялікага князя літоўскага з дынастыі Вазаў — Уладзіслава — адбыўся ў Варшаве 25 кастрычніка – 10 снежня 1646 г. Абставіны, у якіх рыхтаваўся форум, і яго правядзенне былі выключнай падзеяй у гісторыі Рэчы Паспалітай. Напярэдадні манарх фактычна ўзяў на ўзбраенне ідэю крыжовай выправы супраць Асманскай імперыі і прапаноўваў утварэнне кааліцыі хрысціянскіх краін, на чале якой бачыў шляхецкую рэспубліку. У планах двара галоўная мэта правядзення сойма выглядала як апрабацыя і маштабны працяг разгорнутай пераважна ў Кароне вярбоўкі жаўнераў. Сітуацыя ў Вялікім княстве Літоўскім у 1646 г. не выглядала так напружана, як у палякаў, але была, на думку Г. Віснэра, намнога больш складанай. Частка шляхты і магнатаў падтрымлівала намеры караля, іншыя не жадалі абменьваць спакой на вайсковыя турботы [1]. Меркаванні і настроі павятовай шляхты княства па актуальных пытаннях палітычнага і гаспадарчага жыцця напярэдадні сойма 1646 г.

[1] Wisner H. Litwa i plany wojny tureckiej Władysława IV. Rok 1646 // Kwartalnik Historyczny. R. LXXXIV. 1978. Nr. 2. S. 255–268.

можна прасачыць на падставе інструкцый, якімі ўкамплектоўваліся прадстаўнікі лакальнай эліты. На шчасце, зберагліся пастулаты менскай шляхты, напісаныя перад соймам 1646 г.

Інструкцыя менскай шляхты 1646 г. дайшла да нашага часу ў выглядзе копіі ў складзе рукапіснага зборніка, які захоўваецца ў бібліятэцы Польскай Акадэміі навук у Кракаве [1]. Яе дастаткова вялікі для такога тыпу дакументаў тэкст размешчаны на 11 старонках, напісаны на польскай мове з адносна частым ужываннем лацінскіх слоў і выразаў. Аб’ём інструкцыі дазваляе сцвярджаць, што яна не была звыклай фармальнасцю. Без сумнення, дакумент адыгрываў ролю дакладна распісанага рэгламента дзеянняў паслоў на сойме. Дэталізацыя і памеры інструкцыі маглі сведчыць пра намер трымаць сваіх паслоў пад кантролем. Складальнікі дакумента, напэўна, добра сабе ўсведамлялі складанасць практычнай рэалізацыі падчас саймавання ўсіх уключаных у яго змест пунктаў, тым не менш распрацаванасць гэтага суправаджальнага дакумента сведчыла пра спадзяванне на дасягненне пэўных вынікаў. Больш таго, сабраныя на сойміку шляхцічы выказалі жаданне атрымаць ад паслоў інфармацыю аб працы сойма.

Пасламі ад Менскага павета былі абраныя Андрэй Завіша, менскі староста, і Крыштап Валадкевіч, менскі земскі пісар. Абодвух паслоў трэба лічыць парламентарыямі сярэдняга ўзроўню: яны выконвалі пасольскія функцыі ў час Уладзіслава [2], і асабліва актыўна ў першыя гады праўлення Яна Казіміра Вазы [3]. Такім чынам, выбар менскай шляхты мог быць аб'ектыўна абгрунтаваны асабістымі якасцямі гэтых павятовых ураднікаў. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што ў дыярыюшах сойма 1646 г. імёны менскіх паслоў не сустракаюцца, што відавочна сведчыць пра іх другасную ролю ў літвінскай рэпрэзентацыі.

Інструкцыя дае адказ на пытанне: хто кіраваў нарадамі вераснёўскага, прызначанага на 13-е чысло, перадсоймавага сойміка менскай шляхты. Асоба дырэктара была прынцыпова важнай для тона патрабаванняў шляхты і хода іх абмеркавання. Дырэктар уплываў на шляхту падчас абрання павятовай рэпрэзентацыі. У адносінах да дырэктарства ў гістарыяграфіі ёсць розныя меркаванні, але найбольш верагодным з'яўляецца выкананне гэтай функцыі найвышэйшым па іерархіі ўраднікам, прысутным на сойміку, незалежна

[1] Biblioteka PAU i PAN w Krakowie. Rks. 365. S. 132–137.

[2] Прынамсі К. Валадкевіч да 1646 г. ужо адзін раз выконваў пасольскія функцыі і прысутнічаў на каранацыйным сойме 1633 г.: Hołdys S. Praktyka parlamenterna za panowania Władysława IV Wazy. Wrocław, 1991. S. 171.

[3] Ochmann-Staniszewska S., Staniszewski Z. Sejm Rzeczypospolitej za panowania Jana Kazimierza Wazy. Prawo-doktryna-praktyka. T.II. Wrocław, 2000. S. 397–398.

ад яго мясцовай прыналежнасці [4]. У гэтым сэнсе менскі соймік не вылучаўся арыгінальнасцю. Нарадамі менскай шляхты кіраваў Юры Караль на Дуброўне Глябовіч, смаленскі ваявода. Акрамя яго да Менску прыбылі і іншыя сенатары: Аляксандр Служка, трокскі ваявода, Пётр Рудаміна-Дусяцкі, смаленскі кашталян. Такая канцэнтрацыя ўраднікаў пры адсутнасці мясцовых сенатараў, калі судзіць па подпісах пад інструкцыяй, безумоўна, падвышала ўзровень сойміка і сведчыла пра жаданне сенатараў рэалізаваць менавіта свае інтарэсы праз менскі соймік. Прыезд таго ж Ю. К. Глябовіча, які ўвогуле нават да Варшавы ў гэтыя гады выязджаў рэдка з прычыны занятасці аднаўленнем смаленскіх умацаванняў [5], трэба разглядаць як спланаваную акцыю.

Сумарна сабраныя на перадсоймавым сойміку ў Менску ў верасні 1646 г. прапанавалі і зафіксавалі амаль 40 асобных пунктаў, сярод якіх можна вылучыць цэлы блок пытанняў па знешняй палітыцы і арганізацыі абароны. Першаступеннасць для шляхты гэтых тэм была заўважана нават у паслядоўнасці размяшчэння пунктаў: у інструкцыі татарская і турэцкая тэмы займаюць першае месца, і гэта невыпадкова. Каралеўская інструкцыя на сойміки выносіла на абмеркаванне адносіны з паўднёвымі суседзямі. Ад сваёй рэпрэзентацыі менская шляхта патрабавала не ўцягвацца ў канфлікт з татарамі, бо не бачыла нават магчымасці для такой «асаблівай вайны» і раіла выкарыстоўваць кварцянае войска. Каралеўскія прапановы вайны з туркамі выклікалі ў шляхты супярэчлівыя пачуцці. Па-першае, складана было абгрунтаваць аб'яўленне вайны з юрыдычнага пункту гледжання, па-другое, шляхту пужаў сам «цяжар страшнай вайны з так магутным непрыяцелем». У цэлым паслам не рэкамендавалася падтрымліваць мілітарных пачынанняў Уладзіслава, больш таго, яны павінны былі зрабіць запыты пра вярбоўку жаўнераў у Прусіі і Сілезіі, а таксама выхад казакаў на мора. З іншага боку, нельга таксама казаць пра безапеляцыйнае адхіленне шляхтай магчымасці вайны. Не выключана, што на гэта паўплывала прысутнасць Ю. К. Глябовіча, які адкрыта не выступаў супраць планаў Уладзіслава як чалавек, абавязаны каралю нядаўняй намінацыяй [6]. Пазіцыя смаленскага ваяводы магла вызначацца і сваяцкімі сувязямі: ён быў шваграм польнага гетмана ВКЛ

---

[4] Zakrzewski A.B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki. Warszawa, 2000. S. 64.

[5] Czapliński W. Hlebowicz Jerzy Karol // Polski słownik biograficzny. T. IX. Wrocław etc. 1960–1961. S. 543.

[6] Прывілей на Смаленскае ваяводства Ю. К. Глябовіч атрымаў 19.02.1643 г.: Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. IV. Ziemia Smoleńska i województwo Smoleńskie XIV–XVIII wiek. Spisy. Opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba, P.P. Romaniuk. Warszawa, 2003. S. 217.

Януша Радзівіла (жанаты з яго сястрой Кацярынай) [7], які фармальна падтрымаў пачынанні караля, але фактычна з'яўляўся праціўнікам выправы супраць туркаў [8].

Пацыфістычныя настроі традыцыйна дамінавалі сярод шляхты, і гэта знайшло адбітак ва ўспрыманні каралеўскай волі з энтузіязмам захоўваць на перспектыву мір са шведамі, што яскрава ілюструе выраз: «Гэта доўг добрых Айчыны сыноў у першую чаргу зычыць мір сваёй Айчыне». Праўда, існавалі і пэўныя межы шляхецкага пацыфізму, бо менскія абывацелі адкрыта пажадалі, «каб умовы міру былі трактаваныя такім чынам, каб мы аднак не страцілі Інфлянцкай зямлі».

Сойм 1646 г. стаўся часам, калі ізноў актуальнымі сталі супярэчнасці паміж дзвюма часткамі федэратыўнай Рэчы Паспалітай. Падставай для канфлікту была перадача маскоўскаму цару Трубецка, з чым літвіны пагадзіцца не маглі. Менская шляхта ўбачыла ў факце страты тэрыторый недахоп у арганізацыі камісіі па размежаванні з Масквой: прычына палягала ў прызначэнні камісараў уласнаручна каралём, адсюль патрабаванне: «Іх міласцям панам паслам належыць дамаўляцца, каб прызначаныя камісары заўсёды не solo толькі Яго Каралеўскай Міласці autoritate armati, але і consensu fortius regni ordinum». Паводле інструкцыі камісіі павінны «выконваць свае функцыі з ведама ўсёй Рэчы Паспалітай ці прынамсі ваяводы тамтэйшага». Узгадванне ваяводы ў якасці куратара дзейнасці камісараў было невыпадковым, паколькі прысутны на сойміку Ю. К. Глябовіч, напэўна, пачуваў сваю адказнасць за страту Трубецка, які размяшчаўся на тэрыторыі Смаленскага ваяводства. Без сумнення, смаленскія сенатары былі інспіратарамі асуджэння дзейнасці камісіі (commisia illegitima), якая сваёй дзейнасцю «адчыніла браму да Айчыны вераломнаму суседу, аддала вялікія воласці Трубецка маскалям, адабрала прыватныя добры нашых братоў». Страта Трубецка разглядалася ў Менску, і не толькі тут, як цяжкая абраза ўсяго Вялікага княства Літоўскага. Шляхта палічыла самым жаласным тое, што «як аддаць пастанавілі беспраўна, так і адбіралі гвалтам». У выніку паслам наказвалася «не прыступаць не толькі да прапаноў соймавай канклюзіі, але і нарадаў», пакуль не будзе задаволенае ВКЛ у цэлым і асобна «пакрыўджаныя браты». Тут трэба прыгадаць яшчэ адну цікавую акалічнасць. Ніхто асабіста не быў так зацікаўленым у вырашэнні трубецкага пытання, як пасол менскай шляхты К. Валадкевіч, жонка якога Эльжбета Сакалінская, маці Юрыя Віганта, князя Трубецкага, таксама страціла маёмасць [9].

---

[7] Czapliński W. Hlebowicz Jerzy Karol // Polski słownik biograficzny. T. IX. Wrocław etc. 1960–1961. S. 543.

[8] Wisner H. Litwa i plany wojny tureckiej Władysława IV. Rok 1646 // Kwartalnik Historyczny. R. LXXXIV. 1978. Nr. 2. S. 265.

[9] Volumina Legum. Przedruk źbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. Petersburg. T. IV, 1859. S. 44.

У сувязі з размежаваннем з Масквой паслы павінны былі таксама рэкамендаваць камісарам унесці прапанову аб магчымасці вяртання «збеглых падданых з Рускіх краёў», а калі б такая ўмова не знайшла падтрымкі, то належала ўвогуле скасаваць пункт, «які дазваляе, каб сяляне як з нашага, так і маскоўскага боку заставаліся там, куды яны зайдуць, паколькі калі гэтага не забаронім, то Рускія краі прыйдуць да вялікага знішчэння».

Да гэтых пунктаў непасрэдна трэба далучыць патрабаванні, звязаныя з арганізацыяй абароны краіны ад патэнцыйнага агрэсара, пад якім шляхта слушна разумела маскоўскую дзяржаву. Абывацелі былі перакананыя ў тым, што гарантамі бяспекі для ВКЛ з'яўляліся, у першую чаргу, дзве важнейшыя цвердзі — Смаленск і Дынабург. Рэстаўрацыя Смаленскага замка была праблемай, якую не вырашылі і да часу канчатковай страты яго ў 1654 г., але гэта не значыць, што праблемы не заўважалі. Цікава, што на менскім сойміку быў прапанаваны адзін з магчымых шляхоў кампенсацыі княству за страту Трубецка. Паслам наказвалася «сур'ёзна дамаўляцца, каб Іх міласці каронныя паны пэўную суму ў якасці замены за Трубецк, калі іншае не стане рэальным, вылучылі на рэстаўрацыю муроў, як і на выплаты пяхоце, з якой сумы ў будучым направа муроў смаленскіх і плата пяхоце без цяжару для Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага магла быць». Што датычыцца Дынабурга, то з ім прапанавалася паступіць сапраўды арыгінальна: «Іх міласці паны паслы маюць абмеркаваць са станамі Рэчы Паспалітай, каб [залога] была выведзена, а ў выпадку патрэбы яго [замак] належала рэстаўраваць з прыбыткаў, якія ідуць на вайсковы апарат».

Традыцыйнымі для інструкцый з'яўляюцца і разнастайныя парады па лепшай арганізацыі функцыянавання дзяржаўных установ. У першую чаргу гэта датычылася сойма. У 1646 г. менская шляхта прапанавала для спынення нарастання соймавых спраў абіраць дэпутатаў для разгляду скарбовых спраў па ўзору Радамскага трыбунала. Не выклікала задаволенасці і дзейнасць такой важнай для шляхты і ўсёй дзяржавы ўстановы, як канцылярыя ВКЛ. Яе праца выглядала, з пункту гледжання абывацеляў, неахайна арганізаванай: паколькі частымі былі выпадкі выдачы некалькіх прывілеяў на адну і тую ж маёмасць ці яе часткі, з-за чаго заслужаныя асобы «замест выслугі да далейшага прыходзяць занядбання». У сувязі з гэтым караля прасілі «не падпісваць прывілеяў, а ў канцылярыі, каб іх не запячатвалі, ведаючы аб першым атрымальніку». Спрабавалі менскія абывацелі абараніць аўтарытэт іншай важнейшай установы — Галоўнага трыбунала, патрабуючы ад паслоў рашучых дзеянняў супраць тых, хто, карыстаючыся рознымі абаронцамі ў абыход галоўнага апеляцыйнага суда, атрымліваў мандаты ў задвор-

ным і соймавым судах. Па патрабаванні шляхты анігіляцыі падлягалі і рэлаксацыі ад Трыбунала, выдадзеныя з каралеўскай канцылярыі.

Адной з самых папулярных была ў інструкцыях урадніцкая тэма. Не абышлі яе і менскія абываці, якія вылучылі пад гэта два пункты. У адным з іх паслам даручалася абмеркаваць магчымасць вызначэння часу, на працягу якога панам-абывацелям належыць абіраць земскіх урадніказў. У іншым месцы ўдзельнікі сойміка нагадалі: «На шчаслівай элекцыі Яго Каралеўскай Міласці ўстаноўлена, каб усе земскія ўрады ВКЛ і Кароны былі ўраўнаныя і ўжо з ласкі Яго Каралеўскай Міласці прывілеі ва ўсіх ваяводствах і паветах на некаторыя новыя ўрады, якіх у Вялікім Княстве Літоўскім не было, добра заслужаныя і маючыя маёмасць [асобы] паатрымлівалі, а месцаў сваіх паводле Кароннай ардынацыі яшчэ не займаюць». Таму паслам даручалі, «каб паводле парадку Кароннага ўраднікі мелі сваё месца, вызначанае канстытуцыяй на час разгляду публічных спраў».

Асобны блок пытанняў менскай інструкцыі прысвечаны гаспадарчым праблемам. Менскіх абывацеляў асабліва турбавала пытанне з забеспячэннем манетай. Дарэчы, гэта пытанне ставіцца і ў ранейшых інструкцыях менскай шляхты. Так, калі ў 1641 г. адзначалася поўная адсутнасць манеты: «Яе проста не маем», і паслоў абавязвалі пралабіраваць арганізацыю вытворчасці ўласнай манеты [10], то ў 1646 г. абывацелі ўжо проста патрабавалі, каб «добрая манета замест кепскай прыйшла». Асобным пунктам шляхта спрабавала адрэгуляваць гандаль маскоўскіх купцоў у ВКЛ, якім патрабавалі вызначыць для перавозу тавараў толькі «звыклыя гасцінцы». Не толькі маскоўскія, але і ўсе купцы ўвогуле выклікалі незадаволенасць абывацеляў як галоўныя арганізатары дарагавізны. Адсочвала шляхта і парадак папаўнення дзяржаўнага скарбу ВКЛ. Так, у інструкцыі была звернута ўвага на той факт, што вызначаныя два гады, за час якіх на карысць манарха збіраліся падаткі ад так званага новага мыта, скончыліся, таму паслам загадвалася пацікавіцца, дзе знаходзяцца грошы, сабраныя за гэты час.

Вельмі папулярнай у інструкцыях на соймы была жыдоўская тэма. Не абыйшлі гэта пытанне менскія абывацелі і ў 1646 г. Цікава, што тон гэтай інструкцыі выразна дысаніраваў з адзнакай жыдоў у наказе паслам, дадзеным у 1641 г. [11] Праз пяць гадоў становішча малявалася наступным чынам: «Праз арэндаванне чопавага жыдамі вялікія шкоды

---

[10] AGAD, AR II, suplement № 511. S. 2.

[11] Галубовіч В. Яўрэі ў пасольскіх інструкцыях шляхты Вялікага княства Літоўскага за час праўлення Уладзіслава IV Вазы // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006. С. 78.

дзеюцца шляхецкім добрам». На думку абываценяў, станавыя інтарэсы найлепей пільнаваць маглі толькі свае, г. зн., самі шляхцічы, якіх і належала прызначаць на месца зборшчыкаў падаткаў. Станавая салідарнасць была накіравана на падтрымку нізоў шляхецкай грамады. Пры аказіі паслам таксама наказвалася ўзняць пытанне пра нязначны памер такога спецыфічнага падатку, якім была жыдоўская пагалоўшчына.

Да петыцыяў персанальнага характару, што былі зафіксаваныя ў інструкцыі, належыць аднесці просьбу аб адпаведным «гонару» забеспячэнні гетмана і полацкага ваяводы Януша Кішкі, а таксама прапанову пацвярджэння ў соймавай канстытуцыі заключанага пагаднення паміж мечнікам менскім Аляксандрам Юзафовічам і каралеўскім сакратаром Рыгорам Здановічам.

Нарэшце спынімся на такім важным пытанні, як практычная рэалізацыя пунктаў пасольскага наказа. Тут варта адзначыць, што для пасольскай рэпрэзентацыі ВКЛ галоўнай задачай на форуме стала кампенсацыя за страту Трубецка. Вакол гэтага разгарнуліся асноўныя баталіі, што адбілася і на выніках сойма: парламентарыі вымушаныя былі самі канстатаваць немагчымасць вырашэння ўсіх спраў і іх перанос на надзвычайны сойм 1647 г. [12] Разам з тым па некаторых пунктах менскія абываценi засталіся задаволеныя. З ліку спраў, якія закранаaліся ў інструкцыі і знайшлі адлюстраванне ў канстытуцыях, трэба адзначыць трубецкае пытанне, якое было цалкам закрыта на сойме 1646 г. (канстытуцыя «Інкарпарацыя Лоева і Любеча ў ВКЛ»), канчатковае вырашэнне праблемы з вайсковымі авантурамі караля, якія не мелі працягу (канстытуцыя «Аб вярбоўцы новага войска і яго роспуску ў Кароне і ў ВКЛ»), выплата жалавання войску (канстытуцыя «Выплата войску ўскраіннаму»), гарантыя выплаты пяхоце Дынабургскага замка, для чаго склікалася адмысловая камісія (канстытуцыя «Асэкурацыя выплат пяхоце Дынабургскай»), вызначэнне забеспячэння для новай каралевы (канстытуцыя «Выправа каралевы Яе Міласці Людавікі Марыі»), мірныя перамовы з Швецыяй (канстытуцыя «Шведская камісія») [13]. Прынятая канстытуцыя адносна смаленскага пытання пераносіла ўсе справы на будучы сойм [14]. Калі ўлічыць, што сойм зацвердзіў 23 канстытуцыі, то дзейнасць паслоў трэба прызнаць эфектыўнай.

Падсумоўваючы, адзначым, што разгорнуты тэкст інструкцыі, падрыхтаваны да сойма 1646 г., сведчыў пра зацікаўленасць і абазнанасць

[12] Volumina Legum. Przedruk źbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. Petersburg. T. IV, 1859. S. 46.

[13] Volumina Legum. Przedruk źbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego. Petersburg. T. IV, 1859. S. 43–47.

[14] Там жа. S. 47.

менскай шляхты ў палітычным жыцці краіны, разуменні складанасцяў і недахопаў, а таксама механізмаў іх пераадолення. На змест пастаноў менскага сойміка, несумненна, паўплывала прысутнасць сенатараў на чале са смаленскім ваяводам Ю. К. Глябовічам. На жаль, абставіны не дазволілі менскай рэпрэзентацыі рэалізаваць максімум пунктаў у выглядзе соймавых канстытуцый, але тым не менш пэўная частка прапаноў менскага сойміка трапіла ў збор законаў.

*А. А. Лашкевіч*

## Аператыўна-следчая праца Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў пачатку XX ст.

Дадзены артыкул — працяг ранейшай публікацыі [1] і мае за мэту прасачыць дзейнасць вышэйзгаданай установы ў гэты час, асабліва ў перыяд Першай сусветнай вайны, асноўныя накірункі працы як у галіне палітычнага вышуку, так і ў барацьбе з эканамічнай злачыннасцю (карупцыйныя справы і г. д.).

Губернскія жандарскія ўпраўленні з'яўляліся асноўнымі структурнымі звеннямі ваенізаванай паліцыі. Яны падпарадкоўваліся дэпартаменту паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў, а ў вайсковых адносінах — ваеннаму міністру. Перад жандарскімі ўпраўленнямі была вызначана пэўная мэта — папярэджанне дзеянняў, якія накіраваны супраць дзяржаўнага ладу Расійскай імперыі. У іх функцыі ўваходзілі: назіранне за выкананнем законаў на месцах, «дела общественного благоустройства», ахова бяспекі. Акрамя таго, яны вялі следства па палітычных справах.

У начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення меліся тры памочнікі. Першы, знаходзячыся ў Мінску, ведаў справамі, што мелі дачыненне да Мінскага, Барысаўскага і Ігуменскага паветаў. Другі — у Пінску, кіраваў жандарскім апаратам у Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах. Трэці — у Бабруйску, ажыццяўляў кантроль за Бабруйскім, Слуцкім і Навагрудскім паветамі. Памочнікі ў падведамасных ім паветах выконвалі ўсе функцыі губернскага жандарскага ўпраўлення. У паветах і гарадах знаходзіўся дадатковы штат губернскага жандарскага ўпраўлення, што складаўся з унтэр-афіцэраў, вахмістраў, ротмістраў, якія непасрэдна падпарадкоўваліся адпаведнаму памочніку начальніка губернскага жандарскага ўпраўлення [2].

Крыніцамі для напісання гэтага артыкула, як і для ранейшага, з'явіліся справы фонда «Мінскае губернскае жандарскае ўпраўленне» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ). У асноўным гэта

перапіска паміж начальнікам управлення і ягонымі памочнікамі адпаведна ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім, Бабруйскім, Слуцкім і Навагрудскім, Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах, а таксама паміж апошнімі і падначаленымі ім унтэр-афіцэрамі ў сваіх паветах. Яна датычыцца правядзення аператыўна-следчых мерапрыемстваў, складанню розных даведак і г. д.

Патрэбна адзначыць, што ў дакументах, якія былі выкарыстаны для падрыхтоўкі дадзенай публікацыі, адсутнічаюць імёны і імёны па бацьку супрацоўнікаў управлення і іншых службоўцаў, маюцца толькі іх пасады, званні і прозвішчы. Частка вышэйзгаданых ініцыялаў знойдзена ў памятных кніжках па Мінскай губерні за 1900–1917 гг.

У галіне палітычнага вышуку ўпраўленню даводзілася весці барацьбу з living рознымі падпольнымі арганізацыямі сацыялістычнага напрамку. У фондзе жандарскага ўпраўлення захаваліся, напрыклад, тры справы, якія прысвечаны расследаванню дзейнасці «Бунда» (габрэйскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі) альбо назіранню за яе членамі. Так, у жніўні 1903 г. справаю аб распаўсюджванні бундаўцамі нелегальнай літаратуры ў Мінску займаўся памочнік начальніка губернскага жандарскага ўпраўлення ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім паветах падпалкоўнік А. І. Хрыпаў. Ім былі атрыманы агентурныя звесткі аб тым, што шэраг жыхароў горада маюць сувязі з кіраўніцтвам мінскай арганізацыі «Бунда», атрымоўваюць з Гомеля нелегальную літаратуру і знаёмяць з ёю рабочых на спецыяльных сходках. На падставе гэтага мінская паліцыя зрабіла вобыскі, і дадзеная інфармацыя пацвердзілася. У выніку падпалкоўнікам А. І. Хрыпавым была распачата справа супраць Самуіла Іткіна, Шыфры Любінай і Беркі Рабіновіча па абвінавачванню іх у распаўсюджванні нелегальнай літаратуры і прыналежнасці «к преступному сообществу» («Бунду». — *А. Л.*) [10]. Інфармацыі пра далейшы ход гэтай справы ў архіўных фондах пакуль што не выяўлена.

У 1907–1908 гг. супрацоўнікі ўпраўлення зноў расследавалі дзейнасць мінскай арганізацыі «Бунда». 17 лютага 1907 г. службоўцы мінскай гарадской паліцыі правялі вобыск у памяшканні дома Пейсаха Рыпса па Койданаўскай (яна ж Новамаскоўская) вуліцы, якое здымалі краўчыхі Рася-Цыпа Капялёвіч і Сора Сукейнік. У гэтай кватэры паліцэйскія знайшлі значную колькасць нелегальнай літаратуры і перапіскі, якая мела дачыненне да функцыянавання мясцовага камітэта «Бунда», а таксама некалькі сакрэтных дакументаў са справаводства Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення. Таксама паліцыяй быў затрыманы нясвіжскі мешчанін Абрам-Меер Гольдберт. У сувязі з гэтым ад’ютант жандарскага ўпраўлення ротмістр В. І. Жукевіч-Стоша 18 лютага т. г. пастанавіў правесці следства па гэтаму пытанню [13, арк. 7–11 адв.]. Потым справаю займаўся падпалкоўнік Субоцін [13, арк. 61].

У час Першай сусветнай вайны «Бунд», прынамсі частка яго, займаў прагерманскую пазіцыю. Таму жандарскае ўпраўленне па хадайніцтву вайсковай контрразведкі вяло назіранне за жыхарамі Мінска, якія належалі да гэтай арганізацыі. У архіўных фондах маецца некалькі кароткіх зводаў аб выніках назірання за бундаўцамі ў лістападзе 1916 – лютым 1917 г. Яно выявіла двух мінскіх мяшчан: Эстэр-Энту Гурэвіч, 53-х гадоў, і 26-гадовага наборшчыка Абрама-Іцку Калманава. Апошняга высачылі падчас назірання за Эстэр Гурэвіч [5].

Упраўленнем распрацоўваліся і іншыя сацыялістычныя арганізацыі. 13 красавіка 1906 г. памочнікам начальніка ў Бабруйскім, Слуцкім і Навагрудскім паветах падпалкоўнікам І. Ю. Гюнтэрам былі прыцягнуты ў якасці абвінавачваемых па справе аб распаўсюджванні нелегальнай літаратуры алькеніцкі мешчанін Трокскага павета Віленскай губерні Рубін Казёл, а таксама салдаты чыгуначнай брыгады Іван Гамулін і Міхаіл Чэшка (Чэшкаў), затрыманыя супрацоўнікамі паліцыі і жандарскага пункта на кватэры Р. Казла, у мястэчку Баранавічы, 30 студзеня таго ж году. Следства было скончана 23 снежня 1906 г. [11]. Улічваючы, што гэта не першы выпадак вядзення рэвалюцыйнай прапаганды сярод вайскоўцаў Баранавіцкай чыгуначнай брыгады (узгадайма стварэнне латышскага сацыял-дэмакратычнага кружка [1]), трэба прызнаць, што дадзеная брыгада стала для супрацоўнікаў жандарскага ўпраўлення своеасаблівай «гарачай кропкай».

Справа, прысвечаная дзейнасці мясцовай арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, пачалася арыштам 20 сакавіка 1908 г. супрацоўнікамі мінскай гарадской паліцыі чалавека, які назваў сябе Генадзем Міхайлоўскім. Падчас вобыску на кватэры апошняга знайшлі нелегальную эсэраўскую літаратуру і дзве пячаткі з надпісамі «Тэрарыстычная дружына партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў» і «Мінскі камітэт Паўночна-Заходняй арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў» [14, арк. 3–4 адв.]. Пазней затрымалі яшчэ шэраг асоб. Гэтая справа разбіралася Віленскаю судоваю палатаю ў кастрычніку 1909 г. Адпаведна яе прысуду Генадзь Міхайлоўскі, ён жа сын калежскага рэгістратара Сяргей Марозаў-Германаў, і Мікалай Сакалоў, сын калежскага асэсара, атрымалі па чатыры гады катаргі кожны. Іншых жа абвінавачваемых: Ксенію Ілляшэвіч, дачку асабістага двараніна, Кацярыну Ісаеву, дачку тытулярнага саветніка, Шыфру-Цыпу Міленькую, івянецкую мяшчанку, жыхарку Мінска, суд апраўдаў [14, арк. 324–326].

У кампетэнцыю Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ўваходзіла і адсочванне сацыяльнага пратэсту з боку народных мас краю і барацьба з канкрэтнымі праявамі. 28 ліпеня 1908 г. памочнікам начальніка ўпраўлення ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім паветах ротмістрам П. А. Зякіным была распачата справа наконт правядзення

5 чэрвеня таго ж году (у іншых дакументах — 6-га ці 8-га) сялянамі вёскі Блонь Пухавіцкай воласці Ігуменскага павета сходу са складаннем на ім наказаў па зямельнаму пытанню і накіраваннем свайго прадстаўніка ў С.-Пецярбург [12, арк. 5–5 адв., 8]. Следства вызначыла, што на гэтым сходзе ўзнімаліся патрабаванні аб «зямлі і волі», ліквідацыі дзяржаўнай паліцыі і стварэнні сваёй, падпарадкаванай мясцоваму сялянскаму самакіраванню, адмены становішча ўзмоцненай аховы, адстаўкі ўрада і г. д. Начальнік упраўлення палкоўнік П. П. Усясвяцкі прапанаваў мінскаму губернатару выслаць галоўнага арганізатара сходу селяніна Мікалая Цэхановіча ў Архангельскую губерню тэрмінам на чатыры гады пад галосны паліцэйскі нагляд [12, арк. 31].

З пачаткам Першай сусветнай вайны кола абавязкаў Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення значна пашырылася. У прыватнасці, мінскі губернатар 28 красавіка 1915 г. па патрабаванні вайсковых улад усклаў на жандарскую службу абавязак прымаць меры па збіранню згубленай і кінутай вайскоўцамі зброі, якую мясцовае насельніцтва прыхоўвала ў сябе ў патаемных сховішчах [3, арк. 542–542 адв.].

Упраўленне разам з іншымі паліцэйскімі ўстановамі павінна было прыняць меры па спыненню дзейнасці злачынных арганізацый, створаных з дапамогаю германскіх спецслужбаў. Гэтыя арганізацыі выкарыстоўвалі хворых на венерычныя хваробы прастытутак, каб інфіцыраваць вайскоўцаў расійскай арміі, асабліва афіцэраў, аб чым даводзілася мясцовым уладам у адпаведнай дырэктыве начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага ад 1 чэрвеня 1915 г. [3, арк. 350–350 адв.].

Цыркулярам дэпартамента паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў імперыі ад 1 верасня 1915 г. корпусу жандараў разам з іншымі структурамі паліцыі было загадана займацца адсочваннем з'яўлення чутак аб маючым адбыцца спыненні выплаты па ўкладах у дзяржаўныя ашчадныя касы з наступнай перадачай грашовых сродкаў на вайсковыя патрэбы і правядзеннем расследавання па кожным факце ўзнікнення падобных чутак [3, арк. 558].

У сувязі з тым, што агентура германскай і аўстра-венгерскай разведак з дапамогаю крымінальнікаў і асоб, якімі рухала прага нажывы, стала праводзіць у насельніцтва скупку срэбных і медных манет за падробленыя папяровыя грошы, камандуючы Заходнім фронтам генерал Эверт забараніў скупку і захоўванне такой манеты звыш пэўных аб'ёмаў. Кантроль за выкананнем гэтага загаду ўскладаўся і на губернскае жандарскае ўпраўленне [3, арк. 695–696].

Аднак адным з асноўных накірункаў працы ўпраўлення ў ваенны час з'яўлялася расследаванне спраў па абвінавачванню розных цывільных асоб у шпіянажы на карысць Германіі і яе саюзнікаў. Адной з падобных і

была справа жыхара Пінска, кажан-гарадзецкага мешчаніна Лейзэра Розэнберга, прыказчыка германскай фірмы, якая займалася нарыхтоўкаю і вывазам лесаматэрыялаў. Падставаю для ўзнікнення цікавасці да Л. Розэнберга з боку жандарскага ўпраўлення і вайсковай контрразведкі было тое, што апошні вёў перапіску са сваімі нямецкімі працадаўцамі праз пасрэднікаў і пасля пачатку вайсковых дзеянняў. 18 лістапада 1914 г. Лейзэр Розэнберг быў арыштаваны ў Пінску, а 19 лістапада памочнік начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах ротмістр М. М. Архангельскі распачаў следчую справу па падазрэнню Розэнберга ва ўдзеле ў разведвальнай арганізацыі, створанай пад прыкрыццём структур германскай лесанарыхтоўчай фірмы [4, арк. 9–13].

Адпаведна паказанняў В. Ф. Квасняка, жандарскага ўнтэр-афіцэра чыгуначнай станцыі Ахотнікава Паўднёва-Заходняй чыгункі ў Валынскай губерні, Лейзэр Розэнберг, які ў лістападзе 1914 г. знаходзіўся ў гэтых мясцінах, спрабаваў атрымаць у салдат, што неслі ахоўную службу на станцыі, інфармацыю вайсковага характару. У той жа час ён дзейнічаў як нарыхтоўшчык лесу і быццам бы набыты ім лесаматэрыял пры аглядзе аказаўся гнілым [4, арк. 137–138].

У аператыўна-следчых матэрыялах справы адсутнічае інфармацыя аб яе канчатковым выніку, але маюцца звесткі аб тым, што ў красавіку 1915 г. ёю пачаў займацца ваенны следчы 3-га ўчастка Мінскай вайсковай акругі на тэатры ваенных дзеянняў падпалкоўнік Разыграеў [4, арк. 88]. Апошняе дае падставы меркаваць, што дадзеная справа рыхтавалася для перадачы альбо ў суд, альбо павінна была быць вырашана ў адміністрацыйным парадку шляхам адпаведнага загаду вышэйстаячых вайсковых улад. Звычайна такі загад азначаў высылку ў аддаленыя мясцовасці Расійскай імперыі на час вайны альбо забарону пражываць у прыфрантавой паласе і на тэрыторыі, што аб’яўлена на ваенным становішчы. Падобная практыка ўжывалася ў адносінах да тых асоб, супраць якіх мелася недастаткова доказаў альбо такія адсутнічалі зусім. Тым не менш гэтыя людзі лічыліся патэнцыйна небяспечнымі, магчымымі агентамі спецслужбаў Германіі і яе саюзнікаў.

У канцы 1915 г. памочнік начальніка жандарскага ўпраўлення ў Бабруйскім, Слуцкім і Навагрудскім паветах ротмістр З. С. Паноў расследаваў справу ўладальніка вандроўнага цырка шляхціча Ломжынскай губерні Царства Польскага Антона Выгляндоўскага, музычнага клоуна рыжскага мешчаніна Рыхарда Шульца і іншых служачых гэтага цырка, якія падазраваліся ў шпіянажы на карысць Германіі. Падставаю для ўзбуджэння паслужылі агентурныя дадзеныя вайсковай контрразведкі аб тым, што маршрут гастроляў супадаў з месцамі дыслакацыі штабоў буйных злучэнняў дзеючай арміі альбо ўстаноў службы тылавога

забеспячэння войска. У сувязі з гэтым Антон Выгляндоўскі і Рыхард Шульц 12 кастрычніка 1915 г. былі ўзяты пад варту. Аднак следству не ўдалося атрымаць пэўных доказаў таго, што гэтыя асобы збіралі інфармацыю, якая магла б зацікавіць разведку праціўніка. Таму па прапанове Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення галоўны начальнік Мінскай вайсковай акругі абмежаваўся тым, што забараніў А. Выгляндоўскаму і Р. Шульцу пражываць на тэрыторыі акругі ў ваенны час [8, арк. 74, 78, 81–83]. На наш погляд, тут адыграла сваю ролю этнічная прыналежнасць Антона Выгляндоўскага (паляк) і Рыхарда Шульца (астзейскі немец альбо анямечаны латыш). Паколькі сярод гэтых народаў Расійскай імперыі былі распаўсюджаныя германафільскія настроі, то ўлады лічылі іх прадстаўнікоў патэнцыйнымі прыхільнікамі Германіі і Аўстра-Венгрыі.

Іншым разам сам факт сваяцтва і дзелавыя зносіны з грамадзянамі Германіі яшчэ ў даваенны час маглі быць падставаю для забароны пражывання ў прыфрантавой паласе, нават калі падазрэнні ў шпіянажы не пацвердзіліся. Так здарылася з ігуменскім купцом 2-й гільдыі Самуілам Фрыдлендэрам, справаю якога ў лютым-красавіку 1916 г. займаўся памочнік начальніка ўпраўлення ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім паветах палкоўнік А. І. Солтан. Апошні не знайшоў доказаў яго дзейнасці на карысць варожых дзяржаў. Але тое, што ён быў жанаты на грамадзянцы Германіі, прадстаўляў на тэрыторыі Расійскай імперыі інтарэсы гандлёвага дома «С. П. Берловіч» (Эйдкунен, Усходняя Прусія) і г. д., дазволіла жандарскаму ўпраўленню хадайнічаць перад уладамі наконт забароны пражывання С. Фрыдлендэра ў зоне ваенных дзеянняў [8, арк. 209–210 адв.].

Падобная мера ўжывалася і ў тых выпадках, калі не было знойдзена цвёрдых доказаў удзелу западозранай асобы ў шпіянажы, але яна знаходзілася пэўны час на акупаванай германа-аўстрыйскімі войскамі тэрыторыі. Гэта было выкарыстана ў адносінах да ўраджэнкі Чэнстахова Петракаўскай губерні Царства Польскага Настассі Нейфельд, якая на момант яе затрымання вайсковымі ўладамі ў мястэчку Ізяслаў Мінскага павета 25 лютага 1916 г. працавала лекарам у тылавой арганізацыі «Паўночная дапамога». Памочнік начальніка ўпраўлення ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім паветах палкоўнік А. І. Солтан палічыў падазроным тую акалічнасць, што Н. Нейфельд пакінула пасаду земскага лекара ў расійскай глыбінцы ў чэрвені 1915 г. і накіравалася ў Варшаву быццам бы ў мэтах пошуку новага месца працы ў той час, калі расійскае войска пакідала губерні Царства Польскага. У Варшаве яна працавала ў створаным мясцоваю грамадскасцю Абывацельскім камітэце, пакуль апошні не зліквідавалі германскія акупацыйныя ўлады. Пасля шэрагу пераездаў Н. Нейфельд апынулася ў Аўстра-Венгрыі,

адкуль без асаблівых праблем вярнулася праз румынскую тэрыторыю ў Расію. Адпаведна дадзеных вайсковай контрразведкі, яна мела ў Ясах (Румынія) кантакт з прадстаўнікамі аўстра-венгерскай спецслужбы. Контрразведчыкаў і супрацоўнікаў жандарскага ўпраўлення насцярожвала імкненне Настассі Нейфельд увайсці ў блізкія адносіны з вайскоўцамі–франтавікамі, яе ўладкаванне на працу ў вышэйзгаданай арганізацыі «Паўночная дапамога», якая абслугоўвала бліжэйшы тыл. Улічваючы ўсе гэтыя абставіны, начальнік Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення палкоўнік М. Ф. Бабчынскі 25 сакавіка 1916 г. хадайнічаў перад мінскім губернатарам аб яе высылцы ў аддаленыя тылавыя мясцовасці Расійскай імперыі на час ваенных дзеянняў [8, арк. 420, 432–434].

Наогул трэба адзначыць, што супрацоўнікі Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення разам са сваімі калегамі з вайсковай контрразведкі арганізавалі маштабную сістэму праверкі падазроных асоб, што аказваліся на тэрыторыі бліжэйшага тылу Заходняга фронту, які перасякаў у тым ліку і Мінскую губерню. У поле іх зроку трапілі асобы, якія не мелі пры сабе дакументаў, без сталага месцажыхарства і заняткаў, вайскоўцы-дэзерціры альбо тыя, што па тых ці іншых прычынах адсталі ад сваіх часцей. Падазрэнні выклікалі і тыя, хто імкнуўся ўсялякімі спосабамі пасяліцца ў прыфрантавой паласе або завесці блізкія знаёмствы з вайскоўцамі–франтавікамі. Звычайна такіх людзей затрымлівала ваенная контрразведка, а потым далейшае расследаванне наконт магчымай прыналежнасці падазронага да германскай ці аўстра-венгерскай разведвальных сетак праводзіў памочнік начальніка ўпраўлення ў адпаведным павеце Мінскай губерні. З мэтаю ліквідацыі патэнцыйнай магчымасці стварэння агентуры варожых дзяржаў у паласе ваенных дзеянняў, як ужо вышэй згадвалася, у большасці тых выпадкаў, калі ў ходзе следства абвінавачванні ў занятках шпіянажам не пацвярджаліся, асобы, якія праходзілі па такіх справах, звычайна высылаліся адміністрацыйным парадкам у аддаленыя тылавыя мясцовасці Расійскай імперыі. Сярод спраў, якія расследаваліся ўпраўленнем у ваенны час, былі і справы, звязаныя з абразай цара, а ў некаторых выпадках і ўсяго сямейства Мікалая ІІ. Падазроныя ў гэтых дзеяннях належалі да розных катэгорый мясцовага насельніцтва: сяляне, дробная шляхта, мяшчане. Пашырэнне гэтай з’явы ў перыяд вайны можна патлумачыць тымі матэрыяльнымі і псіхалагічнымі цяжкасцямі, што абрынуліся на народы Беларусі, як і іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі: недахоп рабочых рук на вёсцы ў выніку прызыву на вайсковую службу значнай часткі працаздольнага мужчынскага насельніцтва з адначасовым пашырэннем рознага роду казённых павіннасцяў, цяжар апошніх клаўся на цывільнае насельніцтва; інфляцыя і звязаны з гэтым

рэзкі рост коштаў на асноўныя прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці; страты родных і блізкіх, што загінулі ці былі пакалечаныя на вайне, альбо чаканне падобнага; туманныя перспектывы заканчэння ваенных дзеянняў і заключэння міру і г. д. Падобныя з'явы усё болей разгойдвалі аўтарытэт манарха нават сярод тых сацыяльных слаёў, якія раней лічыліся традыцыйна манархічнымі, напрыклад, сялянства.

На наш погляд, тая ўвага, якую супрацоўнікі губернскага жандарскага ўпраўлення надавалі падобным справам, звязана з тым, што ў дадзеных выпадках закраналіся гонар і годнасць першай асобы ў дзяржаве. Расійская імперыя мела характар ідэакратычнай дзяржавы, у якой яе кіраўнік лічыўся сакральнай фігурай, і ўжо самім фактам свайго існавання павінен быў забяспечваць захаванне стабільнасці існуючага ладу. Таму расхістванне аўтарытэта імператара нават на паўсядзённа-бытавым узроўні, не кажучы аб мэтанакіраваных палітычных дзеяннях, лічылася ўжо прыступкаю да пачатку ланцуговай рэакцыі дэстабілізацыі і дэструкцыі тагачаснага грамадска-палітычнага рэжыму.

У кампетэнцыю жандарскага ўпраўлення ўваходзіла і расследаванне спраў карупцыйнага характару, у прыватнасці, аб злоўжываннях чыноў вайсковага інтэнданцкага ведамства, якія з мэтаю атрымання прыбытку незаконным шляхам уваходзілі ў хаўрусы з рознага кшталту дзялкамі. У лютым–сакавіку 1915 г. памочнік начальніка ўпраўлення ў Бабруйскім, Слуцкім і Навагрудскім паветах правяраў абставіны продажу ўладальнікам сухарасушыльні ва ўрочышчы Лігі, паблізу мястэчка Баранавічы, Гэндэлю Файну і Лейбе Іасялевічу сухароў з Баранавіцкай харчовай інтэнданцкай установы. Гэтыя сухары былі атрыманы ад сялян Навагрудскага павета і нібыта былі забракаваныя, як непрыдатныя для ўжывання. Па парадзе службоўцаў установы возчыкі, якія прыехалі забіраць сухары, прадалі іх Г. Файну і Л. Іасялевічу. Як паказала расследаванне, на самой справе толькі меншую частку сухароў нельга было ўжываць. Астатнюю апрацавалі і прадалі той самай інтэнданцкай установе, зразумела, не без карысці для ўладальнікаў сухарасушыльні. У сувязі з гэтым начальнікам упраўлення было ўзнята пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы ў адпаведнасці з вайскова-судовым статутам [7].

Таксама распрацоўваліся справы аб злоўжываннях цывільных дзяржаўных службоўцаў і кіраўнікоў органаў мясцовага самакіравання. Так, у снежні 1915 г. спачатку вахмістр дадатковага штата Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў Барысаўскім павеце Жук, а потым непасрэдна памочнік начальніка ўпраўлення ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім паветах правяралі заявы мясцовых жыхароў наконт махінацый старасты Барысава Антона Паўлоўскага. Апошні выкарыстоўваў займаемую ім пасаду для вырашэння асабістых спраў,

а таксама для спрыяння камерцыйнай дзейнасці набліжаных да яго асоб. Яму ўдавалася пазбягаць кантролю з боку сходу гарадскіх упаўнаважаных шляхам подкупу, у прыватнасці дармавым пачастункам — казённым спіртам [9]. На жаль, пакуль што не выяўлена інфармацыі пра далейшы лёс А. Паўлоўскага. Таксама памочнікам начальніка ўпраўлення ў паветах і іх падначаленым даводзілася правяраць на прадмет сапраўднасці паведамленні аб спробах тым ці іншым спосабам ухіліцца ад вайсковай службы або садзеяння гэтаму з дапамогаю хабару.

Мінскаму губернскаму жандарскаму ўпраўленню даводзілася праводзіць аператыўна-следчыя мерапрыемствы і па запытах калег з іншых рэгіёнаў, у прыватнасці, па выяўленню агентаў разведслужбаў варожых краінаў альбо гандляроў-пастаўшчыкоў, якія прадавалі ваеннаму ведамству тавары па спекулятыўных коштах. Так, у пачатку 1915 г., адпаведна запыту начальніка Валынскага губернскага жандарскага ўпраўлення ад 4 студзеня 1915 г., памочнік начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў Мінскім, Барысаўскім і Ігуменскім паветах ротмістр З. С. Паноў займаўся вышукам Васіля Дзвярніцкага і Аляксея Ліцвіна, якія павінны былі мець падрады на пастаўку войску быдла, свіней і сала. З дапамогаю мінскай паліцыі ён устанавіў, што вышэйзгаданыя асобы пэўны час знаходзіліся ў губернскім горадзе і пражывалі ў гатэлі «Еўропа». Аднак, паколькі свой тавар яны набывалі ў вялікарускіх губернях, на Украіне і ў Сібіры, падрабязных звестак аб іх дзейнасці выяўлена не было [6, арк. 24–24 адв., 31].

Таму ж ротмістру З. С. Панову ў чэрвені 1915 г. давялося спрабаваць, адпаведна запыту жандарскай каманды Брэст-Літоўскай фартэцыі ад 20 чэрвеня таго ж году, знайсці аўтара тэлеграмы з Мінска ў Тэрэспаль. Яна была адпраўлена 12 мая 1915 г. з гатэля «Кракаўскі» па Койданаўскай вуліцы, ад імя нейкага Фогеля. Як ён адзначыў у сваім рапарце на імя начальніка ўпраўлення ад 28 чэрвеня 1915 г., аб ім (Панове) дапытваўся мешчанін мястэчка Срэднікава Ковенскай губерні Нохум-Айзік Фогель, які на момант адпраўкі тэлеграмы пражываў у дадзеным гатэлі, але апошні заявіў, што нічога аб гэтай тэлеграме не ведае. Акрамя таго, зверка почыркаў Фогеля і арыгінала тэлеграмы паказала іх несупадзенне. Іншыя асобы па прозвішчу Фогель, якія ў той час знаходзіліся ў Мінску, у гатэлі «Кракаўскі» не пражывалі [6, арк. 86–90 адв.].

Падсумоўваючы ўсё вышэйзгаданае, можна зрабіць выснову, што галоўным аб’ектам для Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў пачатку XX ст. былі нелегальныя арганізацыі сацыялістычнага накірунку (бундаўцы, сацыял-дэмакраты, эсэры), а таксама стыхійныя праявы сацыяльнага незадавальнення і пратэсту, у прыватнасці, з боку сялянства. У час жа Першай сусветнай вайны на першы план выйшла неабходнасць барацьбы з актыўнасцю разведвальных службаў варожых дзяржаў. Хоць,

зразумела, дзейнасць рэвалюцыйнага падполля ніколі не выпускалася з поля зроку супрацоўнікаў упраўлення, як і расследаванне эканамічных злачынстваў, паколькі апошнія аб’ектыўна садзейнічалі дэстабілізацыі існуючага тады грамадска-палітычнага ладу. Адным словам, дзейнасць Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення заўсёды працякала ў адпаведнасці з асаблівасцямі тагачаснай палітычнай сітуацыі.

### Крыніцы і літаратура


1. Лашкевіч А. А. Мінскае губернскае жандарскае ўпраўленне ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн.: НГАБ, 2007. С. 115–121.
2. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / Сост. Т. Е. Леонтьева. Мн.: БелНИИДАД, 2006. С. 64–65.
3. НГАБ. Ф. 1705. Воп.1. Спр. 20.
4. Там жа. Спр. 22.
5. Там жа. Спр. 23. Арк. 193–200.
6. Там жа. Спр. 32.
7. Там жа. Спр. 33. Арк. 10–11.
8. Там жа. Спр. 34.
9. Там жа. Спр. 36. Арк. 24–30 адв., 188–190 адв.
10. Там жа. Воп. 2. Спр. 4. Арк. 1, 32.
11. Там жа. Спр. 5. Арк. 9, 10, 23–24, 91.
12. Там жа. Спр. 6.
13. Там жа. Спр. 7.
14. Там жа. Спр. 8.


*В. М. Папко*

## Крыніцы па гісторыі роду кн. Радзівілаў у архіве і бібліятэках Познані (Польшча)

У бібліятэках і Дзяржаўным архіве г. Познані сабрана не вельмі вялікая, аднак цікавая калекцыя дакументаў па гісторыі роду Радзівілаў. З гэтым горадам было звязана жыццё, дзейнасць і музычная творчасць кн. Антонія Генрыка (1775–1833) — заснавальніка берлінскай галіны роду Радзівілаў, да якой на працягу XIX ст. адышлі ўсе радзівілаўскія ардынацыі. Недалёка ад г. Астроў, на землях Вялікага княства Познаньскага, знаходзіўся вялікі маёнтак яго

бацькі кн. Міхала Гераніма (1744–1831), які стаў асновай будучай пшыгодзіцкай ардынацыі гэтай галіны роду. У 1815–1830 гг. кн. Антоній Генрык займаў пасаду намесніка прускага караля ў Вялікім княстве Познаньскім, якое было далучана да Прусіі па выніках Венскага кангрэса. Князь адыгрываў значную ролю ў свецкім і культурным жыцці горада, аднак рэальнага палітычнага ўплыву не меў. Сувязь Радзівілаў з гэтым рэгіёнам паспрыяла таму, што ў Познані захаваліся старадрукі і архіўныя дакументы, якія тычацца розных галін роду кн. Радзівілаў, у тым ліку і нясвіжскай.

Маёнтак Пшыгодзіцы ў Радзівілаў з'явіўся ў якасці пасагу Генрыкі Дароты Пшэбендоўскай, жонкі Яна Мікалая Радзівіла (1681–1729), у першай палове XVIII ст. З гэтага часу і да II сусветнай вайны ён належаў Радзівілам. З першай паловы XIX ст. значэнне маёнтка для роду ўзрасло, ён атрымаў статус ардынацыі (дакладныя акалічнасці справы невядомыя). Першым ардынатам лічыўся кн. Антоній Генрык, апошнім, чацвёртым — яго праўнук кн. Міхал па мянушцы Руды (1870–1955). У склад гэтых уладанняў уваходзіла 27 населеных пунктаў і прыватны горад Астроў, самы вялікі ў наваколлі.

Нягледзячы на тое, што назва маёнтка паходзіла ад в. Пшыгодзіцы, рэзідэнцыі княжацкай сям'і там не было. Спецыяльны будынак быў створаны па праекце прыдворнага прускага архітэктара Карла Фрыдрыха Шынкля (1781–1841) у месцы, якое ў гонар гаспадара назвалі Антанінам. Вакол гэтага дома, які прынята называць «паляўнічым», з цягам часу з'явіліся асобныя катэджы для старэйшых дзяцей, а таксама родавая ўсыпальніца. Антанін — месца летняга адпачынку Радзівілаў у XIX ст.

**Дзяржаўны архіў у Познані (Archiwum Państwowy w Poznaniu).** Дакументацыя аб гісторыі роду кн. Радзівілаў, якая захоўваецца ў архіве, мае сваю спецыфіку і адносіцца да некалькіх збораў. У зборы «Спадчыны асоб і сем'яў» у раздзеле «Радзівілы» захоўваецца 5 спраў. Дакументы, якія захоўваюцца ў справе № 1 гэтага збору, тычацца асобы Караля Радзівіла «Пане Каханку» (1734–1790) [1]. Справа № 2 з'яўляецца зборам лістоў кн. Радзівілаў да прадстаўнікоў сям'і Шцюрмэр за перыяд 1787–1789 гг. на нямецкай мове. Яны накіроўваліся ў Марыенбург [2]. Справа № 3 — «Ліст кн. Радзівіла з Берліна да невядомага адрасата ў Польшчы» [3].

Сярод калекцыі лістоў вылучаецца справа № 4 «Карэспандэнцыя Луізы з Гогенцолернаў, жонкі Антонія Радзівіла (маткі), і Элізы

---

[1] Archiwum Państwowy w Poznaniu (далей APP). Spuścizny osób i rodzin. Radziwiłłowie. Sygn. 1.

[2] APP. Spuścizny osób i rodzin. Radziwiłłowie. Sygn. 2.

[3] APP. Spuścizny osób i rodzin. Radziwiłłowie. Sygn. 3.



*Іл. 1.* Накід жаночага профілю ў лісце Элізы Радзівіл (паміж 1820–1832 гг.)

Радзівіл (дачкі) да Адэлі, графіні Сарторыс, і яе мужа, маёра…» (гл. іл. 1) [4]. Асноўная частка справы — лісты кн. Элізы з Рубергу, Антаніна з Познані за 1820–1832 гг. Сярод лістоў, напісаных на французскай і нямецкай мовах, знойдзены невядомы накід жаночага профілю, які ніколі не друкаваўся. Ён быў напісаны 29 лістапада 1830 г. Магчыма, гэта аўтапартрэт князёўны, якая была добрай малявальшчыцай, шмат яе малюнкаў друкавалася яшчэ ў XIX ст. Справа складаецца з 16 лістоў з пячаткамі Радзівілаў, з іх толькі адзін належыць кн. Луізе.

У справе № 5 захоўваецца «Ода да кн. А. Радзівіла». Гэты верш быў прачытаны аўтарам перад князем на спатканні ў Познаньскай гімназіі (1815 г.) [5].

Больш значнымі матэрыяламі валодае фонд «Маёнтак Пшыгодзіцы Радзівілаў» [6]. Яго асноўную частку складаюць гаспадарчыя дакументы, якія тычацца ўпраўлення, урэгулявання межаў паміж маёнткамі і г. д. Перыяд акрэслены такім чынам: 1683/1792–1938 гг. Гісторыя гэтага фонду даследавана кепска. Дакументы трапілі ў склад Ваяводскага

[4] APP. Spuścizny osób i rodzin. Radziwiłłowie. Sygn. 4.
[5] APP. Spuścizny osób i rodzin. Radziwiłłowie. Sygn. 5.
[6] APP. Zesp. 957. Majątek Przygodzice Radziwiłłów.

дзяржаўнага архіва ў 1945 г., апрацаваны ў 1955 г. На многіх дакументах захаваліся сігнатуры пшыгодзіцкай канцылярыі. Даследаванне гэтых сігнатур дазваляе сцвярджаць, што захавалася толькі малая частка дакументаў, што былі ў Пшыгодзіцах. Па меркаванні супрацоўнікаў Дзяржаўнага архіва ў Познані, прыблізна 10–15% ад таго, што было першапачаткова, дайшло да нашых дзён. Адсутнічаюць родавыя дакументы Радзівілаў. Аднак, магчыма, яны тут ніколі і не захоўваліся. Фонд маёнтка Пшыгодзіц складаецца з 256 архіўных адзінак, каля 60% з іх складаюць дакументы аб адносінах паміж адміністрацыяй і сялянамі ў першай палове XIX ст. Шмат дакументаў напісаны на нямецкай мове. Сустракаюцца планы будынкаў, аўтографы XI Алыцкага і II Пшыгодзіцкага ардыната кн. Багуслава (1805–1873).




*Іл. 2.* Парадны партрэт кн. Антонія Генрыка, намесніка прускага караля ў Вялікім княстве Познаньскім (паміж 1815 і 1830 гг.)

**Курніцкая бібліятэка (Biblioteka Kórnicka).** Афіцыйна знаходзіцца ў Курніку — невялікім гарадку каля Познані, аднак, каб карыстацца яе зборамі, няма неабходнасці выязджаць у Курнік. У цэнтры Познані, на галоўнай Ратушнай плошчы, знаходзіцца будынак філіяла бібліятэкі, куды з Курніка прывозяць заказаныя чытачамі кнігі і дакументы.

Сярод дакументаў гэтай бібліятэкі захоўваюцца ўспаміны кн. Эльжбеты Радзівіл, якія тычацца маёнткаў Чэканаў і Багатэла ў 1894–1926 гг. і падарожжа ў 1914 г. з Каралеўства ў Вялікапольшчу [7]. Асаблівую цікавасць для беларускіх гісторыкаў уяўляе збор рукапісных і друкава-

[7] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 11 665. Wspomnienia o Radziwiłłach. 1. «Pamiętnik ks. Elżbiety Radziwiłłowej, siostry ks. Ferdynanda Radziwiłła». K. 18.



*Іл. 3.* Антанін – рэзідэнцыя Радзівілаў у Пшыгодзіцкай ардынацыі (першая палова XIX ст.)

ных судовых актаў 1791 г., якія адлюстроўваюць судовы працэс паміж віленскім кашталянам кн. Мацеем Радзівілам (1749–1800) і віленскім ваяводай кн. Міхалам Геранімам Радзівілам аб апецы над непаўналетнім Нясвіжскім і Алыцкім ардынатам кн. Дамінікам (1786–1813) [8]. Гэты збор паходзіць з дакументаў генерала графа Ігнацыя Мараўскага, жонка якога Тэафіля Радзівіл была роднай цёткай хлопчыка.

Вайсковых спраў ВКЛ тычыцца перапіска віленскага кашталяна кн. Міхала (XVII ст.) і гетмана польнага ВКЛ кн. Міхала (XVIII ст.) [9]. На польскай і лацінскай мовах былі напісаны дакументы павераных навагрудскага ваяводы Яна Мікалая Радзівіла, якія паходзяць з 1719–1730 гг. [10] У калекцыі рукапісаў захоўваюцца і альбомы фотаздымкаў

---

[8] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 11 164. «Zbiór całego processu między JJ.OO. Xiążętami Radziwiłłami Maciejem kasztelanem wileńskim, a Józefem trockim y Michałem wileńskim wojewodami o opiekę nad małoletnim Xiem Dominikiem Radziwiłłem podkomorzycem WXLit. w Trybunale WXLit. odeszłym roku 1791. za laski JW. Roberta Brzostowskiego kaszt. połockiego w Grodnie».

[9] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 1873. Akta różne dotyczące spraw wojska W.X.Lit. i fragment korespondencji Radziwiłłów: Michała kasztelana wileńskiego (XVII w.) i Michała hetmana polnego (XVIII w.)

[10] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 11 165. Akta pełnomocników Jana Mikołaja Radziwiłła wojewody nowogródzkiego: Adama Michała Maluszyckiego i Dominika Fran-

Марыі з Залескіх Чартарыйскай, у якіх ёсць некалькі выяў прадстаўніц берлінскай галіны роду Радзівілаў: Эльжбеты і Алены Патоцкіх і інш. [11] Эльжбета і Алена былі дочкамі XIV нясвіжскага і XII клецкага ардыната кн. Антонія Вільгельма (1833–1904) і Марыі дэ Кастэлян (1840–1916).

Сустракаюцца таксама копіі дакументаў і старадрукаў XVI–XVIII стст., якія былі зроблены ў XIX ст. Прыкладам матэрыялаў такога кшталту можа служыць факсімільная копія твора Яна Каханоўскага, які меў дачыненне да Крыштафа Мікалая Радзівіла «Пяруна». Арыгінал быў надрукаваны ў 1583 г. [12] Адзін з дакументаў гэтай катэгорыі — копія ліста да Мікалая Радзівіла Чорнага [13].

**Бібліятэка Рачынскіх (Biblioteka Raczyńskich).** У аддзеле спецыяльных збораў захоўваецца невялікая калекцыя лістоў Радзівілаў. Каля 20 лістоў з гэтай калекцыі адносяцца да XVII–XIX стст. Самыя раннія з іх — ліст Крыштафа Радзівіла (?) да Паўла Прагульбіцкага (1620 г.), два лісты Крыштафа Альбрэхта Навіцкага да Багуслава Радзівіла (1662 г.) [14]. Ёсць сярод гэтых дакументаў і лісты прадстаўнікоў берлінскай галіны роду, у тым ліку XIII нясвіжскага ардыната кн. Вільгельма, яго сына, XIV Нясвіжскага ардыната кн. Антонія Вільгельма і інш. [15] Выклікае цікавасць таксама вялікі друкаваны партрэт кн. Антонія Генрыка, які, верагодна, быў створаны ў часы яго намесніцтва спецыяльна для афіцыйных патрэб [16]. У мясцовым музеі таксама захаваўся след каралеўскага намесніка — малахітавы столік князя, які яму пасля 1825 г. падарыў расійскі імператар Мікалай I.

У Дзяржаўным архіве Познані, бібліятэках Рачынскіх і Курніцкай захоўваецца невялікая, аднак даволі своеасаблівая калекцыя дакументаў, якая тычыцца гісторыі некалькіх галін роду кн. Радзівілаў, у тым ліку

---

ciszka Wierzeyskiego.

[11] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 11 991/1–2. Albumy Marii z Zaleskich Czartoryskiej.

[12] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 11 180. Jan Kochanowski «Jazda do Moskwy y poslugi z młodych lat aż i przez wszystek czas przeszłej wojny z Moskiewskim… Kristopha Radziwilla…»

[13] Biblioteka Kórnicka. Dział rękopisów. 11 183. Stanisław Orzechwski «List do… Mikołaja Radziwiłła… wojewody wileńskiego…z łacińskiego w polski ięzyk przełożony».

[14] Biblioteka Raczyńskich. Zbiory specyjalne. 1796. Korespondencja polskich dostojników państwowych z XVII w.

[15] Biblioteka Raczyńskich. Zbiory specyjalne. 1808. Zbiór autografów różnych osób z XIX i XX w.

[16] Biblioteka Raczyńskich. Zbiory specyjalne. 2719. Archiwum Raczyńskich. Litografie — portrety. Ks. Radziwiłł Antoni. K. 259 (V).




Старонка з альбома Марыі Чартарыйскай
*Іл. 4.* Сёстры Эльжбета і Феліцыя Радзівіл



*Іл. 5.* Столік Антонія Генрыка Радзівіла, падараваны Мікалаем I (першая палова XIX ст.)

і берлінскай. Асноўная частка іх не звязана з беларускімі землямі, аднак прадстаўляюць навуковы інтарэс для даследавання. У 1814 г. да кн. Антонія Генрыка адышлі нясвіжская і алыцкая ардынацыі, дакументаў па гэтай праблематыцы ў Познані выяўлена не шмат. Мала даследаваліся пшыгодзіцкія маёнткі роду Радзівілаў. Само па сабе пытанне гісторыі ўсіх радзівілаўскіх ардынацый беларускімі гісторыкамі комплексна не вывучалася.

Асобную цікавасць выклікаюць старадрукі, якія захоўваюцца ў Курніцкай бібліятэцы і тычацца XVIII ст. Дакументы, якія захоўваюцца ў архіве і бібліятэках Познані, можна ўмоўна падзяліць на чатыры групы:

I група — дакументы, якія тычацца выключна Пшыгодзіцкай ардынацыі і захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Познані.

II група — дакументы, лісты і партрэты, звязаныя з 15-цю гадамі намесніцтва кн. Антонія Генрыка (1815–1830 гг.).

III група — дакументы, якія не ўваходзяць у першыя дзве групы. Большасць з іх паходзяць з XVII–XVIII стст. Даволі складана прасачыць, якім шляхам яны трапілі ў Познань.

IV група — копіі дакументаў XVI–XVIII стст., якія ствараліся ў XIX ст. і могуць мець навуковую каштоўнасць.

Існуе неабходнасць больш грунтоўнага апісання і даследавання дакументаў, якія захоўваюцца ў Познані. Уключэнне іх у навуковы ўжытак у беларускай гістарыяграфіі можа спрыяць новым архіўным знаходкам.

*Н. У. Сліж*

## «Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай» як крыніца па гісторыі Гародні

**Стан даследавання праблемы.** Цудатворныя іконы з даўніх часоў прыцягвалі ўвагу даследчыкаў. Першым з гісторыкаў у сваёй кнізе змясціў раздзел пра цудатворныя абразы ВКЛ Войцех Віюк Каяловіч у XVII ст. Звесткі пра абраз Маці Божай Студэнцкай упершыню з’явіліся ў друку ў 1671 г. У зборы цудаў, які прысвечаны цудатворнаму абразу Маці Божай у касцёле Св. Міхаіла ў Вільні, адзначалася, што сярод іншых абразоў у Эйсмантах, Троках, Будзе (зараз Будслаў), Адэльску, Красным Бары, Ружаным Стоку «нядаўна аб’явіўся пад Горадняй, у паўмілі, у Кульбаках» новы абраз [1]. Многія знакамітыя цудатворныя іконы траплялі ў марыйныя атласы [2]. Сярод іх езуітам Гэнрыкам Схерэрам згаданы гарадзенскі абраз: «Гродна, над ракой Нёман. Там знаходзіцца цудатворны абраз Маці Божай у храме Айцоў езуітаў» [3]. Наступны раз пра абраз Маці Божай Студэнцкай было ўспомнена ва ўрачыстай песні ў гонар новага сябра студэнцкай кангрэгацыі Даната Зяброўскага, надрукаванай у 1812 г. [4] Пералічаныя выданні толькі ўзгадвалі пра існаванне абраза. Гэта паказвае, што ў тыя часы пра яго ведалі не толькі ў Гародні, але і ў іншых рэгіёнах.

У падарожных нататках Эдварда Хлапніцкага і Фаўстына Вшэдабыльскага ёсць упамінанне пра цудатворную ікону ў Фарным касцёле ў Гародні і пра лаву ў капліцы. Першы вандроўнік прадставіў апісанне

---

[1] «Teraz w tym roku niedawno ziawiony pod Grodniem o puł mili w Kulbakach». Skarbnica niebeska zdawna y temu czasu iasney otwarta. Przy obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie Panien Zakonnych Franciszka Swiętego Fundacyi Sapieżyńskiey, codziennymi, iawnemi autentycznymi, cudami. Wilna, 1671.

[2] «Grodno, Grodna, ad flum. Niemen. Est hic Imago miraculos B. V. in tempo S. I.». Gumppenberg G. Atlas Marianus. Monachii, 1672.; Scherer H. Atlas Marianus sive Georaphia Mariana. Pars III. Dilinga, 1737.

[3] Scherer H. Atlas Marianus… P. 122.

[4] Pieśń Nowo Obranemu Studentskiey solidasow N.M.P. Kongregacyi prefektorowi WJM Panu Donatorowi Zebrowskiemu majorowi woysk rossyyskich. Połack, 1812.

трох выяў на драўлянай лаве, якая знаходзіцца зараз у капліцы Маці Божай Студэнцкай: выратаванне В. Жэляроўскага, урачыстае ўнясенне абраза ў 1664 г., сон К. Сапегі [1]. А другі — 8 выяў: тры сюжэты як у папярэдняга, і выявы з С. Граткоўскім, С. Любамірскім, А. Катовічам, Ю. Тымінскім, К. Завішай [2].

Важным унёскам у далейшае даследаванне гісторыі цудатворных абразоў сталі абагульняючыя працы Садака Баранча, Вацлава Навакоўскага, Алозія Фрыдрыха [3], у іх сярод іншых узгадваецца абраз Маці Божай Студэнцкай. С. Баранч падаў інфармацыю пра паходжанне іконы на падставе «Збору знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай» (далей — «Збор…») [4]. У адрозненне ад папярэдняга даследчыка В. Навакоўскі не толькі прывёў гісторыю паходжання, але і распавёў пра камісію па зборы цудаў, шату, якую падараваў К. Сапега, лаву ў капліцы (памылкова сцвярджаў, што на ёй толькі 8 выяў), адзначыў наяўнасць гравюры Л. Тарасевіча ў «Зборы…» і прывёў спіс літаратуры, дзе ёсць згадкі пра абраз (5 найменняў) [5]. А. Фрыдрых таксама паўтарыў легенду, інфармацыю пра камісію, урачыстае ўнясенне іконы, шату, лаву (правільна палічыў там 16 выяў). Ён пераклаў з лацінскай мовы на польскую першы ліст віленскага біскупа А. Катовіча за 25 лістапада 1686 г. Сярод іншых даследчыкаў яго вылучае тое, што ён прывёў статыстыку цудаў па захворваннях: 20 цудаў — пазбаўленне ад смерці (трэці раздзел), 9 — выздараўленне ад паралюшу і іншых небяспечных хвароб (другі раздзел), 18 — вяртанне зроку (трэці раздзел, але там было 19 цудаў, а вочы вылечыла 5 асоб), 53 — іншыя хваробы (адкуль гэтая лічба ўзялася — незразумела, бо ў іншых раздзелах колькасць адрозніваецца, а агульная — 50) [6]. Усяго, па прыведзеных дадзеных, — 100. Падлікі былі зроблены з памылкамі, бо ў «Зборы…» зафіксавана 98 цудаў [7]. Таксама каштоўным з’яўляецца змяшчэнне ў кнізе выявы алтара Маці Божай Студэнцкай і спіса літаратуры з узгадкай, што «Збор…» захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве.

---

[1] Chłopnicki E. Notatki z róznoczasowych podróży po kraju (Inflianty, żmudź, Litwa, Pobereże). Warszawa, 1863. S. 96–98.

[2] Wszedobylski F. Kaleidoskop. O wszystkiem, o wielu rzeczach i o niczym // Pamiętnik naukowo-literacki. Zeszyt 1. Wilna, 1849. S. 102–104.

[3] Krahel T. Historiografia (archi)decezji Wileńskie do roku 1939 // Szudia z historii kościoła w Polsce. T. 5. Warszawa, 1979. S. 102–107.

[4] Barącz S. Cudowne obrazy Matki Najświetszej w Polsce. Lwów, 1891. S. 83–84.

[5] Nowakowski W. O cudownych obrazach w Polsce Przenajświetszej Matki Bożej. Zeszyt 1. Kraków, 1902. S. 190–191.

[6] Fridrich A. Historye cudownych obrazów Najświętszej Maryi Panny w Polsce. T. 4. Kraków, 1911. S. 91–96.

[7] Больш падрабязны колькасны аналіз цудаў гл. далей.

Па сутнасці гэты экзэмпляр быў вядомы ў навуковых колах з XIX ст., і гісторыкі карысталіся менавіта ім.

Станіслаў Заленскі ў сваёй грунтоўнай працы, прысвечанай гісторыі езуіцкага ордэна ў Рэчы Паспалітай, не абмінуў Гарадзенскі езуіцкі касцёл і кляштар. Разглядаючы звязаныя з імі гістарычныя падзеі, ён закрануў асобныя факты па гісторыі паходжання абраза Маці Божай Студэнцкай і яго абкраданнях [8].

Да абраза і яго гісторыі звярнуўся гарадзенскі даследчык і заснавальнік гісторыка-археалагічнага музея ў Гародні Юзаф Ядкоўскі. Ён зрабіў апісанне яго выгляду, памераў, прывёў гісторыю з'яўлення абраза ў Гародні паводле «Збору…», а таксама звязаў гэты абраз з лавай у капліцы. Яго артыкул праілюстраваны выявамі іконы, алтара і адным з 16 сюжэтаў з лавы — урачыстае ўнясенне іконы ў касцёл у 1664 г. [9] Ю. Ядкоўскі звярнуў увагу на мастацкую і гістарычную каштоўнасць іконы. Усе звесткі пра яе былі ўзяты ім са «Збору…» і не правяраліся па іншых крыніцах. Аднак і гэты твор аўтар выкарыстоўваў фрагментарна, выключна для агульнай характарыстыкі абраза. Ім прыведзены толькі адзін цуд пра выратаванне В. Жэляроўскага і яго сяброў [10].

Гісторыя гэтага абраза была паўторана ў кнізе Яўстафія Арлоўскага, прысвечанай Гародні. Адрознівае яе толькі дадатак пра паданне аб першапачатковым знаходжанні абраза пры крыніцы ў Васількаве і наступным перанясенні ў Гародню [11]. Ён з'яўляецца адзіным даследчыкам, які прывёў падобную інфармацыю.

У канцы XIX – пачатку XX ст. гісторыя каталіцызму, а ў яго рэчышчы гісторыя каталіцкіх абразоў, прыцягнула ўвагу даследчыкаў. Яны кіраваліся не толькі жаданнем аднавіць цікавасць да гістарычнай спадчыны, але і аказаць духоўнае супрацьдзеянне праваслаўю ў Расійскай імперыі. Напрыклад, у сваіх навуковых працах В. Навакоўскі абураўся фактамі знішчэння кляштароў і касцёлаў у Беларусі і ў іншых рэгіёнах імперыі, перадачы храмаў іншым канфесіям, а таксама з'явамі прымусовага перахрышчвання католікоў. Тагачаснымі даследчыкамі і аматарамі была зроблена важная праца: яны не толькі звярнулі ўвагу на гісторыю мастацтва, але і ўзнялі пытанне пра важнасць яе вывучэння. Нягледзячы на тое, што працы ўтрымліваюць шэраг памылак, сабраная інфармацыя пра абразы актуальная і зараз.

---

[8] Zalęski S. Jezuici w Polsce. T. 4. Cz. 3. Kolegia i domy założone w Polsce dobie rządów Zygmunta III i za rządów Władysława IV 1608–1648. Kraków, 1905. S. 1225–1242.

[9] Jodkowski J. Wiadomość historyczna o cudownym Obrazie Naświętszej Maryi Panny Studenckiej w Farnym kościele w Grodnie. Grodno, 1909.

[10] Крыніца і яе змест не прааналізаваны.

[11] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1. Гродно, 1910. С. 109–110.

Урыўкі са «Збору…» былі надрукаваны ў 1918 г. У навукова-папулярным выданні «Naśw. Marya Panna w obrazie kongregackim czyli rzymskim w Farze Grodzieńskiej cudami słynąca (Цудатворны кангрэгацкі, або Рымскі абраз Найсвяцейшай Панны Марыі ў Гарадзенскай фары)» прыведзены звесткі па гісторыі абраза, у т. л. урачыстае ўнясенне ў касцёл, склад камісіі па цудах і цуды. Паводле першай часткі «Збору…» прыводзілася лічба — 102 цуды, а таксама было зроблена апісанне 10 з іх: першы цуд у Васількаве, выпадкі, звязаныя з Даротай Грыжоўскай, гарадзенскім падпіскам земскага суда Юрыем Буткевічам, жонкай Станіслава Гадомскага, Зоф'яй Герасімавай, Янавай Рапейкавай, Юстынай Міхалавай, Грыгорыем Даманскім, Марцінам Чарніцкім, гарадзенскім гродскім суддзёй Ваўжынцам Рукевічам. Быў змешчаны пераклад ліста віленскага біскупа А. Катовіча пра стварэнне камісіі па цудах. Большую частку кнігі складаюць малітвы і песні, прысвечаныя Маці Божай, таму што асноўнай мэтай выдання было прыцягненне ўвагі веруючых да культу Маці Божай Студэнцкай. Згодна рэскрыпту апостальскага адміністратара Віленскай дыяцэзіі Казіміра Мікалая Міхалкевіча № 250 ад 27 сакавіка 1917 г. была ўстаноўлена дата шанавання іконы — 3 жніўня. За тыдзень да гэтага дня праводзіліся імшы, літаніі, а пасля пры вялікай грамадзе абраз урачыста ўнеслі ў Фарны касцёл [12].

У міжваенны перыяд краязнаўцы і даследчыкі Заходняй Беларусі звярнуліся да мясцовых помнікаў гісторыі і культуры. Былі надрукаваны творы, прысвечаныя Маці Божай Суцяшэння ў Гожскім касцёле, Маці Божай Жыровіцкай [13] і іншым іконам. Гэта паказвае тэндэнцыю аднаўлення культу абразоў Маці Божай, што мела рэлігійнае і ідэалагічнае значэнне як адзін са сродкаў супрацьстаяння савецкай ідэалогіі.

У шматтомным выданні па старадруках Рэчы Паспалітай «Збору…» было дадзена кароткае апісанне. Адзначалася, што ён утрымлівае гравюру Л. Тарасевіча, прысвячэнне Алене Агінскай, 7 раздзелаў. У прадмове была прыведзена легенда пра паходжанне абраза. Слушна заўважана выкарыстанне двух шрыфтоў: гатычнага і антыквы. На той момант было выяўлена два месцы захавання твора: бібліятэка Чартарыйскіх у Кракаве і бібліятэка ў Варшаве (сёння — у бібліятэцы Варшаўскага універсітэта) [14].

---

[12] Naśw. Marya Panna w obrazie kongregackim czyli rzymskim w Farze Grodzieńskiej cudami słynąca. Wilno, 1918. Рэпрынт дадзенага выдання быў зроблены ў Гарадзенскай дыяцэзіі ў 90-х гг. XX ст.

[13] [Łukaszewicz J.] Obraz Matki Boskiej Pocieszenia znajdujący się w kosciele parafialnym w Hoży (Powiat Grodzieński). Wilna, 1931; Charkiweicz W. Żyrowice — łask krynice… Słonim, 1930.

[14] Estreicher. Bibliografia polska. T. 30. Kraków, 1934. S. 48.

У другой палове XX ст. беларускія даследчыкі звярнуліся да гісторыі езуіцкага ордэна, у прыватнасці — Гарадзенскага касцёла і кляштара, але ў іх працах абраз і яго гісторыя не разглядаліся [15]. Новыя магчымасці ў вывучэнні мастацтвазнаўства з’явіліся пасля 1991 г. Асноўным прадметам даследавання Вольгі Гарашкавоз стала лава ў капліцы Маці Божай Студэнцкай. Яна падрабязна апісала 4 сюжэты: унясенне абраза, выратаванне В. Жэляроўскага, вылячэнне К. Завішы і дараванне шаты К. Сапегам. Пры вывучэнні лавы яна зрабіла спробу ідэнтыфікаваць цуды, намаляваныя на ёй, з цудамі з кнігі [16]. Аднак у артыкуле ёсць шэраг памылак, звязаных з атаясамленнем цудаў з лавы і са «Збору…», а таксама сустракаюцца памылкі ў прозвішчах. Прыводзячы легенду пра паходжанне абраза, аўтарка спасылаецца на Ю. Ядкоўскага, хаця першакрыніцай з’яўляецца «Збор…».

Марыя Каламайска-Саеед прысвяціла спецыяльнае даследаванне іконе Маці Божай Студэнцкай. Яна выкарыстала ўрыўкі з тэксту, дзе апісана гісторыя паходжання абраза і ўбранне вотамі. Даследчыца адзначыла, што гэта адзіная крыніца, якая прыводзіць дату пачатку будаўніцтва аптэкі ў Гародні ў 1686 г. Аднак яна памылілася з назвай в. Кульбакі, дзе знаходзіўся абраз да перанясення ў езуіцкі касцёл. Яна назвала вёску Кульбаты і таму не змагла яе лакалізаваць. Пра паходжанне абраза, датаванне і месца з’яўлення была дадзена даволі абмежаваная інфармацыя [17].

У апошнія гады літоўскімі гісторыкамі мастацтва сталі вывучацца цудатворныя абразы, а таксама звязаныя з імі зборы цудаў [18]. Сярод іх Таяна Рачунайтэ, якая пры вывучэнні збору цудаў, прысвечанага цудатворнай іконе Маці Божай у касцёле на Лукішках у Вільні, параўнала яго па структуры і зместу са «Зборам…» і знайшла ў іх агульныя рысы [19].

Акрамя навуковых даследаванняў з’явіліся навукова-папулярныя працы, у якіх давалася апісанне абраза Маці Божай Студэнцкай і яго гісторыі, аднак новай інфармацыі па праблеме яны не ўтрымлівалі [20].

---

[15] Мараш Я. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795). Мн., 1971; Мараш Я. История экспансии католической церкви в Белоруссии в XVIII в. Мн., 1974; Блинова Т. Иезуиты в Беларуси. Мн., 1990.

[16] Гарашкавоз В. Вотыўны жывапіс Беларусі // Мастацтва. 1994. № 3. С. 49–53.

[17] Kałamajska-Saeed M. Cudowny obraz Matki Boskiej Studeńskiej z kościoła jezuitów w Grodnie // Roczniki Humanistyczne. 2002. T. L. Z. 4. S. 517–525.

[18] Paknys M. Kasdienybės istorija XVII a. LDK stebuklų aprašynuose // Acta Academiae Artium Vilensis. 2003. № 31. P. 85–94.

[19] Račiūnaitė T. Lukiškių Šv. Jokūbo ir Pilipo bažnyčios Dievo Mirotinos jo paveiklas stebuklų knyga «Mistinis Fontanas…». Stebuklo vieta ir laukas // Acta Academiea Artum Vilnensis. 2002. № 25. P. 223–240.

[20] Maroszek J. Cudowny obraz // Magazyn Polski. 1992. № 1. S.53; Ярашэвіч А. А., Бажэнава В. Дз. Гродзенскі кафедральны касцёл Святога Францыска Ксаверыя. Мн.,

Гістарыяграфія па цудатворных іконах даволі багатая, на жаль, іконе Маці Божай Студэнцкай прысвечана не так шмат спецыяльных даследаванняў. Яны не даюць адназначных адказаў на шэраг пытанняў: паходжанне іконы, датаванне, аўтарства, прычына з'яўлення «Збору…», яго крыніцазнаўчая характарыстыка і інш. Вышэйпрыведзеныя прыклады не заўсёды ўтрымліваюць праўдзівую інфармацыю. Таму «Збор…» і гісторыя абраза Маці Божай Студэнцкай патрабуюць больш глыбокага вывучэння.

Даследаванне крыніцы праводзілася па шэрагу накірункаў: гістарыяграфія, абраз і гісторыя яго паходжання, воты, характарыстыка крыніцы (аздоба, асаблівасці друку, цуды і іх рэлігійнае значэнне, захворванні, сацыяльны і гендэрны склад просьбітаў, геаграфія мясцін, якія ўзгаданы ў кнізе).

**Абраз і месца яго знаходжання.** Гарадзенскі кафедральны касцёл Святога Францыска Ксаверыя з'яўляецца адным з самых прыгожых у Беларусі. Гэты шэдэўр мастацтва пабудаваны і аздоблены ў стылі барока. Належаў ён езуіцкаму ордэну, які быў запрошаны ў Гародню Стэфанам Баторыем у 1584 г. На месцы сучаснага храма спачатку з'явіўся драўляны касцёл, дзякуючы фундацыі Станіслава Касабудскага ў 1622 г. У наступным годзе езуіты заклалі ўласную рэзідэнцыю, бо да гэтага часу яны жылі ў доме Масальскага. Дакладныя даты будаўніцтва касцёла невядомыя, ёсць інфармацыя толькі пра фундацыйныя запісы. Езуіцкі ордэн паспяхова развіваў сваю дзейнасць да вайны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскім княствам 1654–1667 гг. Маскоўскія войскі занялі Гародню ў 1656 г. і практычна зруйнавалі горад. Былі спалены ўсе пабудовы езуітаў, а самі манахі вымушаны былі хавацца па ваколіцах. Яны вярнуліся толькі ў 1658 г., аднак маскоўскія войскі ў 1660 г. зноў знішчылі адноўленыя будынкі. Езуіты ўзнавілі сваю дзейнасць пасля вызвалення Гародні ў 1662 г. Даследчыкі мяркуюць, што амаль у гэты час пабудаваны драўляны храм Св. Пятра і Паўла, куды ў 1664 г. была ўрачыста ўнесена ікона Маці Божай Студэнцкай. Закладзены камень на рагу будучага мураванага касцёла быў асвечаны ў 1678 г. Будаўніцтва храма скончана на пачатку XVIII ст. [21]

---

2005; Ярашэвіч А. А. «Маці Божая Снежная» у Беларусі. Мн., 2003; Катэдральная базіліка ў Гродне. Гродна, 2005.

[21] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce Baroku. Warszawa, 1995. S. 196–209; Paszenda J. Budowle po-jezuickie w Grodnie // Magazyn Polski. 1992. № 2. S. 52–53; № 3. S. 78–80; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. Supraśl, 2005. S. 171–180.

Аднак выяўленыя дакументы прадстаўляюць карціну па-рознаму. Інвентар касцёла за 1773 г. паведамляе, што храм быў пабудаваны Геранімам Дзевялтоўскім [22]. У візітацыі касцёла за 1820 г. адзначаецца, што мураваны касцёл быў узведзены ў 1663 г. Францыскам Далматам Ісайкоўскім і ім жа кансэкраваны пад тытулам Св. Францыска Ксаверыя ў 1667 г. [23] Гэтая інфармацыя пацвярджаецца «Хронікай парафіяльнага касцёла» за 1847 г. [24] Звесткі з апошняй крыніцы выкарыстоўвала ў сваіх даследаваннях Е. Квітніцкая. Польскі гісторык Юры Пашэнда паставіў іх пад сумненне, бо Ф. Ісайкоўскі памёр у 1654 г., таму не мог займацца пабудовай касцёла, а тым больш яго кансэкраваць [25]. Блытаніну ў літаратуру ўнеслі даты зацвярджэння фундацыйных запісаў Ф. Ісайкоўскага на соймах 1647 і 1667 гг. [26]

Пра існаванне касцёла ў 1663 г. сведчыць тэстамент пакаёвага двараніна, гарадзенскага стольніка (1657–1659), віленскага кусташа і каралеўскага сакратара (1659), рэгента вялікай канцылярыі (1661) [27] і віленскага каноніка Юрыя Міхала Бяніцкага (? — пасля 1665), які прасіў пахаваць яго пры Гарадзенскім езуіцкім касцёле (1 сакавіка 1663 г.). На імшы за сваю душу ён прызначыў рухомыя рэчы і грошы. Яго сястра Кацярына Выкоўская атрымала 500 злотых спадчыны. Акрамя гэтага ў тэстаменце ёсць звесткі пра мясцовую шляхту, якая ўваходзіла ў сяброўскае кола: Казімір Эйсмант, Самуэль Гладкоўскі, гарадзенскі падкаморы, Станіслаў і Стэфан Масальскія, Шыман Алізаровіч, Стэфан Валовіч, віленскі схаластык і будучы віленскі біскуп Аляксандр Катовіч [28]. Цікава, што касцёл у тэстаменце называецца езуіцкім, як і ў «Зборы…» [29].

Звесткі аб езуіцкім касцёле таксама ўтрымліваюцца ў тэстаменце Крыштафа Маравіцкага (23 студзеня 1668 г.), які быў актыкаваны ў кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ 10 жніўня 1668 г. Гэта выпіс з гарадзенскіх гродскіх кніг (5 лютага 1668 г.). К. Маравіцкі прасіў пахаваць яго ў Гарадзенскім езуіцкім касцёле, а за гэта і ўспамін

---

[22] Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей — ЛДГА). Ф. SA. Спр. 11 296. Арк. 1.

[23] Там жа. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 4020. Арк. 3–4 адв.

[24] Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Віленскага Універсітэта (далей — Аддзел рукапісаў БВУ). Ф. 4. Спр. 35 955.

[25] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie… S. 191.

[26] Borowik P. Jurydyki miasta Grodna… S. 173.

[27] Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. 1. Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek / Pod. red. A. Rachuby. Warszawa, 2004. S. 200.

[28] Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Літоўскай Акадэміі навук (далей — Аддзел рукапісаў БЛАН). Ф. 43. Спр. 26 588.

[29] Sumariusz cudow i łask… S. 19, 20, 32.

душы запісаў езуітам маёнтак Мілучаўшчына (Гарадзенскі павет) і ўсе рухомыя рэчы, якія ў ім знаходзіліся. Гэты тэстамент пацвярджаў ранейшы запіс, які быў зроблены разам з жонкай Канстанцыяй Міляўскай [30].

Акрамя згаданых дакументаў захаваліся і рукапісныя рэлігійныя творы гарадзенскага ксяндза-прамоўцы Барталамея Вышамерскага. Яго прамова адбылася ў езуіцкім касцёле на дзень Св. Францыска Ксаверыя (1672) [31]. Дакументы сведчаць, што дадзены касцёл быў пабудаваны ў 1663 г. і дзейнічаў, але ўнутранае ўбранства і знешні выгляд не адзначаны.

Хаця мураваны касцёл быў пабудаваны ў пачатку XVIII ст., афармленне яго інтэр'ера працягвалася да 70-х гг. [32] Веліччу і багатым дэкорам адрозніваецца галоўны алтар. Ён быў выкананы знакамітым разьбяром Янам Шмідтам у 30-х гг. XVIII ст. Фундатарамі алтара былі мсціслаўскі кашталян Самуэль Лазовы і яго жонка Канстанцыя з роду Юндзілаў [33]. Акрамя гэтага касцёл прываблівае такімі элементамі, як звон 1637 г., унікальны гадзіннік XVII ст. з адзіным дзейсным механізмам у Еўропе, фрэскавыя роспісы і іншае, якія захаваліся да нашых дзён. Пасля знішчэння Фары Вітаўта ў 1961 г. наступным павінен быў «узляцець» у паветра касцёл Св. Францыска Ксаверыя, але, дзякуючы намаганням вернікаў, ён захаваўся і ўражвае сваёй прыгажосцю.

У гэтым храме знаходзіцца знакамітая цудатворная ікона Маці Божай Студэнцкай. Яна адносіцца да тыпу Маці Божай Снежнай, што падкрэсліваецца ў «Зборы…» [34]. Прататып абраза паходзіць ад старажытнай базілікі Санта Марыя Маджорэ (Італія). На яго аснове былі створаны разнастайныя копіі ў Еўропе і Беларусі. Гэты від іконы выглядае наступным чынам: Багародзіца, якая стаіць і трымае Дзіця на левай руцэ, паверх якой пакладзена правая. У левай руцэ Марыі — этыкетная хустачка. Постаць Маці Божай крыху павернутая ўлева, аднак твар франтальна павернуты да гледача. Позірк Ісуса скіраваны крыху ўгару, да Маці, правая рука благаслаўляе, а левая трымае закрытую кнігу. Мафоры Марыі цёмна-сіняга колеру, шляк — з трох залатых палосак, спод — цёмна-зялёны, над ілбом — залаты візантыйскі крыж, хітон — малінавы. Яе вочы — вялікія, а нос — прамы, з гарбінкай. Твар Дзіцяці антычнага тыпу, валасы —

[30] ЛДГА. Ф. SA 7. Арк. 1330–1339 адв.
[31] Аддзел рукапісаў БВУ. Ф. 3. Спр. 2263. Арк. 6 адв.–9 адв.
[32] Paszenda J. Kościół pojezuicki (farny) w Grodnie… S. 196–209.
[33] Gorszkowoz O., Jaroszewicz A. Ołtarz kościoła farnego w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce Baroku. Warszawa, 1995. S. 79–86.
[34] Sumariusz cudow i łask… S. 51, 68.

хвалістыя. Хітон маленькага Ісуса — жаўтаваты, гімацій — чырвона-карычневы. Німбы — залатыя, фон — карычневай вохры. Вахрэнне твараў бледна-аліўкавага ці шэравата-карычневага колеру, каля вачэй і носа — глыбокія цені [35].

Выява на гарадзенскай іконе паўтарае схему арыгінала. Рысы твару адлюстроўваюць мацярынскую дабрыню і пяшчоту. Тварык Ісуса павернуты да Маці, у ім бачна дзіцячая чуласць і падзяка [36]. Адрознівае абраз тое, што твар Маці Божай павернуты крыху ўбок, а яе позірк не накіраваны на глядача, на левым плячы — васьмікутная зорачка, хустачка ў руках даволі схематычная. Кніжка ў руках Ісуса мае скураную вокладку карычневага колеру і на двух зашчэпках. На вокладцы змешчана распяцце ў коле, што прамянямі разыходзіцца ад яго. Манера выканання адрозніваецца ад арыгінала, які быў намаляваны ў візантыйскім стылі, а гэты абраз — у стылі барока. Візантыйскія рысы твараў Маці Божай і Ісуса адсутнічаюць. Варта адзначыць, што мастацкі ўзровень выканання даволі высокі.

Абраз Маці Божай Студэнцкай невялікі па памерах (22×17 см). Ён выкананы на меднай блясе, таўшчынёй каля 0,5 мм. У «Зборы…» адзначана, што абраз быў малы, намаляваны на медзі і яго можна было насіць у якасці крыжа [37]. Абраз мае залатую сукенку, якую М. Каламайска-Саеед не ідэнтыфікуе з сукенкай, падараванай віленскім ваяводай і вялікім гетманам ВКЛ Казімірам Сапегам, а атаясамляе з новай, пра якую ўзгадвае інвентар касцёла 1773 г. Багатая сярэбраная аправа іконы датуецца 1761 г. Знаходзіцца абраз у капліцы Маці Божай Студэнцкай, якая была фундавана Рымвідам. З 12 алтароў гэта адзіны мураваны. Выкананы ў стылі класіцызму ў 1773 г. Алтар увенчаны разьбянай скульптурай Панны Марыі Беззаганнага пачацця. Паводле меркавання М. Каламайскай-Саеед, аўтарам твору з'яўляецца Тамаш Падгайскі, які працаваў у Вільні, Коўна, Шыдлове, Цітаўлянах і Цельшах. Стракатая мармуровая размалёўка была зроблена ў пачатку XX ст. Раней алтар быў больш сціплым і драўляным, падобным на алтар Св. Міхаіла [38].

---

[35] А. Ярашэвіч прадставіў у сваёй працы 43 беларускія іконы дадзенага тыпу за перыяд XVI–XIX стст., у тым ліку змясціў гарадзенскі абраз Маці Божай Студэнцкай. Гл.: Ярашэвіч А. А. «Маці Божая Снежная»… С. 5–6, 9.

[36] Naśw. Marya Panna w obrazie kongregackim… S. 8.

[37] Sumariusz cudow i łask… S. 14.

[38] Kałamajska-Saeed M. Cudowny obraz Matki Boskiej Studeńskiej… S. 521, 523–524.; Paszenda J. Kośćół pojezuicki… S. 206; Ярашэвіч А. А., Бажэнава В. Дз. Гродзенскі кафедральны касцёл Святога Францыска Ксаверыя. Мн., 2005; Гарашкавоз В. Вотыўны жывапіс Беларусі // Мастацтва. 1994. № 3. С. 52.

Інвентар за 1773 г. утрымлівае кароткае апісанне капліцы Маці Божай Студэнцкай [39]. У ім таксама пералічана колькасць срэбра [40], бялізны [41] і цыны [42], якія ёй належалі.

За сваю гісторыю існавання абраз меў шэраг назваў, аб чым згадваецца ў «Зборы…». Яго называлі Рымскім, бо адтуль быў прывезены, пасля Васількаўскім, бо ў гэтым мястэчку аб'явіўся першы цуд. Наступная яго назва была Кульбацкі, таму што ён некаторы час там знаходзіўся. Пасля перанясення абраза ў езуіцкі касцёл яго сталі называць Студэнцкім ці Кангрэгацкім [43]. Апошнія назвы захаваліся да сённяшняга дня і ўжываюцца абедзве. Пры езуіцкім кляштары існавала сярэдняя навучальная ўстанова для хлопчыкаў (1625–1773) [44]. Яе вучні, якіх называлі студэнтамі, удзельнічалі ў набажэнствах пры іконе. Часам да іх звярталіся хворыя вернікі, каб юнакі сваімі малітвамі да Маці Божай дапамаглі хутчэй выздаравець. Гэтым і абумоўлена назва Студэнцкая. У дадзеным даследаванні выкарыстоўваецца назва абраз Маці Божай Студэнцкай па назве са «Збору…».

Паходжанне іконы даследчыкі падаюць паводле гісторыі, якая апісана ў «Зборы…». З Рыма абраз прывёз дамініканскі правінцыял і падарыў яго канцлеру ВКЛ Альбрэхту Станіславу Радзівілу (1593–1656). Пасля яго смерці ікона перайшла ксяндзу-дамініканцу Куклінскаму, а той падарыў яе гарадзенскаму шляхцічу Войцаху Жэляроўскаму. Абраз Маці Божай

---

[39] «Lewa strona od Wielkiego Ołtarzy zawiera w Sobie. 1. Kaplicę Kongregackiey z Ołtarzem tego Roku wspaniałe wymurowanym, ozdoba iego sztukaterya misterna. Dla nadeszłey zimy we srzodku, y dole nie dana». ЛДГА. Ф. SA. Спр. 11 296. Арк. 1 адв. (Цытуецца на мове арыгінала.)

[40] «Ramy nowe do obrazu Nayszey Panny Voloris zł poł 7503, di… Stare, szata Szczcyrozłota nowa do tego Obrazu, ditt° Stara srebrna pozłoczona, ditt° do Obrazu S. Stanisława, lichtarow większych (6), lichtarow mnieyszych (4), relikwarzow z blachami (4), tabliczek (81), kielich z patyną, lampa większa, lamp mnieyszych (4), krusifix, pacyfikatow». Там жа. Арк. 2 адв.

[41] «Alba wyszywana złotem, tuwalnie złotem haftowana, tuwalnie srebrem haftowana, tuwalnie włoczką szytych (6) komza, welow (2), korporałow (6), subkorporałow (6), ręcznikow (5), chustek (2), obrusow na ołtarz (11)». Там жа. Арк. 3 адв.

[42] «Lichtarze wielkich do lamp (2), lichtarze na ołtarz większych (12), lichtarze na ołtarz mnieyszych (4), dzwonow cynowych do kwiatow (12)». Там жа. Арк. 3.

[43] Sumariusz cudow i łask znakomitszych Nayswietszey Maryey Panny Studentskiey Kongregacyi Grodzienskiey pod tytułem Annuntiationis. Wilna, 1686. S. 64. Назву Маці Божая Студэнцкая меў яшчэ абраз у касцёле Св. Яна ў Вільні. Першы цуд адбыўся пры ім, калі маліліся студэнты. Упершыню пра яго ўзгадвае В. Каяловіч. Nowakowski W. O cudownych obrazach… S. 738.

[44] Zalęski S. Jezuici w Polsce. T. 4. Cz. 3… S. 1224; Блінова Т. Гродзенскі езуіцкі калегіум // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі (далей — ЭГБ). Т. 3. Мн., 1996. С. 134.

Студэнцкай знаходзіўся ў сталовай яго маёнтка Кульбакі. Незадоўга да сваёй смерці 24 сакавіка 1664 г. В. Жэляроўскі падарыў абраз езуіцкаму касцёлу. Урачыстае ўнясенне адбылося 3 жніўня [45].

Гэтая версія была ўзятая з крыніцы і без усялякага аналізу перапісвалася С. Баранчам, В. Навакоўскім, Ю. Ядкоўскім, А. Фрыдрыхам [46]. Сучасныя даследчыкі спасылаліся на працы Ю. Ядкоўскага і на першую частку «Збору…» [47]. М. Каламайска-Саеед пры мастацкай характарыстыцы іконы падала агульнапрынятую версію паходжання, але асцярожна адзначыла, што гэта копія знакамітай Маці Божай Снежнай сярэдзіны XVII ст. Яшчэ яна звярнула ўвагу на тое, што Альбрэхт Станіслаў Радзівіл нічога не напісаў пра яе ў сваіх успамінах [48].

Аднак афіцыйная версія выклікае пэўныя сумненні. У крыніцы не падаецца імя літоўскага правінцыяла дамініканцаў. Правінцыя была створана ў 1647 г. Яе стварэнню спрыяў А. С. Радзівіл [49]. Да 1656 г. (дата смерці канцлера ВКЛ) гэтую пасаду займалі Пятроніюш Каменскі (1647–1649), Альфонс Казнаўскі (1647–1653), Томас Кансоліс (1653–1655) і Рэгінальд Тышкевіч (1656–1658) [50]. З іх у дзённіку канцлера ВКЛ узгадваецца толькі першы ў сувязі з канфліктамі ў дамініканскім ордэне [51]. Калі прытрымлівацца легенды, што дамініканскі правінцыял прывёз абраз з Рыма, то найбольш падыходзіць П. Каменскі (?–1663). Вядома, што ён вучыўся ў Любліне (1618), Неапалі (1626–1627), стаў доктарам тэалогіі ў 1644 г. [52] Існуе верагоднасць, што П. Каменскі падараваў ікону ў якасці падзякі А. Радзівілу за спрыянне ў стварэнні літоўскай правінцыі. Аднак дакумента, які б зафіксаваў гэты факт, няма.

---

[45] Sumariusz cudow i łask… S. 7–9; Jodkowski J. Wiadomość historyczna…; Naśw. Marya Panna w obrazie kongregackim… S. 8–9; Ярашэвіч А.А., Бажэнава В. Дз. Гродзенскі кафедральны касцёл…

[46] Barącz S. Cudowne obrazy… S. 83–84.; Nowakowski W. O cudownych obrazach… S. 190–191.; Jodkowski J. Wiadomość historyczna…; Fridrich A. Historye cudownych obrazów… T. 4. S. 89–90.

[47] Ярашэвіч А. А., Бажэнава В. Дз. Гродзенскі кафедральны касцёл…; Ярашэвіч А. А. «Маці Божая Снежная»… абраз № 4; Maroszek J. Cudowny obraz // Magazyn Polski. 1992. № 1. S. 53; Гарашкавоз В. Вотыўны жывапіс… С. 52.

[48] Kałamajska-Saeed M. Cudowny obraz Matki Boskiej Studeńskiej… S. 517–518, 521.

[49] Brzozecki S. Litewska prowincja dominikanów // Rocznik Augustowsko-Suwalski. 2004. T. 4. S. 224.

[50] Petkus V. Dominikai Lietovos kultūroje. Vilnius, 2004. P. 54.

[51] Radziwiłł A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce. T. 2. Warszawa, 1980. S. 245, 258.

[52] Świętochowski R. szkolnictwo teologiczne dominikanów // Dzieje teologii katolickiej w Polsce. Cz. 2. T. 2. Od Odrodzenia do Oświecenia. Lublin, 1975. S. 265.

Яшчэ адзін супярэчлівы момант у легендзе. Першы цуд здарыўся ў 1655 г. у Васількаве, калі А. Радзівіл быў яшчэ жывы, а ў «Зборы…» адзначаецца, што ікона была перададзена В. Куклінскаму пасля смерці канцлера ВКЛ [53] — гэта значыць у 1656 г. А. Радзівіл даволі падрабязна ў тэстаменце распісаў свае ахвяраванні каталіцкім касцёлам і кляштарам [54], але пры гэтым ён не выказаў жадання перадаць ікону В. Куклінскаму. Яго тэстамент утрымлівае ўзгадку пра абраз Найсвяцейшай Панны Марыі, які канцлер ВКЛ вазіў з сабой як ахоўны знак. Але па волі ўладальніка ён разам з іншымі абразамі павінен быў перайсці Алыцкаму касцёлу [55]. Вядома, што пры жыцці канцлер ВКЛ больш кантактаваў з езуіцкім ордэнам, чым з іншымі законамі [56]. У такім выпадку, чаму абраз быў перададзены дамініканцу?

Ні «Збор…», ні тэстамент В. Жэляроўскага не даюць інфармацыі пра загадкавую асобу кс. Куклінскага. У іншых крыніцах і навуковай літаратуры гэтае прозвішча не пазначана. У гэты час жыў Станіслаў Куклінскі (1596–1679). Ён стаў езуітам, і яго дзейнасць была звязана з Кракавам, Луцкам і Львовам [57]. У кнігах Гарадзенскага земскага суда ёсць дакумент аб працэсе паміж гарадзенскімі бернардзінамі і езуітамі. Старэйшым у езуітаў названы кс. Войцех Куклінскі (1650) [58]. Калі зрабіць дапушчэнне, што гэта быў не дамініканец, а езуіт, то зразумела, чаму абраз вярнуўся да езуіцкага касцёла. Аднак гэта гіпатэтычнае меркаванне.

У тэстаменце В. Жэляроўскі адзначыў атрыманне абраза ад дамініканскага кс. Куклінскага, але без узгадкі аб абставінах: калі, дзе і як гэта адбылося. Зыходзячы з інфармацыі са «Збору…», можна меркаваць, што гэта здарылася паміж 1656 і 1661 гг., верагодна, на тэрыторыі Польшчы. Пасля канчатковага вызвалення Гародні ў 1661 г. В. Жэляроўскі вярнуўся [59] і прывёз з сабой абраз. Таму ў перыяд 1661–1664 гг. абраз дакладна знаходзіўся ў яго.

Тэстамент В. Жэляроўскага для актыкацыі ў Гарадзенскі гродскі суд 10 красавіка 1664 г. падала яго жонка Тэкля Сапоцкаўна, а 17 кастрычніка 1664 г. ён быў перанесены ў Гарадзенскі земскі суд. Памёр аўтар

---

[53] Sumariusz cudow i łask… S. 7.

[54] Radziwiłł A. S. Pamiętnik… T. 2. S. 458–461.

[55] Там жа. С. 456–457.

[56] Przyboś A. Radziwiłł Albrecht Stanisław // PSB. T. 30. Wrocław, 1987. S. 147.

[57] Notański B. Kukliński Stanisław // PSB. T. 16. Warszawa; Wrocław; Kraków; Gdańsk, 1971. S. 118–119.

[58] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 42. Арк. 117.

[59] Там жа. Спр. 46. Арк. 543–550 адв.

тэстамента ў перыяд паміж 28 сакавіка і 10 красавіка. У літаратуры можна сустрэць match рознае напісанне прозвішча Жэляроўскага: Жэлязоўскі, Зеляроўскі, Жалароўскі, бо ў «Зборы…» і подпісы пад выявай на лаве ідзе форма «Zielarowski». Літара «ż» пісалася не заўсёды, што часам прыводзіць да розных варыянтаў напісання імёнаў і прозвішчаў. Але выпіс на старабеларускай мове падае форму «Желяровский», што не выключае магчымасці для разначытанняў.

Амаль у самым пачатку дакумента змяшчаецца інфармацыя пра абраз Маці Божай:

«W ymie Oyca y Syna y Duchy Swieteo. Amen. Ja Woyciech Zelarowski uz nawiedzony będąc od Pana Boga uż czas niemały na ciele chorobą na rozumie iednak y zmysle będąc zdrowy y przy dobrym baczeniu. A czuiąc sie byc błizszym smierci anizeli zywota uboga moią maiętnosc tak rozporzęzony ostatnią wolą moię takowa chce miec. Naprod maiąc w domu swoim wielki kleynot do Boga to iest obraz Cudowny Panny Przenaswiętszey Bogorodzice Maryey ktorymi za wielki upominek dał y wiecznymi czasy darował xiądz Kuklinski Zakonu Dominikanskiego daię ten obraz Panny Przenaswiętszey y wiecznymi czasy daruię do koscioła Jch Msciom Przewielebnych Oycow Jezuitow Rezydencyey Grodzienskiey do Congregacyi y Bractwa Panny Przenaswiętszey ze wszytkiemi wotami y tabliczkami srebrnemi aby tam jako naywiększą chcią te Panną Przenaswiętszą wychwalano przy tym chorągiew kitayczaną y obrazow co ckolwiek mam to wszytko do Congregaciey zapisuię.» Гародня, 28 сакавіка 1664 г. [60]

Звесткі з легенды пацвярджаюць толькі перадачу абраза ад В. Куклінскага да В. Жэляроўскага, і ад апошняга — езуітам. Калі б ён дакладна ведаў пра паходжанне абраза, то распавёў бы пра яго цалкам, а не часткова, і наўрад ці абмінуў такі варты ўвагі момант, што яго прывезлі з Рыма і падарылі А. Радзівілу.

На сённяшні дзень немагчыма дакладна высветліць, чаму менавіта езуітам быў перададзены абраз. Паводле легенды да абраза мелі дачыненне дамініканцы, а атрымалі яго езуіты. Жаданне мець такую ўнікальную рэч у новым касцёле добра зразумела. У Гародні было дастаткова касцёлаў, і паміж імі існавала пэўная «канкурэнцыя». Вядомы ў наваколлі абраз быў проста неабходны, каб прыцягнуць да сябе больш вернікаў. У «Зборы…» адзначана, што В. Жэляроўскаму больш спадабалася набажэнства ў езуіцкім касцёле. Таму ён вырашыў падарыць абраз езуітам [61]. Аднак прычыны маглі быць і іншыя.

[60] НГАБ. Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 46. Арк. 543 адв. Урывак з тэстаменту падаецца на мове арыгінала.

[61] Sumariusz cudow i łask… S. 8.

У «Зборы…» тры разы (цуды №№ 1, 17, 68) узгадваецца, што абраз быў у ксяндза брыгіцкага касцёла Паскуцкага. Ён выехаў разам з брыгіткамі з Гародні пры набліжэнні маскоўскага войска. Яны праязджалі праз Васількаў і Сакольскую плябанію. У снежні 1655 г. Паскуцкі ўжо быў на тэрыторыі Польшчы. Ксяндзы езуіцкага ордэна служылі ў брыгіцкім касцёле. Цалкам верагодна, што Паскуцкі быў езуітам. Таму магчыма, што абраз знаходзіўся ў езуітаў прыкладна да захопу горада маскоўскімі войскамі. Але гэта не высвятляе абставін, пры якіх ікона магла патрапіць да В. Жэляроўскага.

Па версіі, прадстаўленай у кнізе Я. Арлоўскага, абраз паходзіць з Васількава (Гарадзенскі павет, зараз Беластоцкае ваяводства ў Польшчы), адкуль трапіў у Гародню [62]. Аднак дакументальнае пацвярджэнне гэтаму не знойдзена. Такая думка магла ўзнікнуць з-за таго, што першы цуд адбыўся ў Васількаве. Там парафія была заснавана ў 1568 г. Візітацыя касцёла за 1633 г. адзначае, што ў вялікім алтары храма пад тытулам Звеставання Найсвяцейшай Панны Марыі знаходзілася каранаваная ікона Найсвяцейшай Панны Марыі [63]. Далейшы лёс яе невядомы, але гэта не значыць, што абраз быў выявай Маці Божай Студэнцкай — для алтара яна малая памерамі.

Надпіс, які быў выкрыты Уладзімірам Кіслым падчас рэстаўрацыі абраза на пачатку жніўня 2005 г., увёў у навуковы ўжытак новую інфармацыю. Яна зусім не адпавядае афіцыйнай версіі. На адваротным баку на лацінскай мове напісана: «Imago Wollowiczana Padva (Paula?) M. Studiosa» — «Абраз Валовіча Падуанскага студэнта». Першыя два словы захаваліся вельмі добра і дакладна чытаюцца. Яны змешчаны на адным радку, на другім — наступныя два словы, але не ўсе літары добра бачныя. Прыведзены варыянт чытання «Падуанскага студэнта» з’яўляецца прыкладным. Без дакладнай экспертызы надпіс цяжка расчытаць і правесці датаванне.

Надпіс дае звесткі, што абраз належаў Валовічам. Гэта даволі рэдкі выпадак, калі фіксуецца ўладальнік. Але надпіс не дазваляе дакладна вызначыць, хто з гэтага роду валодаў іконай і мог яе прывезці з Рыма. Валовічы ў XVI ст. былі праваслаўнымі. Дакументы пацвярджаюць, што яны падтрымлівалі праваслаўе разнастайнымі фундацыямі. Напрыклад, прадстаўнікі гэтага роду давалі запісы на карысць царквы ў маёнтку Балі (Гарадзенскі павет) [64]. Аднак сыны

[62] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. 1… С. 109–110.
[63] Czyżewski P. Kościół katolicki na Podlasiu. Zbiór dokumentów erekcyjnych i funduszowych. Wasilków. Białystok, 2001. S. 28–29.
[64] ЛДГА. Ф. 1177. Воп. 1. Спр. 4520, 4522; АВАК. Т. 7. Акты Гродненского гродского суда. Вильна, 1874. С. 6–10.

маршалка ВКЛ Івана Валовіча [65] Яраш [66], Яўстафій, Павел, Андрэй ужо былі католікамі [67].

Яўстафій зрабіў кар'еру як каталіцкі дзеяч, быў віленскім біскупам і дбаў аб развіцці каталіцтва [68]. Ён меў кантакты з Італіяй, таму мог прывезці абраз ці замовіць якому-небудзь мастаку. Яго брат Павел таксама можа быць уключаны ў спіс верагодных уладальнікаў абраза. З яго ліста да трокскага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла ад 24 сакавіка 1598 г. вядома, што ён знаходзіўся ў Рыме і быў на прыёме ў Папы [69]. Па лініі Паўла ён мог передавацца па спадчыне. Браты Валовічы (Яраш, Андрэй, Яўстафій) былі на службе ў Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі і выязджалі за мяжу на вучобу, у тым ліку і ў Італію, у канцы XVI ст. [70] На падставе гэтай інфармацыі можна меркаваць, што нехта з іх мог прывезці абраз на Гарадзеншчыну, з якой яны былі звязаны пасадамі і маёнткамі. На жаль, надпіс не пралівае святло, да каго і пры якіх абставінах абраз патрапіў ад Валовічаў да іншых уладальнікаў.

---

[65] Маршалак ВКЛ Іван Валовіч быў жанаты двойчы. Першай яго жонкай была Марына, дачка гарадзенскага падкаморыя Івана Фёдаравіча Мялешкі і Тамілы Сапоцькаўны. АВАК. Т. 21. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1894. С. 352–353. Пахавана Марына Мялешкаўна ў Прачысценскай царкве ў Гародні. Яе сын Яраш падараваў царкве пляцы на Падоле з умовай служыць літургіі за яе душу (1626) [НГАБ у г. Гродна. Ф. 1475. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 72–73]. Другі раз І. Валовіч ажаніўся з Ганнай Копцеўнай. Ён запісаў вена спачатку на маёнтак Мялешкаўскі, а пасля перапісаў на Балі (1571). У гэтым жа годзе І. Валовіч падараваў жонцы рухомыя рэчы [НГАБ. Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 6. Арк. 721–733]. Яўстафій, Павел і Андрэй нарадзіліся ў другім шлюбе.

[66] Яраш Валовіч пабудаваў у сваім маёнтку Залессе касцёл і зрабіў яго цэнтрам парафіі. Па просьбе сваёй жонкі Гальшкі Гаслаўскай (?–1635) і дачкі Тэклі, са згоды брата, віленскага біскупа Яўстафія Валовіча, і дазволу Жыгімонта Вазы ён перанёс свой фундуш Залескай плябаніі гарадзенскім бернардзінкам з 24 падданымі для ўтрымання свецкага ксяндза ці ксяндза-манаха (1618). Ён павінен быў адпраўляць імшу за фундатараў два разы на тыдзень, а за парафіян — кожны тыдзень і па святах. Бернардынкі павінны былі прымаць без пасагу да сябе ў кляштар тых паненак, якіх ім парэкамендуюць фундатары [ЛДГА. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 3985. Арк. 13 адв.]; Pabin A. Grodno // Klasztory bernardzińskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebrzydowska, 1985. S. 509–510.

[67] Kuty D. Etapy budowania pobernardyńskiego kościoła w Grodnie // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. / red. J. Lileyko. Lublin, 2000. S. 399; Przyałgowski W. Żywoty biskupów wileńskich. T. 2. Petersburg, 1860. S. 47.

[68] Przyałgowski W. Żywoty biskupów… T. 2. S. 72–94.

[69] Галоўны Архіў Старажытных Актаў у Варшаве. Dz. V. Sygn. 17957.

[70] Kempa T. Urzędnicy i klienci Mikołaja Krzysztafa Radziwiłła Sierotki // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia historica. T. 9. Poznań, 2003. S. 198.

Малыя памеры іконы Маці Божай Студэнцкай цалкам дазваляюць аднесці яе да прыватнага тыпу, які рабіўся не толькі для стацыянарнага карыстання ў хаце, але і для вандровак. Для касцёла абраз не прыстасаваны. Зараз прэзентабельнасць абразу надае шыкоўная рама. З канца XV ст. у Еўропе пачынаецца эра прыватных абразоў кішэннага памеру, якія сталі відавочным доказам унутранага жыцця асобы. У 1470 г. малады мастак Антаняза Рамана змаляваў абраз Санта Марыі Маджорэ для кіраўніка Песара. Ён быў афіцыйным капіістам старых іконаў. Пазней капіраванне набывае больш шырокі размах. Кожны храм меў мастакоў, якія рабілі копіі па замове. Абраз Санта Марыі Маджорэ быў другі па значнасці пасля Ларэтанскага. У 1569 г. кіраўнік езуіцкага ордэна Францыс Борджыя атрымаў дазвол у Папы капіраваць ікону для патрэб езуітаў. Адначасова адправіў яе выявы ўсім каранаваным асобам Еўропы з інструкцыяй усталяваць месцы яе культу і шанавання. Манастыр ордэна Сан Андрэа Квірынале ў Рыме павінен быў два разы на дзень праводзіць набажэнствы перад іконай [71]. З гэтага часу абраз Санта Марыі Маджорэ становіцца папулярным у Еўропе, у тым ліку і ў Вялікім княстве Літоўскім. Абраз Маці Божай Студэнцкай мог быць замоўлены ў мясцовых капіістаў кім-небудзь з Валовічаў. Варта адзначыць, што на сённяшні дзень за гэты перыяд захаваліся ў асноўным іконы, створаныя для касцёла, а прыватныя — вялікая рэдкасць.

Легенда аб паходжанні абраза з Рыма значна падымала яго аўтарытэт сярод мясцовых абразоў, чыё паходжанне было менш «значным». Напрыклад, ікона Маці Божай Жыровіцкай была знойдзена на дрэве [72], а Маці Божая Ружанастоцкая была намалявана гарадзенскім пратэстантам для дэрпцкага стольніка Шчаснага Тышкевіча [73]. Прывязка абраза да Рыма паказвала духоўную сувязь Гародні са сталіцай каталіцызму і еўрапейскімі традыцыямі. Легенда аб рымскім паходжанні выкарыстоўвалася таксама ў гісторыі іншых абразоў [74].

---

[71] Belting H. Likeness and Presence. A History of the Image before the Era of Arts / Translated by E. Jephcoft. Chicago and London, 1996. P. 409–410, 417–418, 430, 484.

[72] Nowakowski W. O cudownych obrazach… S. 788.

[73] Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku. Wilno, 1857. S. 11.

[74] З Рыму былі прывезены абразы Маці Божай Суботніцкай і Найсвяцейшай Панны Марыі Гвадэлупскай, якую скраў харужы ВКЛ Мікалай Сапега. Tołkacz J. Skarbnica łask nie przebranych Krolowey Nieba i Ziemi niepokalanie poczętey Maryey w kosciele Subotnickim residuiącey złotym kluczem otwała. Wilna, 1683; Nagielski M. Sapieha Mikołaj // PSB. T. 34/4. Zesz. 143. Warszawa; Wrocław; Kraków, 1993. S. 127; Baniulytė A. The cult of the Virgin Mary and its images in Lithuania from the Middle Ages until the seventeenth century // Acta Academiea Artum Vilnensis. 2005. № 25. P. 169. Цудатворны абраз Маці Божай менскага касцёла бернардынак быў падараваны Папай Урбанам VIII жонцы трокскага кашталяна Аляксандра Слушкі Зоф’і Зяновічаўне.

На нашу думку, імя дамініканскага правінцыяла не ўзгадвалася наўмысна, каб не было магчымасці праверыць, хто прывёз абраз. Альбрэхт Станіслаў Радзівіл быў вядомы сваёй мецэнацкай дзейнасцю. Узгадка ў тэксце пра фундацыю ім езуіцкага калегіюма была зроблена не выпадкова. Гэты рэальны факт павінен быў дадаткова пацвердзіць версію. «Збор…» рыхтаваўся да друку праз 30 год пасля падзей, абставіны якіх ужо ніхто не мог успомніць. Самы галоўны сведка — В. Жэляроўскі памёр. На такія акалічнасці, што цуды пачалі здзяйсняцца за год да смерці канцлера ВКЛ і на ўзгадку ксяндза брыгіцкага касцёла як уладальніка абраза, звычайны вернік наўрад ці зверне ўвагу. Але цалкам верагодна, што складальнікі «Збору…» так спяшаліся яго выдаць, што не прыбралі супярэчлівыя моманты.

Стварэнне легендарнага паходжання іконы — гэта даўняя традыцыя ў хрысціянстве. Нават сам прататып — абраз Санта Марыя Маджорэ — мае прыгожую легенду пра снег, якая была ўнесена ў хронікі пасля 1400 г. Яна стала повадам для штогадовых працэсій у гонар іконы, якія адбываліся ў жніўні. З XII ст. даты працэсій усталёўвала кіраўніцтва горада. Культу гэтай іконы надавалася шмат увагі, бо яна лічылася адным з партрэтаў Марыі, які намаляваў Св. Лука [75].

Зыходзячы з вышэйпрыведзеных фактаў, можна меркаваць, што легенда была створана езуітамі ў 1686 г. пры падрыхтоўцы да друку «Збору…», для тлумачэння паходжання абраза. Але існуе верагоднасць, што версію паходжання прыдумалі ў 1664 г., калі дзейнічала камісія. Такая практыка існавала ў Еўропе: пры перадачы іконы з прыватных рук у храм стваралі легенду [76]. Цалкам верагодна, што пра надпіс на адвароце езуіты маглі ведаць, але хіба Валовічаў цяжэй было звязаць з В. Жэляроўскім, хоць сярод іх была цудоўная кандыдатура — віленскі біскуп Яўстафій Валовіч.

З легенды знайшлі пацвярджэнне наступныя факты: валоданне іконай В. Кукліанскім, перадача яе В. Жэляроўскаму, а ад яго — гарадзенскім езуітам. Новыя дадзеныя сведчаць, што абразом яшчэ валодалі Валовічы, і ён знаходзіўся ў кс. Паскуцкага ў 1655 г. Аднак звязаць выяўленыя звесткі ў адзіную лагічную лінію не ўдаецца з-за адсутнасці дакументаў.

Крыніцы ўтрымліваюць цікавую ўзгадку пра існаванне яшчэ аднаго цудатворнага абраза Найсвяцейшай Панны ў Гародні. Напярэдадні

---

У іх доме ён пачаў рабіць першыя цуды. Morze łaski Bozey. Maryia Panna. Przy Obraze swym cudownym w kościele Mińskim Panien Zakonnych S. Franciszka pod tytułem Narodzenia. Wilna, 1672.

[75] Belting H. Likeness and Presence… P. 145–146, 312–315, 319.

[76] Там жа. P. 333.

вайны ён захоўваўся ў адным з уніяцкіх храмаў. Гэтая царква згарэла падчас нападу маскоўскіх войскаў на горад, і таму на часовае захаванне ён быў перададзены ў Гарадзенскі бернардзінскі касцёл гетманам ВКЛ Паўлам Янам Сапегам. Гэта было адзначана на Жыровіцкай уніяцкай кангрэгацыі 28 снежня 1661 г. На ёй таксама гаварылася аб тым, што маскоўскія войскі з найбольшай жорсткасцю дзейнічаюць супраць уніяцкіх храмаў, таму уніяты былі не супраць часовай перадачы абраза бернардзінам [77], хоць бернардзінскі касцёл і кляштар таксама пацярпелі падчас вайны [78]. Ю. Ядкоўскі меркаваў, што перад вайной абраз знаходзіўся ў царкве Св. Барыса і Глеба. Аб факце перадачы бернардзінамі абраза (арыгінала ці копіі) Каложскай царкве І. Кульчыцкі нічога не ўзгадвае. Але ў храме да Першай сусветнай вайны знаходзіўся цудатворны абраз Маці Божай з 50 вотамі XVII і XVIII стст. Пра яго пісалася ў інвентары 1738 г., што ён невялікі па памерах, чвэрць аркуша. Па легендзе быў падараваны Каложскай царкве жабраком, які насіў яго пры сабе. Храм атрымаў абраз перад яго смерцю. Гэты чалавек пажадаў, каб яго пахавалі каля царквы. Выяву абраза падае Ю. Ядкоўскі, адзначаючы, што ён быў выкананы на меднай блясе памерам 22×17,5 [79]. Па гэтых характарыстыках яго можна аднесці да прыватных абразоў. Выклікае цікавасць, што памеры абраза супадаюць з памерамі абраза Маці Божай Студэнцкай так, як і матэрыял, на якім ён выкананы. Больш таго, яго выява нагадвае тып Маці Божай Снежнай і, наколькі можна меркаваць па ілюстрацыі, выявы падобныя. Гэта наштурхоўвае на думку, што цудатворны абраз Маці Божай у Каложскай царкве мог быць копіяй Маці Божай Студэнцкай.

Акрамя паходжання абраза на сённяшні дзень застаецца шмат іншых нявысветленых пытанняў. Невядома, хто намаляваў абраз Маці Божай Студэнцкай, дзе гэта адбылося (у Італіі ці ВКЛ) і калі. Паводле меркавання рэстаўратара У. Кіслага, гэты абраз ніколі не перамалёўваўся і не мае пазнейшых слаёў. Папраўлена была толькі рука Маці Божай. Гэта рабілася праз шату. Датаванне абраза можа быць зроблена прыкладна. Марыя Каламайска-Саеед датуе яго сярэдзінай XVII ст. [80] Улічваючы дакументальныя звесткі, можна аднесці прыкладна да 30–40-х гг. гэтага

---

[77] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 12. Вильна, 1900. С. 75.

[78] Kuty D. Etapy budowania pobernardyńskiego kościoła w Grodnie // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. / red. J. Lileyko. Lublin, 2000. S. 404.

[79] Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży w świetle badań archiwalnych i archeologicznych dokonanych w 1935 r. Grodno, 1936. S. 30, 62; Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 9. Вильна, 1870. С. 411–412.

[80] Kałamajska-Saeed M. Cudowny obraz Matki Boskiej Studeńskiej… S. 521.

стагоддзя, а калі арыентавацца на побыт Валовічаў у Італіі, то да канца XVI – пачатку XVII ст.

**Воты.** Асаблівасцю ўбрання цудатворнага абраза з'яўляецца наяўнасць вотаў. Гэта разнастайныя дары, якія ахвяраваліся людзьмі за вылячэнне ад хваробаў і за спрыянне ў складаных жыццёвых сітуацыях. Ахвяраванне вотаў непасрэдна звязана з зарокам. Звычай не мае ўнармаванай рэлігійнай традыцыі, ён добраахвотны, не носіць абавязковага характару для ўсіх вернікаў і мае два рэлігійныя значэнні: першае — асоба, якая даруе, прысвячае сябе праз ахвяру, другое — бог, у чый гонар ці ў чыё імя зроблены дар. Гэтую традыцыю хрысціяне перанялі ад рымлян, якія складалі воты і такім чынам дзякавалі багам. Большасць вынайдзеных рымскіх шыльдаў канчаліся надпісам «ex voto» [81].

На тэрыторыі Беларусі гэтая з'ява набыла шырокае распаўсюджанне. Вернікі дарылі ўпрыгожванні з каштоўных металаў, залатыя і сярэбраныя шыльды з надпісамі, выявамі вылечаных частак цела, шаты і іншае. Ікона Маці Божай Студэнцкай не з'яўляецца выключэннем. Першыя воты ў яе з'явіліся падчас знаходжання ў доме В. Жэляроўскага [82]. Пасля людзі прыносілі іх у езуіцкі касцёл. На фотаздымку капліцы, змешчаным у артыкуле Ю. Ядкоўскага, і на ілюстрацыі ў кнізе А. Фрыдрыха відаць шмат вотаў вакол абраза [83].

На сённяшні дзень немагчыма вызначыць дакладную колькасць вотаў і ўсіх асоб, якія іх ахвяравалі. Дакументы ўтрымліваюць толькі фрагментарныя звесткі. «Збор…» адзначае наяўнасць вялікай колькасці шыльдаў з выявамі сярэбраных вачэй, рук, ног, зубоў, языкоў, галоў, вушэй, сэрцаў, постацей дарослых і немаўлят, квадратных шыльдачак. Апісанне выяў вотаў падаецца толькі ў некаторых выпадках. Напрыклад, жаўнер за вылячэнне параненай рукі падараваў выяву сярэбранай рукі (№ 13). А. Катовіч ахвяраваў залатыя рукі і ногі пасля выздараўлення ад падагры (№ 28). Сярэбраны язык быў атрыманы ад анямелага шляхціча, да якога вярнулася мова (№ 46). Шляхцянка Гадачэўская падаравала сярэбраную шыльду (№ 85). Два сэрцы былі атрыманы ад жонкі гарадзенскага падкаморыя і пісара ВКЛ Міхаіла Друцкага-Сакалінскага (№ 89), сярэбраная выява нагі — ад гарадзенскага маршалка Стэфана Яўстафія Александровіча (№ 90). Пры апісанні цудаў часта ўзгадваліся воты, але

[81] Niedzielski J. Ex voto // Podręczna encyklopedya kościelna. T. 11–12. E–F. Warszawa, 1907. S. 170; New Catholic Encyclopedia. Vol. XIV. Jack Heraty & Associates, Inc., Palatine, III. Reprinted in 1981. P. 754–755.

[82] НГАБ. Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 46. Арк. 543 адв.

[83] Jodkowski J. Wiadomość historyczna…; Jodkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 92; Fridrich A. Historye cudownych obrazów… T. 4. S. 95.

іх выгляд не падаваўся [84]. Усяго ў тэксце адзначана 29 выпадкаў дарэння вотаў.

Акрамя апісання ў тэксце «Збору…» дадзена тлумачэнне рэлігійнага сэнсу вотаў і спосабаў, якімі можна атрымаць падтрымку ад Бога праз ікону Маці Божай. Дзеянне абраду зароку адбывалася ў наступных фазах: зварот да цудатворнага абраза, маленне, чаканне міласці [85] і падзяка за атрыманыя ласкі. Т. Рачунайтэ вылучае наступную схему: самаахвяраванне — цуд — падзяка — ахвяра, прычым парушэнне яе структуры не падавалася магчымым [86]. Ахвяраванне сябе, свайго дзіцяці ці хворага знаёмага да іконы Маці Божай было найбольш распаўсюджаным [87]. Гэтага ж тычыліся зарок [88] і паломніцтва [89]. Чалавек павінен быў даць зарок на выздараўленне ці спрыянне ў справах.

Невыкананне ўзятага на сябе абавязку павінна было прывесці да пакарання, як гэта адбылося з Яўфіміяй Лукашэвічавай (№ 39) і Даротай Паўлавай (№ 73). Я. Лукашэвічава захварэла на язву. Каб вылечыцца, яна звярнулася да абраза. Дзякуючы гэтаму, жанчына пазбавілася ад хваробы. Аднак яна не выканала зарок, які быў дадзены Маці Божай Студэнцкай. За гэта Яўфімія была пакарана язвай у паўтара разы большай. Другое пазбаўленне яна атрымала, калі папрасіла прабачэння за парушэнне абяцання. Камісіі па апісанню цудаў жанчына паведаміла ўсе абставіны вылячэння. Дарота, яе муж і служанка захварэлі і па парадзе суседзяў звярнуліся да абраза. Яны былі вылечаны цудоўным чынам, але не наведалі абраз, як абяцалі, за што былі пакараны хваробай. Пасля выздараўлення сям'я наведала абраз [90]. Па сутнасці, праз разнастайныя прыклады людзей скіроўвалі выконваць духоўныя зарокі і праяўляць удзячнасць у выглядзе матэрыяльных каштоўнасцей.

У 1690 г. іконе Маці Божай Студэнцкай гарадзенскія шляхцянкі падаравалі наступныя воты: Крысціна Радзіваноўская за імшу за душу памерлага мужа Станіслава Радзіваноўскага — упрыгожванні, жонка Стэфана Адамовіча — пярсцёнак, пані Мастоўская і Марыяна Пікаёска, жонка Юзафа Камінскага — сярэбраныя шыльды [91]. А. Фрыдрых

---

[84] Цуды №№ 2а, 5, 6, 8, 15, 18, 19, 23, 29, 34, 38, 39, 42, 43, 45, 53–55, 59, 61, 62, 72, 73, 75, 76, 79, 81, 90б.

[85] Гэтыя тры фазы адзначаны ў Гарашкавоз В. Вотыўны жывапіс… С. 49.

[86] Račiūnaitė T. Lukiškių Šv. Jokūbo ir Pilipo bažnyčios Dievo Mirotinos… P. 228.

[87] Гэта сустракаецца ў апісанні цудаў пад №№ 1, 2, 7, 9, 10, 13, 14, 18 і інш.

[88] №№ 8, 12, 15, 16, 29, 43, 54. Зарок абіраўся асабіста чалавекам.

[89] №№ 6, 30, 49, 50, 67.

[90] Sumariusz cudow i łask… S. 39–40, 66–67.

[91] Інфармацыя аб вотах выяўлена Кацярынай Дзянісавай у НГАБ (г. Гродна). Ф. 259. Воп. 2. Спр. 2. Арк. 24 адв.

адзначыў, што старыя воты былі выкарыстаны для аздобы іконы. Аднак на падставе чаго была пададзена гэтая інфармацыя — невядома [92].

Наяўнасць шыльдаў адзначалася ў інвентарах Фарнага касцёла. Так, інвентар за 1773 г. утрымлівае кароткую інфармацыю пра 81 сярэбраную шыльду, але падрабязна не распісвае, якія на іх былі надпісы і выявы [93].

У дакументах па візітацыі касцёла за 1820 г. адзначана наяўнасць срэбраных вотаў: квадратныя шыльды — 33, чатырохгранныя — 7, у выглядзе ног — 10, у выглядзе сэрца — 7, у выглядзе рук — 5, крыжыкі — 3, абразкі — 2, медаль — 1, завушніца — 1, залатыя шыльды — 3 [94]. У XIX ст. у інвентарах таксама звярталася ўвага на воты, аднак у іх падаецца толькі колькасць шыльдаў, без падрабязнага апісання. Дакумент за 1835 г. таксама ўтрымліваў інфармацыю аб вотах. З золата былі выраблены: квадратныя шыльды — 3, крыжык — 1, абразы — 3, рама да абраза — 1; са срэбра: квадратныя шыльды — 56, шыльды ў выглядзе сэрца — 32, шыльды ў выглядзе рук і ног — 32, карона — 1, якар — 1, крыжыкі — 6, пярсцёнкі — 9, медаль — 1. Чарговы інвентар за 1899 г. меў звесткі пра воты: залатыя шыльды — 3, крыжыкі — 4, пярсцёнкі — 3, рама да абраза — 1, малыя сэрцы — 2; срэбраныя квадратныя шыльды — 80, шыльды ў выглядзе сэрца, рук, ног — 179, крыжыкі — 9, пярсцёнкі — 13, малая карона — 1; трохкутныя шыльды — 3, круглая — 1, у выглядзе зоркі — 1, з выявай страўніка — 1, малая карона, упрыгожаная перламі — 1, медалі — 2, яўрэйскі медаль — 1, масіўны медаль — 1, медаль, які раскрываецца і з крыжыкам унутры — 1, шыльда з выявай фігуры чалавека, з выявай зуба — 1, выявы — 2, крыжык з букавага дрэва — 1, шыльды з выявамі — 2, круглая шыльда з выявай — 1, шата з чыстага золата — 1 [95]. Найбольшая колькасць вотаў зафіксавана ў апошнім інвентары. Аднак у параўнанні з папярэднімі спісамі іх цяжка ідэнтыфікаваць, бо гэта маглі быць ахвяраванні як з мінулых стагоддзяў, так і зусім новыя. Пры інвентарызацыі касцёла Надзеяй Высоцкай у 1988 г. было зафіксавана 134 воты на чырвоным аксаміце вакол выявы Хрыста ў цярністым вянку [96]. Пра абраз Маці Божай Студэнцкай не ўзгадвалася, верагодна, ён быў схаваны, але такая колькасць вотаў у гэтым касцёле магла належаць толькі яму.

На сённяшні дзень правесці дакладнае статыстычнае даследаванне па вотах немагчыма. За гэты перыяд многія з іх былі згублены ці ўкрадзены.

---

[92] Fridrich A. Historye cudownych obrazów… T. 4. S. 96.

[93] НГАБ у г. Гродна. Ф. 259. Воп. 2. Спр. 71 Арк. 2 адв.

[94] ЛДГА. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 4020.

[95] НГАБ у г. Гродна. Ф. 259. Воп. 2. Спр. 18, 101.

[96] Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі. № 28 8130. Высоцкая Н. Ф. Вопіс аб’ектаў Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Фарны касцёл (езуіцкі) Францыска Ксаверыя. 09.08.1988 г.

Дакладны ўлік з апісаннем, датай даравання і звесткамі пра асобу, якая ахвяравала воту, ніколі не вёўся. Інвентары звычайна адзначалі агульную колькасць вотаў і часам кароткае апісанне. Таму сабраных звестак недастаткова для больш дэталёвага вывучэння праблемы.

**Характарыстыка крыніцы.** Па свайму жанру «Збор…» адносіцца да рэлігійнай літаратуры. Выданне збораў цудаў пачынаецца ў Вялікім княстве літоўскім у XVII ст. Гэта набыло важнае значэнне для ўсіх канфесій. Аднак далёка не кожная ікона была цудатворнай, а нават калі і здараліся пры ёй цуды, то для ўключэння ў збор патрабавалася іх значная колькасць. Друк такога твора значна ўвышаў і ўзмацняў аўтарытэт храма, дзе захоўвалася ікона, прыцягваў да яго вернікаў і, што не менш важна, іх ахвяраванні. Падобныя выданні рабілі праваслаўныя, уніяты, католікі. Напрыклад, у першай палове XVII ст. шмат увагі было прысвечана Маці Божай Жыровіцкай і яе цудам [97]. Гэты абраз шанаваўся прадстаўнікамі трох вышэйзгаданых канфесій. Былі складзены спісы цудаў, якія здзяйсняліся пры абразах Маці Божай Будслаўскай [98], Маці Божай Навагарадскай [99], Маці Божай у Старым Корніне (Падляшша) [100] і інш. Такі жанр, як збор цудаў, меў месца ў рэлігійным жыцці ВКЛ і быў актуальным для трох канфесій [101], але найбольшае распаўсюджанне набыў сярод католікаў і уніятаў [102]. Гэты від крыніцы на сённяшні дзень вывучаны слаба. Варта адзначыць, што надрукавана невялікая колькасць збораў цудаў [103], і не заўсёды яны маюць добрую навуковую апрацоўку.

---

[97] Ярашэвіч А. А. Гістарычныя ўмовы развіцця заходнепалескага іканапісу // Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. Мн., 2005. С. 55–76.; Charkiweicz W. Żyrowice — łask krynice… Słonim, 1930.

[98] Зеляевіч Э. Задыяк нябесны на зямлі. Вільня, 1650. Рэжым доступу: http://www.site.catholic.by/budslau/by/history.htm; Sanktuarium na Białorusi. Budsław. Mińsk, 1993.

[99] Nowa obrona utrapioney Oyczyznie od Boga y nieba dana w obraze nowo cydownym Bogarodzice Panny Maryey przy kosciele Nowogrodzkim. Wilna, 1673.

[100] Księga cudów przez Ikona Matki Bożej w Starym Korninie dokonanych, do druku prygotował i wstępem opatrzył Antoni Mironowicz, Białystok, 1997; Urwanowicz J. Księga cudów przed ikona Matki Bożej w Starym Korninie dokonanych, do druku prygotował i wstępem opatrzył Antoni Mironowicz, Białystok, 1997 // Białystockie Zeszyty Historyczne. T. 10. Białystok, 1998. S. 171–173.

[101] Белоруссия в печати в XVII столетии / сост. М.Василевская. Мн., 1985. С. 55–57; Белоруссия в печати в XVIII столетии / сост. М.Василевская. Мн., 1985. С. 237–243.

[102] Mironowicz A. Wstęp // Księga cudów przez Ikona Matki Bożej w Starym Korninie dokonanych, do druku prygotował i wstępem opatrzył Antoni Mironowicz, Białystok, 1997. S. VI.

[103] Зеляевіч Э. Задыяк нябесны на зямлі…; Sanktuarium na Białorusi. Budsław… S. 56–75; Księga cudów przez Ikona Matki Bożej w Starym Korninie…; Society and religion in the Grand Duchy of Lithuania: preprint of the 1754 Nieśwież edition of Pełnia Piękniey jak

«Збор…» выйшаў у свет у Вільні, у друкарні езуітаў, у снежні 1686 г. Гэты месяц найбольш верагодны, бо апошняя дата за 1686 г., якая ўзгадваецца ў тэксце, 25 лістапада, у лісце А. Катовіча на другой старонцы. Гэта быў адзін з апошніх дакументаў, які падпісаў віленскі біскуп, бо дадатак да свайго тэстаменту ён напісаў у Гародні 20 лістапада 1686 г. незадоўга да смерці [104]. А. Катовіч паходзіў з Гарадзеншчыны і не мог адмовіць у дазволе друкаваць «Збор…», тым больш, што ён прыхільна ставіўся да друку падобных кніжак [105]. Гарадзенскія езуіты спяшаліся выдаваць цуды. Напэўна таму за 1686 г. змешчана толькі 9 цудаў, прычым яны пададзены без дакладнай даты: толькі год, а ў №№ 15, 67, 89а, 90б — толькі месяц кастрычнік. У трох выпадках (№№ 15а, 90а, 90б) людзі пазначаюцца без імёнаў, а ў №№ 89 і 90 узгадваюцца толькі пасады.

Кніга невялікая па памерах (170×128) і ўтрымлівае 91 старонку, нумарацыя пачынаецца з тытульнага аркуша. На сённяшні дзень выяўлена 6 экзэмпляраў «Збору…»: адзін захоўваецца ў Кракаве, у бібліятэцы Чартарыйскіх, другі — у аддзеле старадрукаў бібліятэкі Варшаўскага універсітэта, трэці — у Вільні, у аддзеле старадрукаў бібліятэкі Літоўскай Акадэміі навук, чацвёрты і пяты — у аддзеле старадрукаў бібліятэкі Віленскага універсітэта [106], а шосты — у аддзеле рукапісаў той жа бібліятэкі. У інвентары бібліятэкі езуіцкага калегіюма за 1773 г. адзначалася наяўнасць 8 экзэмпляраў дадзенай кнігі [107], але агульная колькасць накладу невядома.

«Кракаўскі варыянт» крыніцы захаваўся нядрэнна. Ён утрымлівае ўсе старонкі і гравюру герба Агінскіх, але з 31 па 87 амаль скрозь усе старонкі прыкладна на адным месцы знаходзяцца плямы, з-за якіх не прачытваюцца некаторыя словы ці літары. Пашкоджанні ўнізе другой старонкі не закранулі тэксту. У асобніку з бібліятэкі Літоўскай Акадэміі навук захаваліся раздзелы 2–7, няма гравюры, прадмовы і першай часткі. Ён таксама мае пашкоджаныя старонкі, стан яго захавання

---

Xiężyc, łask promieniami światu przysiecaięca. Edited with introdaction by M. Siekierski. Bierkly, 1984; Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku. Wilno, 1857; Bosiacka A. Leśniańska Księga Cudów 1683–1768 // Barok. Historia–Literatura–Sztuka. 2006. XIII/1(25). S. 207–236; Лісейчыкаў Дз. В. Забабоны і цуды ва уніяцкіх парафіях Беларусі XVIII – пачатку XIX ст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн.: НГАБ, 2007. С. 188–198.

104 Аддзел рукапісаў БЛАН. Ф. 43. Спр. 26 643.

105 Fontana mistyczna z obrazu N. P. Marii od roku 1684 cudownymi łaskami w kościele Wileńskim Łukiszskim śś. Apostołów Filipa i Jakuba. Wilna, 1737. S. 11.

106 XVII a. Lietuvos lenkiškos knygos. Kontolinis sąkašas / parengė M.Ivanowič. Vilnius, 1998. P. 162.

107 Аддзел «Рэдкая кніга» Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. К / 003. Lustracja biblioteki 1773 г.

горшы за папярэдні. Немагчыма прачытаць некаторыя ўрыўкі тэксту на старонках 22, 50, 64, 71, парваныя рагі на старонках 83, 85, 87, 89, 91. З 20 па 26 старонкі адбіліся тэксты з іншых адваротных і суседніх аркушаў, таму тэкст чытаецца цяжка. Экзэмпляр з аддзела старадрукаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта захаваўся добра: чыстыя аркушы і без плямаў. Аднак ён мае істотны недахоп — вырвана гравюра з выявай герба Агінскіх. На тытульнай старонцы напісана, што верагодны аўтар — Станіслаў Станюта. Але гэтая інфармацыя памылковая.

У аддзеле старадрукаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта адзін экзэмпляр знаходзіцца ў калекцыі XVII ст. Ён добра захаваўся, толькі на першых 5 старонках плямы ад вады, утрымлівае ўсе лісты. Пяты асобнік, у аддзеле «Бібліятэка Віленскага ўніверсітэта», мае яшчэ лепшы стан. Яго аркушы чыстыя і не зашмальцаваныя, што робіць уражанне, быццам бы яго ніколі не чыталі. Але ў ім, як і ў экзэмпляры з бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта, адсутнічае гравюра з выявай герба Агінскіх.

Ва ўсіх экзэмплярах былі выяўлены аднолькавыя памылкі друку. У нумарацыі цудаў адсутнічае № 91. На старонцы 70 замест 1664 г. памылкова надрукавана 1694 г.

Выяўленне шостага варыянта было дастаткова нечаканым. Пры спробе знайсці арыгінальныя зборы цудаў у рукапісным аддзеле Віленскага ўніверсітэта быў выяўлены рукапіс XIX ст. [108] Ён быў перапісаны з друкаванага асобніка двумя асобамі. Тэкст скапіраваны вельмі акуратна, з захаваннем мовы арыгінала, у некаторых месцах сустракаюцца памылкі, тэкст не мае каментарыяў. Кніга невялікая па памерах, у цвёрдай вокладцы. На першай старонцы знаходзіцца пячатка бібліятэкі віленскай тэалагічнай семінарыі, якая была заснавана ў 1803 г. [109] У выніку можна адзначыць, што захавалася 6 экзэмпляраў кнігі, адзін з іх рукапісны, і знаходзяцца яны ў бібліятэках Літвы і Польшчы. У навуковым асяроддзі першым набыў вядомасць асобнік з Кракава, пасля 1934 г. — з Варшавы, з 1998 г. да іх дадаліся два экзэмпляры з Літвы, а ў 2006 г. аўтаркай быў выяўлены шосты.

У аздабленні кнігі найбольшую цікавасць выклікае гравюра з выявай герба Агінскіх. Яна выканана вядомым гравёрам Усходняй Еўропы Лявонціем Тарасевічам (1650?–1710?). Ён разам з братам, знакамітым гравёрам Аляксандрам Тарасевічам, працаваў у тэхніцы афорта і гравюры па медзі. Яго творы адметныя дакладнасцю малюнка, разнастайнасцю штрыхоўкі, жыццёвасцю вобразаў і цэласнасцю кампазіцыі. Л. Тарасевіч — аўтар партрэтаў, гербаў, кніжных гравюр. На яго працы моцнае ўздзеянне зрабіў пануючы ў той час стыль барока. У адрозненне

[108] Аддзел рукапісаў БВУ. Ф. 3. Спр. 2539.
[109] История Вильнюсского университета (1579–1979). Вильнюс, 1979. С. 66–67.

ад іншых гравёраў ён узбагачае гербы выявамі алегарычных фігур, дамагаючыся пры гэтым гарманічнага ўраўнаважвання кампазіцыі, яскравай дэкаратыўнасці. Вялікая колькасць свецкіх і царкоўных атрыбутаў, метафары, алегорыі і сімвалы вылучаюць яго сярод іншых тагачасных гравёраў. Таксама ў гравюрах Л. Тарасевіча заўважаецца перарастанне рэлігійнага зместу ў свецкі. Яго працы зрабілі значны ўплыў на развіццё віленскай графічнай геральдыкі [110].

Гравюра выглядае наступным чынам [111]. Уверсе размешчаны трохкутнік, унутры якога надпіс на іўрыце «Бог Ягве» [112]. Сам трохкутнік азначае Бога і яго праяўленне ў трыадзінстве Айца, Сына і Святога Духу. Вакол яго — німб з праменнямі, пад ім у цэнтры змешчаны герб Агінскіх — П-падобная падстава на выгнутых ножках з вострымі канцамі, наверсе якой якарны крыж, над тарчой — княжацкая мітра. Падставай служаць сімвалічныя мураваныя ўмацаванні. Унутры падставы змешчаны надпіс: «Wychodz księgo na swiatłosc przez Oginskich Bramę. / Tedy chodzą tryumfy aż na wiecznosc samę [113]» («Выходзь, кніга, на свет праз браму Агінскіх. / Праз яе выходзяць трыумфы аж да самай вечнасці»). Пад гербам знаходзяцца ў коле сімвалы дасканаласці і вечнасці, сімвал улады. Унутры яго біблейскае выказванне «Militia uita homonis super terram. Iob 7.» («Ці не вызначаны чалавеку час на зямлі, і дні яго ці ж не тое самае, што дні найміта?» [кн. Іова, сёмы раздзел, першы верш]).

Герб умоўна падзяляе карціну на дзве часткі: адна сімвалізуе свецкі бок жыцця Агінскіх, а другая — рэлігійны. На свецкім баку змешчаны вайсковыя сімвалы — шабля, дзіды, гетманская булава. На другім баку рэлігійныя — крыж, ружанец з крыжам, біскупская мітра (азначае блаславенне віленскіх біскупаў на друк кнігі), знак езуіцкага ордэна (цудатворная ікона знаходзілася ў езуіцкім касцёле), знак Маці Божай (кніга прысвечана цудам Маці Божай Студэнцкай). Насупраць лаўровага дрэва — кедр, а пад ім — гармата. Унізе гравюры сіметрычна сармату знаходзіцца распяцце Хрыста ў німбе святасці.

---

[110] Шматаў В. Лявонцій Тарасевіч // ЭГБ. Т. 6. Кн. 1. Мн., 2001. С. 503–504; Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI–XVIII стагоддзяў. Мн., 1984. С. 127, 129–131; Шматаў В. Ф. Гравюры Лявонція Тарасевіча // Книга, библиотечное дело и библиотеки Белоруссии. Мн., 1974. С. 270–271; Степовик Д. В. Україньска графіка XVI–XVIII століть. Еволюція образної системи. Київ, 1982. С. 70, 80.

[111] Аўтар выказвае шчырую падзяку кандыдату гістарычны навук А. Шаландзе і доктару гуманітарных навук у галіне гісторыі Ю. Макарчыку за дапамогу пры характарыстыцы выявы гравюры.

[112] Гл. аб Богу і яго імені ў кнізе «Ісход» 3:13–15.

[113] Усе надпісы пададзены паводле арыгінала.

Сімвалізм свецкай і рэлігійнай частак падкрэсліваецца надпісамі на стужках: «Laury chodzą / cedry żywią» («Лаўры прыходзяць, / кедры кормяць») і «Pożar Oginskich / zrodło pożaru» («Пажар Агінскіх / — крыніца пажару»). Першыя часткі надпісаў размешчаны на свецкім баку, а другія, пасля рыскі, — на рэлігійным. Так падкрэслена вечнасць і трываласць духоўных каштоўнасцяў. Пад пажарам Агінскіх маецца на ўвазе іх вера і рэлігійнасць, якая прывяла да пашырэння гэтага «пажару» сярод іншых людзей і да выдання гэтага твора. Унізе гравюра падпісана «Leo Tarasewicz scul» — «Леў Тарасевіч гравёр».

Як бачым, у гравюры выкарыстана барочная сімволіка. Аўтар заклаў у яе тры галоўныя ідэі: панаванне Бога, свецкі і рэлігійны бакі жыцця Агінскіх. Прычым кожная частка мае сваё абгрунтаванне. У свецкай частцы ўзгадваюцца сваякі фундатаркі, а ў рэлігійнай — падкрэслена прыналежнасць абраза да езуіцкага ордэна, знак Панны Марыі паказвае, што кніга прысвечана менавіта ёй. Надпісы акцэнтуюць увагу на выданні кнігі і непасрэднае дачыненне да гэтага Агінскіх. Свецкі і рэлігійны бакі ўраўнаважаныя і сіметрычныя, ніводны з іх не дамінуе, а разам утвараюць гармонію, якая падпарадкоўваецца Богу. Гравюра ўхваляе дзейнасць гэтага роду і ўслаўляе іх учынкі. Яе змест паказвае, што Л. Тарасевіч меў не толькі мастацкі талент, але і добры густ, валодаў сітуацыяй, разумеў сэнс падзеі і максімальна адлюстраваў гэта ў сваім творы. Дадзеная гравюра з'яўляецца асноўным мастацкім упрыгожаннем выдання.

Аздоба кнігі не вылучаецца асаблівай шыкоўнасцю. Змешчаны два ініцыялы на старонках 3 і 7, літары «s» і «z» з раслінным арнаментам. Першая змешчана на фоне арнаменту, а другая абрамавана ім. Часткі 3, 4, 5 і 7 маюць канцоўкі. Тэкст надрукаваны гатычным шрыфтам, а выразы на латыні — антыквай, што было распаўсюджанай з'явай у той час.

Кніга складаецца з ліста віленскага біскупа Аляксандра Катовіча, прадмовы з падзякай да фундатаркі, 7 частак, другога ліста А. Катовіча і зместу. Выданне фундавала дачка гетмана польнага ВКЛ і мсціслаўскага ваяводы Яна Яцака Стэфана Агінскага і Ганны Сямашкі — Алена Іяганна Агінская. Яна дала фундацыйныя запісы францысканскаму касцёлу і кляштару ў Свіслачы [114] на маёнткі Індура і Гладавічы, а пасля падаравала Гладавічы (1705–1706). У дакументах узгадваецца, што касцёл быў раней фундаваны Ф. Ісайкоўскім. Пабудовы да сённяшняга дня не захаваліся [115]. Фундатарская дзейнасць была ўласціва сям'і Агінскіх, як і іншым шляхецкім родам у ВКЛ. Але яны больш падтрымлівалі

114 Вёска знаходзіцца недалёка ад Гародні, прыкладна каля 30 км.

115 Makarchyk J. Kustodia Grodzieńska Zakonu Braci Mniejszych Konventualnych w latach 1687–1832. Lida, 2005. S. 142–144.

францысканскі ордэн. Фундацыя друку Алены Агінскай магла быць звязана з шанаваннем памяці першага мужа і яго дзядзькі смаленскага біскупа Ф. Ісайкоўскага як працяг яго фундатарскай справы.

Першая частка кнігі распавядае пра гісторыю абраза і ўрачыстае ўнясенне яго ў езуіцкі касцёл 3 жніўня 1664 г. Цуды прадстаўлены ў 2–7 раздзелах па хваробах. Другая прысвечана выратаванню ад смерці і вызваленню з палону (20 цудаў). Трэцяя апавядае пра паралюшы, кадукі, каўтуны і пухліны (9 цудаў). Вылячэнне ад падагры, астэамаляцыі, розных болек, маніяў, пературбацыяў, нематы апісана ў чацвёртай частцы (19 цудаў). У пятай сабраны цуды пра вернуты зрок, ліхаманкі, гарачкі, розныя хваробы, болі галавы, а таксама вылячэнне ног і рук (39 цудаў). У наступнай частцы больш увагі надаецца свецкім справам і розным здарэнням (8 цудаў). Апошняя частка прысвечана пакаранню няўдзячных, паценню ці плачу абраза і рэлігійнай трактоўцы выдання (3 цуды). Змест частак 2–7 пранумараваны, кожны нумар утрымлівае адзін цуд, акрамя №№ 2, 89, 90. Першыя два змяшчаюць два цуды пад адным нумарам: 2, 2а і 89 і 89а, а № 90 мае тры цуды — 90а, 90б. Пад нумарамі 1–90, 92–94 зафіксаваны цуды, пад №№ 95–99 апісана тлумачэнне пра плач іконы Маці Божай Студэнцкай, а № 100 утрымлівае інфармацыю пра набажэнства пры гэтай іконе. Спасылкі на цуды падаюцца па іх нумарах. Усяго кніга змяшчае 98 цудаў, а не 100, 102 ці 108, як гэта падаецца ў розных аўтараў [116]. Яшчэ як цуд складальнікі ўспрынялі выпадак смерці Пятра Шавана, які быў адказны за ўнясенне абраза ў касцёл, што адзначана ў першай частцы.

«Збор…» ствараўся шляхам выбару цудаў за розныя гады. У ім прадстаўлены выпадкі з 1655 па 1686 гг. Не ва ўсіх цудах пастаўлены гады, часам толькі месяц, ці адзначана, што ў той жа год. Усе выпадкі размешчаны ў храналагічным парадку, калі ў частцы некалькі відаў захворванняў, то кожнае з іх падаецца з ранейшай даты. Напрыклад, калі цуды зафіксаваны паміж 1662 і 1663 г. і не ва ўсіх пастаўлены год, то яны адносяцца да папярэдняга года, як напрыклад, у нумарах 56–60. Не зафіксаваны дакладныя даты ў цудах №№ 8, 9, 11–13, 16, 31–33, 36, 40, 46, 51, 63–65, 70, 73, 78–80, 89, 93. За вышэйадзначаны перыяд ёсць

---

[116] Nowakowski W. O cudownych obrazach… S. 190–191.; Fridrich A. Historye cudownych obrazów… S. 91–96; Гарашкавоз В. Вотыўны жывапіс Беларусі… С. 52.; Naśw. Marya Panna w obrazie kongregackim czyli rzymskim… S. 11; Ярашэвіч А. А., Бажэнава В. Дз. Гродзенскі кафедральны касцёл Святога Францыска Ксаверыя. Мн., 2005; Račiūnaitė T., Lukiškių Šv. Jokūbo ir Pilipo bažnyčios Dievo Mirotinos… P. 224. З'яўленне гэтых лічбаў даволі проста патлумачыць: 100 — колькасць пунктаў у «Збору…», 102 — колькасць цудаў, адзначаная ў 1 частцы «Збору…», а 108 — колькасць цудаў паводле надпісу на выяве на лаве, дзе намалявана ўрачыстае ўнясенне абраза. Іх узялі з розных крыніц, але ніколі не пералічвалі па кнізе.

звесткі па наступных гадах: 1655 — 5 цудаў [117], 1661 — 5 [118], 1662 — 24 [119], 1663 — 29 [120], 1664 — 20 [121], 1669 — 1 [122], 1681 — 2 [123], 1686 — 10 [124], а 2 выпадкі [125] — без даты. Усяго 98 цудаў. Адсутнічае інфармацыя за 1656–1660, 1665–1668, 1670–1680, 1682–1685 гг. З 31 года змешчаны звесткі толькі за 7 год. Найбольшая колькасць цудаў прыпадае на 1662, 1663, 1664 гг.

На падставе атрыманай інфармацыі можна прывесці агульную статыстыку па колькасці цудаў. У кнізе апісана 98 цудаў пад нумарамі і 1 цуд у першай частцы пра П. Шавана, на лаве новых цудаў змешчана 5 — усяго 104, звесткі пра іх вядомы з друку ці з выяў. Аднак у 1664 г. было зафіксавана 102 цуды, калі дадаць да іх 13 за 1669–1686 гг. (2 — без даты, але пазнейшыя за 1664 г.), 5 — з лавы, то атрымліваецца 122 цуды. Іх рэальную колькасць выявіць на сённяшні дзень немагчыма, але за сярэдзіну XVII – пачатак XVIII ст. дакладна зафіксавана 104 цуды.

Твор быў складзены непасрэдна ў Гародні, пры езуіцкім калегіюме. На гэта паказваюць апісанні асаблівасцей гарадскога жыцця, мова тэксту, самі цуды. Аўтарства на тытульнай старонцы не падпісана, аднак з кантэксту зразумела, што ўкладальнікамі часткі твора, якая адносіцца да перыяду 1655–1664 гг., былі сябры камісіі К. Вайшнаровіч і С. Катоўскі. А складальнікамі версіі 1686 г. верагодна былі прадстаўнікі Гарадзенскага езуіцкага калегіюма.

«Збор…» утрымлівае інфармацыю пра працэс складання кнігі. Першы звод цудаў быў сабраны камісіяй, прызначанай віленскім біскупам Юрыем Белазорам у 1664 г. Яна складалася з канцлера Віленскай дыяцэзіі Казіміра Вайшнаровіча і пробашча гарадзенскага кляштара Св. Брыгіты Станіслава Катоўскага. Ксяндзы пачалі працу 20 ліпеня і скончылі яе праз два тыдні, да 3 жніўня, калі абраз быў урачыста ўнесены ў езуіцкі касцёл. Пасля гэты дакумент быў перапісаны ў 2-х экзэмплярах: адзін — для Віленскай капітулы, а другі — для гарадзенскага езуіцкага касцёла [126]. Цуды запісваліся за перыяд 1655–1664 гг. па ўспамінах і са слоў сведкаў. Усяго на 1664 г. камісіяй было налічана 102

---

[117] Цуды №№ 1, 17, 18, 61, 68.
[118] Цуды №№ 23–27.
[119] Цуды №№ 2, 19, 30, 41, 45, 46, 53–59, 60, 62–65, 69, 70, 94.
[120] Цуды №№ 2а, 3, 20–22, 31–38, 42–44, 47–48, 66, 71–79, 84, 86.
[121] Цуды №№ 4–13, 29, 30, 39, 40, 50, 51, 80–83, 92, 93.
[122] Цуды №№ 28.
[123] Цуды №№ 14, 52.
[124] Цуды №№ 15, 15а, 16, 67, 85, 89, 89а, 90а, 90б, 90в.
[125] Цуды №№ 87, 88.
[126] Sumariusz cudow… S. 9–10. На сённяшні дзень рукапісныя варыянты «Збору…» не знойдзены.

цуды, з іх 83 увайшлі ў выданне 1686 г. Гэта складае 84,7% ад агульнай лічбы, астатнія 15,3% прыходзяцца на пазнейшыя гады (15 цудаў за 1669, 1681 і 1686 гг.). Такая дыспрапорцыя можа сведчыць пра занядбанне культу пасля 1664 г., нерэгулярнае фіксаванне цудаў, падбор іх складальнікамі «Збору…». Пра заняпад культу ў 80-х гг. XVII ст. сказана ў прадмове: многія цуды сталі ўжо забывацца, і кніга была патрэбна для прыцягнення ўвагі да абраза [127]. Гэта ўскоснае сведчанне ў некаторай ступені тлумачыць істотную розніцу ў лічбах.

Віленскім біскупам Аляксандрам Катовічам быў дадзены афіцыйны дазвол рабіць запісы ў грамадскую кнігу пра цуды, цытаваць яе падчас службы. Камісія, якая складалася з айца кангрэгацыі, рэктара калегіюма і сакратара, павінна была адрозніваць цуды ад прыродных з'яў (1686) [128]. Пра занатоўванне цудаў у кнігі адзначана ў №№ 15, 51, 66, 94. Людзі прыходзілі ў касцёл, каб засведчыць пра цуд пад прысягай, якая складалася з клятвы перад іконай аб праўдзівасці сваіх слоў. Асабліва актуальнай яна была, калі цуд даўно меў месца [129]. Тэкст прысягі ўтрымлівае збор цудаў, прысвечаны іконе Маці Божай у касцёле Св. Мікалая ў Вільні [130]. Яго змест мог быць падобны на той, што казалі пры выяве Маці Божай Студэнцкай.

У выніку можна адзначыць, што існавала тры рукапісы: спіс цудаў за 1655–1664 гг. (у 2-х экзэмплярах), за 1664–1686 гг., а таксама трэці спіс ад 1686 г., дзе павінны былі занатаваць цуды з лавы, і іншыя. Калі цуды працягвалі запісваць у XVIII і XIX стст., то іх магло быць і болей. Аб існаванні шматлікіх рукапісных тамоў, з якіх былі адабраны цуды, ёсць згадкі ў «Зборы…» [131]. На сённяшні дзень арыгінальныя спісы не выяўлены, але ёсць верагоднасць, што яны захаваліся. У дакументах па візітацыі касцёла ў 1820 г. адзначалася, што пры касцёле не было бібліятэкі, а захоўваліся толькі метрычныя кнігі [132]. Значыць, на гэты час рукапісаў у Гародні ўжо не было. Хутчэй за ўсё, яны трапілі ў Вільню пасля ліквідацыі езуіцкага ордэна. Надрукаваны тэкст з'яўляецца

---

[127] Sumariusz cudow… S. 3–4.

[128] Там жа. S. 89–90.

[129] Аб прысязе згадана ў №№ 2, 3, 6–12, 16, 22, 32, 33, 37, 40, 44, 50–52, 60, 66, 67, 72–75, 77, 80–83, 85. Усе нумары, акрамя 67 і 85, за перыяд 1661–1664 гг.

[130] «Ja N Przysięnam Panu Bogu Wszechmogącemu w Troycy Swiętey iedynemu na tym jakom prawdziwie doznał osobliwey łaski Bożey przy tym Obrazie Naswiętszey Panny cudownym. Tak mi Panie Boże dopomoż y ta twoia swięta męka». Skarbnica niebeska… Przy obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie… Прысяга таксама змешчана ў кнізе цудаў, прысвечанай абразу Маці Божай Ляснянскай. Bosiacka A. Leśniańska Księga Cudów 1683–1768… S. 214.

[131] Sumariusz cudow… S. 87.

[132] ЛДГА. Ф. 694. Воп.1. Спр.4020. Арк. 13 адв.

зборным дакументам, які паўстаў на аснове некалькіх спісаў, аб чым сведчыць тэматычны падбор цудаў і змест крыніцы.

**Гісторыя краіны і Гародні ў «Зборы...»** Дадзены твор быў складзены ў другой палове XVII ст. Гэта даволі складаны і цяжкі час у гісторыі ўсёй краіны і горада. Першыя цуды прыпадаюць на вайну паміж Вялікім княствам Літоўскім і Масковіяй 1654–1667 гг. Падчас гэтай трагічнай падзеі была знішчана вялікая колькасць беларускага насельніцтва і зруйнавана каля паловы тэрыторыі ВКЛ, а Гародня страціла 46,4% жыхароў. У верасні 1655 г. Гародню захапілі войскі маскоўскага ваяводы Якава Чаркаскага і казацкага палкоўніка Івана Залатарэнкі. 9 сакавіка 1659 г. горад зноў перайшоў да войскаў ВКЛ, а ў снежні яго захапіў ваявода Іван Хаванскі. Канчатковае вызваленне прыйшло ў 1661 г. Наступствам вайны былі пажары, голад, эпідэміі, забойствы жыхароў, вываз рамеснікаў, руйнаванне дамоў, касцёлаў, цэркваў [133].

Гэтая гістарычная сітуацыя адлюстравалася ў дадзенай крыніцы. Пад нумарамі 1, 17, 18, 34, 66, 68, 93 апісаны цуды, звязаныя з гэтай вайной. Першае вылячэнне адбылося падчас вайны ў 1655 г. (№ 1). Пры спрыянні К. Вадынскай гарадзенскія брыгіткі выехалі ў Гданьск [134], таму ў цудах адлюстраваліся некаторыя населеныя пункты, праз якія яны праязджалі. У жніўні 1655 г. войскі падышлі да горада. Прыкладна ў гэты ж час манашкі пакідалі яго. Яны былі ў Васількаве, дзе адбыўся першы цуд (№ 1). Ксёндз Паскуцкі ездзіў у Сакольскую плябанію (№ 68). У снежні брыгіткі, а разам з імі і абраз, знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы. Жонка Станіслава Гадомскага, які валодаў маёнткам Загасцінец (Цеханавецкая зямля, Польшча), Ганна Рыбкоўская прасіла ксяндза Паскуцкага справіць імшу перад абразам за вызваленне мужа з маскоўскага палону (№ 17).

Са «Збору…» вядома, што пасля захопу горада шляхта трапіла ў палон. Яе трымалі ў Старым замку і збіраліся пакараць смерцю. Цудам зняволеныя вырваліся з палону (№ 17). На падставе цудаў №№ 34, 66 вядома, што ў наваколлі ў 1663 г. панавала маравая пошасць. У гэтым жа годзе ў ваколіцах Гародні каля Верцялішак стаяла жамойцкае войска (№ 93). Гэта пацвярджае і дзённік Я. Храпавіцкага [135].

---

[133] Ткачоў М. А. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай // ЭГБ. Т. 2. Мн., 1994. С. 189–200; Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. Мн., 1995; Данскіх С. Гродна ў гады руска-польскай вайны // Памяць. Гродна. Мн., 1999. С. 82–84; Gordziejew J. Socjotopografia Grodna… S. 42–44, 47–48; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna… S. 31–32.

[134] Borkowska M. Miscellanea Brygitańskie: Grodno // Nasza Przeszłość. T. 85. Kraków, 1996. S. 148–149.

[135] Chrapowicki J. A. Diariusz. Cz. 1: 1656–1664 / Oprac. T. Wasilewski. Warszawa, 1978. S. 414.

Падзеі перыяду вайны 1654–1667 гг. таксама змешчаны і ў іншых зборах цудаў. Кніга, прысвечаная цудам навагарадскай іконы Маці Божай, таксама мае ўзгадкі аб выратаванні ад маскоўскіх войскаў Дэмблеўскага (1662) і Мікалая Гадлеўскага (1665). Пра Дэмблеўскага яшчэ апавядаецца, што ён у сваёй хаце хаваў ад маскоўскіх войскаў рэчы з касцёла і ікону (1655). Ён хацеў закапаць яе ў зямлю, але абраз адтуль выходзіў. Тады ён паставіў яго ў асобную камору, і падчас небяспекі яго дом ацалеў [136]. Маці Божая Ружанастоцкая таксама дапамагала вернікам [137]. Як бачым, да цудатворных абразоў звярталіся не толькі ў Гародні, але і ў іншых мясцовасцях. У ваенных умовах яны часам бачылі толькі адну надзею — абарону Маці Божай ад ворага.

Важнай падзеяй для каталіцкага духавенства горада і для гараджан стала ўрачыстае ўнясенне абраза Маці Божай Студэнцкай 3 жніўня 1664 г. Яшчэ ў сакавіку ён быў перададзены езуітам у прысутнасці кангрэгацкага сенату і гарадзенскіх райцаў (Г. Паўльсен, А. Дрогаш). Правядзенне ўрачыстай цырымоніі фінансавалася К. Вадынскай. У ёй прынялі ўдзел шмат людзей: мясцовае духавенства, райцы, гарадскія цэхі, студэнты, шляхта, гараджане. Уся грамада рушыла ад Азёрскага прадмесця да касцёла. Урачыстасць суправаджалася малітвамі, песнямі, казаннямі і скончылася выбухам гарматы [138]. Гародню, як і іншыя гарады ВКЛ, вызвалілі ад падаткаў на 4 гады па пастанове сойма 1661 г. [139] Горад быў вялікакняскай і каралеўскай рэзідэнцыяй і меў важнае палітычнае і стратэгічнае значэнне. Тут адбываліся розныя палітычныя падзеі: сесіі Скарбовага Трыбунала, смаленскія соймікі і іншыя. У 1673 г. была прынята пастанова аб правядзенні ў Гародні кожнага трэцяга сойма Рэчы Паспалітай. За другую палову XVII ст. тут адбылося тры соймы 1678–1679, 1688, 1693 гг. [140] Ведаючы аб гэтых падзеях, складальнікі «Збору…» назвалі Гародню каралеўскім і соймавым местам [141]. Актыўнае ўключэнне горада ў палітычнае жыццё краіны спрыяла будаўніцтву магнацкіх і шляхецкіх камяніцаў [142], а таксама наведванню горада ўраднікамі і саноўнікамі розных узроўняў, што адлюстравалася ў «Зборы…».

---

[136] Nowa obrona utrapioney…

[137] Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku… S. 19, 38, 43–44.

[138] Sumariusz cudow… S. 7–12.

[139] Volumina Legum. T. 4. Petersburg, 1856. S. 385–386.

[140] Dubas-Urwanowicz E. Grodno do XVIII wieku. Miasto i lidność // Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność. Białystok, 1997. S. 17; Gordziejew J. Socjotopografia Grodna… S. 43.

[141] Sumariusz cudow… S. 8, 42.

[142] Чантурыя Ю. Гарады і час // Страчаная спадчына. Мн., 1998. С. 319.

З іншых гарадскіх падзей былі адзначаны пажар 1672 г. і будаўніцтва аптэкі пры езуіцкім кляштары ў 1686 г. [143] Разумеючы, якія перавагі дае ордэну наяўнасць у яго касцёле цудатворнага абраза, яны змаглі перакanаць В. Жэляроўскага падарыць ім яго, а пасля звярнуліся да віленскага біскупа Юрыя Белазора з просьбай прызначыць камісію для спісання цудаў. Да 1686 г. апісанні цудаў існавалі ў рукапісах. Віленскі біскуп Аляксандр Катовіч даў дазвол на іх друк. Гэтая кніга прадставіла рэлігійную думку гарадзенскіх езуітаў адносна цудаў і цудатворнага абраза, іх спробу патлумачыць плач абраза, розныя выпадкі з вылячэннем, пакараннем людзей і іншае. Аднак пры гэтым езуіты пакінулі апісанні эмоцый, чалавечых перажыванняў, тагачасную гаворку, што вылучае кнігу сярод астатніх збораў цудаў, дзе часта ўтрымліваецца толькі сухая інфармацыя пра цуд.

«Збор…» адлюстраваў культурную і рэлігійную сітуацыю, якая склалася ў горадзе пасля вайны 1654–1667 гг. Яе актыўна падтрымлівала шляхта, якая пераехала з Польшчы, а таксама мясцовая шляхта, якая ў канцы XVI – пач. XVII ст. змяніла веравызнанне і перайшла з праваслаўя ў каталіцызм. Першыя касцёлы былі заснаваны па ініцыятыве вялікіх князёў літоўскіх, а пасля дзейнасць каталіцтва падтрымала шляхта [144]. У першай палове XVII ст. усё кардынальна змянілася. У горадзе з’явіліся езуіты, брыгіткі, бернардынкі, дамінікане, кармеліты, францыскане, што наклала адбітак на архітэктурны, культурны і рэлігійны воблік горада. Адразу пасля вызвалення Гародні ад маскоўскага войска каталіцкае духавенства аднавіла сваю дзейнасць, з 1661–1662 гг. дзейнічалі брыгіткі, бернардыны, францыскане [145]. Шляхта ў першую чаргу давала грошы на аднаўленне каталіцкіх храмаў і кляштароў. Большасць з іх была адрамантавана, а уніяцкія цэрквы доўгі час стаялі ў запусценні ці не аднавіліся ўвогуле. Такім чынам, у XVII ст. адбылася змена культурных каштоўнасцяў і прыярытэтаў. Панаваць сталі эліты каталіцкага веравызнання, якія актыўна ўносілі ў гарадское жыццё заходнееўрапейскую культуру. Пры гэтым езуіцкі ордэн заняў дамінуючыя пазіцыі, як і ў іншых мясцовасцях ВКЛ.

У дадзенай крыніцы апісваюцца падзеі не толькі з рэлігійнага жыцця Гародні ў другой палове XVII ст., але і гістарычныя падзеі ў краіне, рэгіёне, горадзе. Твор закрануў ваенную гісторыю, пасляваеннае аднаўленне, палітычныя падзеі і іншае. Але яны прадстаўлены не як асноўныя падзеі, а як фон, на якім здараліся цуды. Тым не менш многія

---

[143] Sumariusz cudow… S. 64, 74.

[144] Topolska B. Społeczeństwo i kultura w Wielkim Księstwie Litewskim od XV do XVIII wieku. Poznań; Zielona Góra, 2002. S. 56–57, 66.

[145] Chrapowicki J. A. Diariusz. Cz. 1: 1656–1664… S. 310, 339, 357.

апісаныя падзеі мелі месца і пацвярджаюцца іншымі крыніцамі. Гэта даказвае, што «Збор…» ствараўся менавіта ў гэты час, і цуды здзяйсняліся ў дадзеным гістарычным кантэксце.

**Разуменне цуду ў каталіцкай рэлігіі і ў «Зборы…»** XVII ст. — гэта супярэчлівы перыяд у развіцці еўрапейскай філасофскай думкі: з аднаго боку імкліва развіваецца рацыяналізм [146], а з другога — каталіцкая царква замацоўвае свае пазіцыі і падчас контррэфармацыйнага руху. Адпаведна феномен цуду ў рэлігійным тлумачэнні дасягае сваёй абсалютызацыі [147]. Культ Панны Марыі набывае надзвычайную папулярнасць і распаўсюджваецца па ўсёй Еўропе [148] і ў ВКЛ [149]. Гэта праявілася ў перавазе іканаграфічных выяў Маці Божай у параўнанні з астатнімі [150], а таксама ў з’яўленні твораў, прысвечаных Маці Божай [151]. Таму ўзнікненне культу абраза Маці Божай Студэнцкай цалкам адпавядала агульнай тагачаснай тэндэнцыі.

Цуд з’яўляецца істотным элементам ва ўсіх рэлігіях, але для кожнай з іх ён мае сваё значэнне [152]. Для каталіцызму цуд — гэта звышнатуральная з’ява, якая трактуецца як праява надпрыроднай моцы ці як Божы знак [153]. Спачатку тэолагі прытрымліваліся тэзіса, прапанаванага Св. Тамашам Аквінскім, што цуд падуладны толькі Богу. Пазней распаўсюдзіўся погляд, які быў прыняты Бенедыктам XIV, што цуд павінен быць вышэй за цялеснае існаванне. Цуд здзяйсняўся праз дух, які дзейнічаў ад Бога. Афіцыйная каталіцкая дактрына сведчыла аб наступным: паводле волі

---

[146] Праявы рацыяналізму ўтрымліваюцца нават у «Зборы…» (№ 93), дзе незнаёмец, аргументуючы супраць цудаў, казаў, што людзі на хваробы маюць медыкаў і медыцыну, на голад — хлеб, і на тэрмін жыцця — смерць.

[147] Rusecki M. Wierzcie moim dziełom. Funkcja motywacyjna cudu w teologii XX w. Katowice, 1998. S. 23–25.

[148] Laurentin R. Matka Pana. Krótki traktat teologii marijnej. Warszawa, 1989. S. 124–125.

[149] Baniulytė A. The cult of the Virgin Mary… P. 157–192.

[150] Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П., Шматаў В. Ф. Распаўсюджанне іканаграфічных сюжэтаў і мастацкія асаблівасці іканапісу Заходняга Палесся // Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. Мн., 2005. С. 318–322.

[151] Radziwill A. S. Dyskurs nabożny z kilki słow wzięty o wystawieniu Naświętszey Panny Bogorodzicy Maryey. Krakow, 1650; Czernicki A. Porta Seu Asylum. Vilnae, 1670. Drews J. Methodus peregrinationis Menstruae Marianae: ad Imagines Dei parae Virg. Per Ditiones Regni Poloniae & M. Ducatus Lithuaniae miraculis celebriores pro publicis privatisque necessitatibus sine fatigatione, fructuose tamen, instituendae. Vilnae, 1684.; Zdanowski K. Loret albo Domek N. P. Maryi. Krakow, 1687.

[152] Rusecki M. Problem cudu w religiach pozachrześcijańskich. Lublin, 2001.

[153] Religia Encykłopedia. T. 3. Warszawa, 2001. S. 62; New Catholic Encyclopedia. Vol. IX… P. 891.

Бога Святы Дух дапамагае і даказвае наяўнасць Бога праз Божыя справы, цуды і прадбачанні [154]. Найбольшую ўвагу тэолагаў прыцягнулі цуды Ісуса Хрыста, апісаныя ў Новым Запавеце [155].

Тлумачэнне цуду мае некалькі варыянтаў. Ён разумеецца як знак прысутнасці Бога. Гэта паняцце звязана з разуменнем цуду як сімвала, які мае сэнс і накіраваны на пэўнага адрасата, а таксама пацвярджае рэальнасць існавання Бога. Цуд таксама разглядаецца як дыялог паміж чалавекам і Богам, які адбываецца праз веру. Акрамя гэтага цуд паказвае сэнс чалавечага жыцця і смерці, прызначэнне чалавека, вырашае яго лёс. Вера ў цуд заснавана на ірацыянальнасці, бо яго можна ўспрымаць не розумам, а сэрцам і пачуццямі. Дзякуючы гэтаму, ён адыгрывае важную матывацыйную функцыю і з'яўляецца адным з самых моцных элементаў у рэлігіі, які прыводзіць да веры, прыцягвае ўвагу ўжо заангажаваных вернікаў і значна ўзмацняе іх веру [156].

Кожная эпоха прыносіла сваё разуменне і бачанне цуду. Развіццё навукі і тэхнікі зменшыла колькасць цудаў: многія з'явы атрымалі навуковае тлумачэнне. У XIX і XX стст. пад уплывам рацыяналізму многія цуды былі пераасэнсаваны. Напрыклад, вядомы гісторык Іяхім Лялевель (1786–1861) адмаўляў існаванне надпрыродных, звышнатуральных з'яў, у тым ліку і цудаў [157]. На сённяшні дзень стаўленні да цуду розныя, а часам процілеглыя: 1) адмаўленне існавання цуду; 2) дапушчэнне цуду як паранармальнай з'явы; 3) трактаванне цуду як існуючай з'явы; 4) цалкам прызнанне рэальнасці цуду [158].

У «Зборы…» таксама ёсць спробы патлумачыць цуды праз дыялог з вернікамі, іх лёсавызначэнне і знак. Цуд як дыялог з Богам і Маці Божай прадстаўлены ў 15 выпадках [159], дзе цытуюцца словы просьбітаў. Яны размаўляюць з Богам і Маці Божай, просяць вылячыць ад хвароб, і тыя адказваюць ім праз сваё спрыянне і пазбаўленне ад пакутаў. Такім чынам, чалавек можа ўступіць у кантакт з вышэйшымі сіламі і атрымаць ад іх адказ. Прычым гэты сродак адносінаў даступны абсалютна ўсім — галоўнае, каб былі вера і давер да падзей, якія адбываюцца.

Маці Божая як лёсавызначальніца жыцця і смерці выступае ў №№ 2а, 11, 25, 32, 58. Да яе людзі звярталіся з просьбай пазбавіць ад пакут праз

---

[154] New Catholic Encyclopedia. Vol. IX… P. 891.

[155] Rusecki M. Wierzcie moim dziełom. Funkcja motywacyjna cudu w teologii XX w. Katowice, 1998. S. 97–137.

[156] Там жа. S. 49, 65, 69, 235, 242, 246, 252.

[157] Cygler B. Poglądy Joachima Lelewela na genezę i rolę religii // Joachim Lelewel człowiek i dzieło w 200-lecie urodzin. Materiały z ogólnopolskiej sesji naukowej, żagań 12–14.IX.1986. Pod red. K.Bartkiewicza. Zielona Góra, 1988. S. 180–181.

[158] Religia Encykłopedia. T. 3. Warszawa, 2001. S. 63.

[159] Гл. цуды №№ 21, 22, 24, 28, 29, 38, 42, 44, 46, 50, 56, 58, 59, 70 ,74.

смерць ці вылячэнне. Прасілі за сваіх дзяцей і аддавалі іх лёс на разгляд Маці Божай Б. Ельяшова, Е. Маліноўская, Д. Пастэўчанка. Найбольшай красамоўнасцю вылучаецца зварот да Найсвяцейшай Панны з разважаннем пра жыццё і смерць жонкі гарадзенскага бурмістра З. Шульцаўны [160].

Знак ад Маці Божай людзі атрымлівалі ў рэчаіснасці і ў сне. Дзеля страху людзей перад Богам і адказнасці за свае абяцанні прыводзіліся прыклады пакарання за невыкананне зарокаў (№№ 39, 73). Людзі былі вылечаны ад хваробаў, але не аддзякавалі за гэта, таму пакуты вярнуліся да іх зноў. Самы яскравы прыклад пакарання ад Маці Божай — у № 92, калі нямецкі жаўнер абразіў яе і быў у той жа момант пакараны катаннем па зямлі. Лёгкае дакаранне за сумненне ў веры і цуды Маці Божай атрымалі жонка Ефрасіння Рабееўна і дачка (імя невядома) Крыштафа Сапоцькі (№ 93). Яны вырашылі паехаць паглядзець цудатворную ікону. Ім сустрэўся чалавек, які рацыянальна ставіўся да жыцця. Ён быў упэўнены, што няма неабходнасці ў цудах, бо на ўсё ёсць тлумачэнне. Пасля такіх аргументаў Сапоцькі вярнуліся да хаты, а ноччу абедзве бачылі здань, якая ім раіла з пакорай ізноў паехаць да абраза. Дарэчы ў дадзеным выпадку кантакт з вышэйшымі сіламі ішоў не праз малітву і зварот, а ў сне. Такім жа чынам атрымала параду ісці лячыцца ад язвы да абраза ў Кульбаках жонка Яна Гедройца (№ 30). З'яўленне ў сне Маці Божай стала для віленскага ваяводы К. Сапегі знакам падараваць залатую шату іконе замест скрадзенай сярэбранай (1696). У зборы цудаў, прысвечаным Маці Божай Будслаўскай, таксама ёсць выпадак звязаны са сном, калі шляхцянцы, жонцы Аляксандра Вайсовіча, Палоніі Ягальскай з'явілася ў сне Найсвяцейшая Панна са словамі: «Чаму ж не прыйдзеш да майго абраза ў Будзе? Там будзеш аздароўленая» (1634) [161]. Выява Маці Божай, што знаходзілася ў касцёле Св. Міхаіла ў Вільні, з'явілася да святара касцёла і накіравала яго да абраза (1667) [162]. Паводле тагачаснага тэалагічнага разумення дачыненні з Богам і Маці Божай маглі здзяйсняцца ў чалавека ў рэальным жыцці і ў сне. Сон разумеўся як знак, які паказваў, што рабіць чалавеку ў пэўнай сітуацыі. Таму гэта ўспрымалася як рэальная інфармацыя, якую нельга ігнараваць і якой трэба кіравацца.

«Збор…» прадстаўляе сваё разуменне цуду. Самым масавым цудам з'яўлялася вылячэнне ад хваробаў (90 цудаў з 98 — 82,2%). Змест кнігі пабудаваны менавіта па прынцыпу хваробаў. Хоць у той час зборы цудаў складаліся па храналагічнаму прынцыпу [163], пазней тэматычна

---

[160] Sumariusz cudow… S. 58–59.

[161] Sanktuarium na Białorusi. Budsław. Mińsk, 1993. S. 58.

[162] Skarbnica niebeska… Przy obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie…

[163] Зеляевіч Э. Задыяк нябесны на зямлі…; Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku. Wilno, 1857; Nowa obrona utrapioney…; Skarbnica niebeska… Przy

былі прадстаўлены цуды, што адбываліся пры іконе Маці Божай у касцёле Св. Філіпа і Якуба ў Вільні на Лукішках [164]. «Збор…» можна выкарыстоўваць як тагачасную медыцынскую энцыклапедыю: шукаць сваю хваробу і лячыцца. Акцэнт на гэта быў зроблены невыпадкова, бо хвароба кранае асабіста кожнага і яго асяроддзе. Аздараўленне людзей займала асноўнае месца і ў іншых зборах цудаў. Літоўскі даследчык Міндагас Пакныз прааналізаваў змест рукапісных і друкаваных твораў, прысвечаных цудатворным абразам у Троках, Будславе, Навагарадку, Астроўне, Вільне і Коўне за перыяд 1603–1675 гг. і вызначыў, што агульны працэнт вылячэння людзей у іх склаў 70% [165]. У зборы цудаў, што прысвечаны абразу Маці Божай Лясніцкай, 61% цудаў — гэта выздараўленне ад розных хвароб [166].

Акрамя хвароб у крыніцы да цудоўных з'яў аднеслі выратаванне з маскоўскага палону (№№ 17, 18), спрыянне ў судовых справах (№ 86), выратаванне горада ад пажару (№ 87), гарэнне каменя лою цэлы год (№ 88), пакаранне ад Маці Божай (№№ 92, 93). Як цудоўны знак патлумачылі ў першай частцы смерць П. Шавана пасля ўрачыстага ўнясення іконы, таму што ён зрабіў шмат намаганняў для гэтай цырымоніі. З гэтага пераліку бачна, што да цуду адносілі ўсё, дзе было спрыянне Маці Божай, нават калі гэта была звычайная свецкая справа ці прыродная з'ява.

Даволі важным знакам лічылася паценне ці плач іконы, як гэта здарылася ў 1662 г. (№№ 94–99), калі перад абразом малілася аб сваім цяжкім лёсе шляхцянка Тэкля Зеляноўская. Гэты факт патлумачылі па-рознаму як каштоўныя перлы і як міласэрнасць Маці Божай да просьбіткі. Яму было дадзена больш за ўсё ўвагі, бо такая з'ява адбываецца далёка не з кожнай іконай [167].

Праз усе апісанні цудаў праходзіць агульная думка, што дзеля атрымання падтрымкі ад Найсвяцейшай Панны неабходна шчырая і абсалютная вера ў яе магутнасць. На думку тагачасных тэолагаў, Маці Божая выказвае свае ласкі незалежна ад сацыяльнага становішча. Галоўнае, каб людзі цалкам давяралі і верылі ёй, былі шчырымі ў сваіх просьбах. Таму сярод прыкладаў можна сустрэць прадстаўнікоў усіх саслоўяў:

---

obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie…;Tołkacz J. Skarbnica łask nie przebranych Krolowey Nieba i Ziemi niepokalanie poczętey Maryey w kosciele Subotnickim…

[164] Fontana mistyczna z obrazu N. P. Marii od roku 1684 cudownymi łaskami w kościele Wileńskim Łukiszskim śś. Apostołow Filipa i Jakuba. Wilna, 1737.

[165] Paknys M. Kasdienybės istorija XVII a. LDK… P. 88–90.

[166] Bosiacka A. Leśniańska Księga Cudów 1683–1768… S. 210.

[167] Такі самы цуд быў пры іконе Маці Божай Ляснянскай, паценне адбывалася даволі доўгі час. Там жа. С. 212.

духавенства, шляхты, гараджан, сялян з навакольных вёсак. Прычым у тэксце праводзіцца думка, што кожны сацыяльны стан павінен аддзякаваць у адпаведнасці са сваім статусам. Духавенства абавязкова адпраўляла імшу, чытала малітвы. Ад шляхты і мяшчан чакалі шыкоўных вотаў, а ад сялян дастаткова было прысутнасці на набажэнстве. «Вясковая палітыка» Маці Божай тлумачылася ў выпадку вылячэння сына Яна Рапейкі з Русоты (№ 41). Яго жонка проста прынесла дзіця да іконы, і яно выздаравела. Тут не прыведзены яе зварот да Маці Божай, але адзначана, што чым чытаць пацеры, лепш шчыра даверыцца божаму наканаванню, як зрабіла сялянка. Факт вылячэння Яна Вазніцы, служкі брыгіцкага кляштара, суправаджаўся каментарыем, што Найсвяцейшая Панна заўсёды мае час для аўдыенцыі для бедных (№ 57). Гэтым паказвалася, што Панна Марыя турбавалася за ўсіх і для яе не было розніцы, хто прасіў дапамогі: шляхціч ці селянін. Усе мелі роўныя магчымасці атрымаць міласэрнасць Маці Божай. Пры гэтым варта адзначыць, што большую вагу і значэнне мелі цуды, якія адбыліся са шляхтай.

Асобна трэба звярнуць увагу на змест і сэнсавае значэнне самога цудатворнага абраза. У рэлігійным разуменні ікона не толькі характарызуе святога, але і матэрыяльна даказвае факт, што ён святы. Цуды пры выяве неабходны як пацвярджэнне яго святасці. Абраз Маці Божай падкрэслівае падвоеную сутнасць Дзіцяці, бо Марыя не магла даць жыццё звычайнаму дзіцяці. Цудатворны абраз часам выступае супраць царкоўных пастулатаў, бо ён не мае дакладна вызначанага месца ў царкоўнай іерархіі і дае магчымасць размаўляць з Богам і святымі без царкоўных службаў [168]. Такія факты мы знаходзім у «Зборы…». Для вернікаў абраз уяўляў сабой пасрэдніка, праз якога яны звярталіся да Маці Божай. Да яе ставіліся не толькі як да Маці Ісуса, але і як да Маці ўсіх людзей, у тым ліку і кожнага, хто да яе звяртаецца. Архетып маці самы старажытны і з’яўляецца аўтарытэтам усяго жаночага — гэта мудрасць і інстынкт, гэта тое, што дае прытулак, жыццё, месца пераасэнсавання і адраджэння [169]. Вобраз Маці Божай увабраў у сябе гэтыя старажытныя чалавечыя пачуцці і таму ён стаў блізкі, зразумелы для кожнага верніка, які шукаў пры ім паратунак.

Адпаведнае тлумачэнне паняццю «цудатворны абраз» мы не знойдзем у тэолагаў [170]. Таксама разнастайныя каталіцкія энцыклапедыі не даюць азначэнне гэтага тэрміна і таму не ўтрымліваюць крытэрыі, паводле якіх той ці іншы абраз можа быць аднесены да ліку цудатворных. Абразы

---

[168] Belting H. Likeness and Presence… P. 284–285, 382.

[169] Юнг К. Г. Психологические аспекты архетипа матери. Рэжым доступу: http://psycho.dtn.ru/txt/jung/j014.htm

[170] Belting H. Likeness and Presence… P. 6.

мелі важнае значэнне для каталіцкай рэлігіі ў Беларусі. Іх шанавалі і захоўвалі, у перыяд небяспекі хавалі ад ворага, бо ведалі, што іх чакае знішчэнне. Тагачасны рэлігійны дзеяч Фабіян Біркоўскі адзначаў, што абраз ярка і зразумела даносіць рэлігійныя ідэі да чалавека і робіць гэта лепш, чым кніга ці слова святара (1629) [171].

На падставе разнастайных збораў цудаў XVII ст., якія былі надрукаваны на тэрыторыі ВКЛ, была зроблена «класіфікацыя» цудаў, якія ўводзілі абраз у лік цудатворных. Па сабраных матэрыялах [172] можна сцвярджаць, што існавалі пэўныя «абавязковыя» цуды. Абраз павінен быў ажыўляць памерлых, лячыць хворых, абараняць у небяспецы, караць няўдзячных і блюзнераў.

Самым важным цудам лічылася ажыўленне памерлых. Гэты цуд здзейсніў Хрыстос, а пасля яго гэта рабілі многія святыя. Абраз як выява святога таксама павінен быў ажыўляць. У розных зборах цудаў гэтаму надаецца шмат увагі, і такія выпадкі апісваюцца даволі падрабязна. Памерлы вяртаўся да жыцця дзякуючы шчырым малітвам бацькоў, сваякоў ці сяброў. Так здаралася пры абразах Маці Божай Жыровіцкай, Маці Божай Будслаўскай, Маці Божай Ружанастоцкай і іншых [173]. Па сутнасці, гэта быў самы галоўны цуд, які мог здзейсніць абраз, што адразу вылучала яго сярод іншых. Не без падстаў, першы цуд Маці Божай Студэнцкай — гэта пазбаўленне ад смерці стальмаха з Васількава.

**Лячэнне розных хвароб.** Лячэнне розных хвароб у тым ліку і смяротных, было самае запатрабаванае цуда. Вагу цудатворнаму абразу надавала вылячэнне такіх сур’ёзных захворванняў, як паралюш, чума, слепата і інш. Лепш любога ўрача Маці Божая пазбаўляла ад пакутаў. Тагачасная медыцына не магла паспяхова лячыць многія захворванні, таму для людзей рознага сацыяльнага стану цудатворныя абразы былі апошняй надзеяй на выратаванне ад пакутаў.

У другой палове XVII ст., у сувязі з вайной 1654–1667 гг., надзвычай актуальна была абарона ў небяспечных для жыцця сітуацыях. У асноўным яна патрабавалася падчас небяспекі ад маскоўскіх войскаў,

---

[171] Birkowski O świętych obrazach […] // Sajkowski A. Barok. Wyd. 2. Warszawa, 1987. S. 199–201.

[172] Зеляевіч Э. Задыяк нябесны на зямлі…; Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku…; Fontana mistyczna…; Nowa obrona utrapioney…; Skarbnica niebeska… Przy obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie…; Society and religion in the Grand Duchy of Lithuania…; Sumariusz cudow…; Morze łaski Bozey. Maryia Panna. Przy Obraze swym cudownym w kościele Mińskim…; Bosiacka A. Leśniańska Księga Cudów 1683–1768… S. 211–244.

[173] Напрыклад, у зборы цудаў, прысвечаным Маці Божай Лясняцкай, 11% цудаў складае ажыўленне памерлых. Bosiacka A. Leśniańska Księga Cudów 1683–1768… S. 210.

а таксама пры выратаванні з палону. Калі чалавек аддаваў сябе пад апеку і абарону Маці Божай, яна ахоўвала яго ад ворага і спрыяла хуткаму вызваленню з-за кратаў. Такая абарона жыцця разумелася як цуд, асабліва калі ўлічыць, што ў гэту вайну ВКЛ страціла палову насельніцтва забітымі ці вывезенымі ў няволю. Абарона каталіцкіх абразоў ад маскоўскага і шведскага войскаў падкрэсліваецца ў той ці іншай ступені ва ўсіх зборах цудаў, якія выйшлі ў свет у той час. Гэта мела важнае значэнне, каб падкрэсліць, што толькі каталіцтва дапамагала супрацьстаяць праваслаўнаму маскоўскаму войску і пратэстанцкаму шведскаму.

Маці Божая была міласэрная да тых, хто яе шанаваў і выконваў свае абяцанні, але тых, хто ішоў супраць, чакала пакаранне. Асобы, што забыліся ёй падзякаваць і выканаць свой зарок, атрымлівалі зноў сваю хваробу і, як правіла, у больш цяжкіх формах. Гэтае пакаранне з іх здымалася, калі яны выконвалі абяцанні і фіксавалі ў кнізе пра занядбанне зароку. Больш жорстка Маці Божая абыходзілася з тымі, хто зневажаў яе. Такія людзі караліся шаленствам, няшчаснымі выпадкамі, якія прыводзілі да калецтва ці смерці. Прысутнасць гэтага элементу ў зборах цудаў мела выхаваўчы і павучальны характар. Падобная інфармацыя прымушала людзей выконваць свае абавязкі, каб не апынуцца на месцы пакараных.

Гэтыя чатыры віды цудаў з'яўляюцца абавязковымі элементамі цудатворнага абраза. Яны прысутнічаюць у зборах цудаў, прысвечаных Маці Божай Ружанастоцкай, Маці Божай Наваградскай і інш. Праз абраз Маці Божая можа і адорваць чалавека сваімі шчадротамі, і караць яго за непаслухмянасць. Складальнікамі было адзначана ў «Зборы…», што яна кожнаму дае сваё: добрым — добрая, пакорным — шчодрая, злым — злая, а да няўдзячных — справядлівая [174]. Чалавек атрымлівае тое, што ён заслугоўвае. Таму нядзіўна, што Маці Божая не толькі дапамагала, але і карала.

Такое разуменне цудатворнасці знайшло адлюстраванне ў выявах на лаве. Акрамя подпісаў пра цуды змешчаны надпісы на латыні пра Маці Божую. У надпісах яна характарызуецца як жанчына, якая вяртае да жыцця (ажыўленне Ю. Тымінскага), суцяшае хворых (вылячэнне А. Катовіча) і іх вылечвае (вылячэнне С. Граткоўскага), вяртае зрок (вылячэнне ад слепаты С. Любамірскага), вызваляе з няволі (вызваленне В. Жэляроўскага і шляхты). У выявах не прадстаўлена пакаранне няўдзячных.

Акрамя гэтых асноўных цудаў, разнастайныя зборы даюць звесткі аб тым, якім з'явам надавалася такое значэнне: пах ад абраза, ажыўленне сухіх раслін, выратаванне тапельцаў, выкрыццё злачынцы, вяртанне

---

174 Sumariusz cudow… S. 80.

згубленых рэчаў і грошай, выратаванне ад пажару, самазапальванне лямпы пры іконе, дапамога пры родах [175].

Па здзейсненых цудах і духоўнаму значэнню абраз Маці Божай Студэнцкай у тэксце параўноўваўся з абразамі ў ВКЛ, Польшчы і Еўропе і пры гэтым адзначалася, што яна не горш за іншыя цудатворныя іконы. У маналогу А. Катовіча ёсць выказванне, што Найсвяцейшая Панна адна і тая ж у Гародні, Чэнстахове і Ларэце, і шчырая вера робіць больш, чым доўгатэрміновае паломніцтва (№ 28). Гэтым яна ставілася на адзін узровень з важнымі і знакамітымі выявамі Маці Божай, якія набылі сваю вядомасць у XV–XVII стст. і былі старэйшыя за гарадзенскую. Яна была больш дзейсная ў параўнанні са святынямі ў Жыровічах, вялікіх Эйсмантах і Шэляцічах. Асабліва істотна было адзначыць гэта адносна першых двух абразоў, якія мелі вялікае шанаванне і складалі моцную «канкурэнцыю» іконе ў Гародні. Акрамя таго, цудатворныя абразы былі ў Красным Бару, Лідзе, Ружаным Стоку, Навагарадку, Троках, ды і Вільня была адносна недалёка, дзе было цэлае сузор’е цудатворных абразоў [176]. Таму ў дадзенай сітуацыі трэба было шмат прыкладаць намаганняў, каб вернікі накіроўваліся менавіта да абраза Маці Божай Студэнцкай.

Складальнікі «Збору…» акцэнтавалі ўвагу на тое, што чалавек у пошуках лячэння можа наведаць Ларэту, Кампастэлу, Рым, Іерусалім, Студзяны, Чэнстахова, а лекі знайсці ў доме — гэта значыць пры іконе Маці Божай Студэнцкай (№ 52). Пералічаныя самыя знакамітыя і важныя мясціны, якія былі вядомы ўсяму хрысціянскаму свету, былі абраны для параўнання невыпадкова. Гэта не толькі ставіла Гародню ў адзін з імі рад, але нават і вышэй за іх. Каб атрымаць міласць Маці Божай, не трэба было выязджаць у небяспечную вандроўку, а дастаткова прыйсці ў езуіцкі касцёл. Вядучая роля абраза сярод астатніх мясцовых падкрэслівалася шанаваннем яго духоўнымі асобамі з іншых ордэнаў. У «Зборы…» узгаданы манашкі–базыліянкі з Гародні і Менска (№№ 4, 48) і манашкі з Гарадзенскага брыгіцкага кляштара (№№ 56, 57, 84).

У Еўропе цудатворныя абразы набываюць значэнне мясцовых святых, якія ахоўваюць суполку [177]. Такое ж значэнне яны атрымліваюць і ў ВКЛ. Большасць абразоў, у тым ліку і Маці Божай Студэнцкай, мелі лакальнае значэнне. У тэксце сустракаецца яе назва — як тутэйшая, хатняя,

---

[175] Зеляевіч Э. Задыяк нябесны на зямлі…; Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku…; Fontana mistyczna…; Nowa obrona utrapioney…; Skarbnica niebeska… Przy obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie…; Society and religion in the Grand Duchy of Lithuania…; Sumariusz cudow…; Bosiacka A. Leśniańska Księga Cudów 1683–1768… S. 210.

[176] Nowakowski W. O cudownych obrazach… S. 310, 470–473, 567–571, 720–754; Fridrich A. Historye cudownych obrazów… S. 114–115.

[177] Belting H. Likeness and Presence… P. 61.

мясцовая [178]. Сярод іншых вылучаецца абраз Маці Божай Жыровіцкай, які набыў статус дзяржаўнага пасля наведання яго польскім каралём і вялікім князем літоўскім Уладзіславам IV у 1644 г. [179] Цуды гэтага абраза перадрукоўваліся шмат разоў [180].

Зразумела, што цуды займалі цэнтральнае месца ў дадзенай кнізе. Яны павінны былі прадэманстраваць веліч і значнасць іконы Маці Божай Студэнцкай, ставячы яе на адзін узровень з іншымі знакамітымі хрысціянскімі святынямі. Цуды паказвалі міласэрнасць Маці Божай да людзей, яе спрыянне ва ўсіх жыццёвых сітуацыях, асабліва ў хваробах. Пасля выдання гэтай кнігі абраз стаў займаць важнае месца ў жыцці Гарадзенскага павета, самога горада, езуіцкага касцёла і кожнага верніка.

**Хваробы.** Хваробы з даўніх часоў з'яўляюцца сур'ёзнай праблемай чалавецтва. Каб ад іх пазбавіцца, людзі звярталіся да традыцыйнай і народнай медыцыны, а таксама да цудатворных ікон. Дзеля таго, каб зразумець, чаму хворыя прасілі дапамогі ў абраза Маці Божай, трэба ведаць тагачасны стан развіцця медыцыны. Гэтая галіна ведаў у Беларусі развівалася ў кантэксце еўрапейскай навукі, чаму спрыяла вучоба жыхароў ВКЛ за мяжой, а таксама праца замежных лекараў пры дварах вялікіх князёў літоўскіх і багатай шляхты. Замежныя асобы мелі магчымасць карыстацца апошнімі дасягненнямі медыцыны. Мясцовыя і іншаземныя лекары працавалі ў віленскага біскупа Паўла Гальшанскага (?–1555), Радзівілаў і інш. Акрамя таго медыцынская літаратура траплала з Еўропы ў прыватныя бібліятэкі і бібліятэкі навучальных устаноў. Напрыклад, у зборах Гарадзенскай езуіцкай калегіі былі кнігі па медыцыне [181]. Сярод насельніцтва папулярнасцю карысталіся зборнікі рэцэптаў па лячэнню розных хвароб.

Развіццё медыцынскай навукі не абышло і Гародню. 15 студзеня 1586 г. тут было зроблена анатамічнае ўскрыццё цела Стэфана Баторыя [182]. Гэта першы зафіксаваны ў дакументах выпадак, які адбыўся на тэрыторыі Беларусі і Усходняй Еўропы. Паводле інвентара 1773 г. пры езуіцкім калегіюме знаходзілася дзве аптэкі: адна мураваная, пабудаваная некалькі год таму, а другая «старажытная» — для лячэння хворых манахаў. Аднак крыніца адзначала, што медыцынскіх матэрыялаў і паслуг першая аптэка рабіла не шмат, а лекаў з-за мяжы ў гэты год не

---

[178] Sumariusz cudow… S. 20, 34, 41, 53, 68, 80.

[179] Ярашэвіч А. Жыровіцкі абраз Маці Божай // ЭГБ. Т. 3. Мн., 1996. С. 384.

[180] Белоруссия в печати в XVII столетии… С. 56.; Charkiewicz W. Żyrowice — łask krynice…

[181] ЛДГА. Ф. SA. 11 296. Арк.43.

[182] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа: из истории белорусской медицины. Мн., 1987. С. 66, 114–115.

атрымала. Абедзве аптэкі былі ў даўгах [183]. З аднаго боку, у ВКЛ ведалі пра дасягненні еўрапейскай медыцыны, а з другога — агульны ўзровень тагачаснай медыцыны не дазваляў паспяхова лячыць многія захворванні нават у XVIII ст., ды і паслугі лекара былі даступныя далёка не ўсім. Медыкі былі абсалютна бездапаможныя перад эпідэміямі. Таму хворыя вымушаны былі звяртацца да цудатворных абразоў.

«Збор…» з'яўляецца крыніцай па гісторыі медыцыны другой паловы XVII ст. Яго змест падзелены па захворваннях. Тэкст дае змястоўную інфармацыю па хваробах, а таксама па іх сімптомах і ў некаторых выпадках па лячэнню. Прычым далёка не ўсе хваробы дакладна ідэнтыфікаваліся. Не выклікае сумнення выяўленне чумы (№№ 34, 66). Гэта эпідэмічнае захворванне, якое мела масавы характар, і яго сімптомы былі вядомыя. Падагра (№ 28) у спісе сустракаецца толькі адзін раз, гэта хвароба лічылася шляхецкай і не кранала прадстаўнікоў іншых саслоўяў. Дакладна вызначаліся наступныя назвы захворванняў: астэамаляцыя (№ 29), дызентэрыя (№№ 41, 42), каўтун (№ 22), немата (№ 46), паралюш (№№ 19, 81), панос і ванітаванне (№ 5), пухліны (№№ 23–27), язвы (№№ 30, 31, 32, 35–40), вадзянка (№ 33), пераломы рук (№№ 76, 80) і ног (№№ 77, 90а) [184], цяжкія роды (№ 68), ілжывая гарачка (№№ 63, 65), ліхаманка (№№ 6, 15, 16, 53–62, 64, 67), хваробы на вочы (бяльмо, слепата і іншыя — №№ 47–49, 51, 52), боль галавы (№№ 50, 83), вар'яцтва (№№ 43–45, 84). Аднак варта адзначыць, што прычыны гэтых захворванняў, а часам і іх характар, па апісанні вызначыць немагчыма. Напрыклад, ліхаманка можа быць выклікана рознымі хваробамі, як і пухліны, болькі, болі галавы і іншае.

Сярод цудаў вылучаецца пазбаўленне ад чараў (№ 71), якія маюць не медыцынскае, а д'ябальскае паходжанне. Лекары не ў стане пазбавіць ад хваробы, якая была выклікана чарамі, і таму зварот да іконы мог стаць адзіным выратаваннем для ахвяры. Нягледзячы на панаванне хрысціянства, у XVII ст. паслугі чараўнікоў карысталіся попытам сярод розных слаёў насельніцтва, аб чым сведчаць разнастайныя судовыя скаргі за гэты час [185].

---

[183] ЛДГА. Ф. SA. 11 296. Арк.15.

[184] Аднак цяжка дакладна вызначыць хваробу, калі пра яе адзначалася, што балела рука (№ 86) ці нага (№№ 75, 78, 79).

[185] Аб вядзьмарскіх працэсах у ВКЛ і чараўніцтве гл.: Śliż N. Elementy pogaństwa w kulturze szlacheckej wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI–XVII w. // Księga — Nauka — Wiara w średniowicznej Europe / Pod red. T.Ratajczka. Poznań, 2004. S. 182–184; Бабкова В. Чарадзейства // Наша Ніва. № 23. 2 верасня; Jodkowski J. O czarowniku Znaku na inkwizicji w Grodnie w 1691 r. Lwów, 1932; Лобач У. Паганства і хрысціянства ў сярэднявечнай Беларусі // Весці Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Гуманітарныя навукі. 1996. Т. 2. С. 3–11; Лобач У. Чарадзейства на Полаччыне:

У шэрагу выпадкаў хваробы ідэнтыфікаваліся як смяротныя, у асноўным яны прыведзены ў другой частцы кнігі. Іх апісанне не дае магчымасці вызначыць хваробу, акрамя раненняў (№№ 13, 14). Аб’ядноўвае гэтыя выпадкі тое, што людзі знаходзіліся пры смерці. У тэксце сустракаюцца апісанні захворванняў без дыягназу (№№ 69, 70, 72–74, 89, 90а, 90б). Хваробы, апісаныя ў «Зборы…», не з’яўляюцца ўнікальнымі, яны сустракаюцца ў іншых падобных крыніцах [186].

У 16 выпадках [187] у той ці іншай ступені негатыўна характарызуецца тагачасная медыцына і яе метады лячэння. Складальнікі імкнуліся падкрэсліць марнасць «зямных лекаў»: традыцыйных і народных — зёлкі, тоўчаныя ракі, чорныя куры, пластыры з хрэну, селядцы, жывымі распатрошаныя ліні, прымочкі, разаграванні, парашкі, мазі і інш. (№№ 37, 45, 48). З’яўленне ў горадзе аптэкі пры езуіцкім калегіюме толькі часткова выправіла сітуацыю. Аднак у параўнанні з набожнымі лекамі ад Маці Божай Студэнцкай яны яўна прайгравалі. У «Зборы…» чырвонай ніткай праходзіць думка, што медыкі не могуць вылечыць, а толькі бяруць грошы і падманваюць людзей для ўласнай выгады. Паводле тагачасных уяўленняў лічылася, што Бог насылае хваробу [188]. Тады разумна і лагічна было шукаць пазбаўлення ад яе менавіта ў Бога.

Хвароба насіла сацыяльны характар. Яна была падзеяй для навакольнага асяроддзя, якая аб’ядноўвала суполку вакол аднаго чалавека. Прыцягвалі ўвагу людзей разнастайныя адхіленні. Асабістае жыццё было празрыстым, яно праходзіла навідавоку сям’і, сяброў і суседзяў. Выключэнне складалі эпідэміі, якія выклікалі адваротную рэакцыю,

---

гісторыка-культурны кантэкст // Полацк: карані нашага радавода. Полацк, 1996. С. 50–59; Лобач У. Браслаўская судовая справа 1615 г.: да характарыстыкі чарадзейства ў сярэднявечнай Беларусі // Браслаўскія чытанні: матэрыялы 4-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі 24–25 красавіка 1997. Браслаў, 1997. С. 69–73.

[186] Зеляевіч Э. Задыяк нябесны на зямлі…; Cudowny Obraz Bogorodzicy w Różanymstoku…; Fontana mistyczna…; Nowa obrona utrapioney…; Skarbnica niebeska… Przy obrazie Bogarodzice Maryey Panney w Kościele Michała Swiętego w Wilnie…; Society and religion in the Grand Duchy of Lithuania…; Paknys M. Kasdienybės istorija XVII a. LDK… P. 85–94. Śliż N. Elementy pogaństwa w kulturze szlacheckej wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI–XVII w. // Księga — Nauka — Wiara w średniowiecznej Europe / Pod red. T.Ratajczka. Poznań, 2004. S. 182–184; Slizh N. Lithuania Grand Duchy of // Encyclopedia of Witchcraft. The Western Tradition. Volume 3, K–P. / editor Richard M. Golden. Santa Barbara; Denver; Oxford, 2006. P. 658–660.

[187] Адмоўнае стаўленне да тагачаснай медыцыны сустракаецца ў наступных нумарах «Збору…»: 5, 8, 12, 19, 22, 23, 28, 29, 35, 37, 45, 48, 55, 62, 67.

[188] Дадзеная фармулёўка была шаблоннай і прысутнічала амаль ва ўсіх тэстаментах. Сліж Н., Гардзееў М. Шляхецкія тэстаменты XVI – пачатку XVIII ст. // Гістарычны альманах. Т. 3. Гародня, 2000. С. 90–110.

як гэта паказана ў № 34. Лаўрын Кмётак застаўся адзін, без падтрымкі хатніх, сваякоў і суседзяў (1663).

Варта адзначыць, што ў «Зборы…» падрабязна апісаны актыўны ўдзел суседзяў, знаёмых, хатніх у лячэнні хворага [189]. Яны давалі парады, ахвяравалі іконе. Іх прысутнасць пры хворым была абумоўлена наступнымі прычынамі. Па-першае, грамадская супольнасць адыгрывала важную ролю ў жыцці чалавека, а яе традыцыйнасць ставіла ў залежны стан ад асяроддзя. Сацыяльная група падпарадкоўвала асабістыя інтарэсы інтарэсам суполкі. Па-другое, у лакальным асяроддзі звычайная з'ява наведаць хворага суседа. Па-трэцяе, спасылаючыся на Біблію, каталіцкая рэлігія ўхваляла спачуванне да хворага [190], як праяўленне хрысціянскай міласэрнасці. Таму гэтыя прычыны маглі стаць матывацыяй для суседзяў і знаёмых, каб прычыніцца да вылячэння суседа. Яскравым прыкладам удзелу асяроддзя з'яўляецца вылячэнне звар'яцелага гараджаніна Пятра Міхалевіча. Сябры і суседзі вырашылі ахвяраваць для яго цудатворнай іконе: кожны ўзяў на сябе абавязак прачытаць малітвы, пацеры ці выканаць іншыя рэлігійныя зарокі. Такое адзінадушнае жаданне дапамагчы прывяло да станоўчага выніку — хворы прыйшоў да розуму [191].

Адносіны да хваробы былі розныя. Аб ёй не саромеліся казаць, бо людзі маглі даць слушную параду, паспачуваць. Сорам яна выклікала ў тым выпадку, калі мяняла знешнасць і адрознівала ад іншых людзей. Асобная роля ў кнізе надаецца псіхалагічнаму фактару, таму гэтая крыніца невыпадкова была адзначана ў гістарыяграфіі як цікавы дакумент па вывучэнню ментальнасці людзей [192]. Рэдка крыніцы гэтага перыяду так добра адлюстроўваюць псіхалагічны стан асобы падчас хваробы і напярэдадні смерці. У большасці выпадкаў чалавек звяртаўся да цудатворнага абраза, калі зямныя сродкі ўжо былі выкарыстаны і засталіся толькі «нябесныя». Праз маналогі і дыялогі людзей перадаюцца іх пакуты ад разнастайных хваробаў [193]. Хворыя трывалі фізічны і маральны боль. Яны былі пастаўлены перад выбарам: смерць ці пакутніцкае жыццё. Пры ўмове працягу жахлівай хваробы людзі часта выбіралі смерць.

Паводле сучасных меркаванняў псіхолагаў, смяротна хворы чалавек праходзіць пяць стадый: адмаўленне смерці (гэта не са мной), гнеў (чаму

---

[189] Гл. цуды №№ 3, 19, 24, 25, 29, 32, 36, 38, 43, 45, 50, 54, 59, 60, 72, 73, 81, 84.

[190] Кн. Ісаі 53, Псалом 6. Srodki wielcezbawienne, ktorych kto szczyrze zażywac będzie żywota pobożnego y swiętobliwego, a potym w Niebie wieku istego dostąpi. Vilna, 1645. S. 322.

[191] Sumariusz cudow… S. 43–44.

[192] Krahel T. Historiografia (archi)decezji Wileńskiej do roku 1939 // Szudia z historii kościoła w Polsce. T. 5. Warszawa, 1979. S. 106.

[193] Гл. цуды №№ 15, 18, 22–24, 26, 28–30, 37, 39, 40, 42, 46, 50, 52–54, 56, 58, 59, 81, 83, 84.

менавіта я), здзелка са смерцю (спроба працягнуць жыццё), прыгнечанасць (асэнсаванне) і прыняцце смерці (падпарадкаванне прысуду) [194]. Гэтыя стадыі прасочваюцца ў маналагічных выказваннях. У такім стане толькі рэлігія дапамагае людзям прыняць непазбежнае і скарыцца перад сваім лёсам. Аднак у дадзеным творы вынік для хворых станоўчы, таму стадыі напярэдадні смерці трэба разглядаць, улічваючы гэтыя важныя абставіны.

Маналогі паказваюць псіхалагічны стан падчас хваробы. У ім адчай, боль, фізічныя і маральныя пакуты, страх за свой далейшы лёс ці лёс блізкіх людзей, схільнасць да самагубства. Гэтыя пачуцці добра знаёмы тым, хто перажываў цяжкія хваробы свае і сваіх родных. Яны турбавалі людзей як раней, так і зараз. У той час маральныя і фізічныя пакуты разумеліся ў адпаведнасці з рэлігійнай дактрынай як расплата за грахі. Пры абвастрэнні захворвання ўсе пакутніцкія пачуцці дасягалі свайго піку, што спрыяла максімальнай канцэнтрацыі хворага/хворай на жаданні вылечыцца. Гэта адлюстроўвалася ў малітве-звароце да Маці Божай. Напрыклад, у прамове жонкі гарадзенскага бурмістра Ганнуса Паўльсена Зузаны Шульцаўны адчуваецца адчай і страх за свой лёс, якія прымусілі яе прасіць пра вырашэнне складзенай сітуацыі ў бок жыцця ці смерці (№ 58). Небяспека для жыцця В. Жэляроўскага і яго сяброў паставіла ўсіх у экстрэмальныя ўмовы, калі трэба было тэрмінова прымаць рашэнне для выратавання свайго жыцця: яны змаглі прабіць муры і скокнуць з іх (№ 18).

Крыніца надае шмат увагі цудоўнаму пазбаўленню ад хвароб, бо гэта асноўныя цуды абраза. У ёй зафіксаваны псіхалагічны стан асобы падчас хваробы, яе пакуты і перажыванні, што дае дадатковую інфармацыю пра жыццё чалавека ў эпоху барока. Для гісторыі Гарадзенскага рэгіёна яна ўнікальная, бо асвятляе не толькі падзеі, але і ўнутранае жыццё тагачасных людзей.

**Геаграфія мясцінаў, з якіх паходзілі асобы.** У «Зборы…» фіксаваліся не толькі імёны, але і месцы паходжання асобаў. У большасці выпадкаў фігуруюць гарадзенцы і жыхары навакольных вёсак. Рэдкія выпадкі — гэта асобы, якія прыехалі ў Гародню па справах. Большасць зваротаў прыходзіцца на жыхароў Гародні (усяго 29 выпадкаў) [195]. Сярод іншых населеных пунктаў узгадваюцца: Русота [196], Альшанка [197], Абуха-

[194] Фрейд З. Мы и смерть // Рязанцев С. Танатология (учение о смерти). СПб., 1994. С. 13–25.

[195] Цуды №№ 2, 2а, 3, 5, 9, 10, 15а, 32, 35, 36, 37, 42, 43, 44, 45, 48, 56, 57, 58, 75, 77, 79, 80, 83, 84, 90, 90а, 90б.

[196] Цуды №№ 31, 38, 41, 50, 65.

[197] Цуды №№ 24, 49.

ва (№ 59), Васількава (№ 1), Кульбакі (№№ 18, 21, 92), Путрышкі (№ 20), Капліца (№ 34), Талочкі (№№ 27, 71), Корчык (№ 70), Грандзічы (№ 63), Верцялішкі (№ 74), Бержнікі (№ 78), Яскевічы пад Індурай (№ 81) — усяго 19. Аднак не заўсёды ў тэксце адзначаецца дакладнае месца пражывання. Паводле кантэксту зразумела, што людзі паходзілі з Гарадзенскага павета [198]. Фіксуюцца даволі рэдкія выпадкі звароту асоб з іншых рэгіёнаў: Менск (№ 4), Вільня (№ 15), Хондзін (№ 67), Львоў (№ 47), Прэгаліны (Падляшша) (№ 52), Загасцінец (Польшча) (№ 17) — усяго 5. Па сутнасці сярод просьбітаў пераважала насельніцтва Гарадзеншчыны. Гэта паказвае, што абраз меў лакальнае значэнне і карыстаўся папулярнасцю сярод гарадзенцаў і жыхароў навакольных вёсак. Дарэчы, многія з іх захавалі свае назвы да сённяшняга дня.

**Сацыяльны склад просьбітаў.** Дадзены твор дае добрую магчымасць прасачыць сацыяльны склад людзей, якія звярнуліся за дапамогай да абраза Маці Божай Студэнцкай. Амаль ва ўсіх выпадках адзначалася паходжанне праз тытулатуру ці іншыя дадзеныя. Фігуруе пяць прадстаўнікоў духавенства. З іх са шляхты паходзілі Уладзіслаў Эйсмант (№ 15) і Кацярына Сапежанка (№ 4). Пра астатніх вядома, што гэта былі прафесар граматыкі (№ 15а), ксёндз езуіцкага калегіюма (№ 90а) і манашка Гарадзенскага базыліянскага кляштара (№ 48) — іх імёны і прозвішчы не падаюцца. Найбольшая колькасць зафіксавана са шляхты — 50 асоб [199]. Дакладна ідэнтыфікаваны 23 чалавекі, і тры з пэўнай доляй верагоднасці. Самыя вядомыя прадстаўнікі шляхецтва — жонка кароннага падкаморыя В. Бутлера Канстанцыя Вадынская, жонка стольніка ВКЛ Яўстахія Валовіча Барбара Сапежанка, жонка бельскага падкаморыя Юзафа Карпа Гальшка Сапежанка, пісар ВКЛ Міхаіл Друцкі-Сакалінскі, пісар ВКЛ Андрэй Катовіч. На лаве змешчаны цуды са знакамітымі асобамі, якія не ўключаныя ў кнігу: гетман ВКЛ Казімір Сапега, менскі староста Крыштаф Завіша, каронны маршалак Станіслаў Любамірскі.

Аднак у асноўным прадстаўлена сярэдняя і дробная павятовая шляхта: Сапоцькі, Талочкі і іншыя, сярод якой польская шляхта — Длугаборскія, Славагорскія, Чарніцкія і іншыя. Пры ідэнтыфікацыі асоб гэтага саслоўя высветлілася, што многія з іх звязаныя паміж сабой сваяцкімі, шлюбнымі і сяброўскімі адносінамі і добра ведалі адзін аднаго. Напрыклад, В. Жэляроўскі быў жанаты з Т. Сапоцькаўнай, якая

---

[198] Гэта адзначаецца ў цудах №№ 6–8, 11–14, 19, 22, 23, 25, 26, 28, 33, 39, 40, 44, 54, 55, 60, 61, 62, 66, 69, 72, 76, 82, 85, 89, 89а, 93, 94.

[199] Гл. цуды №№ 6, 8–12, 14, 16–19, 21–23, 25–30, 33, 39, 40, 46, 52–55, 59–62, 66, 67, 69–73, 76, 82, 83, 85, 86, 89, 89а, 90, 93, 94.

па мацярынскай лініі належала Длугаборскім, праз якіх была звязана з Абухоўскімі, Аленскімі, Маліноўскімі, Хрантовічамі. Праз яе муж увайшоў у мясцовае асяроддзе, а пасля звярталася за дапамогай да іконы, што знаходзілася ў яго доме. Сваяцкія сувязі сталі адным са сродкаў распаўсюджання інфармацыі пра ікону. Уплывовай асобай на мясцовым узроўні быў Марцін Чарніцкі (гл. № 66), які часта фігураваў у дакументах Гарадзенскага земскага суда ў якасці апекуна, выканаўцы тэстаменту, фундатара, і яго сям'я была звязана з гісторыяй іконы. Вакол абраза стварылася шляхецкая суполка, якая была зацікаўлена ў шанаванні культу Маці Божай [200].

У творы прадстаўлены гараджане featureназнага сацыяльнага ўзроўню — ад жонак бурмістраў (З. Шульцаўна, Д. Пастэўчанка) да рамеснікаў і мяшчан з навакольных вёсак — усяго 17 чалавек [201]. Сустракаюцца вядомыя мяшчанскія прозвішчы Паўловічы, Гібулы, Гранды. З рамеснікаў фігуруе не шмат: Стальмах з Васількава і жонка гарадзенскага краўца Юстына Міхалава (№№ 1, 51). Не меншую цікавасць прадстаўляюць нататкі пра абслугоўваючы персанал брыгіцкага кляштара, які амаль не трапляе ў дакументы: садоўніка, вазніцы і сталяра (№№ 56, 57, 84).

«Дэмакратычнай» робіць крыніцу наяўнасць сярод просьбітаў сялян — 14 асоб [202]. Акрамя вышэйпералічаных яшчэ два жаўнеры (№№ 13, 93), а таксама дзве асобы не ідэнтыфікаваны па сацыяльнаму стану (№№ 44, 47). Як бачым, больш за палову просьбітаў — шляхта, але гэта не азначае, што яна больш хварэла ці ікона карысталася большай папулярнасцю сярод шляхты. Арыгінальныя спісы цудаў могуць утрымліваць іншую інфармацыю. Дадзеныя суадносіны да шляхты паказваюць пра тэндэнцыйнасць падбору ўкладальнікаў «Збору…», якія хацелі аддаць перавагу менавіта гэтаму саслоўю, якое больш, чым астатнія, падтрымлівала фінансава касцёл, а таксама пэўны час абраз захоўваўся менавіта сярод шляхты. Яна зрабіла шмат намаганняў, каб культ гэтай іконы шырока распаўсюдзіўся. Прадстаўнікі шляхецтва фінансавалі ўрачыстае ўнясенне яе ў касцёл, выданне кнігі, дарылі воты. Яны ўнеслі значны ўклад у развіццё рэлігійнага і культурнага жыцця горада. Аднак варта адзначыць, што ў «Зборы…» прадстаўлены ўсе асноўныя саслоўі грамадства ВКЛ. Такім чынам, складальнікі імкнуліся падкрэсліць блізкасць абраза да ўсіх і кожнага незалежна ад яго становішча, бо для езуітаў было важна прыцягнуць увагу вялікай колькасці вернікаў да абраза.

---

[200] Belting H. Likeness and Presence… P. 45.

[201] Гл. цуды №№ 1–3, 5, 7, 32, 35–37, 42, 43, 45, 51, 56–58, 75, 77, 79, 80, 84, 90б.

[202] Гл. цуды №№ 20, 24, 31, 34, 38, 41, 49, 50, 63, 64, 68, 74, 78, 81.

**Гендэрны склад вернікаў, сямейныя звароты.** «Збор…» дае магчымасць правесці аналіз асоб, якія прасілі дапамогі ў Маці Божай Студэнцкай, па палавому прынцыпу. Самастойна звярнуліся да абраза 29 мужчын рознага сацыяльнага стану [203]. У асноўным іх звароты былі выкліканы хваробамі, у рэдкіх выпадках свецкімі справамі. Жанчыны пры тых жа абставінах наведвалі цудатворны абраз. Колькасць іх зваротаў не намнога перавышае мужчынскія — 32. Па сутнасці, хваробы мужчын і жанчын амаль аднолькавыя: пухліны, ліхаманкі, болькі і інш. Жанчыны таксама звярталіся за дапамогай да Маці Божай пры цяжкіх родах (№ 68). На той час акушэрства не было развіта на адпаведным узроўні, роды прымалі павітухі і знахаркі. Першая медыцынская школа з аддзяленнем для павітух была адчынена ў Гародні пры спрыянні А. Тызенгаўза [204]. Даволі часта роды прыводзілі да смерці жанчыны, а дзеці нараджаліся мёртвымі ці паміралі хутка пасля нараджэння. Таму нядзіўна, што ў вышэйадзначаным выпадку Кацярына Янава запрасіла да сябе ксяндза, каб спавядацца, ведаючы, што яна можа не перажыць родаў.

Асобна трэба адзначыць звароты, звязаныя з сямейнымі справамі. Найбольшы клопат бацькоў выклікалі дзеці. У 25 цудах зафіксаваны зварот бацькоў да іконы з-за хваробы дзяцей [205]. Усе яны апісваюць глыбокія перажыванні за лёс дзяцей і моцнае жаданне, каб яны як мага хутчэй выздаравелі, бо самае жахлівае для бацькоў — гэта хаваць сваіх дзяцей. Іх перажыванні былі недарэмныя, бо гэты перыяд у гісторыі Беларусі вызначыўся вялікай дзіцячай смяротнасцю. За дапамогай да Маці Божай звярнуліся 6 бацькоў, 14 маці, у 3-х выпадках разам і ў 2-х выпадках не пазначана, хто звяртаўся. Сярод дзіцячых хваробаў адзначаюць дызентэрыю, панос, ліхаманку, але часта ідэнтыфікаваць захворванне немагчыма, бо ў тэксце яно не характарызуецца дакладна і называецца смяротным. Уражвае выпадак у № 32, калі сын бурмістра Пятра Ляўковіча ўжо лічыўся памерлым, ад цела пачалі адыходзіць скура і мяса, а пасля звароту да Маці Божай ён ачуняў.

Гэтыя факты вельмі важныя для даследавання гісторыі дзяцінства. Крыніц па гэтай тэме захавалася мала. У большасці выпадкаў дзеці фігуравалі ў дакументах пасля дасягнення паўналецця ці калі прыходзіць пара на шлюб. У дыярыюшах згадваюцца даты нараджэння, смерці ці

---

[203] Гл. цуды №№ 1, 13–15а, 18, 19, 22, 24, 28, 34, 37, 38, 43–47, 52, 54, 56, 57, 65, 72, 76, 84, 89а, 90, 90а.

[204] Грицкевич В. П. С факелом Гиппократа: из истории белорусской медицины. Мн., 1987. С. 97.

[205] Гл. цуды №№ 2, 2а, 3, 5, 7–11, 20, 21, 32, 33, 35, 36, 41, 42, 51, 67, 70, 71, 74, 77, 80, 90б.

шлюбу дзяцей. Жыццё дзіцяці, яго побыт, гульні выпадаюць. У «Зборы…» прадстаўлена адна з істотнейшых праблем, з якой сутыкаліся бацькі, актуальная і зараз, — гэта хвароба дзіцяці і яе вылечванне. Важна, што тут апісаны бацькоўскія эмоцыі, што даволі рэдка сустракаецца ў крыніцах. Яны паказваюць, што бацькі былі гатовыя зрабіць усё магчымае і немагчымае, каб іх дзіця стала здаровым. Гэта ўласціва было бацькам усіх саслоўяў: шляхце, мяшчанам, сялянам.

Сямейныя праблемы аб'ядноўвалі мужа і жонку і прымушалі іх разам шукаць выйсця са складанай сітуацыі. Калі здаралася хвароба ці няшчасце з любым прадстаўніком сям'і, гэта ўспрымалася як агульная праблема, якая закранала ўсіх. Хвароба прымушала клапаціцца пра хворага, выдаткоўваць на яго сродкі. Сямейны зварот да абраза адзначаны ў №№ 61, 73. Перажыванне за лёс і здароўе мужа або жонкі таксама сустракаецца ў «Зборы…». Так, Юрый Буткевіч быў вельмі заклапочаны здароўем жонкі і зрабіў паломніцтва да іконы Маці Божай Студэнцкай (№ 6). Жонка Станіслава Гадомскага замовіла імшу за вызваленне з палону мужа (№ 17), а жонка Францыска Гнявінскага Зоф'я Сцяцкевічаўна паехала ў Гародню за лекамі і паводле парады людзей пайшла за дапамогай да абраза і такім чынам вылячыла мужа (№ 72). Усяго ў 38 выпадках сярод ініцыятараў зваротаў былі мужчыны, а ў 49 — жанчыны.

Цуды, звязаныя з гісторыяй сям'і, паказваюць важны бок жыцця, калі людзі траплялі ў непрыемныя сітуацыі ці хварэлі, і ў гэты час ім была патрэбна падтрымка блізкіх людзей. Аб гэтым пісалі шляхцічы і шляхцянкі ў сваіх тэстаментах і дароўных граматах, калі адорвалі сваіх блізкіх маёмасцю, грашыма і рухомымі рэчамі [206], бо ў першую чаргу яны спадзяваліся менавіта на іх дапамогу. Дзеці ў шляхецкай, мяшчанскай і нават сялянскай сем'ях займалі ніжэйшы статус, чым дарослыя. Аднак кожная сям'я стваралася менавіта дзеля працягу роду, таму клопат пра дзяцей быў асноўнай задачай пры выкананні выхаваўчай, сацыяльнай, статуснай, абарончай функцый [207]. Такія выпадкі з'яўляюцца прыкладам шчырага турбавання пра лёс дзяцей у розных слаях тагачаснага грамадства. Гісторыя дзяцінства фрагментарна прадстаўлена ў крыніцах, а «Збор…» раскрывае цікавыя аспекты для вывучэння гэтага накірунку.

У выніку трэба адзначыць, што Збор…» меў важнае значэнне для рэлігійнай, гарадской і шляхецкай культуры Гарадзеншчыны. Гэта своеасаблівы «летапіс», у якім адлюстраваліся разнастайныя лакаль-

---

[206] Сліж Н., Гардзееў М. Шляхецкія тэстаменты XVI – пачатку XVIII ст. … С. 100–101.

[207] Сліж Н. Тэрміналогія па гісторыі шляхецкай сям'і Вялікага княства Літоўскага ў 16–17 стст. // Гістарычны альманах. 2003. Т. 9. С. 57–59.

ныя працэсы і гісторыі людзей. Матэрыялы з кніг земскіх, гродскіх, магдэбургскіх судоў і іншых крыніц пацвярджаюць многія звесткі. Аднак легенда пра паходжанне абраза не знайшла поўнага адлюстравання ў дакументах. У крыніцах зафіксаваны толькі факты яго перадачы ад В. Куклінскага да В. Жэляроўскага, а ад апошняга — гарадзенскім езуітам, якія зрабілі шмат намаганняў, каб абраз карыстаўся шанаваннем сярод мясцовага насельніцтва. Гэта рэдкі выпадак, калі да сённяшняга дня захаваліся ўсе элементы цудатворнага абраза: сам абраз, збор цудаў і лава, на якой яны адлюстраваны. Усе разам яны даюць цэласнае ўяўленне пра абраз Маці Божай Студэнцкай. Сярод іх «Збор…» займае асобае месца як крыніца, якая тлумачыць сэнсавы змест абраза і яго значэнне для лакальнага асяроддзя. Спіс цудаў паказвае моц дадзенага абраза, яго неабмежаваныя магчымасці ўздзеяння на лёс чалавека: ад ажыўлення да пакарання.

Варта звярнуць увагу на тое, што «Збор…» вельмі добра прадстаўляе жыццё тагачаснага чалавека і раскрывае ўнутраны свет асобы ў складаных жыццёвых сітуацыях, што не так часта сустракаецца ў дакументах. Ён паказвае асабістыя праблемы людзей, іх заклапочанасць сабой і блізкімі, успрыманне асяроддзя і падзей. Менавіта гэта робіць крыніцу актуальнай не толькі для гісторыкаў, але і для звычайных людзей, якія маюць тыя ж праблемы і перажыванні, што і людзі ў XVII ст.

Падобныя рэлігійныя творы сталі складацца ў масавым парадку пасля вайны 1654–1667 гг. Яны павінны былі даказаць, што каталіцкая рэлігія праз цудатворныя абразы стварыла моцны духоўны супраціў праваслаўнаму маскоўскаму і пратэстанцкаму шведскаму ворагам. Веравызнанне стала сімвалам варожасці. «Правільнай верай» стала каталіцкая, а іншая — здрадніцкая. Гэты стэрэатып прысутнічаў у той ці іншай ступені ў тагачасных зборах цудаў, і асабліва ён падкрэсліваўся ў цудах, якія былі звязаны з вайсковымі падзеямі.

С большой долей вероятности можно утверждать, что В. Корейша был одним из самых образованных священников неглюбской церкви. В пользу этого говорит и произведенный ремонт церкви, и строительство здания церковно-приходской школы. Благодаря его усилиям сложился крепкий прицерковный круг активных прихожан, отношения причта и крестьян были ровными и стабильными, благоустраивалась прицерковная территория, только в конце XIX – нач. XX в. в книгах расходов есть строка о выдаче денег «певчим для поощрения их трудов» [19, л. 29; 20, л. 13]. В 1901 г. впервые встречается упоминание о «церковной библиотеке» из 36 томов [3, л. 2], через 5 лет — уже из 48 [4, л. 1].

В 1910 г. В. Корейша переехал в с. Корюковка Сосницкого уезда Черниговской губ. [15, л. 12 а]. Удивительно, но его имя помнят до сих пор: автору приходилось слышать мнение, что «больше, чем Корейша, для церкви никто не делал».

В том же году в Неглюбку «по собственному прошению» был переведен Иоанн Иовлевич Жуковский. По архивным документам и полевым записям о нем собраны наиболее полные сведения. В памяти неглюбчан имя И. Жуковского неразрывно связано с трагическими событиями закрытия и разорения храма.

Родился И. Жуковский в с. Васильевка Гомельского уезда Могилевской губ. в семье псаломщика. Образование получил в Гомельском духовном училище, по окончании которого был учителем грамматики в школе д. Колбовка Гомельского уезда, псаломщиком Кручанской церкви Могилевского уезда, дьяконом в церкви д. Закружье Гомельского уезда, после рукоположения в священники переведен в Неглюбку. У И. Жуковского и его жены Капитолины Петровны было шестеро детей: Петр, 1895 г. р., Мария, 1891 г. р., Анна, 1898 г. р., Олимпиада, 1902 г. р., Зиновия, 1910 г. р., Георгий, 1913 г. р. [9, л. 3].

Иоанн Иовлевич Жуковский стал последним священником Свято-Николаевской церкви. Практически до самого закрытия здесь проходили службы и совершались христианские таинства. Но уже в 1927 г. избирательного права были лишены священник, староста Иван Николаевич Кротенок [20], псаломщик Савва Елисеевич Клименко (1880 г. р., «крестьянин-собственник, окончил земское 1-классное 4-годичное училище», как псаломщик известен с 1910 г.) [6, л. 2].

Драматична история семьи И. Жуковского. Сам он был репрессирован [21], а младший сын, Георгий, отрекся от отца. В газете «Полесская правда» в январе 1930 г. была опубликована статья «Редеют ряды «святых отцов», где приводился текст его письма: «…Отец мой состоит попом в Неглюбской церкви. Я не религиозный, в церковь не хожу, но благодаря своей экономической зависимости я был вынужден жить с отцом. Теперь, в связи с организацией колхоза в Неглюбках, я порываю с ним всякую связь. Призываю всю молодежь отказаться от религии и церквей и требовать изъятия их под культурные очаги. В частности, требую передачи Неглюбской церкви под клуб. Жуковский Георгий Иванович» [33, л.11].

Закрытие церкви произошло в 1930–1931 гг., что вызвало упорное сопротивление прихожан: активисты прорвались в храм только с помощью вооруженных солдат. Семью священника укрывали, рискуя собственной жизнью. Церковь была разорена: сбросили на землю купола и колокола. Иконы и церковную утварь, выброшенные на улицу, жители тайно разобрали по домам. Здание церкви было приспособлено под склад зерна, позднее перестроено в школьное общежитие.

Автором статьи собраны некоторые сведения о дальнейшей судьбе Жуковских. Дом священника сожгли сельские активисты. Его семья укрылась в доме Павла Емельяновича Осипенко. Вскоре Жуковские переехали к дочери Анне в д. Шеломы Новозыбковского района Брянской области. Анна Жуковская, закончившая Гомельскую учительскую школу [9, л. 3], вместе с мужем Варфоломеем Филипповичем Нестеренко

---

[20] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Веткаўскага р-на: У 2-х кн. Мн.: БелТА, 1998. Кн. 2. С. 381–382.

[21] И. И. Жуковский репрессирован в 1929–30 гг. См.: Маракоў Л. У. Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917–1967. Энцыклапедычны даведнік: У 2-х т. / Л.У. Маракоў. Мн.: Бел. Экзархат, 2007. Т. 1. С. 300. Можно предположить, что И. И. Жуковский был репрессирован в 1931–1932 гг. В справке о состоянии Гомельской епархии за 1932 год священником Неглюбской церкви значится Прокопий Кекух, переведенный «из заштатных» 5 мая 1932 г. и уехавший в ноябре того же года. В 1933 г. священника в церкви не было. [НИАБ. Ф. 2786. Оп. 1. Д. 550. Л. 22, 23].

преподавала в сельской школе. В их дом и переехали И. Жуковский с женой Капитолиной, сестры Олимпиада, Мария, Зиновия. Олимпиада работала медсестрой, ухаживала за тяжело заболевшей Анной, после смерти которой вышла замуж за Варфоломея Филипповича. Вырастила приемного сына Анны Иосифа, двух дочерей умершей сестры Марии. Зиновия вышла замуж за Николая Кравченко, у них было двое детей, Тамара и Юрий. Георгий Жуковский некоторое время работал в неглюбском колхозе «Хваля», после жил в д. Репки Новозыбковского района Брянской области, работал электриком. Там женился, с женой Галиной воспитывали сына Алика [22].

В самой Неглюбке после закрытия церкви стихийно возникли и долгое время существовали своеобразные духовные центры, в которых роль хранителей традиций взяли на себя наиболее активные мужчины и женщины. Самыми уважаемыми из них были Павел Емельянович Осипенко и Евдокия Игнатьевна Приходько (матушка Еликонида).

Павел Емельянович Осипенко (1874–1967) после закрытия церкви, рискуя благополучием семьи, прятал книги из церковной библиотеки. Более трех десятилетий он служил по праздничным дням, крестил детей, отпевал умерших, пользовался непререкаемым авторитетом у односельчан. Евдокия Игнатьевна Приходько (1886–1988) приняла постриг в Чигиринском Свято-Троицком Мотронинском монастыре, после закрытия которого вернулась в Неглюбку. В начале 1940-х гг. в своем доме она собрала общину, по типу монастырской, из женщин Неглюбки и окрестных деревень [23].

Многолетние этнографические исследования Гомельско-Брянского пограничья, в частности, группы сел Неглюбского региона, дали удивительный результат в области изучения духовной жизни крестьян в XX в. Собранные полевые материалы позволяют говорить об одном важном факте: православные традиции здесь в течение XX ст. не прерывались. Одной из первых восстановили неглюбскую Свято-Николаевскую церковь: за восемь месяцев 1991 г. на месте старой церкви был выстроен и освящен новый храм. Символично, что фундамент новой церкви сложен из кирпича прежней. Констатируя непрерывность православной традиции в Неглюбке в XX в., судить о том, каким образом и чьими усилиями она была сформирована, можно только в результате изучения достоверных источников, в первую очередь архивных материалов.

---

[22] Ковалева А. Ф. 1925 г. р. П. Передавец, Неглюбский с/с. Архив автора. Кас. 104.

[23] Смірнова І. Ю. Матушка Еліканіда / І. Ю. Смірнова // Царкоўнае слова. 2008. № 38.

## Источники

1. НИАБ. Ф. 2962. Оп. 1. Д. 1.
2. Там же. Д. 2.
3. Там же. Д. 3.
4. Там же. Д. 5.
5. Там же. Д. 7.
6. Там же. Д. 8.
7. Там же. Д. 9.
8. Там же. Д. 10.
9. Там же. Д. 11.
10. Там же. Д. 12.
11. Там же. Д. 14.
12. Там же. Д. 17.
13. Там же. Д. 18.
14. Там же. Д. 20.
15. Там же. Д. 28.
16. Там же. Д. 35.
17. Там же. Д. 36.
18. Там же. Д. 40.
19. Там же. Д. 41.
20. Там же. Д. 42.
21. Там же. Д. 43.
22. Там же. Д. 44.
23. Там же. Д. 48.
24. Там же. Д. 49.
25. Там же. Д. 61.
26. Там же. Д. 62.
27. Там же. Д. 63.
28. Там же. Д. 65.
29. Там же. Д. 68.
30. Там же. Д. 70.
31. Там же. Д. 71.
32. Там же. Д. 73.
33. Там же. Ф. 2786. Оп. 1. Д. 417.

*А. К. Цітоў*

# Злотнічныя цэнтры Беларусі (ад даўніх часоў – да пачатку ХХ ст.)

Пытанні, звязаныя з беларускім злотніцтвам, да сённяшняга часу не знайшлі дастатковага адлюстравання ў айчыннай навуковай літаратуры. Асобныя эпізоды гэтай тэмы эксплуатуюцца як даследчыкамі, так і прадстаўнікамі розных плыняў і накірункаў даволі інтэнсіўна, як, напрыклад, імя полацкага майстра-злотніка XII ст. — Лазара Богшы. Пасля гэтай постаці імёны майстроў-ювеліраў, што працавалі на нашых землях, амаль не згадваюцца. У працах беларускіх гісторыкаў другой паловы ХХ ст. канстатуецца наяўнасць, без «залішняй» дэталізацыі гэтай з'явы, злотніцкага рамяства. Падобная сітуацыя прыводзіць да няправільных высноваў у дачыненні да працэсаў развіцця беларускага места і ўвогуле да не зусім адэкватнага успрыняцця гістарычных працэсаў, што адбываліся на Беларусі. Гэтая штучна створаная «лакуна» спараджала і спараджае памылковую думку аб нейкай адсталасці мескага (гарадскога) жыцця ў далёкім мінулым краіны і нават спарадзіла стойкі міф аб вясковай прыродзе беларускага народа. Сапраўдныя гістарычныя факты, зразумела, далёка няпоўныя, сведчаць аб тым, што ў старадаўнія часы ў нашых месцах назіралася актыўнае рамесніцка-цэхавае, у тым ліку і злотніцкае жыццё. Ніжэй паспрабуем зрабіць агляд злотніцкай дзейнасці ў беларускіх гарадах.

**Бабруйск.** Першым, вядомым па літаратурных крыніцах, тутэйшым майстрам з'яўляецца нейкі Багдан. Ён жыў у месце ў 20-х гг. XVII ст. Больш падрабязна адлюстраваліся ў дакументальных крыніцах бабруйскія злотнікі XIX ст. На той час, па няпоўных падліках, у месце працавала звыш двух дзесяткаў ювеліраў і рэзчыкаў пячатак. Звесткі пра іх сканцэнтраваныя, галоўным чынам, у канцы 40-х – пачатку 50 гг., калі мінскай проберскай палатай былі выяўлены факты выпуску недобраякасных залатых і срэбных вырабаў. Мінскім губернскім праўленнем разглядалася справа аб вырабе нізкапробнай залатой і срэбнай прадукцыі, якая кляймілася зробленым таксама ў Бабруйску фальшывым кляймом з лічбамі «84». Усяго па гэтай справе было прыцягнута каля паўтара дзесятка бабруйскіх майстроў разам са старшынёй Бабруйскага цэха залатых і срэбных спраў, які і ўзначальваў гэтае «прадпрыемства». У 80-х гг. XIX ст. у горадзе налічвалася 14 майстроў злотніцка-срэбраніцкага цэха, якіх узначальваў В. Смілавіцкі. У 50-х гг. ён быў вучнем і «вызначыўся» тым, што пад кіраўніцтвам свайго настаўніка зрабіў завушніцы са шклом, якое выдавалі за брыльянты.

**Бярэсце.** У рэвізіі места, якая адбылася ў 1566 г., згадваюцца 4 злотнікі [1]. Прывілей на заснаванне цэха быў нададзены берасцейскім злотнікам, першым сярод іншых местаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, 17 красавіка 1599 г. Статут быў зацверджаны мескімі ўладамі і літаральна праз два тыдні, 3 траўня, ён быў канфірмаваны каралём Жыгімонтам III Вазай. Цікавай асаблівасцю берасцейскага цэха было тое, што, акрамя злотнікаў, у яго стварэнні прынялі ўдзел і мастакі, што абумовіла існаванне аб'яднанага злотніцка-малярскага цэху. Адпаведна статуту, «калі каторы таварыш хацеў у Бярэсці стаць майстрай, павінен папярэдне працаваць у цэху два гады, каб ягоныя жыццё і паводзіны маглі быць пазнаны. Затым, жадаючы стаць майстрам, добра выхаваны і вывучаны, мусіў два гады ў далёкіх і чужых месцах займацца сваім рамяством похвальна і прыстойна яго вывучаць». Спачатку таварыш прымаў «права мескае» і прыносіў прысягу на вернасць Бярэсцю. Пасля гэтае працэдуры ў прысутнасці цэхмістра прэтэндэнт на званне берасцейскага злотнічнага майстра быў абавязаны «паказаць штукі рамяства свайго»: па-першае, мусіў зрабіць келіх, потым пячатку, на якой патрэбна было «вырыць» прылбіцу з наміткай альбо галінкамі ці кветкамі ўпрыгожаную, і, па-другое, мусіў умацаваць каштоўны камень у залатым пярсцёнку. У канцы дакумента было падкрэслена, каб цэх і ратуша таго места Берасцейскага узбраеннем былі забяспечаны. Берасцейскія рамеснікі, у адпаведнасці са згаданым прывілеем, былі абавязаны «кожныя пяць гадоў, ад зачацця цэху, набываць штогадова пулгак [мушкет сярэдняга памеру. — *А. Ц.*] і шэфелін [піку. — *А. Ц.*], каб праз дзесяць гадоў яны мелі цэлую збраёўню». Прывілеямі іншым злотнічным цэхам таксама падкрэсліваецца, што цэху неабходна мець «харугву, бубен і ўселякую армату срэбную для абароны і аздобы места тамтэйшага».

Статут брацтва быў канфірмаваны сынам Жыгімонта III — каралём Уладзіславам IV 2 лютага 1633 г. Дадаткова да папярэдніх артыкулаў кароль падкрэсліў, што ніхто іншы, акрамя злотнікаў цэхавых, прысяглых, не можа «смалеваць» срэбра ў месце. У гэтым жа дакуменце было пазначана, што замкавы ўрад не можа прыцягваць злотнікаў да свайго суду, і яны падлягаюць толькі юрысдыкцыі Берасцейскага ўрада.

За перыяд з другой паловы да канца XVI ст., па няпоўных дадзеных, зафіксавана сем майстроў, у XVII ст. іх фіксуецца звыш тузіна. Калі Бярэсце страціла ваяводскі статус і стала звычайным павятовым цэнтрам Гродзенскай губерні, у XIX – пачатку XX ст., паводле архіўных

---

[1] Тодар Забела. Места Берасцейскае ў XVI сталецці (Социяльна-эканамічны нарыс). Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кніга 8. Праца клясы гісторыі. Том III. Мн., 1929. С. 81–126.

статыстычных дадзеных, рамеснікаў, занятых злотніцкай і срэбраніцкай справай і рэзаннем пячатак, было трохі больш дзесятка.

**Вільня.** Злотнічныя традыцыі ў гэтым месце існавалі з глыбокай старажытнасці. Прывілей на злотніцкі цэх быў атрыманы «перад святам св. Барталамея» у 1495 г. Ён быў пацверджаны і атрыманы віленскімі майстрамі ў 1516 г., у дзень «пасля фэста св. Марціна».

Як сведчаць гістарычныя крыніцы, злотніцкае рамяство не заўсёды існавала ў межах толькі цэхавых структур. У гэтым аспекце нам уяўляецца цікавым наступны дакумент, што быў дадзены каралём Жыгімонтам Аўгустам, а менавіта «Подтверждение золотаром виленским Литве и Руси, тым которые не суть в цэху золотарском…» ад 22 кастрычніка 1544 г. Апошнія скардзіліся на залатароў віленскіх — палякаў і немцаў, якія падпарадкоўваліся злотніцкаму цэху, і « …нехотечи им допустити роботы золотарское … робити на коморах их золотарских…», з патрабаваннем далучыцца да цэху, папярэдне здаўшы іспыты, а дакладней зрабіўшы «мейстерштуки». Сваім прывілеем кароль дазволіў тутэйшым майстрам «…подле давного обычаю тую роботу золотарскую в месте виленском без жадных цэхов и без мейстершков робити……золтаром цэховым …нашим приказали же бы они … …роботы золотарское мати им не забороняли …которые трудности в томъ имъ не задавали и къ цеху своему не приворочвали…». Гэты дакумент адлюстраваў супярэчнасці, што існавалі не толькі ў Вільні, але і ў іншых старажытных культурных цэнтрах Беларусі. Аднак, не заўсёды яны набывалі форму прамога супрацьстаяння, як гэта здарылася ў Вільні.

Першапачаткова цэхавы статут быў заактыкаваны мескім магістратам 9 сакавіка 1628 г., потым, 30 лістапада 1687 г. Мескі магістрат, у сувязі са скаргамі спажыўцоў на якасць залатых і срэбных вырабаў, дадаў да статута новыя артыкулы. Канфірмацыя гэтага дакумента была зроблена каралямі Жыгімонтам III Вазай і Уладзіславам IV, пазней, 30 чэрвеня 1664 г., Янам Казімірам. У прэамбуле гэтае канфірмацыі было падкрэслена, што даўнія «прывілеі, артыкулы і канфірмацыі загінулі падчас Маскоўскай акупацыі». Гэтыя «паракграфы» былі пацверджаны каралём Аўгустам Моцным 5 лістапада 1705 г. Апошняя канфірмацыя адбылася 12 лістапада 1774 г.

Вільня была не толькі буйным злотніцкім, але і эмісійным цэнтрам у перыяд Вялікага княства Літоўскага. Віленская мінца (манетны двор) функцыянавала з XV ст. да 30 снежня 1667 г. Сваю дзейнасць пачала ў часы Вітаўта (1392–1430) выпускам дэнараў; пры вялікім князю літоўскім і каралю польскім Аляксандры Ягелончыку (1492–1506) тут выпускаліся срэбныя манеты наміналам ад дэнарыя да гроша; у часы праўлення Жыгімонта Старога (1506–1548) прадукцыяй гэтае мінцы

былі паўгрошы і грошы, а ягоны сын — Жыгімонт Аўгуст (1548–1572) даў мінцы прывілей выпускаць агульныя, для ўсёй Рэчы Паспалітай, грошы. З гэтага часу пачалося карбаванне манет са спалучаным чатырохпалёвым гербам (Арол + Пагоня). На ўсіх грашовых знаках, што былі выпушчаны тут, прысутнічаюць гербы падскарбіяў ВКЛ або апазнавальныя знакі арандатараў мінцы. Адным з першых, вядомых нам, віленскіх проберaў быў Пётра Платын. Ён згадваецца 6 лютага 1592 г. у лісце Жыгімонта Аўгуста аб «вызваленні» яго з вязення і вяртанні яму «друку і інструментаў»(металаапрацоўчых). 5 красавіка таго ж года кароль Жыгімонт Аўгуст выдае ліст аб непадсуднасці П. Платына віленскаму земскаму і гродскаму судам. Потым быў Ян Цірлзе, які фігуруе ў консэнсі 1601 г. караля Жыгімонта III Вазы, якім апошні зацвярджае ліст падскарбія А. Завішы аб змене пробераў. На ягонае месца трапіў Ян Дзітмар, які заняў пасаду пробера ў тым жа 1601 г. Пры ўзвядзенні яго на пасаду замест Я. Цірлзе ў лісце падскарбія патрабуецца, каб «пенёндзы ў мінце рабіліся белыя патройныя срэбныя». Наступны пробер — Ян Трыльнер, што згадваецца ў дакументах за 1614–1648 гг. У 1614–1616 гг. ён судзіцца са злотніцкім брацтвам, паколькі цэхавыя старшыя «містры» адмаўляліся ўнесці ў свой рэестр ягонага сына — Ганyса. Апошні ў 1632–1633 гг. і каля 1649 г. выконваў «дзяржаўныя заказы», «вырыў» (зрабіў) срэбныя пячаткі для Канцылярыі ВКЛ часоў праўлення караля польскага, вялікага князя літоўскага Ўладзіслава IV і ягонага наступніка Яна II Казіміра. У «дыпломе» віленскага біскупа Юрыя Белазора ад 1663 г. згадваецца «фактор» Андрэй дэ Горн, якому дазваляецца «выбіваць» на віленскай мінцы «орты, шэлягі, патройныя і пулторакі, і грошы так, яко до того в Короне Польской біто» на агульную суму звыш пяці мільёнаў злотых. Дзейнасць тутэйшых ювеліраў не заўсёды працякала ў бясхмарнай абстаноўцы — у 1776 г. у выніку цеснага хаўрусу паміж віленскім магістратам і тутэйшым кагалам не вытрымаў нячэснай канкурэнцыі і знік «юбілерскі» цэх [2].

Адным з лепшых віленскіх злотнікаў, па вызначэнню сучаснікаў, быў Крыштаф Струнк. Ён атрымаў ад караля Уладзіслава IV прывілей, якім, за «умельства ў сваім раместве», быў залічаны ў лік каралеўскіх слуг і вызвалены з пад юрысдыкцыі ўсіх уладаў, акрамя асабістай падсуднасці каралеўскаму двару. Гэта здарылася 29 чэрвеня 1634 г.

Вільня з’яўлялася цэнтрам падрыхтоўкі злотнікаў з розных гарадоў і мястэчкаў як Вялікага княства Літоўскага, так і замежных дзяржаў (Германіі, Чэхіі, Польшчы, Італіі і Масковіі). Як адзначалі даследчыкі Е. Лапацінскі і Э. Максімава, з 1650 па 1750 гг. злотніцкую адукацыю ў Вільні атрымалі больш як 250 чалавек (мал. пячаткі).

---

[2] НГАБ. КМФ-18. Спр. 132. Арк. 173 адв.–178.

Пасля далучэння ў 1795 г. да Расійскай імперыі, да пачатку дзейнасці віленскай проберскай палаткі, функцыі нагляду за чысцінёй і якасцю каштоўных металаў ускладаліся на розныя ўстановы — рамесныя ўправы і проберскія канторы. Адпаведна з пастановай 1816 г. Маскоўскай горнай палаты пры Міністэрстве фінансаў Расіі была «устроена» проберская палатка. Віленская акруговая проберская палатка пачала дзейнічаць у месце з 1821 г. Першым проберам быў Караль Праторыус, які займаў гэтую пасаду з 1821 па 1833 г. Усяго ў Вільні за XIX ст. дзейнічалі 33 проберы [3]. Увогуле віленскія проберскія ўлады з 1888 г. значна пашырылі тэрыторыю сваёй дзейнасці — адпаведна з пастановай Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства ад 12 (22) снежня 1888 г. у Мінску была скасавана проберская палатка [4]. Яе функцыі былі перададзены ў Вільню, праўда, фактычна дзейнасць Мінскай проберскай палаткі спынілася толькі ў канцы 80-х гг. XIX ст. На такім значна пашыраным абшары віленскія проберскія ўлады дзейнічалі і на пачатку XX ст.

**Віцебск.** Традыцыі злотніцкага рамяства, безумоўна, існавалі тут з глыбокай старажытнасці. Упершыню злотнікі афіцыйна фігуруюць сярод «людэй рамесных» у прывілеі караля Жыгімонта III Вазы ад 17 сакавіка 1596 г. У ім гаварылася: «Каждому цеху свою хоругов… …мети позволяемъ и вечне утверждаемъ…». Пры гэтым «золотары» афіцыйна фігуруюць на першым месцы ў пераліку прадстаўнікоў розных спецыяльнасцяў, што можа ўскосна сведчыць аб іхняй удзельнай вазе ў мескай рамеснай вытворчасці [5]. Усяго за XVI–XVIII стст. намі адшуканы 20 прадстаўнікоў гэтай прафесіі ў згаданым месце. Праўда, у дакументальных крыніцах рамеснікі–злотнікі найбольш інтэнсіўна фіксуюцца з другой паловы XVII ст., калі іх налічваецца 16 чалавек. Аднак толькі чацвёра лакалізуюцца ў Віцебску, астатнія былі вывезены ў Маскву падчас т. зв. «руска-польскай вайны». Шасцёра з іх не выклікалі даверу царскіх улад і былі па палітычных меркаваннях звольнены са сваіх пасадаў у 1663 г. Недахоп дакументальных крыніц ставарае пэўную «лакуну» у нашых ведах па дадзенаму прадмету з другой паловы XVII ст. да пачатку XIX ст.

Падчас знаходжання места ў складзе Расійскай імперыі злотніцкае рамяство набыло тут новыя, больш шырокія маштабы. Гэтаму спрыялі як старадаўнія традыцыі, так і атрыманы Віцебскам статус новай для Беларусі адміністрацыйнай адзінкі — губерні. Гэты статус і абумовіў узнікненне

---

[3] Laucevičius E., Vitkauskenė B. R. Lietuvos Auksakalyste XV–XIX amzis. Vilnius. 2001.
[4] НГАБ. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 326. Арк. 4.
[5] Сапунов А. Витебская старина. Т. 1. С. 77, 80.

новых устаноў, у тым ліку і проберскай палаткі. Яна была ўтворана пастановай ад 1816 г. Маскоўскай горнай палаты пры Міністэрстве фінансаў Расіі. Першым, вядомым на сёння проберскім майстрам быў віцебскі мешчанін, злотнік В. І. Розэт, які ў 1819 г. быў накіраваны за «казённы кошт» у Маскоўскае горнае праўленне для вучэння проберскаму «мастацтву». Пасля заканчэння вучобы ў 1820 г. быў накіраваны на працу ў Віцебск. Фактычна проберская палатка пачала дзейнічаць у Віцебску адпаведна з Указам Віцебскага губернскага праўлення ад 10 кастрычніка 1820 г., калі Розэт і быў прызначаны сюды проберскім майстрам. Па тагачаснай традыцыі для размяшчэння проберскай палаткі гарадскія ўлады арандавалі памяшканне. Часта, як гэта сталася і ў нашым выпадку, гэта быў уласны дом проберскага майстра, там яна размяшчалася каля дваццаці наступных гадоў. В. І. Розэт выконваў свае абавязкі па проберскай частцы амаль дваццаць пяць гадоў. Толькі ў 1844 г. ён атрымаў загад здаць «…дела, книги, инструменты и прочее имущество Пробирной палатки…» для перадачы свайму пераемніку — Палякову. Пасля ўтварэння 27 лістапада 1840 г. Віцебскай мытнай проберскай палаткі 1-га разрада пасаду тамтэйшага пробера заняў А. Бялоў, праўда, на вельмі нязначны тэрмін. Затым у Віцебскую казённую палату 5 чэрвеня 1844 г. паступіла «объявление» «…об определении в оную исправляющим должность пробирера унтер-шихтмейстера Полякова» для іспытаў і кляймення золата і срэбра. У канцы мая 1845 г. з Пецярбурга ў Заходнія губерні быў камандзіраваны інспектар «проберных палаток» 5 класа Герман Обергаутман [6]. Магчыма, наступным пасля Палякова, выконваючым пасаду пробера Віцебскай мясцовай проберскай палаткі, стаў Іван Паварнаў. Звесткі аб ім трапляюцца ў 1856 г. Віцебская проберская палатка праіснавала да пачатку 80-х гг. XIX ст. Пазней, у адпаведнасці з проберскім статутам, што быў зацверджаны 9 лютага 1882 г., Рыжская проберская палатка выдала прадпісанне аб неабходнасці атрымоўваць «дозволительные свидетельства» [на права займацца рамяством. — *А. Ц.*] не пазней 1 лютага кожнага году [7]. Утрыманне проберскіх уладаў пацягнула даволі высокія траты мескіх грошай, пра што сведчыць прашэнне гарадскіх уладаў аб скасаванні нядоімак па падатках, што накапіліся за Віцебскам. Як сведчыць «Дело о снятии недоимки с гор. Витебска», «…за время существования в городе Витебского пробирного учреждения городским общественным управлением нанималось на средства города помещение, за которое в последнее время до 1884 г. уплачивалось по 300 руб. в год, тогда как подобные расходы прочие города Витебской губернии не несли…» [8].

---

[6] НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 12587. Арк. 1.
[7] Там жа. Ф. 2505. Воп. 1. Спр. 505. Арк. 1.
[8] Там жа. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 39 053.

Па размежаваных статыстычных дадзеных пазамінулага стагоддзя, у месце на 1867 г. па злотніцкай справе налічвалася майстроў — 14, падмайстроў — 6, вучняў — 9 чал. [9]. А паводле спіса цэхавых майстроў на 1892 г. у месце было 27 майстроў, што карысталіся правам удзелу ў абранні цэхавых старшыняў [10]. Увогуле, на працягу XIX – пачатку XX ст. у губерні намі зафіксавана звыш сотні рамеснікаў-спецыялістаў, што працавалі з каштоўнымі металамі і камянямі. Дакладней, у канцы XIX ст., паводле статыстычных дадзеных 1894 г., на тэрыторыі Віцебскай губерні ў злотніцтве працавала майстроў, падмайстроў і вучняў — 131 чал.

**Гародня.** Прадстаўнікі гэтай прафесіі жылі ў месце з глыбокай старажытнасці. На першую палову XVI ст. фіксуюцца тры злотнікі, у другой палове — два. У часы, калі ў Гародні быў фундаваны цэх, ёсць магчымасць меркаваць, хоць нам вядома толькі некалькі імёнаў рамеснікаў, што тут сфарміравалася пэўная група спецыялістаў гэтай прафесіі. У выніку яны маглі прэтэндаваць на ўтварэнне злотніцкага брацтва. 12 верасня 1637 г. была зроблена «актыкацыя» брацкага статута мескімі ўладамі (адпаведна з гэтым прывілеем свой галоўны алтар злотнікі мелі ў Гродзенскім фарным касцёле) і літаральна праз некалькі месяцаў, 10 снежня 1637 г., адбылося зацвярджэнне статута каралём Уладзіславам IV. Дзеля параўнання можна адзначыць, што магілёўскія злотнікі ў 1629 г. «заактыкавалі» свой статут на мескай ратушы, атрымалі каралеўскі прывілей і зацвярджэнне свайго статута толькі праз пяць гадоў.

Канфірмацыя статута адбылася па прашэнню бурмістра злотніка Станіслава Цвікліча 20 сакавіка 1650 г. [11] Найбольш каларытнымі ў асяроддзі гарадзенскіх злотнікаў нам уяўляюцца браты Станіслаў і Ян Цвіклі (Цвіклічы). Яны займалі ключавыя пазіцыі — старшых у цэху. Так было і ў мескім магістраце, калі браты абіраліся на пасады радцаў і бурмістраў, а Станіслаў быў нават абраны лентвойтам (1634 г.). Лентвойтам называецца і яго сын Казімір. Так, брат Станіслава Ян у 1671 г. адпаведна з тэстаментам свайго пляменніка Казіміра Цвікліча, лентвойта гарадзенскага, атрымаў «кунтуш лазаравы, шапку з выдры і пенёндзы». У канцы XVII ст. іхні родзіч Войтэх Цвікля быў прызначаны пажыццёвым старостай гарадзенскіх рыбакоў. За перыяд з XVI па XVIII стст., па далёка няпоўных дакументальных дадзеных, у месце налічваецца звыш двух дзесяткаў майстроў.

---

[9] НГАБ. Ф. 2505. Воп. 1. Спр. 114. Арк. 101.
[10] Там жа. Спр. 522. Арк. 5–5 адв.
[11] Там жа. КМФ-18. Спр. 123. Арк. 299.

Змена ўлады ў канцы XVIII ст. і атрыманне местам статуса губернскага цэнтра не магло не паспрыяць далейшаму развіццю гэтага рамяства. Па нашых няпоўных дадзеных, усяго ў Гарадзенскай губерні на працягу XIX ст. налічваецца звыш 39 чал., сярод якіх іудзеяў — 19, хрысціянаў — 6, нявызначанай рэлігійнай прыналежнасці — 5 чал. Не выключаецца, што агульная лічба злотнікаў у гэтай губерні мусіць быць значна большай. Паводле статыстычных матэрыялаў, што захаваліся ў архівах на працягу XIX – пачатку XX ст., на тэрыторыі губерні дзейнічала звыш сотні прадстаўнікоў гэтай прафесіі. У самой Гародні, паводле тых жа дадзеных, рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак, было звыш 30 чал.

Па вядомых на сёння дакументальных звестках, гарадзенскія проберскія ўрады дзейнічалі тут з пачатку пазамінулага стагоддзя. Проберская палатка ўзнікла, адпаведна з раней згаданай пастановай, у 1816 г. У 1821–1828 гг. яе ўзначальваў Іван Міхаэліс. Пэўныя змены надзорных урадаў адбыліся ў 60-х гг. таго ж стагоддзя. Дакументальныя дадзеныя пацвярджаюць, што ў месце на 1835 г. было чатыры ювеліры, а ў 1839 г. — дзевяць. У дакументах, датаваных красавіком 1862 г., згадваецца проберскі майстра Лаўрэн Балабанаў, які, мусіць, займаў гэтую пасаду з 1851 г. У маі 1862 г. на пасаду проберскага майстры прэтэндуе былы тутэйшы злотнік Ф. П. Венглеўскі, які 10 мая 1862 г. звярнуўся ў казённую палату з прашэннем назначыць яго на пасаду пробера. Гэта хадайніцтва не было задаволена: у архіўных крыніцах ужо ў чэрвені 1862 г. (да 1873 г.) называецца «выконваючым пасаду» пробера В. Зімін. Пасля ўступлення на пасаду разгарнуў бурную дзейнасць. Падчас яго знаходжання на гэтай пасадзе (ва ўсялякім выпадку ў першыя гады) адбывалася штогадовая змена проберскіх клейнаў. У Гародни, паводле статыстычных дадзеных, на працягу XIX ст. рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак, было звыш 30 чал. Юрысдыкцыя гарадзенскіх проберскіх урадаў распаўсюджвалася на тэрыторыю ўсёй губерні. Як сведчаць статыстычныя і іншыя крыніцы, на працягу XIX ст. у павятовых месцах — Ваўкавыску, Кобрыне і Пружанах — лічба асобаў, занятых у злотніцтве, вагалася ад шасці да двух. У Бельску, Драгічыне, Мельніку, Сакулцы, Янаве — ад трох да аднаго. Гарадзенская проберская палатка праіснавала да 80-х гг. XIX ст., калі яе функцыі перайшлі да Віленскай проберскай палаткі.

**Магілёў.** Цэх быў створаны адпаведна з ініцыятывай дванаццаці «людзей рамяства злотнічнага, якія звярнуліся ў мескую ратушу з прашэннем зацвердзіць іхні статут». Магістрат прыняў пастанову аб гэтым 20 верасня 1629 г. Яна «заактыкавала артыкулы парадку золотнічого» [12]. Кароль

[12] Историко-юридические материалы извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевсеой (далее — ИЮМ). Витебск, 1877. Т. 8. С. 426-431.

Уладзіслаў IV выдаў 22 чэрвеня 1634 г. «ліст-прывілей», які налічваў 24 артыкулы і паўтараў дакумент ад 20 верасня 1629 г. Уласна ад каралеўскай улады было прадпісана карыстацца канкрэтным цэхавым гербам. Гэта быў «леў за кратамі», якім яны [злотнікі магілёўскія. — *А. Ц.*] «маюць адзначаць свае вырабы і на харугвах меці». Тым жа прывілеем кароль дазволіў злотнікам, «ку хвале Богу», двойчы на год сыціць па дванаццаць пудоў мёду — першы раз на свята Трох Каралёў, другі — на Святога Пётру [13]. Праз год, пасля канфірмацыі цэху — 15 кастрычніка 1635 г., да злотнікаў далучыліся канвісары (валавяншчыкі) і масяжнікі (меднікі). Яны тлумачылі сваю ініцыятыву тым, што «для… недостатков…цеху своего особливого мети не могучы, приступили есмо вси згодне и одностайне до цеху злотницкого»… і прынялі на сябе абавязацельства «послушенство давати цехмистром обраным» да таго часу, пакуль яны не ўтвораць свой уласны цэх [14]. Гэты акт стаў штуршком для ўзнікнення спрэчкі паміж цэхам злотнікаў і магілёўскім рымарска-сядлярскім цэхам. Апошні, імкнучыся павялічыць сваю колькасць, і адпаведна паступленні ў сваю скрынку, пачаў дамагацца выканання павіннасцей з боку магілёўскіх бляхароў, масяжнікаў, канвісараў на карысць свайго цэха. Спачатку справу разглядаў мескі магістрацкі суд, але апошнюю кропку ў ёй паставіў каралеўскі суд, які ў 1636 г. пацвердзіў рашэнне тутэйшага суда і сваім дэкрэтам «узмоцніў і замацаваў навадалучаных да злотніцкага цэху» [15]. Маштаб і эканамічнае значэнне места ў краіне абумовіла наяўнасць вялікай колькасці рамеснікаў гэтае спецыяльнасці. За часы з XVI ст. па 70–я гг. XVIII ст. іх колькасць перавышае палову капы. Ён знаходзіцца на першым у краіне, пасля Вільні, месцы па колькасці рамеснікаў-злотнікаў. Большасць з іх тутэйшага паходжання, праўда, у месце працаваў і злотнік іудзей Мейта, які паралельна з заняткамі рамяством, як аб тым сведчаць дакументы, прыгандлёўваў яшчэ і гарэлкай. Працавалі ў месце і немцы, мяркуючы па прозвішчу, адзін з іх (Д. Дэверт) непасрэдна звязаны з утварэннем у Магілёве злотніцкага цэха. Дэверт нават быў абраны сваімі калегамі ў 1635 г. старшым цэха. У сваю чаргу, магілёўскія злотнікі працавалі ў Масковіі. Так, магілёвец Мікола Логвінаў у 1654 г. выконваў заказы Залатой палаты Маскоўскага Крамля. Бурная ваенная гісторыя «слаўнага места магілёўскага» не магла не сказацца адмоўна на развіцці розных галін вытворчасці, у тым ліку злотніцтва. Набыццё Магілёвам статуса губернскага места ў часы Расійскай імперыі стала пэўным штуршком для развіцця гэтае галіны рамеснай вытворчасці, але недахоп дакументальных крыніц значна звужае перспектывы пошуку. З поўнай упэўненасцю можна гаварыць аб існаванні тут у 20-х гг. XIX ст.

---

[13] ИЮМ. Т. 8. С. 494-502.
[14] Там жа. С. 218.
[15] НГАБ. КМФ-18. Спр. 316. Арк. 13.

проберскіх урадаў. Магілёўская проберская палатка функцыянавала, магчыма, да пачатку 80-х гг. XIX ст., пасля чаго яна была пераведзена ў Кіеў. Створана, калі ўлічваць час далучэння Магілёўшчыны да Расійскай імперыі, даволі позна: у адпаведнасці з пастановай Маскоўскай горнай палаты, ад 1816 г. пры Міністэрстве фінансаў Расіі. Да гэтага часу кантрольныя функцыі ўскладаліся на розныя ўстановы — рамесныя ўправы і проберскія канторы. Хутчэй за ўсё першым магілёўскім проберам быў Гурэвіч Гірша Гамшавіч, які ўжо да 1821 г. займаў пасаду пробермейсцера Магілёўскай губерні. На гэтай пасадзе ён апошні раз згадваецца ў 1847 г., у час звароту да начальства з прашэннем «аб задавальненні грашыма магілёўскага проберскага майстры» [16]. Некалькі пазней, у сярэдзіне XIX ст., гэтую пасаду займае Янкель Кельн. Звесткі аб наступных магілёўскіх проберах пакуль не высветлены. Больш падрабязныя звесткі вельмі праблематычныя ў сувязі з тым, што матэрыялы аб дзейнасці Магілёўскай рамеснай управы і блізкіх ёй па функцыях устаноў у дакументальных фондах на тэрыторыі Беларусі не захаваліся.

Што тычыцца Магілёўскай проберскай палаткі — яна дзейнічала да 80-х гг. XIX ст., пасля чаго функцыі кляймення і выдачы дазволаў майстрам на заняцце рамяством перайшлі на Кіеў.

**Мінск.** Упершыню злотнікі згадваюцца, калі ў «годзе 1591 месяца снежня 2 дня» створаны ў месце цэх «васьмі рамёстваў» — сюды ўваходзілі кавалі, катляры, слесары, пабраічы (спецыялісты па вырабу конскай збруі), пушкары, мечнікі, нажэўшчыкі і «з-за малой лічбы містроў у месце» — злотнікі. Гэты «парадак цэхавы…» быў пацверджаны каралём Жыгімонтам III Вазай 20 лістапада 1592 г.

Толькі амаль праз дваццаць пяць гадоў — 31 траўня 1615 г. минскія злотнікі атрымалі прывілей на права заснавання свайго асобнага цэха [17]. У ім былі сфармуляваны цэхавыя артыкулы, там было падкрэслена: «На астатак [дазваляецца] мець сваю цэхавую пячатку, бубен і армату, патрэбную для абароны і аздобы … места». Разам з тым, акрамя «парадку статутовага» і ўзаемаадносінаў паміж майстрамі, падмайстрамі, вучнямі і чаляднікамі, прадугледжвалася, каб цэх меў свае ўласныя пячатку і харугву, пад якую былі абавязаны стаць іншыя рамеснікі, якія не мелі ўласных цэхаў. На жаль, сёння няма звестак аб тым, якія сімвалы ці гербы іх упрыгожвалі. У тым жа дакуменце было падкрэслена, што іхні «дом цэхавы» вызваляўся ад усялякіх пастояў. Стварэнне асобнага цэха не вырашыла ўсіх супярэчнасцяў, якія існавалі паміж злотнікамі (магчыма, не ўсе з іх імкнуліся далучыцца да цэха, жадаючы працаваць аднаасобна,

---

[16] НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 18 496. Арк. 1–2.

[17] Цітоў А. К. Менск — места майстроў. Мн., 2003. С. 43–50.

як гэта было ў Вільні). На гэтыя спробы адасобіцца кароль Жыгімонт III Ваза 27 чэрвеня 1619 г. накіраваў мінскаму старосце Пятру Тышкевічу ліст, у якім патрабаваў, каб апошні прымусіў мінскіх злотнікаў да «паслушэнства цэхавым уладам і каб з цэху яны не выламываліся». Не выключаецца, што гэта водгук такога ж самага канфлікту, які здарыўся ў Вільні паміж тутэйшымі злотнікамі і новапрыбылымі. Але на гэты раз улада заняла больш актыўную пазіцыю і не стала «міндальнічаць» з «абарыгенамі». Нельга не адзначыць і пэўны «рэверанс» у бок цэхавых рамеснікаў — кароль падкрэсліў, што прыезджым злотнікам, а таксама «купцам і жыдам» забараняецца прывозіць і гандляваць у Мінску вырабамі з золата і срэбра падчас з’ездаў і трыбуналаў. Пазней прывілей і статут былі пацверджаны па прашэнню злотніцкіх майстроў — Юр’я Эса (Гэса?) і Яна Горвата 29 чэрвеня 1634 г. каралём Уладзіславам IV. Пасля статут быў зацверджаны каралём Янам Казімірам 7 траўня 1664 г. Апошняя канфірмацыя папярэдніх прывілеяў зроблена 25 чэрвеня 1672 г. каралём Міхаілам, які паўтарыў прывілеі сваіх папярэднікаў, не дадаўшы асабіста ад сябе да статута нічога новага.

Лепшым з мінскіх майстроў быў патомны злотнік Матыс Бальцаровіч. Нарадзіўся ён у бацькоў пратэстанцкага веравызнання — Людвіка і Раіны, якая была на той час у трэцім шлюбе. Матыс 29 ліпеня 1645 г. атрымаў каралеўскі прывілей на права вольнага гандлю ў Кароне і ВКЛ і за «умеетнасць» прыняты ў лік каралеўскіх слуг. Неаднаразова абіраўся мескім радцай і бурмістрам. Апошняя знойдзеная намі згадка аб ім датуецца 1671 г., калі ён названы старшым злотніцкага цэха і мінскім радцай.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі «золата — срэбніцкае рамяство» у Мінску атрымала новы імпульс. Як цэнтр губерні ён стаў прыцягальным рынкам збыту і месцам жыхарства для рамеснікаў розных спецыяльнасцяў, у тым ліку і злотнікаў. Адпаведна з дакументальнымі дадзенымі, у тыя часы цэх узначальваўся выбарным старшынёй і двума ягонымі памочнікамі — таварышамі старшыні, якія таксама падлягалі штогадоваму абранню на агульнацэхавай сходцы.

Кантрольныя функцыі за тутэйшымі злотнікамі былі ўскладзены на адпаведныя ўстановы нагляду і за якасцю іхняй прадукцыі. Праберскія ўрады ў Мінску існавалі з пачатку XIX ст. Яны ўзніклі ў адпаведнасці з вышэйзгаданай пастановай 1816 г. На той час у Мінскай губерні налічвалася 87 майстроў залатых і срэбных спраў. Безумоўна, найбольшая іх колькасць была ў губернскім месце — 30 чал. У сувязі са значна меншай лічбай майстроў у цэнтрах паветаў была прынята пастанова, што «няма патрэбы ўстанаўліваць праберскія палаткі ў павятовых местах, пакідаючы гэта для больш зручнага часу». Адпаведна з рашэннем 1819 г. Мінскай грамадзянскай камісіі «обще» з гарадскім

магістратам было пастаноўлена паслаць аднаго чалавека «хорошего поведения, имеющего грамоту» у Маскву для вывучэння проберскай справы [18]. Першым вядомым за царскія часы проберскіх спраў майстрай быў тутэйшы мешчанін С. Г. Анташкевіч. Ён быў накіраваны з Мінска на вучобу ў Маскву і «по окончании наук» у 1827 г. вярнуўся ў свой горад на пасаду, якую займаў да дня сваёй смерці — 14 сакавіка 1850 г.

У сярэдзіне XIX ст. у месце існавалі дзве самастойныя, але блізкія па сваіх прафесійных інтарэсах групы рамеснікаў — срэбраніцкі цэх, дзе ў 1849 г. было 18 майстроў і 5 вучняў, і «юбілерскі» цэх. У той самы час у Мінску налічвалася 45 майстроў і 5 падмайстраў «юбілерскага рукадзелля» [19].

Чарговая рэарганізацыя мінскага злотніцка-срэбраніцкага цэха адбылася ў сувязі з Указам Мінскага губернскага праўлення ад 14 сакавіка 1853 г. Адпаведна з дадзенымі развіцця прамысловасці па губерні, якое было складзена на пачатку 80-х гг. XIX ст., у горадзе было 40 майстроў і падмайстраў злотніцка-срэбраніцкага майстэрства. Ужо ў 1854 г. у мінскім злотніцка-срэбраніцкім цэху налічвалася 53 спецыялісты [20]. Сярэдні штогадовы заробак гэтага рамяства вагаўся ад 1000 да 5000 руб. Сваю прадукцыю яны рэалізоўвалі як на месцы, па губерні, так і ў буйных цэнтрах Расійскай імперыі. Зразумела, каб не было спакусы, працавалі пад пільным наглядам проберскай палаткі.

Як правіла, проберская палатка размяшчалася ў памяшканні, якое здымалася менавіта з гэтай мэтай у тутэйшых мяшчанаў. Мінская проберская палатка з 1860 па 1866 гг. размяшчалася на вул. Бернардзінскай, у камяніцы ўдавы аптэкара Фохта. Пасля некалькі разоў свой дом на Віленскай «надбрежнай» здаваў мінскі купец А. Ліхтэрман (дагавор з арандатарам падпісваўся на тры гады, па 140 руб. срэбрам у год). Увогуле, проберскія ўлады існавалі ў месцы да 1888 г.

Усяго, па літаратурных дадзеных (праўда, не заўсёды пацверджаных дакументамі і архіўнымі ці музейнымі крыніцамі), праз мінскія проберскія ўрады прайшло з дзесятак спецыялістаў, якія займалі гэтыя пасады і адпаведна пакінулі свае клейны на вырабах мінскіх майстроў. Сёння гэтыя клейны засталіся адзіным сведчаннем іхняга фукцыянавання.

Паводле пастановы Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства ад 12–22 снежня 1888 г. у Мінску была скасавана проберская палатка (яе функцыіі былі пераадрасаваны Вільні) [21].

---

[18] НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 165. Арк. 196.

[19] Там жа. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 338. Арк. 20–21, 49–50.

[20] Там жа. Спр. 770. Арк. 2–3, 7 адв., 9.

[21] Там жа. Ф. 10. Воп. 1. Спр. 326. Арк. 4.

**Навагрудак.** Нягледзячы на сваю багатую палітычную гісторыю, злотніцкае рамяство, як нам здаецца, не дасягнула ў гэтым месце таго ўзроўню, як гэта адбылося ў такіх местах, як Вільня, Магілёў ці Мінск. У дакументах першай паловы XVI ст. згадваецца адзін злотнік, праз стагоддзе ў дакументальных крыніцах (падчас стварэння злотніцкага цэха) іх налічваецца трое. Прывілей на стварэнне цэха быў зацверджаны ў Вільні каралём Уладзіславам IV 10 чэрвеня 1636 г. па ініцыятыве чатырох старшых злотніцкага рамяства, якіх узначальваў бурмістр Міхаіл Вільгемовіч, як падкрэслена ў дакуменце, «для захавання паміж сабой [злотнікамі. — *А. Ц.*] любові і братэрскай згоды, для лепшага вучэння недасканалай у тым раместве моладзі [і. — *А. Ц.*] для пакарання свавольных …». Папярэдне гэты дакумент быў зацверджаны мескімі ўладамі 10 траўня 1636 г. Да тэксту цэхавага статута каралеўская ўлада дадала, што, для таго, каб усе злотнікі знаходзіліся пад мескай юрысдыкцыяй, іншым злотнікам забаранялася працаваць або рэалізоўваць у месце сваю прадукцыю. Сярод цэхавых атрыбутаў злотніцкі цэх мусіў, па прыкладу сталічнага места Вільні, мець уласную пячатку з гербам, пэўным, да іх цэха належачым, і харугву, пад якую ў час ваеннай небяспекі, вялікіх рэлігійных святаў і інш., акрамя іх саміх [злотнікаў. — *А. Ц.*], былі абавязаны станавіцца і навагародскія цырульнікі. Для «памнажэння» гэтага цэха мясцовым злотнікам дазвалялася запрашаць і прымаць у сваё асяроддзе рамеснікаў сваёй спецыяльнасці з іншых местаў і мястэчкаў, «людзей са свядзецтвам, пачцівых і рамяство добра умеючых». Магчыма, гэтае рамяство не атрымала ў месце далейшага развіцця, таму ў дакументальных крыніцах звесткі пра тутэйшых злотнікаў амаль не трапляюцца: усяго намі зафіксавана за XVII–XVIII стст. толькі сямёра рамеснікаў гэтае спецыяльнасці. Яшчэ менш дакументальных дадзеных у нашым распараджэнні на перыяд, што тычыцца XIX і пачатку XX ст.

**Нясвіж.** Размяшчэнне ў месце цэнтра княжацкай ардынацыі і сталіцы аднайменнага княства не магло не паўплываць і абумовіць наяўнасць вялікай колькасці рамеснікаў, што абслугоўвалі як гаспадарчыя патрэбы двара, так і тутэйшых мяшчанаў. За час з канца XVI – па пачатак XIX ст. у Нясвіжы дзейнічала не меней сямі паўнавартасных рамесных цэхаў. Праўда, трэба адзначыць той факт, што злотніцкага цэха сярод іх не назіралася за ўвесь згаданы перыяд. Гэты факт не выключае іхняга «аднаасобнага» існавання, калі яны, хоць і не былі аб'яднаны ў адзіную ўстанову рамеснае брацтва — цэх, але падпарадкоўваліся і кантраляваліся ў сваёй дзейнасці княжацкай, некаторыя касцёльнай, а таксама і магістрацкай адміністрацыяй. Па нашых няпоўных дадзеных, тут на працягу згаданага перыяду дзейнічала звыш дваццаці пяці майстроў-ювеліраў. Гэты факт не выключаў таго, што прадстаўнікі

княжацкага двара перадавалі дарагія заказы злотнікам Варшавы, Дрэздэна, Парыжа і іншых еўрапейскіх гарадоў. На жаль, прыходзіцца канстатаваць той факт, што большая частка гэтай «злотнічай» спадчыны рассеяна віхурамі гісторыі і асела ў сховішчах суседніх дзяржаваў, галоўным чынам на Усходзе.

**Пінск.** Хоць асобнай злотнічнай суполкі тут не было, але злотнікі ўпершыню згадваюцца ў дакументальных матэрыялах ужо ў пачатку XVI ст. Пазней яны фігуруюць на першых ролях у 1639–1640 гг., падчас стварэння ў месце аб’яднанага злотніча-кавальска-катлярска-мечнічага цэха [22].

**Полацк.** З глыбокай даўніны меў традыцыі рамеснай вытворчасці, што абумоўліваліся палітычным становішчам места Полацкага як цэнтра магутнага княства. Добра вядомы і сучаснай грамадскасці злотнік — майстра Лазар Богша, які зрабіў у 1161 г., па загаду князёўны Еўфрасінні Полацкай, крыж. Гістарычныя абставіны зменшылі ролю гэтага места ў дзяржаве, што, безумоўна, знізіла і працэнт рамеснікаў гэтай спецыяльнасці ў месце. Тым не менш, рамесніцкае насельніцтва Полацка займала даволі значную нішу як у грамадскім, так і эканамічным жыцці места. У выраку вялікага князя літоўскага і караля польскага Аляксандра ад 30 снежня 1502 г. па скарзе полацкіх мяшчанаў на «пана полацкага» Станіслава Глябовіча, які ўціскаў іх майдэборскія вольнасці і правы, першымі сярод рамеснікаў фігуруюць «золотари» [23]. Той самы факт фіксуецца і ў канфірмацыйным прывілеі на майдэборскія правы месту ад 1510 г., дзе таксама першымі сярод рамеснікаў ізноў згадваюцца «золотари». Гэта можа ўскосна сведчыць аб іхняй удзельнай вазе ў агульнай структуры тутэйшай рамеснай вытворчасці [24]. На сённяшні дзень статут злотнікаў не знойдзены, але ў дакуменце, які атрымалі палачане 28 снежня 1605 г., прадугледжваўся «парадак, [які. — *А. Ц.*] з немецка цэхом называют», тут жа агаворвалася: «Абы во всемъ прыкладом цехов в месте виленском будучых справовалисе … в месте своёмъ способни быти могли». У дакуменце згадваюцца кавалі, катляры, слесары, мечнікі, краўцы, кушняры, шапнікі, чабатары, гарбары, шаўцы і «золатары» [25]. Далей было падкрэслена, што «до которого права и порадку цехового и золотаров того ж места прылучаем…». Дакументальных звестак аб майстрах гэтага места, якія б працавалі непасрэдна ў

---

[22] Собрание древних актов Минской губернии, 1845 (далее — СМГ). Мн., 1845. С. 221–223.
[23] Полоцкие грамоты. Вып. 2. М., 1978. С. 197.
[24] Акты Западной России (далее —АЗР). СПб, 1848. Т. 2. С. 76.
[25] НГАБ. КМФ-18. Спр. 88. Арк. 235–236 адв.

ім у XVII ст., пакуль што не адшукана, але інфармацыя аб злотніках, якія былі вывезены ў Маскву падчас рэлігійных войнаў сярэдзіны XVII ст., захавалася. Там зафіксавана ў гэты перыяд шэсць майстроў і вучняў, якія паходзілі адсюль. У 1660 г. у маскоўскай срэбранай палаце майстрамі былі Сямён Якаўлеў і С. Астаф'еў, яны мелі вучняў, праўда, звесткі аб іх губляюцца па прычынах недахопу дакументаў і ў сувязі са смерцю хлопцаў. Толькі вучань С. Астаф'ева — Іван Палачанінаў згадваецца ў 1679 г. як лепшы майстра, які быў «пажалаваны палукармазінавым» сукном. З апошняй трэці XVIII ст. разам з іншымі гарадамі Усходняй Беларусі места апынулася ў межах Расійскай імперыі. Звесткі пра развіццё злотніцтва на гэты час даволі цьмяныя. Па літаратурных крыніцах, гэтаму гораду прыпісваюцца два проберскія майстры 1840–1842 і 1847 гг. Да нашага часу захаваліся іхнія клейны, як і клейны трох невядомых майстраў і майстры П. Саеўскага [26]. На наш погляд, з'яўляецца вельмі праблематычным факт наяўнасці паўнавартасных проберскіх урадаў у гэтым месцы. Хутчэй за ўсё на гэтую думку даследчыкаў магло падштурхнуць супадзенне графічных вобразаў гербаў гэтых гарадоў — вядома, што пасля далучэння да Расійскай імперыі значная колькасць тамтэйшых гарадоў атрымала даволі стандартныя выявы гарадскіх гербаў, што адрозніваліся паміж сабой толькі афарбоўкай дэталяў. На гербах гарадоў Полацка і Віцебска, выявы якіх былі прадстаўлены на проберскіх клейнах, — перасечаны шчыт, у горнай частцы якога выява паловы расійскага двухгаловага арла, а у дольнай — герб «Пагоня». На проберскіх клейнах, якія тады існавалі, з-за іхніх памераў было вельмі складана падкрэсліць каляровыя элементы гербаў. Гэты факт і мог падштурхнуць некаторых нашых папярэднікаў да памылковых высноваў.

**Слонім.** Места дало шмат майстроў-злотнікаў. У дакументальных крыніцах згадваюцца слонімцы — злотнікі рознай кваліфікацыі. Безумоўна, найвышэйшай дасканаласці ў сваёй кар'еры дасягнуў Станіслаў Даніловіч, які паходзіў са Слоніма, але пачаў свой шлях у майстэрстве з Вільні ў 1662 г. Пасля таго, як ён прайшоў вучнёўства і «адбыў службу таварыскую», ён у 1670 г. набыў статус віленскага грамадзяніна, даў пачатак віленскай дынастыі злотнікаў — Даніловічаў, пакінуў пасля сябе вучняў. Сярод ягоных таварышаў-падмайстраў у Вільні таксама часта фігуруюць слонімцы. Гэта сведчыць пра дух зямляцтва, якім ён карыстаўся пры падборы сабе памочнікаў. Памёр у 1706 г.

Сярод злотнікаў другой паловы XVII ст., акрамя згаданага вышэй С. Даніловіча, фігуруюць яшчэ, па меншай меры, восем ураджэнцаў Слоніма, і мы мяркуем, што гэты спіс не канчатковы. Для перыяду да

[26] Золотое дело… С. 238.

канца XVIII ст. выяўлены толькі два злотнікі, што, безумоўна, вельмі мала для такога места. Трэба адзначыць, што адзін з іх за злачынства быў прыгавораны ў 1707 г. да шыбеніцы і «всказаны на горло» у Магілёве.

У XIX ст. карціна рэзка змяняецца: у дакументальных крыніцах фігуруюць ажно дзесяць майстроў-злотнікаў, што, магчыма, з'яўляецца працягам даўняй традыцыі злотніцтва ў гэтым месце. А, увогуле, у самім месце, паводле няпоўных статыстычных дадзеных, на працягу XIX ст. рамеснікаў, занятых злотніцтвам і рэзаннем пячатак, было звыш 20. Ва ўсялякім выпадку, па колькасці ювеліраў Слонім знаходзіцца на адным з першых месцаў сярод тагачасных павятовых гарадоў Беларусі.

**Слуцк.** Статус сталіцы княства абумовіў той факт, што места стала буйным рамесніцкім цэнтрам. У XVII ст. у ім налічвалася значная колькасць рамесных цэхаў, праўда, злотніцкага сярод іх не згадваецца. А. П. Грыцкевіч адзначае наяўнасць у месце ў канцы XVI – першай палове XVII ст. цэха «золотых дел мастеров», а таксама піша аб аб’яднаннях рамеснікаў «серебряников… ювелиров… гравёров» [27]. Гэтая інфармацыя аб існаванні ў месце рамесных суполак такой накіраванасці не знайшла пацвярджэння ў нашых даследаваннях. Адсутнасць злотніцка-срэбраніцкіх рамесных аб'яднанняў не выключае наяўнасць у месце значнай колькасці рамеснікаў-індывідуалаў, што займаліся гэтым рамяством.

Наяўнасць багатага княжацкага двара абумовіла прысутнасць тут даволі значнай, у параўнанні з большасцю тагачасных местаў, колькасці злотнікаў. Дакладная інфармацыя аб майстрах гэтай прафесіі змешчана ў «інвентарах…» як места, так і ўсяго княства. Толькі ў XVIII ст. тут зафіксавана звыш двух дзесяткаў рамеснікаў-злотнікаў. Трэба адзначыць той факт, што некаторыя з іх былі прадстаўнікамі прафесійных дынастый, калі сыны асвойвалі бацькоўскую прафесію.

**Шклоў.** Найбольш старадаўнім пацвярджэннем аб злотніках, што былі ў месце, з’яўляецца скарга 1579 г. тутэйшага злотніцкага майстры Цярэшкі Лукашэвіча на нейкага Г. Максімовіча за тое, што апошні не аддаў актору (істцу) ягоных талераў. Другі злотнік — Васіль Грыгор’еў, ураджэнец Шклова, згадваецца як «жалаваны майстра» маскоўскай срэбранай палаты, якога называюць у маскоўскіх дакументах «поляк-иноземец». Ён пражываў (хутчэй за ўсё не па асабістаму жаданню) і працаваў у Маскве, як сведчаць пісьмовыя крыніцы, з 1660 па 1689 гг. Вядома, што ў XIX ст. было не менш за шэсць майстроў-злотнікаў, выхадцаў са Шклова.

---

[27] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии XVI–XVIII вв. Мн., 1975. С. 88.

*Ф. В. Чарняўскі*

## Крыштоф Валадковіч: факты з жыцця і дзейнасці

Чытачу прапаноўваецца біяграма такой выбітнай асобы, як Крыштоф Валадковіч, які з 1633 г. і па 1658 г. выконваў абавязкі пісара земскага Менскага ваяводства, а потым, да канца свайго жыцця, займаў пасаду ваяводы навагародскага і войта менскага. Падрыхтоўка гэтага матэрыяла вялася пераважна з выкарыстаннем архіўных дакументаў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, гродскага і земскага судоў Менскага ваяводства. У меншай ступені былі выкарыстаны дакументы судоў Навагародскага ваяводства і Гарадзенскага павета. Некаторыя звесткі атрыманы з літаратурных крыніц.

Крыштоф Валадковіч, дваранін караля польскага і вялікага князя літоўскага, спачатку пісар земскі менскі, а потым і ваявода навагародскі, адзін з найбольш вядомых прадстаўнікоў сям'і Валадковічаў герба «Радван». За сваё доўгае жыццё дасягнуў высокага становішча ў іерархіі Вялікага княства Літоўскага. Нягледзячы на даволі вялікую колькасць дакументаў, якія захаваліся з гэтага часу, пакінуў тым не менш шмат загадак, растлумачыць якія пакуль што ніхто так і не сабраўся. Да сённяшняга дня невядома, калі нарадзіўся Крыштоф Валадковіч, і прозвішча яго маці. Зусім мала вядома пра яго асабістае жыццё. У каралеўскіх прывілеях на наданне Крыштофу Валадковічу леннай маёмасці ў дажывоцце згадваецца пра яго ўдзел у розных ваенных экспедыцыях яшчэ з часоў Жыгімонта III. Вельмі цікавымі і да канца нераскрытымі з'яўляюцца абставіны, якія прывялі Крыштофа Валадковіча ў бліжэйшае акружэнне каралевіча Уладзіслава Вазы. Толькі дзякуючы таму, што Крыштоф Валадковіч быў пакаёвым дваранінам Уладзіслава IV і неаднаразова ўдзельнічаў у вайсковых экспедыцыях пад яго кіраўніцтвам у складзе асабістай харугвы каралевіча, можна растлумачыць атрыманне ім у 1633 г. урада пісара земскага менскага. На нашу думку, перад сваім вяселлем у 1620 г. Крыштоф Валадковіч значны час правёў у вайсковым абозе польскага каралевіча Уладзіслава, які ў кастрычніку 1618 г. спрабаваў узяць штурмам Маскву. Знаходзячыся пры Уладзіславе IV, Крыштоф Валадковіч прыняў удзел у вайне за Смаленск, якая адбылася на пачатку 30-х гг. XVII ст. Войска Вялікага княства Літоўскага аказала супраціўленне палкам Маскоўскай дзяржавы, якія спрабавалі вярнуць горад. Ведаючы геаграфію паходаў Уладзіслава IV пасля 1610 г., можна з некаторай пагрэшнасцю вызначыць тыя ваенныя экспедыцыі, як тады называліся войны, у якіх мог і ўдзельнічаў Валадковіч. У тых каралеўскіх прывілеях, наданне якіх адбывалася ўжо пры Уладзіславе Вазе, згадваецца аб удзеле Крыштофа Валадковіча «… у розных

ваенных экспедыцыях яшчэ пры Жыгімонце III, з нямалай стратай сваіх грошай…» [1, л. 316].

Крыштоф Валадковіч ніколі не ўзгадваў імя свайго бацькі. Толькі нядаўна, у дакуменце 1622 г. удалося сустрэць прамое сведчанне: Крыштоф Валадковіч мянованы Марцінавічам, суддзічам земскім менскім.

Большасць звестак пра будучага пісара земскага менскага ў працах гісторыкаў, якія грунтуюць свае даследаванні на простым пераказе паведамленняў Т. Жыхлінскага, не адпавядае праўдзе. Так, Тэадор Жыхлінскі паведамляе, што Крыштоф Валадковіч быў жанаты толькі на Гальшцы Друцкай-Сакалінскай, удаве князя Пятра Трубяцкога, падкаморыя старадубскага, і з ёю меў двух сыноў: старэйшага Марціна Казіміра, гараднічага і падстаросту судовага менскага, і малодшага Тэадора Валадковіча, спачатку войскага і суддзю гродскага менскага, а потым пісара земскага менскага, і дзвюх дачок: Зосю, за князем Аляксандрам Палубінскім, і Рэгіну, за князем Багданам Агінскім, падкаморыем трокскім [2, s. 424]. Аднак, на нашу думку, з паведамлення Т. Жыхлінскага толькі дзве дэталі адпавядаюць гістарычнай праўдзе: што Крыштоф Валадковіч сапраўды быў жанаты, праўда, шлюб быў нядоўгавечны, на Гальшцы (мы не ўжываем яе другое імя — Альжбета, якое, несумненна, было ўведзена ва ўжытак польскімі гісторыкамі значна пазней) Друцкай-Сакалінскай, і імя яго старэйшай дачкі Зосі, якая ўступіла ў шлюб з Аляксандрам, князем Палубінскім, пісарам польным ВКЛ, а ў канцы жыцця і маршалкам вялікім літоўскім. У пацвярджэнне нашай думкі можна паведаміць і тое, што кароль Ян Казімір 29 лютага 1653 г., праз сем год пасля ўступлення ў шлюб Крыштофа Валадковіча, пісара земскага менскага, і пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай, дае дазвол на пераход дажыватных правоў, заўважым, толькі ад самога Крыштофа Валадковіча, не ўпамінаючы яго жонку, на толькі што ўступіўшых у шлюб Аляксандра Гілярыя Палубінскага і пані Зосі Валадковічаўны, дачкі пісара земскага менскага [3, л. 352]. Зося Валадковічаўна ўступала ў шлюб, маючы каля 18–20 год ад нараджэння. А так як Крыштоф Валадковіч справіў вяселле з Гальшкай Друцкай-Сакалінскай у канцы 1644 г., то Зося Валадковічаўна магла нарадзіцца толькі пасля 1628 г., найбольш верагоднага часу ўступлення Крыштофа Валадковіча ў шлюб з пані Гальшкай Акунёўнай. У дадатак да ўсяго вышэйсказанага, гэтая ж інфармацыя ўскосна пацвярджае, што пані Гальшка Друцкая-Сакалінская памерла да 29 лютага 1653 г.

Усе астатнія звесткі ўзніклі толькі як дапушчэнне з-за немагчымасці больш дэталёвага даследавання архіўных крыніц і не адпавядаюць гістарычнай праўдзе. Тэадор Валадковіч, які нарадзіўся ў пачатку XVII ст., не мог быць братам Марціна Казіміра, так як быў яго стрыем

(дзядзькам), старэйшым братам бацькі. Ды і сам МарцінВаладковіч, суддзя земскі менскі, у першай палове XVII ст. піша, што Крыштоф Валадковіч з'яўляецца ягоным сынам ад першай жонкі, але, на жаль, не паведамляе яе імя і прозвішча. Крыштоф Валадковіч у дакументах, якія датычацца пані Дароты Дарагастайскай, ваевадзянкі смаленскай, другой жонкі Марціна Валадковіча, суддзі земскага менскага, ніколі не называе яе маці. Толькі Тэадор Валадковіч, войскі менскі, падпісваючы дароўны дакумент бацькі пані Дароце Манівід Дарагастайскай, звяртаецца да яе як да сваёй маткі. Што датычыцца бацькоў Міхала Станіслава, спачатку падсудка, а потым і суддзі земскага менскага, і Марціна Казіміра, будучага гараднічага і падстаросту судовага, а потым і пісара земскага менскага, Валадковічаў, то ў нашым распараджэнні маецца дакумент, складзены іх маткай пані Гальшкай Камаеўскай, у першым шлюбе — Адамавай Юдыцкай, а ў другім — Пятровай Валадковічавай, дзе яна, па смерці свайго мужа, запісвае сынам Міхалу Станіславу і Марціну Казіміру Валадковічам 100 коп грошай літоўскіх [4, л. 88]. Другая дачка Крыштофа Валадковіча — Іаана, а не Рэгіна, як у Т. Жыхлінскага, уступіла ў шлюб з Марцінам Міхалам Крыспін Кіршэнстайнам, старастам аршанскім, а з 1697 г. кашталянам троцкім, сынам Гераніма, падскарбія ВКЛ, і Ганны Млоцкай [5, s. 6].

Калі ж звярнуцца да шлюбных адносін, датычных героя нашага аповяда, то, па нашых падліках, Крыштоф Валадковіч, пісар земскі менскі, за гады свайго жыцця panaўляў шлюбы не менш чатырох разоў.

Раней мы ўжо пісалі, што нават дата нараджэння Крыштофа Валадковіча не ўстаноўлена. Аўтар нататкі ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі [6, с. 205] дапускае, што ён мог нарадзіцца ў 1600 г. На нашу думку, будучы ваявода навагародскі нарадзіўся значна раней. Марцін Валадковіч, суддзя земскі менскі, дзед Крыштофа, у свой другі шлюб з Рэгінай Друцкай-Горскай уступіў каля 1565 г. Старэйшыя яго сыны: Адам, гараднічы менскі, і Марцін, будучы падсудак, а потым і суддзя земскі менскі, згодна нашых меркаванняў, нарадзіліся да 1570 г. Такім чынам, Марцін Валадковіч, бацька Крыштофа, на 1600 г. меў не менш за 30 год ад нараджэння. Прымаючы гэтыя разважанні за адпраўны момант, з невялікай пагрэшнасцю можна дапусціць, што Крыштоф Валадковіч нарадзіўся ў 1593–1596 гг. Толькі пры такім дапушчэнні можна зразумець, што і ў двор каралевіча Уладзіслава Крыштоф Валадковіч трапіў у зусім маладыя гады, да 1615 г., ва ўзросце каля 20 гадоў.

**Шлюб з Аляксандрай Ваўрынцоўнай Дамінікоўскай.** Найбольш поўныя звесткі пра сямейнае жыццё Крыштофа Валадковіча падае яго нашчадак Андрэй Валадковіч. За час сваіх пошукаў ён устанавіў імёны і прозвішчы чатырох жонак пісара земскага менскага — гэта Ганна

Камаеўская, Гальшка Акунёўна, Гальшка Друцкая-Сакалінская і Ізабэла Масальская [5, s. 6]. У адным моцна памыляецца Андрэй Валадковіч, пані Ганна Камаеўская, у першым шлюбе Адамавая Юдыцкая, сапраўды была ў другім шлюбе за Валадковічам, але толькі за Пятром Марцінавічам, суддзічам земскім менскім, зводным братам Крыштофа Валадковіча. Што ж датычыцца самога Крыштофа Валадковіча, на той час пакаёвага двараніна каралевіча Уладзіслава, то ў свой першы шлюб ён уступіў у 1620 г. з пані Аляксандрай Ваўрынцоўнай Дамінікоўскай. Хаця і тут, магчыма, мы памыляемся, і для Крыштофа Валадковіча гэта мог быць другі шлюб.

Вядучы аповяд пра Крыштофа Валадковіча і дапаўняючы яго гісторыю асобнымі момантамі з жыцця яго жонак, мы зможам больш даведацца не толькі пра абставіны яго жыцця, але і зразумець прычыны, якія сфармавалі характар, патлумачыць матывы дзеянняў. Пры гэтым нам даецца магчымасць правесці больш шырокую рэканструкцыю грамадскага жыцця Вялікага княства Літоўскага ў першай палове XVII ст.

Першая жонка Крыштофа Валадковіча Аляксандра Ваўрынцоўна Дамінікоўская, з якой ён уступіў у шлюб да 8 сакавіка 1620 г. [7, л. 21–23], за сваё досыць доўгае жыццё ўжо пабывала ў шлюбе. Яе першы муж Станіслаў Мацеевіч Захарэўскі, падстолі земскі Менскага ваяводства, памёр, верагодна, пасля 1618 г. Апошні раз яго імя сустракаецца ў архіўных матэрыялах 11 жніўня 1616 г. У гэты дзень у Менскім гродскім судзе разглядалася справа, узбуджаная Паўлам Давыдавічам Есманам супраць Станіслава Мацеевіча Захарэўскага [8, л. 270]. Станіслаў Захарэўскі, сын каралеўскага ротмістра Мацея Захарэўскага і пані Ядвігі Кгавароўны [9, л. 339], упамінаецца ў актавых дакументах судоў Менскага ваяводства з 1592 г. Ужо тады ён быў жанаты, але, на жаль, у большасці дакументаў, якія трапілі ў нашы рукі, не прыведзена імя яго жонкі. Даследуючы гэтае пытанне, мы дапускалі, што, магчыма, Аляксандра Дамінікоўская і была якраз жонкай Станіслава Захарэўскага ў 1592 г., але поўнай упэўненасці ў гэтым не мелі. Да таго ж нам хацелася даведацца аб бацьках пані Дамінікоўскай і месцы іх пражывання. Сярод матэрыялаў архіва маёнтка Глыбокае Зяновічаў і Радзівілаў, з Галоўнага Архіва старажытных актаў у Варшаве, у скрыні пад нумарам 59 знойдзены прадажны ліст, складзены маткай Аляксандры Дамінікоўскай, пані Барбарай Богушаўнай, былой Ваўрынцовай Дамінікоўскай, а цяпер Андрэевай-Сушынскай [10, с. 5]. Аказваецца, Дамінікоўскія пражывалі ў Ашмянскім павеце і валодалі некаторай маёмасцю недалёка ад Глыбокага. Разам са сваімі дочкамі, старэйшай Аляксандрай і малодшай Гальшкай, і зяцямі яна прадала Мышкаўскі палац берасцейскаму ваяводзе Крыштофу Зяновічу. Нашы меркаванні атрымалі поўнае пацвярджэнне: на час складання прадажнага ліста на Мышкаўскі палац, менавіта

на 2 сакавіка 1592 г., Аляксандра Дамінікоўская была ўжо ў шлюбе з Станіславам Мацеевічам Захарэўскім. Так як у шлюбе была і яе малодшая сястра Гальшка, а яе шлюб хутчэй за ўсё адбыўся некалькі пазней за вяселле Аляксандры, то зусім верагодна, што шлюб Станіслава Захарэўскага з Дамінікоўскай мог адбыцца каля 1590 г.

Некаторыя, вельмі цікавыя звесткі аб генеалогіі Дамінікоўскіх прыводзіць у сваёй працы А. Банецкі. Згодна з яго паведамленнем, Дамінікоўскія, герба «Грымала», выйшлі з Канецкага і Шадкоўскага паветаў кароны Польскай [11, s. 349]. Да пачатку XVI ст. размяшчаліся ў Польшчы. Каралі польскія і вялікія князі літоўскія ахвотна пасялялі на сваіх уласных літоўскіх землях польскіх ваяроў, якія больш выдзяляліся, справядліва спадзяючыся атрымаць на ўсходзе Рэчы Паспалітай адданых слуг.

Улічваючы, што Аляксандра Дамінікоўская магла ўступіць у першы шлюб, маючы найменш семнаццаць гадоў, і пражыла са Станіславам Мацеевічам Захарэўскім каля чвэрці веку, то ў 1620 г. яна мела не менш за сорак год жыцця. Такі выбар маладога чалавека, які, па некаторых сведчаннях, на працягу ўсяго жыцця выдзяляўся не толькі вялікай фізічнай сілай, але і прыгажосцю, патрабуе тлумачэння. Магчыма, да такога кроку Крыштофа Валадковіча падштурхнулі няпростыя ўнутрысямейныя абставіны, якія склаліся паміж ім і бацькам — Марцінам Валадковічам, суддзёю земскім ваяводства Менскага. Неабходна ўлічваць, што Крыштоф Валадковіч быў сынам Марціна Валадковіча ад яго першага шлюбу, а ў суддзі земскага Менскага ваяводства ад шлюбу з Даротай Манвід Дарагастайскай, ваевадзянкай смаленскай, на 1620 г. ужо нарадзілася некалькі дзяцей, ды і сам ён быў яшчэ ў сіле і не збіраўся хутка паміраць, а пасля згаданага шлюбу свайго сына пражыў яшчэ амаль дваццаць год. Таму разлічваць на багатую спадчыну Крыштоф Валадковіч не мог. Зразумела, што і Марцін Валадковіч не збіраўся выпускаць са сваіх рук значныя грашовыя сумы і землі, неабходныя для забеспячэння маладому чалавеку здольнасці весці жыццё, адпаведнае яго стану. Якраз да перыяду 1620–1626 гг. адносіцца ўнясенне Марцінам Валадковічам у гродскія і земскія акты дакументаў, складзеных значна раней, з 1612 па 1615 гг. Такія дакументы звычайна складаліся праз некаторы час, прыкладна праз пяць-шэсць гадоў пасля шлюбу. Марцін Валадковіч, тады яшчэ падсудак земскі менскі, паступова перадаваў і замацоўваў за жонкай права на пажыццёвае карыстанне пляцамі з забудаваннямі ў Менску, землямі, рознай рухомай і нерухомай маёмасцю, значнымі грашовымі сумамі, забяспечанымі коштам розных менняў. Нам здаецца, што шлюб Крыштофа Валадковіча і спроба яго бацькі забяспечыць будучыню сваёй другой жонкі і дзяцей, народжаных у шлюбе з ёю, звязаны паміж сабой. Для маладога чалавека заставаўся адзіны выхад: знайсці хаця і састарэлую, але заможную ўдаву і ўступіць з ёю ў шлюб.

Наогул з інфармацыяй пра Крыштофа Марцінавіча Валадковіча да 1630 г. справа выглядае вельмі кепска. У нашы рукі за гэты перыяд трапіла некалькі паведамленняў: тры за 1620 г. і па аднаму за 1622, 1624 і 1628 гг. У сакавіку 1620 г. Аляксандра Дамінікоўская, пасля ўступлення ў шлюб, перадала Крыштофу Валадковічу ўсе правы на яе маёмасць, у тым ліку і на тую, што засталася ад першага мужа [8, л. 1005–1006, 1110]. Прычым правы на яе маёмасць перадаваліся Крыштофу Валадковічу, выключаючы правы ўсіх яе крэўных. Гэта значыць, што ў выпадку смерці Аляксандры Дамінікоўскай ніхто з яе блізкіх не мог прэтэндаваць на спадчыну, дабівацца ў судах атрымання спадчыннай маёмасці, рухомасці і грашовых сродкаў, належачых цяпер асабіста Аляксандры Ваўрынцоўне Дамінікоўскай.

8 сакавіка 1620 г. Крыштоф Валадковіч і Аляксандра Дамінікоўская, па невядомых нам прычынах, праз некалькі месяцаў пасля шлюбу заключаюць дамову з Мікалаем Млечкам, харужым аршанскім, аб продажы яму Халопеніч, размешчаных у межах Аршанскага павета. У склад грунтоў, атрымліваемых Мікалаем Млечкам за 12 000 злотых, уваходзілі частка Халопеніч, набытых у 1610 г. Станіславам Захарэўскім у Войцаха Дарагастайскага, ваяводзіча смаленскага, і частка гэтай жа маётнасці [1], раней належачай Адаму Валадковічу, гараднічаму менскаму, з дваром і сялом Халопенічы і сёламі Шчыраўка, Хацюхова, Залессе, Галькі з новапаселенымі слабодамі, таксама некалі выкупленыя Станіславам Захарэўскім. Нейкае святло на абставіны такой хуткай прадажы Халопеніцкай маётнасці пралівае звестка аб рэпратэстацыі Марцыяна Горскага, харужага віленскага, паданай 14 красавіка 1620 г. у каралеўскі асэсарскі суд. Харужы Віленскага ваяводства, уступіўшы ў шлюб з удавой, ваяводзічнай смаленскай, усур’ёз узяўся за вяртанне ў свае рукі зямель, якія некалі належалі Войцаху Дарагастайскаму. На Халопенічы прад’яўляў свае прэтэнзіі і Януш Кішка, староста парнаўскі і больніцкі. Акрамя ўсяго вышэйпералічанага ў руках Аляксандры Дамінікоўскай па смерці першага мужа засталася застаўная маётнасць Кіявец і Люцын. Люцын быў наданы Аляксандры Дамінікоўскай запісам яе мужа яшчэ ў 1600 г. [12, л. 434–435].

Пасля смерці Станіслава Захарэўскага яго сястра Юстына Захарэўская Юр’евая Кулявая спрабавала вярнуць што-колечы з маёмасці брата, але безвынікова. І Крыштоф Валадковіч, і Аляксандра Дамінікоўская на суд не з’явіліся [8, л. 144–145].

Дата смерці Аляксандры Дамінікоўскай Крыштофавай Валадковічавай намі не ўстаноўлена. Андрэй Валадковіч у сваім даследаванні пазначае, што яна памерла ў 1628 г. На жаль, даследчык не паведаміў аб

---

[1] Тут і далей пад «маётнасцю» разумеецца ўладанне, нерухомая маёмасць.

крыніцах, якія захоўваюць гэтую звестку. Невядома, ці былі народжаны дзеці ў гэтым шлюбе.

Звесткі, якія трапілі ў нашыя рукі, за перыяд 20-х гг. XVI ст. мала звязаны паміж сабой. Час і людзі моцна папрацавалі над знішчэннем архіўных дакументаў. Задоўга да пачатку 1622 г. у Менску адбылося крывавае забойства. Слуга Крыштофа Валадковіча, дваранін каралевіча Уладзіслава, Андрэй Дэмбінскі забіў шляхціча Януша Быхаўца. Справа была ўзбуджана чамусьці Янам Шчасным Галаўчынскім да Крыштофа Валадковіча. Па рашэнню суда, сказаўшага забойцу «на горла» (пакаранне смерцю), 4 сакавіка 1622 г. дворны генерал ВКЛ Давыд Масевіч разам з братамі нябожчыка Юр'ем і Базылём Быхаўцамі выканаў прысуд каралеўскага суда [13, л. 10]. Звычайна вяльможныя паны неахвотна выдавалі сваіх слуг на пакаранне, нават калі іх віна і была даказана. Крыштоф Валадковіч не абараніў свайго служку і не пайшоў насуперак рашэнню суда. Верагодна Крыштоф Валадковіч прыклаў шмат высілкаў, каб выратаваць Андрэя Дэмбінскага. Аднак справа ўскладнялася яшчэ і тым, што Быхаўцы былі набліжаны да Льва Сапегі, канцлера ВКЛ. У дадатак да ўсяго і Юр'я Быхавец, брат забітага Януша, займаў урад пісара гродскага Лідскага павета, а яшчэ адзін брат нябожчыка — Базыль Быхавец — на 17 лістапада 1608 г. працаваў у канцылярыі Вялікага княства Літоўскага. Ды і сам Януш Быхавец, згодна са звесткамі А. Банецкага, быў жанаты на Ганне Друцкай-Горскай, дачцы Яна Рыгоравіча Друцкага-Горскага, маршалка аршанскага [14, s. 358], якая знаходзілася ў блізкім сваяцтве з Валадковічамі. У дадатак да ўсяго гэтага Януш Быхавец з 13 ліпеня 1616 г. па каралеўскаму прывілею займаў урад войта менскага [15, л. 22]. Зразумела, што ўсе гэтыя абставіны значна ўскладнялі становішча самога Крыштофа Валадковіча пры рашэнні гэтай справы ў судах павета і ВКЛ і рабілі немагчымым выратаванне жыцця яго слугі. Адзінае, што змог зрабіць Крыштоф Валадковіч для свайго слугі, які дзейнічаў, несумненна, калі і не па прамому загаду свайго гаспадара, то з яго маўклівай згоды, гэта зацягнуць на як мага даўжэйшы час разгляд судовай справы. Такім чынам, справа Андрэя Дэмбінскага аб забойстве Януша Быхаўца, войта менскага, магчыма, цягнулася каля года. У апошні раз упамінанне Быхаўца ў дакументах прыпадае на 5 лютага 1618 г. Паводле ўгодлівага ліста Самуэля Немсты і Гальшкі Падарэўскай з Янушам Быхаўцам адбылося скасаванне яго прэтэнзій на куплю ў Януша Радзівіла Астрашыцкага Гарадка, які ён меў у заставе [16, л. 669].

Пасля шлюбу з Аляксандрай Дамінікоўскай матэрыяльнае становішча Крыштофа Валадковіча рэзка змянілася. Цяпер ён мог жыць так, як гэта разумелася ў асяроддзі тагачаснай шляхты, згодна з няпісанымі нормамі жыцця, не дапускаючы знявагі свайго высокага стану. Аднак

з дакументаў, складзеных з яго ўдзелам у гэты і значна пазнейшы час, вынікае, што Крыштоф Валадковіч аказаўся вельмі ашчадным чалавекам і цаніў кожны грош, трапіўшы ў яго рукі. Ён вельмі рэдка пазычаў, але калі і прыходзілася гэта рабіць, то пазычаў звычайна невялікія сумы і амаль ніколі не затрымліваў іх вяртанне. Значна часцей Крыштоф Валадковіч сам даваў у пазыку грошы розным асобам. Дастатковае пацвярджэнне гэтым высновам мы атрымліваем з дакумента аб заставе маёнтка Цітва, што размешчана ў межах Менскага павета, або, як пісалі ў тагачасных дакументах, Менскага ваяводства, ад Ежы-Самсона Падбярэзскага, маршалка Браслаўскага павета. Маршалку браслаўскаму тэрмінова спатрэбіліся грошы, і не малыя, 42 000 польскіх злотых. Самае галоўнае было ў тым, што яны знайшліся ў Крыштофа Валадковіча [17, л. 680].

Аналіз каралеўскіх прывілеяў першай паловы XVII ст. паказвае, што Валадковічы, якія знаходзіліся ў скрытай апазіцыі антыправаслаўнай палітыкі Жыгімонта III, не атрымоўвалі ніякіх наданняў. Выключэннем быў Крыштоф Валадковіч. У архіве Радзівілаў у Варшаве захоўваецца прывілей каралевіча Уладзіслава Жыгімонта ад 25 чэрвеня 1628 г. на наданне Крыштофу Валадковічу, дваранін свайму, «заслужонаму ў розных экспедыцыях, сел Велятычы, Міотча і Аўрамкаў, аддзеленых ад староства Барысаўскага, да жывата…» [18, s. 1]. Самае ж цікавае заключаецца ў тым, што гэтае староства крыху раней было надана аднаму з самых блізкіх да каралевіча асоб, яго фаварыту Адаму Казаноўскаму, маршалку надворнаму кароннаму.

**Крыштоф Валадковіч на пасадзе пісара земскага менскага.** Істотна змянілася становішча Крыштофа Валадковіча пасля каранацыйнага сойма, на якім Уладзіслаў IV Ваза быў каранаваны на каралеўства Польскае. На сойме кароль вызначыў камісараў для вырашэння зямельнага пытання, узнятага ігуменам менскага Свята-Вазнясенскага манастыра Феафілактам. Разам з Ярашам Іваноўскім, пісарам гродскім менскім, на гэтую справу быў вызначаны і Крыштоф Валадковіч. Яна была вельмі звычайнай для тых часоў: дзяржава даволі часта забывалася пра свае абяцанні ў адносінах да асоб, якія прадаставілі пазыку скарбу або часова перадалі княству свае землі. У 1570 г. Юр'я Васільевіч Тышкевіч, ваявода берасцейскі, па загаду караля правёў межаванне зямель у Менску. Месцічы валодалі многімі землямі далёка ад Менска, а шляхта наадварот купляла ў самім Менску зямлю пад сядзібы і агароды, што аднолькава было забаронена законамі княства. Станіслаў Ясінскі, добра вядомы ў княстве чалавек, за час свайго жыцця купіў у Менску нямалы кавалак зямлі з 10 дамамі, заселенымі асабіста яму належачымі рамеснікамі. Звычайна такія рамеснікі працавалі на свайго гаспадара і

ніякіх падаткаў гораду не плацілі. У дадатак да ўсяго гэтага, на гэтай зямлі, памерам у 10 моргаў і 3 пруты (каля васьмі гектараў), Ясінскі пабудаваў вялікую карчму і ад спойвання месцічаў таксама меў немалы прыбытак. Згодна з канстытуцыяй гэтыя землі разам з іх жыхарамі былі перададзены Менскай Ратушы і сталі прыносіць прыбытак ужо ў даходы Менскага гарадскога самакіравання. Менскія бурмістры паабяцалі выдзеліць Станіславу Ясінскаму адмену, новыя землі [19, л. 1]. З цягам часу і каралеўскія ўлады, і Ратуша забыліся пра свае абяцанні. Станіслаў Ясінскі зразумеў, што назаўсёды страціў свае набыткі і, як чалавек, добра дасведчаны ў законах, вырашыў справу вяртання спадчынных земель ускласці на плечы царквы. Узамен ён спадзяваўся атрымаць боскую ўдзячнасць і выратаванне ад кары за многія грахі. Перад смерцю Ясінскі запісаў гэтыя землі на Вазнясенскі манастыр, атрымаўшы ад айцоў-манахаў пачэсныя провады ў апошні шлях са звонам і маленнем за выратаванне яго душы. Невядома, ці атрымаў на небе Ясінскі дараванне сваіх цяжкіх грахоў, але і манастыр гэтых зямель не атрымаў. На плечы камісараў выпала цяжкая справа па забеспячэнню справядлівасці. Вольных зямель у павеце не было, а каралеўскія ленныя землі надаваліся толькі пажыццёва і за вайсковую службу.

Больш цяжкім было другое каралеўскае даручэнне: садзейнічаць перадачы праваслаўным вернікам ад уніятаў царквы Святой Тройцы ў Менску. Уніяты сілай вымусілі адступіцца і Крыштофа Валадковіча, і праваслаўных вернікаў ад выканання каралеўскага рашэння. Па выніках супрацьстаяння быў складзены акт, пад якім падпісаліся многія месцічы: Ян Валадковіч, Ян Жыжэмскі, стольнік менскі, Адам Ваньковіч, войскі менскі, і некаторыя іншыя [20, л. 170].

Пасля смерці ў 1632 г. Мікалая Вяжэвіча, пісара земскага менскага, Крыштоф Валадковіч абіраецца менскай шляхтай адным з чатырох электаў (кандыдатаў) на вакантную пасаду пісара земскага. Спіс кандыдатаў, як гэта звычайна рабілася, быў прадстаўлены каралю, і той прывілеем ад 4 чэрвеня 1633 г. менаваў пісарам земскім менскім Крыштофа Валадковіча [21, л. 372]. На гэтай пасадзе Крыштоф Валадковіч, з вялікім пажыткам для сябе, прасядзеў больш за чвэрць веку, пакуль 18 сакавіка 1658 г., па смерці Пятра Вяжэвіча, не атрымаў прывілей на яшчэ больш прэстыжны ўрад — урад ваяводы навагародскага.

На 1634 г. Крыштоф Валадковіч, ужо будучы пісарам земскім менскім, знаходзіўся ў новым шлюбе, на гэты раз з Гальшкай Акунёўнай. Да 19 чэрвеня гэтага года адносіцца падпісанне каралём пацвярджэння ранейшага прывілея Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, «правам дажыватным, за адданасць Радзіме і верную службу ў розных экспедыцыях», на маёмасць Міотча, Веляцічы і сяло Абрамкава, адзеленыя ад Барысаўскага староства, з пераводам дажыватных правоў

на гэтыя добры і на яго жонку Гальшку Акунёўну [22, л. 390]. Цікавай з'яўляецца прыпіска ў прывілеі, унесеная, несумненна, як перасцярога некаторым асобам, спрабуючым адабраць у Крыштофа Валадковіча гэтае каралеўскае наданне: «Калі ж хто-небудзь запатрабуе ад Валадковіча і яго жонкі вяртання сёл да староства, то абавязаны прадаставіць яму добры з такой жа сумай даходаў». Гэтая прыпіска мела самае непасрэднае дачыненне да асобы каралеўскага фаварыта Адама Казаноўскага і, несумненна, была ўведзена каралём, каб замацаваць правы Валадковіча. Здаецца, што кароль добра ведаў Беларусь і часта наязджаў у яе межы не толькі для выканання сваіх дзяржаўных абавязкаў, але і на паляванне. Гэты дакумент быў падпісаны ў Радашковічах, непадалёку ад Налібоцкай пушчы.

Можна дапусціць, што памерла Аляксандра Дамінікоўская да 1630 г., а ў новы шлюб Крыштоф Валадковіч уступіў яшчэ да атрымання ўрада пісара земскага менскага, гэта значыць каля 1633 г. Андрэй Валадковіч, мянуючы новую жонку Крыштофа Валадковіча Гальшкай, піша, што ў шлюб з Гальшкай Акунёўнай, дачкой Марціна і Зосі, княжны Крошынскай, Крыштоф Валадковіч уступіў у 1628 г. [5, s. 5]. Андрэй Валадковіч памыляецца, лічачы, што Гальшка была дачкой Марціна Окуня і князёўны Зосі Крошынскай. Згодна з Фёдарам Еўлашэўскім, Марцін Окунь яшчэ 5 лютага 1584 г. уступіў у шлюб з Баянецкаю [23, с. 249] і памёр пасля 1600 г. Зося Крошынская зусім маладой дзяўчынай каля 1610 г. пашлюбілася з Янам Окунем, маршалкам ваўкавыскім. У гэтым шлюбе ў пачатку 1614 г. нарадзілася Гальшка. Такім чынам, на момант яе шлюбу з Крыштофам Валадковічам яна мела ад нараджэння каля 18 год. Лёс не быў спагадлівы да гэтай жанчыны. Яна памерла, не дасягнуўшы трыццацігадовага ўзросту [24, л. 413].

Атрыманыя ад караля землі, аддзеленыя ад Барысаўскага староства, Крыштоф Валадковіч неаднойчы выкарыстоўвае для атрымання значных сум грошай. Грошы часцей за ўсё былі неабходны для ўдзелу ў вайсковых экспедыцыях, як у той час менавалі войны. Для чалавека такога ўзроўню, як Валадковіч, не магло і размовы быць аб няўдзеле ў вайне. Вайна была ганаровым абавязкам кожнага шляхетнага чалавека. Армія Вялікага княства Літоўскага складалася з початаў высакароднай шляхты, набранай ёю за свой асабісты кошт, і наёмных харугваў, зацягнутых (найманых) за кошт скарбу. Наём і ўзбраенне початаў абыходзіліся вельмі дорага. Зразумела, што ў Крыштофа Валадковіча маглі быць і іншыя накірункі выдаткавання асабістых і пазычаных грошай. Ён некалькі разоў звяртаўся да караля з прашэннем аб дазволе на перадачу ленных зямель у заставу або арэнду. Кароль не адмаўляў свайму вернаму служцы і даваў дазвол. Каралеўскі кансенс (дазвол) у многіх выпадках заканчваўся словамі: «… На перадачу каму сам хоча…».

Звестак пра жыццё і дзейнасць Крыштофа Валадковіча ў 30-я гг. XVII ст. у нашы рукі трапіла нашмат болей, чым за ўвесь мінулы перыяд яго жыцця. Так, мы ведаем, што ў самым пачатку 1633 г., а менавіта 8 студзеня, Крыштоф Валадковіч, пісар земскі менскі, купляе ў Балтазара Стравінскага, ваяводы менскага, частку Беліцы, размешчанай у Навагародскім ваяводстве [25, л. 824–825]. Па смерці ваяводы некаторая частка Беліцы знаходзілася ў пажыццёвым карыстанні Зафеі Балтазаравай Стравінскай, ваяводзіны менскай, і таксама была выкуплена Крыштофам Валадковічам. У гэтым жа, 1633, годзе Крыштоф Валадковіч набыў адну са сваіх найбольш улюбёных мясцін Грэбень.

Зусім верагодна, што пані Гальшка Акунёўна, уступаючы ў шлюб з Крыштофам Валадковічам, прынесла ў якасьці пасагу і запісала яму «да жывата» (да самай сваёй смерці) свае маётнасці. Але, на жаль, звестак аб гэтым мы не знайшлі. Затое мы атрымалі поўнае пацвярджэнне, што стаўленне караля да Крыштофа Валадковіча і яго жонкі засталося самым найлепшым. Аб гэтым могуць служыць некаторыя звесткі, унесеныя ў кнігі Метрыкі ВКЛ. Так, 10 сакавіка 1635 г. Уладзіслаў IV падпісвае Крыштофу Валадковічу і яго жонцы новы кансенс на перадачу ягоных ленных зямель, размешчаных у Аршанскім павеце, у арэнду на 4 гады каму хоча [1, л. 303]. Літаральна праз тры дні, 14 сакавіка, Валадковічам надаюцца сёлы Краснае, Усполле і некаторыя іншыя, размешчаныя ў Мсціслаўскім ваяводстве. Пры гэтым кароль, надаючы правы на гэтыя сёлы, якія сталі вольнымі з нагоды смерці Ежы Хелхоўскага, падкрэслівае, што сёлы даюцца «удзельніку розных ваенных экспедыцый яшчэ пры карале Жыгімонце III, з нямалай стратай сваіх грошай і падчас цяперашняй (1631–1634 гг.) вайны з Масквой» [1, л. 316].

Неабходнасць адзначыць вернага слугу праяўляецца і яшчэ ў адным каралеўскім прывілеі. У гэтым жа, 1635 г. Уладзіслаў IV па кадуку (маёмасць памерлага беспатомнага чалавека пераходзіла ва ўласнаць караля і надавалася каралеўскім прывілеем розным асобам) перадае Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, «з даўніх часоў заслугі меўшаму ў розных экспедыцыях, так і пры двары каралеўскім», маёмасць і грошы менскага месціча, рэзніка Фёдара Нешыны, памерлага беспатомным [1, л. 186].

Вельмі цікавай і не да канца даследаванай з`яўляецца справа аб атрыманні зводным братам Крыштофа, Тэадорам Валадковічам, прэстыжнага ўрада войскага менскага. На нашу думку, дзеля гэтага Крыштоф Валадковіч выкарыстаў спаўна свае сувязі з Уладзіславам IV. У пачатку 1636 г. памёр былы войскі менскі — Адам Стэфанавіч Ваньковіч, прызначыўшы сваім тэстаментам ад 9 лютага апекуном сваёй жонкі і дзяцей Крыштофа Валадковіча. Матка жонкі Адама Ваньковіча пані Настасія Валадковічаўна Станіслававая Дуброўская, у другім шлюбе

Міхалавая Ленкевічавая, была роднай цёткай Крыштофа Валадковіча. У сыноў Адама Ваньковіча, Стэфана і Пятра, былі ўсе правы і магчымасці на атрыманне ўрада войскага. Аднак па прывілею караля прэстыжны ўрад войскага ўжо 3 сакавіка 1636 г. быў нададзены Тэадору Валадковічу [26, л. 454–455]. Праз кароткі час, у канцы XVII – першай палове XVIII ст., унукі і праўнукі Адама Ваньковіча, войскага менскага, абое Уладзіславы, па чарзе трымалі ўрад войскага, які яны, напэўна, лічылі спадчынным.

Па нейкіх прычынах Крыштоф Валадковіч і Гальшка Акунёўна праз год пазбаўляюцца толькі што атрыманых ленных добр у Мсціслаўскім ваяводстве. Уладзіслаў Ваза падпісвае 25 красавіка 1636 г. Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, і яго жонцы Гелене Акунёўне кансенс на адмову ад ленных правоў на маётнасць Усполле і Краснае на карысць Аляксандра Ярашавіча Грабянскога [1, л. 603]. Зусім верагодна, што атрыманыя грошы праз некаторы час былі выдаткаваны Крыштофам Валадковічам, пісарам земскім менскім, асабіста. У тэксце дакумента на куплю Гатава ад Рэміяна Юр`я Служкі, ваяводзіча вендэнскага, унесена толькі яго прозвішча. Хаця грошы ў сям'і Валадковічаў выкарыстоўваліся сумесна, у гэтым дакуменце Гальшка Акунёўна не згадваецца. Магчыма, што Гальшка Валадковічавая, пісаравая земская менская, сышла з гэтага свету. Як сведчаць актавыя матэрыялы Менскага гродскага суда, 6 лютага 1640 г. была праведзена інтрамісія па ўвядзенню ў правы валодання Гатавам Крыштофа Валадковіча, пісара земскага менскага, каралеўскага двараніна [4, л. 160].

Наша думка аб смерці Гальшкі Акунёўны каля 1640 г. пацвярджаецца яшчэ адным дакументам. На 6 чэрвеня 1643 г. Крыштоф Валадковіч, падпісваючы ліст на заставу сваёй часткі маётнасці Стаўбуновічы свайму стрыечнаму брату Яну Валадковічу, піша, што на перыяд тэрміну заставы ніхто з яго блізкіх, уключаючы і жонку, якая, «калі дасць бог», будзе ў яго, не мае права ўмешвацца ў карыстанне маётнасцю [26, л. 678–679].

На канец кастрычніка 1640 – пачатак студзеня 1641 г. прыпадаюць падзеі з бадай што адзінай, вядомай нам, справай па невяртанню Крыштофам Валадковічам пазыкі. Марцін Каштэль і яго жонка Кацярына Фанендаўна ўлеўковым правам (перадатачны запіс) уступілі Марцыбеле Ганне Карэцкай Ракоўскай, ваяводзіне віцебскай, правы на атрыманне з пісара земскага менскага 6000 злотых [26, л. 185–186]. Крыштоф Валадковіч і Гальшка Акунёўна пазычылі гэтыя грошы, але па невядомых прычынах не разлічыліся з крэдыторам. Намаганні Марціна Каштэля аказаліся марнымі: Крыштоф Валадковіч не збіраўся вяртаць грошы.

У канцы 1640 г. драўляны Менск амаль цалкам згарэў. Не абышла бяда і самога Крыштофа Валадковіча. Полымя знішчыла некаторыя

дамы, належачыя яму асабіста і яго крэўным. На 6 студзеня Крыштоф Валадковіч прадае Яну Валадковічу, пісару гродскаму менскаму, пляц на вуліцы Полацкай за 500 злотых. Цікава, што гэты пляц з пабудовамі зусім нядаўна, 8 жніўня 1640 г., падараваў яму за некаторыя паслугі маршалак Вялікага княства Літоўскага Казімір Лявон Сапега [26, л. 217]. Узамен Крыштоф Валадковіч атрымаў такі ж самы пляц, са знішчанымі Макаровічаўскімі пабудовамі, каля самой Ратушы. Дароўны ліст на гэты пляц падпісала Дарота Дарагастайская Марцінавая Валадковічавая, суддзіна земская менская, мачаха Крыштофа [26, л. 213].

Крыштоф Валадковіч даў 4 чэрвеня 1641 г. буйную пазыку ў 16 000 польскіх злотых і за гэта атрымаў у заставу (забеспячэнне пазыкі) на 2 гады нядрэннай маётнасці: Целякова з прылеглымі сёламі Стары Целякоў, Карпілаўка, мястэчкам Ялаўка і сёламі Ялаўка, Кабылічы і Горкі [27, s. 265–269]. Зразумела, што з падданых гэтых сёл за 2 гады Крыштоф Валадковіч атрымаў добры працэнт на пазычаную суму. Да 8 красавіка 1642 г. ён дадаткова да набытых раней купляе ў Рэміяна Юр'я Служкі, ваяводзіча вендэнскага, і яго жонкі Кацярыны Юндзілаўны значныя зямельныя абшары, якія расцягнуліся ад Шчытамержыц да Гатава. Яны ўключалі спадчынныя землі бабулі Юр'я Служкі пані Багданы Лазчанкі Івановай Служчынай, астравы Мачульскі і Міханавецкі, «… каля ракі Свіслачы, пры гасцінцу з Менска, каля Сенніцы і Новага Двара, сяло Востраў на 17 надзелаў…» [28, л. 28].

У пачатку 1643 г. Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, які застаўся ўдаўцом, кароль падпісвае новы прывілей на кадук па памерлым беспатомным месцічу менскім, на гэты раз іншаземцу — арганісту Якубу. Найбольш прыцягальным у гэтым наданні для Крыштофа Валадковіча было атрыманне пляца і дома ў Менску, на Старым Месце, якраз насупраць касцёла [29, л. 387]. У гэтым жа годзе Крыштоф Валадковіч, пісар земскі менскі, разам з Вяжэвічам і Марцынкевічам атрымлівае чарговае каралеўскае даручэнне — правесці рэвізію Смаленскіх каралеўскіх добр [29, л. 73]. Усе адчувалі, што вайна з Масквой можа адбыцца неўзабаве і таму неабходна было праверыць не толькі, як выкарыстоўваюцца ленныя землі, але і ступень гатоўнасці ваяводства да абароны ўсходняй мяжы краіны.

Несумненна, што Крыштоф Валадковіч з цягам часу заваёўвае аўтарытэт і штогод прыцягваецца каралеўскай адміністрацыяй да выканання розных даручэнняў. Так, 28 студзеня 1644 г. разам з Стэфанам Жарноўскім ён праводзіць агранічэнне (межаванне) зямель Азярышчанскага староства, размешчанага ў межах Браслаўскага павета [29, л. 710]. У Крыштофа Стэцкевіча, падкаморыя браслаўскага, старосты азярышчанскага, айчыма Гальшкі Акунёўны, за доўгі час накапілася шмат непаразуменняў з навакольнай шляхтай аб прыналежнасці

некаторых грунтоў. Для разгляду скаргі старосты барысаўскага Адама Казаноўскага па каралеўскаму пісьму ад 10 чэрвеня 1647 г. Крыштоф Валадковіч накіроўваецца ў Барысаў судзіць падданых барысаўскіх і падстаросту судовага барысаўскага за напады некаторых людзей, спусташаючых каралеўскія землі, якія ўваходзілі ў склад Барысаўскага староства [30, л. 860].

У першай палове 1647 г. Крыштоф Валадковіч вядзе судовы працэс з менскім месцічам Іванам Фёдаравічам Чарнышовічам, шаўцом, які вельмі кепска пашыў яму «халат лампертовы, сабалямі падшыты, з залатымі гузікамі, абшыты залатымі, срэбнымі галунамі…» [31, л. 241]. Іван Чарнышовіч, як сёння бы сказалі, быў асабістым шаўцом Крыштофа Валадковіча і абшываў ужо не адно пакаленне гэтай сям'і. Крыштоф Валадковіч у сваёй скарзе ўспамінае аб заказе на 100 коп, некалі атрыманым шаўцом ад Марціна Валадковіча, суддзі земскага менскага. Верагодна, справа была не зусім звычайная, бо пасля першапачатковага разгляду ў менскіх судах яна трапіла ў Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага.

Нямала пацярпеў пісар земскі ад удавы па Войцаху Янішэўскім, маткі Адама, будучага пісара гродскага менскага. На працягу 1646 г., будучы прызначаны разам з Янам Карэйва апекуном жонкі Войцаха Янішэўскага і яго патомства, Валадковіч вымушаны апраўдвацца перад Менскім гродскім судом. Пані Барбара Прэсмыцкая Войцахава Янішэўская па смерці мужа ўступіла ў новы шлюб з Паўлам Пясецкім, падсудкам земскім навагародскім. Як паведамляюць апекуны ў сваім дакуменце ад 20 сакавіка 1646 г., пані Пясецкая, падсудковая земская навагародская, «… усе свае рэчы, золата, срэбра, грошы, шаты, коні і быдла вывезла і па забранні, у новы шлюб уступіла і нічога патомству памерлага не пакінула…» [32, л. 784]. Азнаёміўшыся са скаргай памерлага, пані Барбара Прэсмыцкая ўнесла ў гродскі суд сваё бачанне справы. На яе думку, апекуны аказаліся самі нячыстымі на рукі. Валадковіч і Карэйва, ведаючы аб яе шлюбе і не выказваючы супраціву гэтаму кроку ўдавы, «… усе добры, як рухомасць, так і грошы, агульнай сумай у дзве тысячы польскіх злотых, забралі сабе…» [33, л. 773].

На працягу амаль пяці гадоў доўжылася судовая справа з жонкай памерлага Аляксандра Жыжэмскага, былога стольніка менскага, а потым і падстолія ВКЛ, пані Зосяй Гербультаўнай і яе сынамі: Стэфанам, каралеўскім ротмістрам, і Тамашом, будучым падкаморыем менскім. Па дэкрэту судоў ВКЛ ад 14 чэрвеня 1646 г. на яе ўсклалі да выплаты вялізную суму пенязей (штрафаў і судовых накладаў) — 10 650 коп [34, л. 218]. Здаецца, што кошт усёй маётнасці Засулле, на якое ўскладалася выплата грошай, не мог забяспечыць выкананне гэтага судовага дэкрэта. Жыжэмскія не скарыліся. Літаральна праз дзве тыдні, менавіта

30 чэрвеня гэтага ж года, Стэфан Жыжэмскі з падтрымкай Мікалая Богуша, харужага мозырскага, зяця Тэадора Валадковіча, войскага і суддзі гродскага менскага, роднага брата Крыштофа, учыняе, «… не баючыся суда боскага…», як пра гэта пісалі на той час у скаргах, злосны напад на уладанні пісара земскага менскага. У дадатак да ўсяго гэтага, Жыжэмскія, сабраўшы натоўп падданых і слуг, не дапусцілі ў Засулле скарбовага дваравіна, накіраванага ў маёнтак для спагнання вызначанай сумы. Барацьба ішла з пераменным поспехам. Жыжэмскія не трацяць час дарма: ужо 18 сакавіка 1647 г. яны атрымліваюць сублевацыю (адтэрміноўку) на выкананне прысуду. Аднак літаральна праз шэсць дзён Крыштоф Валадковіч «за супраціўленне дэкрэту ГТЛ» атрымлівае новы баніцыйны ліст на Жыжэмскіх [34, л. 489–490]. У жніўні гэтага ж года Жыжэмскія атрымліваюць другую сублевацыю на баніцыю ад Валадковіча, а 8 кастрычніка — яшчэ адну [34, л. 397, 412].

Вялікая некалі маётнасць Стаўбуновічы, спадчыны дзеда Марціна Валадковіча, суддзі земскага менскага, і пані Раіны Друцкай-Горскай, за паўвека была падзелена на невялікія кавалкі паміж шматлікімі нашчадкамі. Не без поспеху Крыштоф Валадковіч праводзіць выкуп асобных частак Стаўбуновічаў у сваіх крэўных. Нешта яму перайшло ад трох сясцёр, а нейкія часткі маётнасці былі выкуплены ў іншых родзічаў. Так, 15 студзеня 1648 г. складаецца дакумент аб выкупе часткі Стаўбуновічаў у аднаго з малодшых братоў — Геліяша Валадковіча [35, л. 85].

Пасля смерці свайго дзядзькі Рыгора Валадковіча, суддзіча земскага менскага, Крыштоф і яго стрыечны брат Ян, суддзя земскі менскі, атрымалі ў карыстанне значныя зямельныя валоданні. Па тэстаменту дзядзькі ў рукі Крыштофа Валадковіча трапілі дзедзічныя добры Грозаў і Новы Двор, а таксама набытыя самім Рыгорам Валадковічам Жабчыцы і Таргошыцы з прылеглымі вёскамі і грунтамі. Рыгор Валадковіч на працягу апошніх дваццаці гадоў знаходзіўся ў беспаспяховай судовай справе з суседзямі — магутнымі ўладарамі слуцкіх і грэскіх зямель Радзівіламі, якія спрабавалі вярнуць сабе страчаныя амаль дзевяноста гадоў таму назад грозаўскія землі. Адчуваючы бесперспектыўнасць працяглага судовага змагання з магутнымі суседзямі, якія, дарэчы, не заўсёды пры вырашэнні спрэчных пытанняў ужывалі законныя сродкі барацьбы, Крыштоф Валадковіч не выканаў апошнюю волю свайго дзядзькі аб передачы Грозаўскай маётнасці пасля сваёй смерці Грозаўскаму праваслаўнаму манастыру і саступіў Радзівілам спрэчныя землі за тры тысячы польскіх злотых. На некаторую частку зямель Рыгора Валадковіча меў правы па тэстаменту памерлага і Ян Валадковіч. Падзел маёмасці памерлага з-за ваенных дзеянняў доўжыўся каля дзесяці год. Толькі ў лістападзе 1657 г. браты разабралі падданых

з сяла Жабчыцы [36, s. 10–12]. Да жніўня 1661 г. КрыштофВаладковіч вырашыў і лёс апошніх валоданняў дзядзькі. Сваю частку Жабчыц і Таргошыц пісар земскі менскі прадаў Андрэю Брэсцкаму, чашніку Пінскага павета [8, л. 81, 83, 105, 112]. Паміраючы, Рыгор Валадковіч запісаў у сваім тэстаменце распараджэнне Крыштофу Валадковічу аб выплаце сваім шматлікім пляменнікам і пляменніцам даволі значных сум грошай, забяспечаных коштам гэтых добраў. Аднак вяртанне гэтых грошай адбылося толькі пасля смерці ваяводы навагародскага.

Пры ўсім гэтым на плячах Крыштофа Валадковіча ляжала вялікая адказнасць. Ён забяспечваў адпраўленне судовых спраў, вёў судовую перапіску з Галоўным Трыбуналам па справах, якія патрабавалі ўмяшання вышэйшай судовай інстанцыі княства, выдаваў выпісы па дэкрэтах земскага суда, праводзіў актыкацыю (натарыяльнае сведчанне) шматлікіх прадажных дакументаў, шлюбных дамоў, тэстаментавых дакументаў, займаўся захоўваннем і прывядзеннем у належны парадак архіва земскага суда. Абавязкі пісара земскага былі складанымі і шматбаковымі, але Валадковіч на працягу ўсяго тэрміну існавання пасады, як мы заўважылі, не меў нараканняў на якасць сваёй працы.

Як пісар земскі менскі Крыштоф Валадковіч у перыяд пасяджэнняў Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Менску, згодна з соймавымі канстытуцыямі, вёў усё справаводства Трыбунала. Аднак, здаецца, што ў 1652 г. яго абіраюць і дэпутатам Трыбунала, бо толькі дэпутаты гэтай установы маглі быць абранымі на перыяд адсутнасці маршалка Трыбунала, кіраўніка судовай установы, яго намеснікамі. Згодна з матэрыяламі Галоўнага Трыбунала ад 1652 г., Крыштоф Валадковіч падпісваў акты Трыбунала ў якасці яго маршалка: 1 ліпеня, 3 і 12 снежня гэтага года [37, л. 217, 408]. Зразумела, што часы былі надзвычайнымі, ішла крывавая вайна, не ўсе дэпутаты маглі прысутнічаць на пасяджэннях Трыбунала, таму маглі быць некаторыя выключэнні з ранейшых правіл і пастаноў. Галоўнае, што мы атрымалі з гэтых дакументаў: аўтарытэт Крыштофа Валадковіча быў вельмі высокім. Вядома, што не кожнаму дэпутату маглі даверыць выкананне абавязкаў маршалка Трыбунала. Адначасова мы знаходзім у гэтых дакументах і ўскоснае пацвярджэнне асобых стасункаў, звязваючых самога Крыштофа, а потым і іншых прадстаўнікоў гэтага рода з сям'ёй Завішаў. Нездарма ў Крыштофа Станіслава Завішы, старосты судовага менскага, у канцы XVII ст. дарадчыкам быў адзін з Валадковічаў.

Не забывае Крыштоф Валадковіч і аб выратаванні сваёй душы. На 14 красавіка 1652 г. ён атрымлівае каралеўскі кансенс на перадачу Менскаму базыльянскаму жаночаму кляштару некаторых участкаў з забудовамі [3, л. 69]. Пляцы належалі да войтаўскай пасады і перадаваліся Валадковічу да часу заканчэння тэрміну выканання ім урадавых

абавязкаў. Крыху раней, менавіта ў 1647 г., ён займаецца забеспячэннем землямі менскіх бернардынак. Для гэтай мэты ім выдзяляюцца асабістыя землі ў Гатаве і Новым Двары [38, л. 33, 50].

Пры гэтым Крыштоф Валадковіч, нягледзячы на тое, што быў пастаўлены дабівацца выканання статутовых палажэнняў, сам асабіста не вельмі дбаў аб інтарэсах дзяржавы. Як устанавіў Ян Валадковіч, падсудак земскі і паборца менскі, Крыштоф Валадковіч на 1650 г. не паказаў толькі ў сваёй маётнасці Грабяні 32 дымы новікаў (новапаселеных падданых). Яшчэ 30 дымоў новікаў былі выкрыты і ў іншых яго маётнасцях [39, л. 540].

У наступны шлюб Крыштоф Валадковіч, яшчэ будучы пісарам земскім менскім, уступае з Гальшкай Друцкай-Сакалінскай. Згодна з паведамленнем Андрэя Валадковіча, Гальшка Друцкая-Сакалінская, дачка князя Яна Друцкага-Сакалінскага, маршалка аршанскага, і Зосі Рэй з Наглавіц, была ўдавой Пятра Трубяцкога, князя, падкаморыя старадубскага [5, s. 5]. На час смерці Пятра Трубяцкога ў пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай яшчэ жылі брат Ежы Станіслаў і сястра Барбара. Пётр, князь Трубяцкі, падкаморы старадубскі, сын Юр'я Трубяцкога, памерлага ў 1621 г., і пані Солтыкавай [40, с. 85], нарадзіўся ў 1610 г. і жыў яшчэ на пачатак красавіка 1644 г., калі атрымаў дазвол караля Уладзіслава IV на пэўныя добры ў Старадубскім павеце. Раней гэтыя добры былі ў пажыццёвым карыстанні Аляксея Івашкевіча, а верагодна пасля яго смерці трапілі да каралеўскай дыспазіцыі (распараджэння). Пётр Вігунт Трубяцкі, падкаморы старадубскі, па гэтаму каралеўскаму дазволу ад 5 красавіка 1644 г. атрымаў вёску Яскевічы і пусташ Патолава [29, л. 538].

Наданні зямель Трубяцкіх спадчыннікам славутага Андрэя Вігунта, сына Альгерда, пачаліся задоўга да смерці Пятра Трубяцкога. У 1634 г. браты Аляксей і Пётр, пакаёвы дваранін караля Уладзіслава IV, Трубяцкія атрымалі значную частку ленных зямель замка Трубчэўскага [41, л. 133–135]. Яшчэ праз год, 11 красавіка 1635 г., Пётр Трубяцкі атрымаў нейкую частку Трубяцка і некалькі сёл у Смаленскім ваяводстве [41, л. 435]. Непасрэдна перад сваёй смерцю Пётр Трубяцкі, падкаморы старадубскі, пакаёвы дваранін караля, адчуваючы вялікую патрэбу ў наяўных грошах, зрабіў шматлікія пазыкі пад заклад сваіх ленных добр у Смаленскім ваяводстве. На той лад жыцця, які ён вёў, не хапіла б грошай і ў больш багатага чалавека. 8 кастрычніка 1641 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі падпісаў Пятру Трубяцкому кансенс на перадачу ў арэнду або ў заставу паловы добр Трубяцкіх, «праву леннаму падлеглых». У Старадубскім павеце Пятру Трубяцкому дазвалялася перадаць у заставу, каму ён сам захоча, вёскі Вострая Лука, Радуціна, Аленская і Груздова [42, л. 137]. На Трубяцк мелі правы і прадстаўнікі сям'і Солтыкаў. Павел Солтык

яшчэ пры жыцці Пятра Трубяцкога ўнёс у скарб княства значную суму грошай і атрымаў права на эксплуатацыю лясных багаццяў у ваколіцах Трубяцка.

Памёр Пётр Трубяцкі, пакінуўшы адзінага спадчынніка, сына Юр'я Вігунта Трубяцкога, хутчэй за ўсё ў 1645 г., бо ўжо ў 1646 г. сойм Рэчы Паспалітай, прымаючы рашэнне аб выдзяленні кампенсацыі за страчаныя ў выніку перадачы па рашэнню кароннага сойма Маскве землі Трубчэўска або Трубяцка, так званую Трубяцкую суму ў 180 000 польскіх злотых, упамінае толькі ўдаву падкаморыя старадубскага і яго непаўналетняга сына.

Крыштоф Валадковіч, пісар земскі менскі, будучы ў вялікім сяброўстве з памерлым і да таго ж прызначаны па тэстаменту Пятра Трубяцкога апекуном жонкі і сына, не мог не звярнуць увагі на такую багатую ўдаву і дабіўся згоды Гальшкі Друцкай-Сакалінскай, былой Пятровай Трубяцкой, на новы шлюб. Верагодней за ўсё шлюб адбыўся ў канцы 1645 — пачатку 1646 г. Ужо 23 сакавіка 1646 г. Крыштоф Валадковіч атрымлівае ад караля прывілей на атрыманне Гальшкай Друцкай-Сакалінскай дажыvotных правоў на добры Вялятыцкія, некалі наданыя яму за вайсковыя заслугі [21, s. 23]. Як нам здаецца, Крыштоф Валадковіч у кожным шлюбе запісваў жонкам правы на ўсе свае маётнасці, рухомасць і грошы па сваёй магчымай смерці, выключаючы прэтэнзіі на іх усіх сваіх крэўных і блізкіх. Такім жа запісам і яго жонкі перадавалі яму свае добры.

Адразу ж пасля шлюбу Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, і Гальшцы Друцкай-Сакалінскай прыйшлося вытрымаць сапраўдны наступ шматлікіх крэдытораў. Паміраючы, Пётр Вігунт Трубяцкі пакінуў шмат няскончаных спраў па ранейшых сваіх пазыках. У 1645 г. на Крыштофа Валадковіча і Гальшку Друцкую-Сакалінскую, былую Пятровую Трубяцкую, падкаморыну старадубскую, а цяпер Крыштофавую Валадковічавую, пісаравую земскую менскую, каралеўскім асэсарскім судом вынесена баніцыя ад Мікалая Лапацінскага [34, л. 90]. Працягвалася і вынясенне выракаў (рашэнняў) па судовых справах, пачатых яшчэ пры жыцці Пятра Трубяцкога. Баніцыі на Валадковічаў, Крыштофа і Гальшку, дэкрэтам Галоўнага Трыбунала ад 16 снежня 1645 г. былі вынесены ад Юзэфа Гнайніцкага і Стэфана Маркоўскага. Па рашэнню судоў ВКЛ неабходна было спагнаць з Крыштофа Валадковіча і пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай 96 тыс. 95 коп літоўскіх грошай. Сублевацыя на 12 тыдняў была атрымана толькі 1 лістапада 1646 г. [34, л. 232]. Два гады ішлі перамовы суддзі земскага менскага і Стэфана Маркоўскага, але ўрэшце бакі змаглі прыйсці да згоды і мірна вырашылі справу [43, л. 387]. Крыштоф Валадковіч са сваіх асабістых сродкаў змог разлічыцца з многімі

крэдыторамі. У некаторых выпадках у судовым парадку ён змог давесці беспадстаўнасць прад'яўленых прэтэнзій.

Па судовых справах, трапіўшых у нашы рукі, бачна, што Крыштоф Валадковіч у многіх выпадках дабіваўся прымальных для сябе рашэнняў судовых устаноў ВКЛ. Чаго тут было болей: выкарыстанне сувязей або сапраўды яго прэтэнзіі былі больш абгрунтаванымі? Гэта павінны сказаць даследчыкі. Так, 23 кастрычніка 1645 г. Крыштоф Валадковіч, прадстаўляючы інтарэсы Гальшкі Друцкай-Сакалінскай, дабіваецца баніцыі на старосту эйшышскага Адама Крыцкага. Справа была пачата яшчэ самім нябожчыкам Пятром Трубяцкім. У 1643 г. Галоўны Трыбунал па скарзе Пятра Трубяцкога вынес на старосту эйшышскага баніцыю за супраціўленне ранейшым рашэнням ГТЛ аб спагнанні 8000 злотых з маётнасці Адама Крыцкага Гарадзішча. Як звычайна, у гэтую суму былі ўключаны не толькі шкоды і страты, панесеныя Пятром Трубяцкім, але і, як тады гаварылі, «наклады праўныя» (судовыя выдаткі [34, л. 90]). Адам Крыцкі не задаволіўся такім рашэннем суда і прыклаў значныя матэрыяльныя высілкі для атрымання спрыяльнага для сябе судовага рашэння. У выніку праведзенай падрыхтоўкі судовыя вагі калыхнуліся ў яго бок: 20 студзеня 1644 г. Галоўным Трыбуналам было прынята рашэнне на карысць Адама Крыцкага з Бышаўца, старосты эйшышскага [44, л. 425]. Аднак вопыт, сувязі і фінансавыя магчымасці Крыштофа Валадковіча, пісара земскага менскага, у канцы 1645 г. перасілілі супраціўленне Адама Крыцкага. Але, як і заўсёды, справядлівасць у Вялікім княстве Літоўскім не прыходзіла так хутка, як яе чакалі. Праходзілі гады, пакуль у судовай справе можна было заўважыць некаторыя зрухі. Ды і то, зрухі звычайна адбываліся ў той бок, які меў больш магчымасцей для подкупу судовых ураднікаў. Так і ў гэтым выпадку, Адам Крыцкі з Бышаўца, староста эйшышскі, 28 чэрвеня 1646 г. атрымлівае сублевацыю на баніцыю ад пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай Крыштофавай Валадковічавай, пісаравай земскай менскай [45, л. 52]. Справа з Адамам Крыцкім цягнулася яшчэ і ў 1648 г. 27 сакавіка гэтага года каралеўскі асэсарскі суд выносіць чарговае рашэнне па гэтай справе [44, л. 163]. Магчыма, што справа доўжылася б яшчэ шмат гадоў, але ў пачатку 50-х гг. XVII ст. Адам Крыцкі памірае.

Незадоўга да смерці Гальшкі Друцкай-Сакалінскай Крыштоф Валадковіч дабіваецца ад Яна Адэркаса, падканюшага кароннага, адмовы ад вельмі выгаднага ўрада — урада войтаўства менскага. Зразумела, што былы баявы таварыш Валадковіча па ўдзелу ў паходах Уладзіслава IV Ян Адэркас пазбыўся войтаўства менскага за добрыя грошы. Кароль Ян Казімір сваім кансенсам ад 4 снежня 1651 г. зацвердзіў дасягнутае паразуменне [46, л. 267]. Саміх актаў менскай магдэбургіі за гэтыя гады не захавалася, але некаторыя з іх былі ў копіях унесены ў зборы

Радзівілаў, Сапегаў і некаторых іншых магнатаў. З гэтых дакументаў відаць, што Крыштоф Валадковіч сумяшчаў свае справы ў судзе земскім і войтаўстве менскім [47, л. 16].

У 1652 г. старэйшая дачка Валадковіча Зося ўступіла ў шлюб з Аляксандрам Гіларыем Палубінскім, будучым пісарам польным і маршалкам Вялікага княства Літоўскага, які пакінуў памяць у суайчыннікаў як выдатны ваеначальнік літоўскіх войск у вайне з Масквой і казакамі. Падчас смерці пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай Крыштоф Валадковіч, пісар земскі і войт менскі, дабіваецца ад караля дазволу на адмову ад сваіх пажыццёвых правоў на ленныя добры Вялятычы, Міотча і Аўрамкаў, размешчаныя ў межах Аршанскага павета. Кароль у Бярэсці пагаджаецца падпісаць 29 лютага 1653 г. прывілей на пераход гэтых добр падкаморыю слонімскаму Аляксандру Гіларыю Палубінскаму і яго жонцы, дачцы Крыштофа Валадковіча, пісара земскага менскага, Зосі [3, л. 352]. У прывілеі, як гэта заўсёды рабілася ў такіх выпадках, даецца невялікая характарыстыка самому Аляксандру Палубінскаму, ротмістру харугвы гусарскай, якую ён набраў сваім коштам. Адзначаецца, што ротмістр гусарскай харугвы ўжо паспеў праславіцца ў гэтай жорсткай вайне, якая знясіляла краіну. Верагодна, што кароль, падпісваючы гэты прывілей, меў на ўвазе крывавае падаўленне абароны Пінска, дзе асабліва праявіў свой талент Гілары Палубінскі. Праз шмат гадоў, апісваючы падзеі, звязаныя з паўстаннем пінчукоў, Аляксандр Ельскі, нашчадак удзельніка гэтых падзей каралеўскага рэгіментара Лукаша Ельскага, прызнае, што «… войска мусіла здабываць кожны дом. Пачалася жахлівая разня, якая доўжылася без перапынку… цэлыя суткі» [48, с. 194].

Памерла пані Гальшка Друцкая-Сакалінская Крыштофавая Валадковічавая, пісаравая земская менская, на пачатку 1653 г. На 1 красавіка 1653 г. кароль Ян Казімір падпісвае Крыштофу Валадковічу туторыю (дазвол на апеку) над непаўналетнім Юр'ем Вігунтам Трубяцкім, сынам Пятра і Гальшкі Трубяцкіх [49, л. 456]. На падрыхтоўку самога прывілея на апеку, на правядзенне пахавання нябожчыцы патрэбен быў некаторы час. У прывілеі на апеку падкрэсліваецца, што «… Гальшка Друцкая-Сакалінская, спярша Пятровая Вігунтавая Трубяцкая, падкаморына старадубская, а цяпер Крыштофавая Валадковічавая, матка і апякунка Юр'я Вігунта Трубяцкога, смерцю з гэтага свету зыходзячы, тэстамент — дыспазіцыю добр, як у Рэчы Паспалітай, так і некаторых сум у сябе маючыхся, апякуном над малалетнім сынам сваім, а і над добрамі яго, усімі грашамі Крыштофа Валадковіча назначыла, а іншых усіх крэўных і блізкіх аддаліла…». Згодна з статутовымі правамі ў ВКЛ, тэстаментавы апякун выключае правы ўсіх блізкіх і крэўных, і толькі пры дасягненні Юр'ем Вігунтам Трубяцкім, падкаморычам старадубскім, узросту паўналеццця абавязаны перадаць яму ўсе яго спадчынныя добры

і грошы. Што цікава, Крыштоф Валадковіч па тэстаменту памерлай жонкі павінен быў атрымаць са скарбу грошы, належачыя яе сыну. Нагогул, яму былі прадастаўлены вельмі вялікія правы на «… адшуканне ўсіх сум, знаходзячыхся ў каго б то ні было, не выключаючы родных, блізкіх і іншых людзей…».

Як кажуць, багатаму і чорт дзяцей калыша, Крыштофу Валадковічу пашанцавала і на гэты раз. Яго пасынак Юр'я Вігунт Трубяцкі (1640–1679), які застаўся пасля смерці маткі зусім чужым і адзінокім у доме свайго айчыма, з дазволу вышэйшых колаў Рэчы Паспалітай ад'ехаў у 1657 г. у Маскву, да свайго стрыечнага дзеда Аляксея Трубяцкога, які ўваходзіў у склад бліжэйшага акружэння маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча, вельмі багатага чалавека, але беспатомнага. Вядома, што Вігунт Трубяцкі памёр у 1679 г., так і не пабываўшы на сваёй радзіме. Трэба думаць, што яго ад'езд адбыўся не без уплыву і Крыштофа Валадковіча, якому, напэўна, жадалася застацца адзіным гаспадаром вялікіх літоўскіх уладанняў Трубяцкіх, ды і надзея на атрыманне «Трубяцкой сумы» займала не апошняе месца ў яго меркаваннях. Падставу для такіх высноў дае нам дакумент аб перадачы Крыштофу Валадковічу ўсіх правоў на менні і грошы, належачыя Юр'ю Вігунту Трубяцкому, складзены перад ад'ездам падлетка ў далёкую і чужую краіну. У гэтым дакуменце, складзеным 6 сакавіка 1657 г. у Лыскаве, Юр'я Трубяцкі піша: «Я, за загадам яго царскай вялікасці, як будучы заваёваны ад Масквы, едучы, даў асаблівы ліст — дабравольны запіс Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, дабрадзею майму, цягам нямалых, праз яго міласць высілкаў па знясенню, на родзічах маіх і на мне самім ляжачых, выдаткаў, па выданню сум па дахаджэнні як сумы Трубяцкой, у скарбе каронным будучай, так, толькі, і па розным, на мяне спаўшым маётнасцям і рухомасці, у асобе маёй знясенне праўнае, прыяцельскі даходзіў…». Відаць, што і Крыштоф Валадковіч, і сам Юр'я Трубяцкі не ведалі, чым можа скончыцца гэтае падарожжа «да яго царскай вялікасці». Юр'я Трубяцкі па парадах апекуна запісвае: «… Варуючы (прадугледжваючы), і то асабліва, з чаго схавай нас божа, калі правіць з Масквы назад, так бы на мяне смерць, альбо там для якой-небудзь іншай прыгоды ад царскай вялікасці калі не вярнуся, то тады ўсё застанецца, ад якіх аддаляю братоў і сясцёр, пісару земскаму менскаму, дабрадзею…». Але Крыштофу Валадковічу паказалася гэтага тэксту недастаткова і ён раіць упісаць у дакумент палажэнне аб наданні яму, пісару земскаму, поўнай даверанасці на аперацыі з усімі матэрыяльнымі і грашовымі набыткамі Трубяцкога. «На дахаджэнне маіх належнасцяў, да майго прыезду, моц зупольную даю…» [50, л. 345]. Здаецца, што скласці такі дакумент было не пад сілу падлетку, які значную частку свайго жыцця, з-за смерці бацькоў і вайны, па сутнасці, быў прадастаўлены адзіноце.

Надзеі Крыштофа Валадковіча пачалі спраўджвацца адразу ж па ад’ездзе Юр’я Вігунта Трубяцкога ў Маскву. Ужо 15 лютага 1658 г. кароль падпісаў прывілей Крыштофу Валадковічу на «усе добры, грошы і рухомасць, што засталіся ад Трубяцкога, які на кароткі час, з дазволу нашага і не без згоды пісара земскага пушчанага, з’ехаў у Маскву і назад не вярнуўся» [51, л. 296]. Як сказана ў прывілеі, «то ўсе, за выняткам вяртання пазык і інш., і сумы Трубяцкія» перадаюцца Крыштофу Валадковічу. Відавочна, што для атрымання такога прывілея Валадковічу прышлося прыкласці вялікія намаганні. Яшчэ 15 кастрычніка 1657 г. кароль польскі Ян Казімір дэкрэтам сваім перадаў усе добры, «па Трубяцкім знаходзячыяся, дзе б яны ні былі», на Крыштофа Юндзіла, ротмістра казацкага [52, л. 93]. Некаторыя землі ў Аршанскім павеце, якія засталіся па ад’ездзе Трубяцкога ў Маскву, былі перададзены Аляксандру Бакштанскаму, які ваяваў у войску яшчэ пры Жыгімонце III і Уладзіславе IV [53, л. 180]. На атрыманне кампенсацыі за страты, панесеныя ў выніку перадачы трубяцкіх зямель Маскве, вельмі актыўна прэтэндаваў і пан Базылі Солтык, падчашы чарнігаўскі, крэўны пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай.

Нельга не сказаць некалькі слоў і аб судовым працэсе, які вёў Крыштоф Валадковіч з Базылём Солтыкам, сынам Паўла. Справа аб «Трубяцкой суме», нягледзячы на ваенныя дзеянні, ахапіўшыя краіну, пастаянна знаходзілася ў цэнтры ўвагі караля і яго акружэння. Амаль на кожным каронным сойме прыхільнікі Крыштофа Валадковіча і Солтыкаў узнімалі гэтае пытанне. Кожны стараўся давесці свае правы на атрыманне калі не ўсёй сумы, дык большай яе часткі. На соймах абяцалі выдаць грошы, якія захоўваліся ў каронным скарбе, прымалі адпаведныя дэкрэты і ўносілі ў соймавыя канстытуцыі, але кожны раз справа толькі гэтымі пастановамі і заканчвалася. З-за недахопу ў скарбе дзяржавы сродкаў грошы так і не паступілі ў рукі Крыштофа Валадковіча пры яго жыцці.

Спрэчкі паміж Валадковічам і Солтыкам аб памерах падзелу сумы вяліся з пераменным поспехам каля дзесяці год. У самы разгар вайны Крыштоф Валадковіч, ваявода навагародскі, ставіць апошнюю кропку ў вырашэнні такой складанай справы, якой было для яго атрыманне «Трубяцкой сумы». На сойме, па пытанню кампенсацыі асобным уладальнікам зямель у ваколіцах страчанага Трубяцка, была ўстаноўлена не толькі агульная сума кампенсацыі, але і вырашана праблема вызначэння яе памераў для асобных уладальнікаў. Так, Трубяцкія павінны былі атрымаць 180 000 злотых. Толькі пасля таго, як і асэсарскі суд, і каронны сойм 17 сакавіка 1659 г. «… прынялі рашэнні аб перадачы Крыштофу Валадковічу 130 000 злотых, а 50 000 злотых Базылю Солтыку на арэнду Трубяцка, прызнанай памерламу Паўлу Солтыку…», бакі вырашылі прыйсці да згоды і замацавалі сваё вымушанае рашэнне

ўгодлівымі лістамі. Абодва лісты складзены 19 мая 1659 г. і для большай надзейнасці прадстаўлены для актыкацыі ў адпаведную кнігу Літоўскай Метрыкі [53, л. 91, 94]. Згодна з рашэннем сойма «… вяльможнаму ваяводзе навагародскаму штогод будзе даходзіць (перадавацца) з кароннага скарба правізіі (камісійных за адтэрміноўку поўнага разліку) 8666 польскіх злотых і 20 грошай, а Солтыку — 3333 злотых і 10 грошаў… па камісіі Львоўскай…» [54, s. 317].

Пахаванне памерлай жонкі і вырашэнне спраў з яе маёмасцю Крыштофу Валадковічу прыходзілася сумяшчаць з вядзеннем шматлікіх судовых спраў па сваіх пазыках, па шкодах, нанесеных яшчэ Пятру Трубяцкому ды і самому пісару земскаму. У сакавіку–красавіку 1653 г. адбываліся рочкі (пасяджэнні) Менскага гродскага суда па разгляду яго справы з пані Ядвігай Падбярэзскай Самуэлевай Швейкоўскай, харужынай навагародскай, з-за невяртання ў тэрмін некалі ўзятай пазыкі [39, л. 1016–1017].

Краіна ўсе больш і больш уцягвалася ў крывавую вайну з запарожскімі казакамі і войскамі Маскоўскай дзяржавы. Для вядзення такой вялікай і працяглай вайны ў краіне не было ні грошай, ні людскіх рэсурсаў. Справа даходзіла да таго, што вайсковыя адзінкі, сканфедэраваўшыся (г. зн. арганізаваўшы саюз, які яны менавалі «Братэрскім хаўрусам»), наогул прыпынялі вайсковыя дзеянні. Пастаянная нястача грошай для выплаты войску прыводзіла да неабходнасці правядзення рэквізіцыі ў мясцовага насельніцтва ўсяго неабходнага, што, на самой справе, было толькі грабяжом і прыводзіла да ўзнікнення вострага супраціву дзеяннем свайго войска. Крыштоф Валадковіч у 1654 г. быў пасланы ў войска Януша Радзівіла, вялікага гетмана, для выплаты грошай жаўнерам, узбунтаваўшымся з нагоды рэгулярнай нявыплаты войску грашовага ўтрымання [55, с. 35]. Войску так званага старога зацягу (найму), якое першапачаткова знаходзілася пад камандай Януша Радзівіла, памерлага незадоўга да паездкі Крыштофа Валадковіча, не хапала да поўнага разліку за мінулы час вялікай сумы грошай, якіх, як гэта было ўжо неаднойчы ў гісторыі княства, у скарбе не было. Справа з вяртаннем войску выслужанага доўжылася да 1671 г.

Крыштоф Валадковіч, ваявода навагародскі, войт менскі, прымаў чынны ўдзел у вайне з казакамі і войскамі маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча, якія ўварваліся на тэрыторыю Вялікага княства. За кошт асабістых сродкаў ён узброіў казацкую харугву з 120 казакаў, якая дзейнічала на правым крыле каралеўскага войска. Некаторую частку яго харугвы складалі початы людзей, блізкіх да Крыштофа Валадковіча. Адну такую невялікую вайсковую адзінку складалі людзі, узброеныя за кошт пляменніка — Марціна Казіміра Валадковіча, будучага падстаросты і гараднічага менскага. Наўрадці сам Крыштоф Валадковіч прымаў

непасрэдны ўдзел у баявых аперацыях, хаця ваенны вопыт у яго меўся, у час найбольшай небяспекі для існавання дзяржавы, калі амаль уся яе тэрыторыя была захоплена войскам непрыяцеля. Нават сталіца княства Вільня была ў руках перамагаючага ворага. Шмат хто перайшоў на бок маскоўскіх войскаў. Можна здагадацца, што і Крыштоф Валадковіч не быў вольны ад ваганняў: верагодна і яго хвалявала думка аб пераходзе на бок пераможцы. Так, толькі гэтым можна растлумачыць давядзенне да ведама грамадскасці зместа граматы цара Аляксея Міхайлавіча да караля Польшчы, да яе ўручэння самому каралю. Як паведамляюць польскія гісторыкі, Валадковіч вымушаны быў апраўдвацца. Ужо ў 1662 г. Крыштоф Валадковіч у сваім пісьме каралю пісаў, што гэта было зроблена толькі «для дабра кароны і для карысці справы, для атрымання адтэрміноўкі і выдачы тым часам патрэбных распараджэнняў». Як паведамляе царскі баярын князь С. Урусаў, прыводзіўшы ў 1655 г. да прысягі Аляксею Міхайлавічу жыхароў заваяваных паветаў і ваяводстваў Вялікага княства, гэтую прысягу падчас уступлення царскіх войск у межы Навагародскага ваяводства прынеслі праз сваіх слуг: Пётр Вяжэвіч, ваявода навагародскі, і Крыштоф Валадковіч, пісар земскі менскі [56, с. 61, 110]. Брат Крыштофа Валадковіча Тэадор Валадковіч, войскі і суддзя гродскі менскі, перайшоў на бок маскоўцаў. Ці не было гэта зроблена з патаемнага дазволу старэйшага брата? Няма сумнення, што і вяртанне Тэадора Валадковіча пад айчынныя сцягі, і захаванне за ім усіх добр і ранейшых урадаў адбылося пры падтрымцы старэйшага брата. Толькі моцнай падтрымкай Крыштофа Валадковіча, прычым на самым высокім узроўні, можна растлумачыць атрыманне Тэадорам Валадковічам такога важнага ўрада, як урад пісара земскага менскага, нягледзячы на востры супраціў многіх прадстаўнікоў шляхецтва княства, у тым ліку і свайго пляменніка Марціна Казіміра Валадковіча, маючага шмат заслуг перад дзяржавай. Як вядома, Марцін Казімір Валадковіч, гараднічы менскі з 1658 г., не атрымаўшы жаданага ўрада, разам з Лукомскім сарваў сойм Рэчы Паспалітай.

Крыштоф Валадковіч асабіста трубяцкія грошы не атрымаў: яны былі атрыманы Аляксандрам Палубінскім, жанатым на старэйшай дачцы Крыштофа Валадковіча Зосі Валадковічаўне. Абставіны, пры якіх адбылося прызнанне Аляксандра і Зосі з Валадковічаў Палубінскіх спадчыннікамі Гальшкі Друцкай-Сакалінскай, былой Пятровай Трубяцкой, а потым Крыштофавай Валадковічавай, нам засталіся пакуль невядомымі.

**Крыштоф Валадковіч на пасадзе ваяводы навагародскага.** Па смерці Пятра Казіміра Вяжэвіча, ваяводы навагародскага, Крыштоф Валадковіч атрымаў прывілей, падпісаны каралём 18 сакавіка 1658 г.,

на ваяводства Навагародскае [51, л. 258]. На два дні раней, чым быў атрыманы гэты прывілей, Крыштоф Валадковіч, яшчэ пісар земскі менскі, атрымлівае новае наданне ад караля. Згодна прывілею караля ад 16 сакавіка 1658 г. Крыштофу Валадковічу, пісару земскаму менскаму, перадаваліся «… усе сумы і рухомая маёмасць па здрайцах Карабане і яго сынах, за яго заслугі і ўдзел у ваенных экспедыцыях, служыў нашым продкам: бацьку і брату…» [52, л. 130].

На пачатак 60-х гг. XVII ст., часу канчатковага выгнання іншаземных войск з тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, Крыштоф Валадковіч аказаўся вельмі багатым чалавекам. Толькі частка зямель належала яму поўнасцю і была набыта за свае грошы або перайшла да яго па тэстаментах памерлых жонак. Значную частку яго ўладанняў складалі каралеўскія, так званыя ленныя добры, якія перадаваліся ў пасесію (карыстанне) пажыццёва. Верагодна, што не ўсе ленныя добры трапілі ў рукі Крыштофа Валадковіча, ваяводы навагародскага, законна. За некаторыя з гэтых маётнасцяў Крыштоф Валадковіч заплаціў не толькі грашыма, але і жыццём сваіх слуг. На многія каралеўскія ўладанні меліся прэтэндэнты, па нейкіх прычынах адхіленыя ад іх трымання. Зразумела, што ранейшыя гаспадары не маглі прымірыцца са стратай сваіх наданняў і як маглі дабіваліся іх вяртання. Пры гэтым іх зусім не хвалявала высокая пасада, займаемая Валадковічам. У 1660 г. такіх спраў было некалькі. Спачатку на яго добры напаў Фердынанд Рор і добра пагасцяваў у фальварку ваяводы навагародскага. З дэкрэту асэсарскага суда ад 21 сакавіка 1662 г. вынікае, што Фердынанд Рор «… з нямалай грамадой людзей у парушэнне права паспалітага на добры, знаходзячыяся ў карыстанні ваяводы навагародскага, напаў…». Зразумела, што была страляніна, гарэлі хаты і на зямлі засталіся ляжаць забітыя людзі [57, л. 81]. На 24 ліпеня 1660 г. і Казімір Белякевіч наехаў з натоўпам сваіх людзей на сяло Ладзішычы, належачае да Навагародскага замку, і звёў нямала быдла да сваёй дзяржавы Голдава, што ў Лідскім павеце [58, л. 80].

Крыштоф Валадковіч, ваявода навагародскі, карыстаўся даходамі з сяла Ладзішычы, прыпісанага да Навагародскага замку, маётнасці Урэчча ў Ковенскім павеце і сяла Кублічы ў Ваўкавыскім павеце [36, s. 15]. У Менскім павеце ваяводзе навагародскаму належалі Грозаў, Грэбень, Астрашыцкі Гарадок з фальваркам Кардоўшчына [59, л. 355]. Як запісана ў матэрыялах па збору падымнага ў Менскім павеце, у Астрашыцкім Гарадку разам з млынам і нязменнай карчмой Валадковіч трымаў да 60 дымоў падданых. У Самахвалавічах, або Стаўбуновічах, належаўшых яшчэ дзеду Крыштофа пану Марціну Валадковічу, суддзі земскага менскага, налічвался яшчэ 21 дым. Каля 10 дымоў налічвала сяло Маляўка, належачая да войтаўства Менскага. Аднак, несумненна,

самым вялікім меннем, якім на гэты час карыстаўся Валадковіч, былі Стоўбцы з карчмой і 126 дымамі падданых, атрыманыя ім ад Чыжа ў доўгатэрміновую заставу [60, л.2].

Напэўна, самай вялікай і ўлюбёнай для яго была маётнасць Лыскава ў Ваўкавыскім павеце, дзе Крыштоф Валадковіч любіў праводзіць вольны час. У гэтай маётнасці агульная колькасць падаткаплацельшчыкаў, большасць з якіх складалі падданыя, дасягала 1170 чалавек. Пры зборы ў 1662 г. пагалоўнага падатку, устаноўленага соймам, Валадковіч заплаціў са сваіх асабістых сум за ўсіх насельнікаў Лыскава і прылеглых да яго фальваркаў больш за 1400 польскіх злотых [13, л.19]. Цікава паглядзець, як розніліся памеры падатку ў залежнасці ад сацыяльнага стану падаткаплацельшчыка. За сваю асобу ваявода навагародскі ўнёс 3 злотыя і як сенатар даплаціў дадаткова яшчэ 300. Самая высокая стаўка падатка, такая ж як і ў самога Валадковіча, была ўнесена за яго няпаўналетнюю дачку. За пані стольнікавую віцебскую, выхавацельку дачкі Крыштофа Валадковіча, і ахмістрыню, кіраваўшую дамавой гаспадаркай пана ваяводы навагародскага, унесена па 2 злотых. За пані Валадковічавую — 1 злоты і 15 грошай. За ўвесь астатні служэбны люд, які нёс павіннасць па ахове і абслугоўванню сям’і ваяводы, агульным лікам 62 чалавекі, было ўнесена яшчэ 62 злотых і 15 грошай. Па 1 злотаму было ўнесена ў скарб дзяржавы за кожнага з 1078 жыхароў вёскі Лыскава і прылеглых да яе фальваркаў.

Зразумела, што гэтыя сёлы і фальваркі складалі толькі невялікую частку яго маётнасцяў. Былі і некаторыя іншыя маётнасці, на жаль, не выяўленыя намі. Значныя добры знаходзіліся ў валоданні яго жонкі, пані Ізабэлы Масальскай, у межах Навагародскага ваяводства. Яшчэ ў 1690 г. знаходзіліся ў заставе ад яе вёскі Бышнякі і Масевічы [61, s. 180].

Будучы выдатным дыпламатам, Крыштоф Валадковіч браўся за выкананне самых адказных задач. На працягу значнага часу, у перыяд найбольш крывавых ваенных дзеянняў, паміж Масквой і кіруючымі коламі ВКЛ вяліся перамовы. Літоўскія дыпламаты, сярод якіх не апошнюю ролю адыгрываў Крыштоф Валадковіч, вялі перамовы з камісарамі маскоўскага цара, спрабуючы атрымаць на невялікі час адтэрміноўку ад вядзення вайсковых дзеянняў. Здаецца, што менавіта яму, улічваючы вялікі вопыт, кіруючыя колы каталіцкай царквы даручылі правесці ў канцы 1661 г. справу па «наварочванню» (пераходу) у каталіцкае веравызнанне аднаго з самых адданых і ўплывовых кальвіністаў Вялікага княства Літоўскага — Крыштофа Кавячынскага, падкаморыя менскага. За час свайго жыцця Крыштоф Кавячынскі сабраў вялікія добры. На жаль, гэтыя менні некаму было пакінуць, у падкаморыя менскага не засталося прамых спадчыннікаў. З усёй радні найбольш блізкія адносіны захаваліся ў Кавячынскага з роднай сястрой — Барбарай з Кавячынскіх

Самуэлевай Друцкай-Горскай, войтавай менскай. Аднак на шляху жадання апальнага падкаморыя менскага перадаць свае добры сястры стала яго канфесійная прыналежнасць. Верагодна, што Крыштофу Кавячынскаму паабяцалі не праводзіць канфіскацыі яго набыткаў пры ўмове пераходу ў каталіцызм і перадачы некаторых сваіх маёнткаў на забеспячэнне патрэб кляштараў і касцёлаў Менскага павета. У выкананні гэтай справы, акрамя самога Крыштофа Валадковіча, прынялі ўдзел Аляксандр Нарушэвіч, падканцлер ВКЛ, і Гіляры Чыж, падкаморы і біскуп віленскі [62, л.1307].

Як паведамляе А. Рахуба [63, s. 136], на 1662 г. Крыштоф Валадковіч, ваявода навагародскі, знаходзіўся ў новым шлюбе. Па смерці пані Гальшкі Друцкай-Сакалінскай Крыштоф Валадковіч, нягледзячы на вайну і свой чынны ўдзел у ёй, уступае ў новы шлюб з пані Крыстынай Тураўнай, былой Юр'явай Воланавай, пісаравай гродскай віленскай. Праўда, устанавіць дату смерці Юр'я Волана і дату шлюбу Крыштофа Валадковіча і пані Крыстыны Тураўны нам не ўдалося. Як вынікае з даследаванняў А. Рахубы, Юр'я Волан, кальвініст, займаў урад пісара гродскага Віленскага ваяводства на працягу 1653–1655 гг. Апошняе паведамленне пра яго датуецца 6 красавіка 1655 г. Яго наступнік Юр'я Комар, войскі вендэнскі, як паведамляе А. Рахуба, згодна з соймавай канстытуцыяй, павінен быў быць прызначаным на ўрад пісарства гродскага на рэляцыйным сойміку віленскім, які адбыўся 10 жніўня 1661 г. Гэтая інфармацыя дазваляе лічыць, што Юр'я Волан памёр да 1660 г. Магло быць і так, што ў час акупацыі горада соймікі не праводзіліся, ды і сам Віленскі гродскі суд не мог працаваць, таму і аб больш раннім уладкаванні Комара на згаданую пасаду размовы быць не магло. У такім выпадку шлюб Крыштофа Валадковіча з Крыстынай Тураўнай мог мець месца значна раней, каля 1656 г. У нашым распараджэнні ёсць адзін дакумент 1665 г., таксама прадстаўлены А. Рахуба, які датычыцца Крыштофа Валадковіча, ваяводы навагародскага, і яго жонкі Крыстыны Тураўны. У 1665 г. Даніел Лахніцкі пазваў у суд Крыштофа Валадковіча і яго жонку Крыстыну Тураўну, у першым шлюбе Юр'евую Воланавую, пісаравую гродскую віленскую. Справа датычылася правоў уласнасці на маётнасць Ластаі, размешчаную ў Ашмянскім павеце, і выглядала не зусім лёгкай для Валадковічаў. На руках у Лахніцкага і яго жонкі ўжо меўся дэкрэт Галоўнага Трыбунала, дзе на Валадковічаў выносілася баніцыя за беспадстаўнае супраціўленне дэкрэтам Трыбунала [64, k-757]. У гэтым выпісу з дакумента Крыштоф Валадковіч пазначаны як ваявода навагародскі. На жаль, сам арыгінал нам не прышлося трымаць у руках і таму мы не можам упэўнена сказаць, ці адпавядае выпіс арыгіналу. Справа ў тым, што адначасова з Крыштофам Валадковічам, спачатку пісарам земскім менскім, а потым і ваяводам навагародскім,

жыў і прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці Менскага ваяводства яшчэ адзін Крыштоф Валадковіч, сын Адама Марцінавіча Валадковіча, гараднічага менскага. Вяртаючыся да Крыстыны Тураўны, мы выказваем меркаванне, што ў шлюб Крыстына Тураўна сапраўды ўступіла з Крыштофам Валадковічам, але не з ваяводам навагародскім, а з гараднічоўцам менскім. Нам здаецца, што Крыштоф Валадковіч пасля смерці Гальшкі Друцкай-Сакалінскай да 1655 г. уступіў у апошні шлюб з Ізабэлай Людвікай Масальскай, былой Лукашовай Война, харужынай ваўкавыскай.

У матэрыялах Радзівілаўскага архіва, які захоўваецца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, нам сустрэўся дакумент аб справе, якая ўзнікла ў 1654 г. паміж Крыштофам Валадковічам, пісарам земскім менскім, і яго жонкай Людвікай, былой Уладзіслававай Казаноўскай, з земскімі ўраднікамі Берасцейскага ваяводства Янам Казімірам Умястоўскім, суддзёю, і Марцінам Аляксандрам Бухавецкім, падсудкам, за няправільны суд іх па фальварку на Берасцейшчыне з Паўлам Сапегай, ваяводай віцебскім [13, л. 17–18]. У канцы дакумента, на адвароце, зроблена прыпіска аб тым, што гэтая справа датычыцца Ізабэлы Масальскай. Ізабэла Масальская, дачка Андрэя Масальскага, кашталяна берасцейскага (на 1627 г.), былога ваяводы менскага (1643–1645 гг.), ваяводы берасцейскага (з 1645 г.), які памёр у 1651 г., і Альжбеты Вайгер, ваевадзянкі мальбарскай. Згодна са звесткамі Андрэя Рахубы, да Крыштофа Валадковіча Ізабэла Масальская была ў шлюбе толькі за Лукашом Война, харужым ваўкавыскім. Паведамленняў аб яе шлюбе з Уладзіславам Казаноўскім дагэтуль нам не сустракалася. Ад Лукаша Войны ў Ізабэлы Масальскай засталася адзіная дачка — Крыстына, якая ўступіла ў шлюб з Якубам Кунцэвічам, ваяводам берасцейскім. Другая ж дачка Ізабэлы Масальскай Крыштофавай Валадковічавай, ваяводзіны навагародскай, Іаана, як і пацвярджае сама ваяводзіна навагародская ў сваім тэстаменце, уступіла ў шлюб з панам Марцінам Крышпін-Кіршэнштэйнам, старостам плунгянскім [65, k. 925–936], і мела значныя добры на тэрыторыі Навагародскага ваяводства (Бышнякі, Масевічы і некаторыя іншыя).

Пацвярджэннем нашай думкі аб шлюбе Валадковіча толькі з Ізабэлай Масальскай з’яўляецца валоданне Крыштофам Валадковічам меннем Лыскова. Першае ўпамінанне аб гэтым менні датычыцца 1657 г. Менавіта ў гэтым сяле Крыштоф Валадковіч і Юр’я Трубяцкі, перад ад’ездам Вігунта ў Маскву, складаюць дакумент аб перадачы пісару земскаму менскаму ўсіх правоў на карыстанне спадчыннымі землямі і грашовымі сумамі, належачымі Трубяцкім. І ў 1662 г. Крыштоф Валадковіч, як нам стала вядома з квіту паборцаў Ваўкавыскага павета [13, л.19], збіраючых «пагалоўны падатак, уведзены соймам у гэтым

жа годзе», працягваў карыстацца маётнасцю Лыскава, дзе і пражываў разам са сваёй жонкай і непаўналетняй дачкой. Як вядома, гэтую маётнасць пані Ізабэла Масальская, ваевадзянка менская, атрымала ад свайго першага мужа — пана Лукаша Войны, харужага Ваўкавыскага павета. У дакуменце ад 3 лютага 1635 г. пацвярджаецца трыманне Лукашом Война і пані Ізабэлай Масальскай Лукашовай Войнінай гэтай маётнасці. Якраз гэтым днём пазначана вынясенне баніцыі ад пана Калечыцкага на Лукаша Войну і яго жонку з-за невяртання пазыкі. Вяртанне самой пазыкі, шкод, панесеных самім Калечыцкім у ходзе разгляду справы і судовых выдаткаў, было ўскладзена на іх маётнасць Лыскава, размешчаную ў Ваўкавыскім павеце [66, л. 579]. Трэба адзначыць, што Лукаш Война не дапусціў спусташэння Лыскава, і муж, і жонка адчайна баранілі сваю ўласнасць ад разрабавання, нягледзячы на прынятыя Галоўным Трыбуналам адпаведныя дэкрэты аб баніцыі і інфаміі на Войнаў.

Апошнія гады жыцця Крыштофа Валадковіча былі азмрочаны працяглай барацьбой за ўрад менскага войта з амбітным Ежы Дадзьбогам Лукомскім, які не цураўся ніякіх спосабаў у барацьбе за дасягненне пастаўленай мэты. Так, на 8 чэрвеня 1670 г., верагодна, што сам пан ваявода навагародскі, войт менскі, знаходзіўся яшчэ пры жыцці, у матэрыялах Менскай магдэбургіі ўнесены дакумент аб правядзенні войтаўскага суда Ежы Дадзьбогам Лукомскім, войтам і падчашым менскім [67, л. 678]. Склад магдэбургскага суда зацвярджаўся войтам, і кожная судовая справа пачыналася з пераліку службовых асоб, якія судзілі ў Менскай Ратушы: лентвойта, бурмістраў, райцаў, лаўнікаў, з поўным менаваннем войта менскага, зацвердзіўшага склад гэтага суда. Наступныя запісы аб правядзенні судоў Менскай магдэбургіі ўтрымліваюць паведамленне аб правядзенні слуханняў судовых спраў ландвойтам і ўсімі бурмістрамі, райцамі і лаўнікамі менскімі, устаноўленымі на сваё судовае месца ад пана ваяводы навагародскага, войта менскага Крыштофа Валадковіча. Здаецца, што ваявода навагародскі змог на невялікі час дабіцца прызнання Лукомскім сваіх правоў на гэтую пасаду. Апошні запіс аб устанаўленні ўсяго склада Менскай магдэбургіі ад Крыштофа Валадковіча, ваяводы навагародскага, войта менскага, мы знаходзім у дакуменце ад 17 чэрвеня 1670 г. [67, л. 590]. У пазнейшых судовых справах склад суда ўстанаўліваўся Ежы Лукомскім, падчашым і войтам менскім.

Пасля смерці Крыштофа Валадковіча, ваяводы навагародскага і войта менскага, пані Ізабэле Масальскай прыйшлося вытрымаць сапраўдны штурм крэдытораў. Аказалася, што ў магутнага вяльможы ў апошнія гады яго жыцця важнае месца ў забеспячэнні яго патрэб займалі пазыкі. Некаторыя з іх, як, напрыклад, грошы Самуэла Валадковіча, падсудка земскага менскага, захоўваліся ў Крыштофа Валадковіча яшчэ з часу

смерці яго стрыя (дзядзькі) Рыгора Валадковіча. У канцы 1670 г. прыйшлося выплачваць або дамаўляцца аб пераносе тэрмінаў вяртання грошай на іншы час з многімі крэдыторамі. Так, была дасягнута дамоўленасць з дочкамі памерлага Самуэла Валадковіча, Леанорай і Канстанцыяй Валадковічаўнамі, аб адданні ў 1671 г. 1200 злотых [68, s. 108]. Зусім па-іншаму паглядзела на неабходнасць вяртання бацькоўскіх пазык родная дачка Крыштофа Валадковіча — пані Зося Канстанцыя Аляксандравая Палубінская, маршалковая ВКЛ. Супярэчнасці ўзгарэліся з-за прыналежнасці маётнасці Астрашыцкі Гарадок. Паміраючы, ваявода навагародскі пакінуў маётнасць сваёй дачцы — пані Зосі Аляксандравай Палубінскай. Аднак, верагодна, для таго, каб яго спадчыннікі не пачувалі сябе вельмі спакойна на дзедзічных землях, запісаў 40 000 злотых на Астрашыцкі Гарадок другой сваёй дачцы — пані Іаане, народжанай у шлюбе з Ізабэлай Масальскай. Зразумела, што маршалак ВКЛ па ўсіх правілах вайсковай навукі зрабіў наезд на маётнасць і добра пачысціў яе сусекі [69, s. 1–3].

Памерла пані ваяводзіна навагародская ў 1673 г., амаль на тры гады перажыўшы свайго мужа. У сваім тэстаменце пані Ізабэла Масальская падкрэслівае, што мела ад Крыштофа Валадковіча дачку Іаану. Зразумела, што ў такім выпадку, будучы ў шлюбе з пані Ізабэлай Масальскай, не мог Крыштоф Валадковіч, ваявода навагародскі, судзіцца з Даніелем Лахніцкім з-за Ластаёў у 1665 г. Менавіта ў гэты час Іаана Валадковічаўна мела каля дзесяці год ад нараджэння і знаходзілася на выхаванні ў пані стольнікавай віцебскай. Судовую справу з Даніелем Лахніцкім і яго жонкай мог весці разам з Крыстынай Тураўнай, былой Юр’явай Воланавай, толькі Крыштоф Валадковіч, гараднічовец менскі.

У некаторых гісторыкаў сустракаем паведамленне, што незадоўга да сваёй смерці Крыштоф Валадковіч атрымаў новы прывілей на намінальна існуючае Смаленскае ваяводства. Аднак самога прывілея нам не давялося сустрэць у матэрыялах Метрыкі. Да таго ж матэрыялы актавых кніг Менскай магдэбургіі ўтрымліваюць звесткі аб менаванні Крыштофа Валадковіча, войта менскага, яшчэ 18 чэрвеня 1670 г., незадоўга да смерці, ваяводам навагародскім. Дакладна вядома, што сам Крыштоф Валадковіч, ваявода навагародскі і войт менскі, памёр у чэрвені 1670 г., пражыўшы больш за 70 гадоў.

## Крыніцы і літаратура

1. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 111. Л. 316.
2. Zychlinski T. Zlota księga szlachty polskiej. Poznań, 1883. T. V. S. 424.
3. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 128. Л. 352.
4. Там жа. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 12. Л. 88.

5. Wolodkowicz Andrzej (1928–1995). Wolodkowiczowie herbu Radwan. Ottawa, 1978. Л. 6.
6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн.: БелЭн, 1994. Л. 205.
7. Брэгер Г. М. Хацюхова. Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. Л. 21–23.
8. НГАБ. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. Л. 270.
9. Там жа. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 268. Л. 339.
10. Брэгер Г. М. Архіў маёнтка Глыбокае Зяновічаў і Радзівілаў у Галоўным Архіве старажытных актаў у Варшаве // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Мн., 2006. Вып. 4. Л. 5.
11. Boniecki A. Herbarz Polski. Warszawa. 1901. T. IV. S. 349.
12. НГАБ. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 1. Л. 434–435.
13. Там жа. Ф. 1702. Воп. 1. Спр. 4. Л. 10.
14. Boniecki A. Herbarz Polski. Warszawa. 1905. T. VIII. S. 358.
15. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 296. Л. 22.
16. Там жа. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. Л. 669.
17. Там жа. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 9. Л. 680.
18. AR. X 354, nr 204. S. 1. Са збораў А. Рахубы.
19. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 313. Л. 1.
20. Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн.: губ. тип., 1848. Л. 170.
21. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 106. Л. 372.
22. Там жа. Спр. 110. Л. 390.
23. Еўлашэўскі Ф. Успаміны. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1990. Л. 249.
24. НГАБ. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 2. Л. 413.
25. Там жа. Ф. 1702. Воп. 1. Спр. 2. Л. 824–825.
26. Там жа. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 3. Л. 454–455.
27. MHEWil. R-893. S. 265–269. Са збораў А. Рахубы.
28. НГАБ. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 14. Л. 28.
29. Там жа. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 114. Л. 387.
30. Там жа. Спр. 119. Л. 860.
31. Там жа. Спр. 334. Л. 241.
32. Там жа. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 9. Л. 784.
33. Там жа. Спр. 11. Л. 773.
34. Там жа. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 328. Л. 218.
35. Там жа. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 33. Л. 85.
36. AP. X 354, nr 203. S. 10–12. Са збораў А. Рахубы.
37. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 502. Л. 217, 408.
38. АВАК. Т. XV. Л. 33, 50.
39. НГАБ. Ф. 1727. Воп. 1. Спр. 34. Л. 540.

40. Нарбут А. Т. Генеалогия Белоруссии. М., 1994. Вып. 2 (XVI–XVIII). Л. 85.
41. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 108. Л. 133–135.
42. Там жа. Спр. 118. Л. 137.
43. Там жа. Спр. 343. Л. 387.
44. Там жа. Спр. 335. Л. 425.
45. Там жа. Спр. 332. Л. 52.
46. Там жа. Спр. 125. Л. 267.
47. Там жа. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 946. Л. 16.
48. Ельскі А. Выбранае. Мн.: Беларускі кнігазбор, 2004. С. 194.
49. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 127. Л. 456.
50. Там жа. Ф. 1730. Воп. 1. Спр. 1. Л. 345.
51. Там жа. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 131. Л. 296.
52. Там жа. Спр. 130. Л. 93.
53. Там жа. Спр. 133. Л. 180.
54. Wolumna Legum. Wyd. S. Ohryzko. Petersburg, 1859. T. IV. S. 317.
55. Сагановіч Г. М. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. Мн.: Навука і тэхніка. С. 35.
56. Крестоприводная книга шляхты Великога княжества Литовскога 1655 г.: Памятники истории Восточной Европы: Источники XV–XVII вв. / Сост. Лыкова Е. Е., Кулецкий М. М.: Древлехранилище, 1999. Т. IV. С. 61, 110.
57. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. С. 349. Л. 81.
58. Там жа. Спр. 348. Л. 80.
59. Там жа. Ф. 1769. Воп. 1. Спр. 29. Л. 355.
60. Падымнае Менскага ваяводства на 1667 г. Л. 2. Са збораў М. Спірыдонава.
61. Metrika Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Wojewodstwo Nowogrodzkie 1690 r. Pod red. A. Rachuby, opracowali H. Lulewicz, A. Rachuba. Warszawa, 2002. S. 180.
62. НГАБ. Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 8. Л. 1307.
63. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. 1. Wojewodstwo Wilenskie. XIV–XVIII wiek. Pod red. A. Rachuby. Opr. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk przy wspolpr. Ul. Jemialianczuka, A. Macuka. Warszawa, 2004. S. 136. № 609.
64. VUB, F. 7-6/5960, k-757. Са збораў А. Рахубы.
65. LVIA, SA 13, k-925–936v. Са збораў А. Рахубы.
66. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 320. Л. 579.
67. Там жа. Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 1. Л. 678.
68. AR. X 354, nr. 209. S. 108. Са збораў А. Рахубы.
69. AR. X 354, nr. 232. S. 1–3. Са збораў А. Рахубы.

*М. У. Шымукенус*

# З гісторыі Троіцкай царквы ў Магілёве

На левым беразе Дняпра, насупраць гістарычнага цэнтра Магілёва, знаходзіліся дзве часткі горада — сотні Лупалаўская і Зарэцкая ці Троіцкая (Траечча). На тэрыторыі Зарэцкай сотні размяшчалася Троіцкая царква, якая ў XVI – пачатку XX ст. вызначала жыццё гэтай часткі горада. Дакладна невядома, калі яна ўзнікла. У пераліку магілёўскіх цэркваў за 1552 г. даведваемся, што «царква Святой Троіцы, да яе надання ніякага няма, адно з перавозу дняпроўскага частка яко іншым цэрквам» [1]. Наступны раз царква згадваецца ў дакументах у 1588 г., калі дойліды Халей Мацюшын, Іван Аляксеевіч і Цімошка Гаўрыловіч дакладалі судоваму ўраду аб сваім найме на будаўніцтва прытвора Св.-Троіцкай царквы [2, с. 179]. У гэты час царква была драўлянай і хутчэй за ўсё невялікай. У 1590 г. у ёй адбыўся кур'ёзны выпадак. Святар царквы Святой Троіцы Павел Грыгаровіч напісаў скаргу ў магілёўскі магістрат на сваіх прыхаджан — мяшчан Траечча. Вернікі адабралі ключы ў святара і абвясцілі, што аддаюць царкву другому папу, Аўдзею Цішковічу, якога прасілі адслужыць вячэрню. Святар, палічыўшы гэты ўчынак за абразу і несправядлівасць, спасылаўся на тое, што служыць у царкве па дзедзічнаму (спадчыннаму) праву, яшчэ дзед яго Самуйла Іванавіч быў тут папом. Бурмістр і радцы паслалі ў Траеччу «слугу меская» Пятра Мітковіча для расследавання дадзенага факта. Высвятлілася, што мяшчане былі не задаволены паводзінамі святара, быццам бы ён не паважаў прыхаджан і не жадаў да іх прыслухоўвацца. Грыгаровіч заяўляў, што не ад мяшчан атрымлівае грошы, а ад каралеўскай улады, што царква з'яўляецца яго ўладаннем. Неабходна заўважыць, што прыхаджане Троіцкай царквы былі не простымі людзьмі, сярод іх было шмат багатых гандляроў і рамеснікаў, бурмістраў і радцаў. Яны жадалі самі вызначаць рэлігійнае жыццё. Таму святару прыходзілася служыць у няпростых умовах. Магістрат памірыў прыхаджан і папа на пэўных умовах. Прыхаджане згадзіліся прыняць назад Грыгаровіча, каб ён не быў «пыхлівым і гордым», на ўмовах пажыццёвага ўладання. Не выпадкова, што поп прасіў абавязкова запісаць гэтае рашэнне ў судовыя кнігі магілёўскага магістрата. Падзеі 1590 г. сведчылі аб перамозе жыхароў Зарэцкай сотні над клірам Троіцкай царквы. З гэтага дакумента бачна, што Троіцкая царква існавала ўжо ў сярэдзіне XVI ст., прыхаджанамі якой з'яўляліся мяшчане Траечча і жыхары сяла Аніскавічы [3, с. 496–498].

У канцы 1595 г. Магілёў захапіў атрад казакаў на чале з Севярынам Налівайка. У каралеўскім лісце ад 4 траўня 1596 г. указвалася, што войска Налівайкі спаліла 7 цэркваў, у тым ліку і Троіцкую [14, с. 71].

У 1596 г. падпісана Берасцейская унія, праваслаўныя храмы пераваралі ва уніяцкія. Гісторыя распаўсюджвання уніяцтва — гэта працэс супрацьборства праваслаўнай і уніяцкай цэркваў. У 1618 г. магілёўскія месцічы не пусцілі ў горад уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, за гэты ўчынак зачынілі праваслаўныя цэрквы ў Магілёве, сярод якіх згадвалася і Троіцкая [14, с. 71].

Адкрыццё Троіцкай царквы ў 1633 г., згодна з загадам караля Уладзіслава IV, звязана з трагічнай падзеяй. У праваслаўнага насельніцтва Магілёва вялікай павагай карысталася свята Троіцы. Раніцай, у дзень Прасвятой Троіцы, праваслаўныя вернікі спяшаліся ў царкву на богаслужэнне. Жадаючых пераправіцца праз Дняпро было шмат, і паром перавярнуўся, патанула значная колькасць людзей. Хадзілі чуткі, быццам уніяты падрэзалі канаты парома. Праўда, у адным з дакументаў гэта падзея адносіцца да 1635 г. [13, с. 20].

Ёсць звесткі пра Троіцкую царкву і ў часы вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй (1654–1667 гг.). У 1654 г. Магілёў захапілі рускія войскі. Гетман Януш Радзівіл не змог вызваліць горад, вясной па яго загаду спалілі Задняпроўе, у тым ліку і Троіцкую царкву. У часы Паўночнай вайны (1700–1721 гг.) паміж рускімі і шведамі Задняпроўе не было спалена, і Троіцкая царква ўцалела [14, с. 71–72].

Дакладнае месцазнаходжанне Троіцкай царквы ў XVI–XVIII стст. вызначыць цяжка. Справа ў тым, што царква ў вышэйзгаданы перыяд была драўлянай, некалькі разоў перабудоўвалася, спальвалася ў войнах, зноў аднаўлялася ў новых месцах. Першапачаткова яна знаходзілася на тэрыторыі паміж сучаснымі лядовым палацам і ДК «Хімвалакно». Апошняя Троіцкая царква знаходзілася ў тым месцы, дзе заканчваецца мост цераз Дняпро і пачынаецца праспект Пушкіна (з боку горада).

Пасля пажару 9 снежня 1792 г. жыхары Траечча сталі будаваць новую мураваную царкву. Па звестках супрацоўніка НГАБ З. Яцкевіча, царква закладзена не пазней 1794 г. У 1810 г. Троіцкая царква асвечана і пачала сваю дзейнасць. Будынак царквы быў мураваным, а пры ёй знаходзілася драўляная званіца. Дах і купал царквы пакрылі жалезам, на купале жалеза замянілі ў 1844 г. У 1871, 1888, 1895 і 1901 гг. Троіцкую царкву рамантавалі. Яна была халоднай (летняй), таксама існавала невялікая цёплая (зімовая) царква ва імя Раства Багародзіцы, якая знаходзілася пад званіцай. Зімовая царква фактычна была паўразбуранай, і таму ў 1864 г. пачалі будаваць новую. На грошы, атрыманыя ад дзяржавы за перадачу часткі зямлі пад шашу, а таксама за кошт духоўнага ведамства новую царкву ў 1865 г. пабудаваў гомельскі мешчанін Ціхан Сямёнавіч Разанаў. Асвечана гэта царква 21 лістапада 1864 г. епіскапам Яўсевіем як царква Срэцення Гасподня, перабудавана ў 1885 г. [6, арк.1–1 адв; 11, арк. 3; 9].

Царква Святой Троіцы ў канцы XIX ст. не выдзялялася арыгінальнасцю, выглядала звычайна. Мясцовыя святары пастаянна сачылі за станам царкоўных пабудоў, наймалі майстроў, якія бялілі і штукатурылі сцены, перакрывалі дах, красілі купалы. Абедзве царквы былі белага колеру, з блакітнымі купаламі. Над уваходам у Троіцкую царкву знаходзілася ікона Госпада Бога Саваоха са Святым Духам, у выглядзе галубка. Царкоўная маёмасць складалася з 2 паціраў, 2 сасудаў, 1 дыскаса, 10 перамен святарскага адзення, 3 дыяканскіх сціхараў і 10 сурвэтак для абрадавых патрэб [6, арк. 1–1 адв.].

Мелася і царкоўная бібліятэка, у 1898 г. у ёй налічвалася ўсяго 34 кнігі рэлігійнага зместу і 36 кніг духоўнай накіраванасці. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) на сённяшні момант знаходзяцца на захаванні рахунковыя кнігі, пачынаючы з 1856 г., прыходныя кнігі — з 1858 г. Усе кнігі былі прашнураваны, з пячаткай. Захоўваліся ведамасці кашальковых грашовых сум, таксама тут трымалі і фінансавыя сродкі. З 1832 г. пачалі весці і захоўваць метрычныя кнігі з запісамі аб нараджэнні, шлюбе і смерці. Спавядальныя запісы пачалі складаць з 1849 г., а з 1839 г. — вобыскныя запісы (звесткі пра шлюб, маладых, іх бацькоў і сведкаў). Добрая факталагічная база дакументаў Троіцкай царквы захавалася і ў значнай ступені дайшла да нашых дзён [5, арк. 1; 6, арк. 2].

Цікава прасачыць прыбыткі і выдаткі кліра Троіцкай царквы. З даўніх часоў прыхаджане і рэлігійныя дзеячы ахвяравалі царкве розныя каштоўнасці: грошы, упрыгажэнні, зямлю і г. д. Так, у 1691 г. беларускі епіскап і намеснік Сільвестр Валчанскі завяшчаў царкве Святой Троіцы 20 залатых, у 1858 г. прыхаджанка Марыя Яцуціна — 70 руб. срэбрам. Магілёўскі мешчанін Стэфан Бутома завяшчаў Троіцкай царкве 4 дзесяціны 564 сажні сенакосных лугоў. Пастаянны прыбытак прыносіў продаж свечак. Напрыклад, у студзені 1858 г. прададзена 2 фунты свечак на суму 2 руб. Таксама збіралі грошы кубкамі на святы. Так, на свята Троіцы ў маі 1858 г. сабралі 2 руб. 86 кап., а ў маі 1864 г. — 10 руб. 52 кап. Троіцкая царква здавала ў арэнду землі і лугі, за гэта атрымлівала грашовыя сумы. Напрыклад, у лістападзе 1867 г. узялі 3 руб. за арэнду зямлі ад мешчаніна Антона Лабякова [4, с. 421; 5, арк. 1; 8, арк. 2; 10, арк. 21 адв.].

Выдаткі царква мела таксама вялікія, неабходна было ўтрымліваць царкоўную маёмасць у добрым стане і шмат чаго купляць і рамантаваць. У чэрвені 1856 г. служыцелі Троіцкай царквы набылі 10 скрынак вугалля ў селяніна памешчыка Гартынскага Савы Фёдарава за 60 кап. У красавіку 1860 г. за складанне новага зруба плотніку Калужскай губерні селяніну Філіпу Казлову заплацілі 25 руб. Яўрэю Абраму Жытомірскаму за ўнутраны рамонт царквы ў чэрвені 1860 г. аддалі 10 рублёў. Троіцкая

царква расходавала многа грошай, невялікія прыбыткі не дазвалялі яе кліру поўнасцю вырашаць шматлікія фінансавыя праблемы. Таму ў канцы XIX – пачатку XX ст. Троіцкая царква выглядала малапрыкметнай рэлігійнай установай, якіх у Беларусі налічвалася сотні [10, арк. 23].

Троіцкая царква мела пэўную колькасць зямлі, якая з цягам часу памяншалася ў сувязі з будаўніцтвам Нова-Чарнігаўскай шашы. У 1898 г., па плану землямера Маеўскага, пры царкве налічвалася каля 7 дзесяцін зямлі як прыдатнай, так і непрыдатнай. На ёй размяшчаліся дамы святара і дзяка, а таксама агароды. Яшчэ 6 моргаў сенакоснай зямлі насупраць Буйніч належала Троіцкаму прычту. Акрамя зямлі ў межах горада царква мела шмат ворыўнай зямлі ў маёнтках памешчыка Сенажэцкага, асабліва каля вёскі Палетнікі. У 1852 г. усе гэтыя землі перайшлі дзяржаве, таму штогод прычту Троіцкай царквы выплачвалася 7 руб. 53 кап. [5, арк. 1; 6, арк. 1–1 адв.].

Па штату 1844 г. Троіцкай царкве дазвалялася мець святара і дзяка (з 1873 г. — псаломшчыка). Захаваліся звесткі пра святароў Троіцкай царквы. З 1851 па 1889 гг. святаром на Траеччы з'яўляўся Іосіф Пятровіч Кернажыцкі, які пражыў 75 гадоў. Цікавы жыццёвы лёс гэтага чалавека. Ён скончыў Магілёўскае духоўнае вучылішча ў 1837 г., быў настаўнікам духоўнага вучылішча ў Гомелі, а потым служыў у Буйнічах пры царкве Раства Багародзіцы і пры дзявочым манастыры, а пазней святаром Федароўскай царквы Рагачоўскага павета. Яго жонку звалі Аляксандра, яны мелі дачку Марыю і сына Канстанціна. Да 1851 г. дзякам і панамаром тут служыў Мікалай Кашмарэвіч, а пасля яго смерці — Дзмітрый Самініч, які з'яўляўся зяцем Кашмарэвіча [5, арк. 1–2].

Значны ўклад у жыццё праваслаўнага насельніцтва Траечча ўнёс святар Пятро Львовіч Бруевіч, які служыў тут з 1889 г. да пачатку XX ст. Ён нарадзіўся ў 1859 г., скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, працаваў законавучыцелем у розных народных вучылішчах, а з 1889 г. стаў святаром Троіцкай царквы. Праасвяшчэнны Сергій яго ўзнагародзіў набедранікам у 1892 г., у 1894 г. быў прызначаны памочнікам благачыннага. У памяць царствавання імператара Аляксандра III Бруевіч атрымаў срэбраны медаль на Андрэеўскай стужцы ў 1896 г., а праз год абраны членам праўлення Магілёўскай духоўнай семінарыі. Яго жонкай была Сафія Львоўна, яны мелі дзяцей: Пятра, Надзею, Георгія, Міхаіла і Паўла. З 1858 г. дзякам Троіцкай царквы з'яўляўся Леў Якушэвіч, а ў 1862 г. — Пятро Паслаўскі і Флор Тышкевіч. У 1864 г. дзякам служыў Павел Піотух, а з 1868 г. — Іван Андрыцкі. Найбольш вядомым служыцелем Троіцкай царквы быў Міхаіл Рыгоравіч Свідэрскі, які пачаў працаваць дзякам з 1871 г. і меў некалькі падзяк ад вышэйстаячых святароў. Напрыклад, у 1896 г. ён атрымаў медаль на Андрэеўскай стужцы. Цікавы выпадак адбыўся са Свідэрскім у 1886 г. За ўдзел у вянчанні,

не дазволеным законам, ён цэлы месяц знаходзіўся ў зняволенні ў Аршанскім манастыры [6, арк. 2 адв.–3; 9, арк. 11 адв.].

З даўніх часоў прыхаджане Троіцкай царквы выбіралі старосту — грамадскага кіраўніка, які вырашаў розныя гаспадарчыя і фінансавыя пытанні, сярод якіх можна згадаць: Спірыдона Яцуціна, Сямёна Агеева і Афанасія Шкеля [6, арк. 4 адв; 10, арк. 9 адв.].

Да Троіцкай царквы адносіліся жыхары Траечча і Грабянёва, захаваліся лічбы аб насельніцтве. Так, у 1898 г. у межах горада пражывала прыхаджан — 301 чалавек, а ў Грабянёва — 382, і адпаведна ў 1903 г. — 346 і 473 жыхароў. Такім чынам, Троіцкая царква з'яўлялася цэнтрам жыцця праваслаўнага насельніцтва Троіцкай сотні Магілёва, і спачатку вёскі Аніскавічы, а потым Грабянёва [6, арк. 6 адв.; 7, арк. 6 адв.].

## Крыніцы і літаратура

1. Віцебская даўніна. Т. 1. № 153.
2. Магілёўскі магістрат 1580–1581, 1588. Вып. I. Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII стст. / Склад. З. Л. Яцкевіч, А. А. Лашкевіч. Мн.: БелНДІДАС, 1999.
3. Историко-юридические материалы. Вып. 7. Витебск, 1876. С. 496–498.
4. Там же. Вып. 9. Витебск, 1878. С. 421.
5. НГАБ. Ф. 2324. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 1–2.
6. Там жа. Спр. 7. Арк. 1–6 адв.
7. Там жа. Спр. 16. Арк. 6 адв.
8. Там жа. Спр. 18. Арк. 2–31.
9. Там жа. Спр. 28. Арк. 11 адв.
10. Там жа. Спр. 29. Арк. 1–32 адв.
11. Там жа. Спр. 74. Арк. 1–6 адв.
12. Фонд З. Яцкевіча.
13. Хроника белорусского города Могилёва. М., 1887. С. 20.
14. Шымукенус М. З гісторыі Магілёўскага Задняпроўя. Шляхі Магілёўскай гісторыі. Зборнік прац удзельнікаў IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць». Магілёў, 2005. С. 69–74.

# Генеалогія

*В. В. Урублеўскі*

## Род галандскіх дваран Гартынгаў на Беларусі

Гісторыя і генеалогія замежных дваранскіх родаў на Беларусі не атрымала вельмі шырокага асвятлення ў сучаснай гістарыяграфіі. Самай значнай на сёння спробай даследавання гэтай тэматыкі можа лічыцца кандыдацкая дысертацыя М. М. Елінскай «Крыніцы аб дваранскіх родах заходнееўрапейскага паходжання…» [1]. У якасці прыклада неабходна ўзгадаць і некаторыя іншыя навуковыя і навукова-папулярныя айчынныя працы: манаграфія А. І. Валахановіча, прысвечаная роду графаў Гутэн-Чапскіх [2], артыкул В. У. Хурсіка адносна гісторыі роду Офенбергаў, уладальнікаў маёнтка Лочын на Ігуменшчыне [3], інфармацыйнае паведамленне М. М. Елінскай аб ірландскіх графах О'Рурках на Беларусі [4] і г. д.

Род Гартынгаў мала вядомы ў айчыннай гістарычнай навуцы. Даследаванне ж гэтага пытання набывае значную актуальнасць у сувязі з неабходнасцю паглыблення мясцовай гісторыі, гісторыі населеных пунктаў і адпаведна звароту ўвагі на асоб, з імі звязаных. З роду Гартынгаў выходзілі слынныя дзяржаўныя і вайсковыя дзеячы, і таму ён варты асобнага даследавання.

Для напісання артыкула былі выкарыстаны: вывад, зроблены Гартынгам 12 сакавіка 1870 г. Мінскім дваранскім дэпутацкім сходам [5] [1], справа аб паходжанні роду, што захавалася ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [6] і некаторыя архіўныя і ўжо публікаваныя матэрыялы.

Яшчэ з пачатку XVIII ст. у Расійскай імперыі пачаў адчувацца прыток іншаземцаў, галоўным чынам вайскоўцаў, службоўцаў, дзеячаў культуры. Пачатак XIX ст. адзначыўся тымі ж працэсамі. Да ліку такіх

---

[1] Гартынгі таксама былі прызнаны ў дваранстве Пецярбургскім ДДС, ад якога атрымалі вывад 15 лістапада 1856 г.

мігрантаў адносіўся і Марцін-Марыя-Квінцін Гартынг (1785–1824), што паходзіў з дваранскага роду г. Лэйдэн Батаўскай рэспублікі (Галандыя).

Прозвішча Harting/Garting/Gartyng можа паходзіць ад нямецкага слова «hart», што значыць цвёрды, жорсткі, трывалы. Род карыстаўся ўласным гербам «Harting». Апісанне герба згодна з малюнкам у нямецкім выданні «Grobes mappen bilder lerifon» наступнае: колер поля шчыта невядомы, у шчыце змешчаны перакрыжаваныя мячы лязом уніз, у клейноце — падкова з кордам у цэнтры, накіраваным вастрыём уверх [7; s. 670]. Польскі мастацтвазнаўца і гісторык Раман Афтаназі апісвае герб Гартынгаў у выглядзе падтрымліваемага грыфонамі картуша, завершанага баронскай каронай. Пад картушам вылучаўся надпіс родавага дэвіза «Semper Linea recta in nomine semper» [8; s. 60]. Дадзены варыянт герба, магчыма, з'яўляецца мадыфікацыяй таго варыянта, што апісаны ў нямецкім выданні.

Гісторыя роду Гартынгаў на прасторах Расійскай імперыі распачалася ў 1803 г., калі інжынерны паручнік войск Батаўскай рэспублікі Марцін Мікалаеў Гартынг быў выкліканы ў Расію сваім суайчыннікам і суродзічам П. К. Сухтэленам [2], для залічэння на рускую службу [9; с. 240].

Генерал Пётр Сухтэлен, знаходзячыся на пасадзе ўпраўляючага імператарскай світай па квартмайстарскай частцы, быў абавязаны камплектаваць яе адукаванымі і таленавітымі маладымі афіцэрамі, асабліва годнымі для ваенна-тапаграфічнай здымкі, якая прадстаўляла вялікую важнасць пры вядзенні ваенных дзеянняў [10; с. 211]. У лік такіх афіцэраў увайшоў у 1808 г. і М. Гартынг.

Прадстаўнікі замежных родаў за кошт вялікай працаздольнасці, стараннасці і разумення вайсковай справы даволі хутка павышаліся па службе. Марцін Гартынг атрымліваў званні паручніка (з 03.05.1806), капітана (з 27.01.1809), падпалкоўніка (з 15.09.1811) [6; арк. 17]. Удзельнічаў у войнах з Францыяй 1805–1807 гг. У 1812–1813 гг. Гартынг з'яўляўся обер-кватэрмайстрам 3-га пяхотнага корпуса, з якім удзельнічаў у Айчыннай вайне 1812 г. Вызначыўся ў бітве пад Малаяраслаўцам 12 кастрычніка 1812 г., за што быў узнагароджаны чынам палкоўніка. За ўдзел у бітве пад Чырвоным атрымаў залатую шпагу з надпісам «За храбрасць», пад Кульмам — ордэн Св. Уладзіміра, за Лейпцыг — ордэн Георгія 4 ступені [9; с. 240].

У 1814 г. прызначаны обер-кватэрмайстрам гвардзейскага корпуса, а пасля агляду пад Верцю атрымаў званне генерал-маёра 1-й арміі. Знаходзячыся на гэтай пасадзе, Гартынг зрабіў шмат па частцы здымак

---

[2] Сухтэлен Пётр Карнілавіч (1751–1836) — інжэнер-генерал, з 1783 г. — на рускай службе, з 1822 г. — граф Вялікага княства Фінляндскага.

заходніх прастораў Расіі. Будучы выдатным здымшчыкам і чарцёжнікам, ён падтрымліваў гэты занятак паміж падначаленымі яму афіцэрамі. Яшчэ ў 1815 г. у Францыі была знята ў двухвёрсным маштабе паўночна-заходняя частка краіны, занятая 1-й часткай арміі. У 1816 г. Гартынгам прадпрынята праверка стааркушовай, а ў 1817 г. — маршрутнай карт, таму што абедзве былі выкананы з памылкамі.

У 1816–1821 гг. ён зрабіў маштабную здымку ўсёй тэрыторыі, якую займала 1-я армія, з мэтай стварэння агульнай пяцівёрснай карты. Карта была створана на 64 аркушах. Праводзіліся таксама здымкі для вайсковых збораў і манёўраў. У гэтыя ж гады была праведзена трыганаметрычная і тапаграфічная здымка Віленскай губерні обер-кватэрмайстрам 1-га пяхотнага корпуса палкоўнікам Тэнэрам [3]. Гартынг прымаў актыўны ўдзел у працах апошняга, даваў яму розныя практычныя парады, назіраў за правільнасцю матэматычных разлікаў. Карысная дзейнасць Гартынга была ўзнагароджана ордэнам Св. Ганны 1 ступені (у 1820 г.). 9 ліпеня 1824 г. ён быў прызначаны генерал-кватэрмайстрам Галоўнага штаба, але памёр 13 жніўня таго ж года ў Магілёве, не паспеўшы заступіць на пасаду [9; с. 241]. «Исключен из всех списков умершим» 27 жніўня 1824 г. [6; арк. 17].

Па ўспамінах сучаснікаў і біёграфаў, Марцін Мікалаевіч меў добрую адукацыю. З'яўляючыся выдатным матэматыкам, ведаючы ў дасканаласці некалькі жывых моў з іх літаратурай, Гартынг у той жа час быў аўтарытэтам у вайсковай справе і асабліва ў тым, што датычылася здымкі і тапаграфічнага вывучэння мясцовасці. Паводле сведчанняў вайсковага пісьменніка і гісторыка М. П. Глінаецкага, у веданні тапаграфіі заходняй памежнай прасторы ён не меў сабе роўнага ў Генеральным штабе. Гартынг карыстаўся значнай пашанай у вялікага князя Мікалая Паўлавіча, якога суправаджаў пры аглядзе палёў бітваў 1812 г. Вялікі ўплыў Гартынг аказваў і на афіцэраў кватэрмайстарскай часткі, большасць якіх пастаянна знаходзілася пры 1-й арміі, пільна сачыў за іх заняткамі, паводзінамі і асаблівасцямі мыслення, да дробязяў ведаў сваіх падначаленых з усімі іх слабасцямі і недахопамі. За часы службы акрамя пералічаных адзнак вайсковай вартасці быў узнагароджаны ордэнамі Св. Уладзіміра 3 ступеняў, замежнымі ордэнамі Леапольда 3 ступені, Прырскага Чырвонага Арла 3 класа, Шведскім мячом, медалём за кампанію 1812 [9; с. 241].

Марцін Гартынг, паходзячы з сям'і лютэран-евангелістаў, захаваў сваю веру і ў праваслаўнай Расіі. Калі ў агульнай масе насельніцтва Беларусі пратэстанты складалі нязначны працэнт — 1,6% [11; с. 5], то сярод дваран-іншаземцаў ён быў значна вышэй. Па інфармацыі

---

[3] Тэнэр Карл Іванавіч (1783–1860) — генерал ад інфантэрыі, тапограф, удзельнік трыганаметрычнай і тапаграфічнай здымкі Пецярбурга, Віленскай губерні і Курляндыі.

М. М. Елінскай, тут паказчык набліжаецца да 35% [1, с. 41]. Лютэранства вызнавала і жонка Гартынга (з 18.04.1818 г.) Амалія-Дар'я, дачка графа Мацвея Іванавіча (Густава Маціяса) Ламсдорфа (1745–1828), генерала ад інфантэрыі, сябра Дзяржаўнага Савета і выхавацеля вялікага князя Мікалая Паўлавіча (будучага імператара Мікалая І). Род Ламсдорфаў паходзіў з Вестфаліі, але ў пачатку XV ст. пасяліўся ў Прыбалтыцы. Ён быў унесены ў дваранскі матрыкул Курляндскай губерні і ў 5-ю частку радаслоўных кніг Петраградскай і Палтаўскай губерняў [12].

Такая бліскучая партыя, разам з вайсковымі паслугамі, не магла ў далейшым не садзейнічаць павышэнню становішча роду у вышэйшых колах правячага саслоўя.

У сям'і Гартынгаў нарадзіліся тры сыны: Густаў, Канстанцін і Мікалай [4]. Густаў з'явіўся на свет у Пецярбургу, Канстанцін і Мікалай — у Магілёве. З гэтага можна зрабіць выснову аб пачатку пражывання Гартынгаў на Беларусі, пачынаючы прыблізна з 1820 г. Два першыя сыны адзначыліся на вайсковай ніве, малодшы Мікалай быў накіраваны на дзяржаўную службу.

Густаў-Мікалай-Марцін Гартынг (1819–1879) даслужыўся да чына паручніка і 10 траўня 1841 г. быў звольнены са службы ў чыне штабротмістра па хатніх абставінах, у сувязі са з'яўленнем сям'і, што адбылося 26 студзеня 1841 г. Жонкай Густава была Людвіка Антонаўна Несялоўская. У 1854 г. Іосіф выкупіў у сваякоў Людвікі маёнтак Сноў з фальваркамі Дольны і Горны Сноў у Навагрудскім павеце.

Выкупны акт 1864 г. па маёнтку Сноў Густава Гартынга ахопліваў вёскі Агароднікі, Панюцічы, Новы Сноў, Мікуцэвічы, Грускаў, Клепачы і Хвоева. Рэвізскіх душ налічвалася 557, сялянскіх двароў — 150. Землі ў маёнтку пад ворывам былі чарназёмнымі, пад сенажацямі — гліністымі. У карыстанне сялян было адведзена прысядзібнай зямлі 95 дзесяцін і 106 сажняў, ворыўнай зямлі — 1428 дзесяцін і 25 сажняў, сенакоснай — 159 дзесяцін і 1270 сажняў [13; арк. 12].

У спісе землеўладальнікаў Мінскай губерні за 1876 г. даецца апісанне ўладання Сноў: яно займала 2 тыс. 672 дзесяціны зямлі. Гаспадаркай кіраваў упраўляючы, гадавы прыбытак з вінакурнага завода складаў 600 руб., з піваварнага — 127 руб., з вадзяного млына — 20 руб., з трох корчмаў — 570 руб. [14; с. 76].

Другой жонкай Густава была Эльфрыда Друцкая-Любецкая. З абодвух шлюбаў вядома сем дзяцей Густава Гартынга — Амалія, Квінцініум, Іосіф, Мікалай, Густаў, Соф'я і Эльфрыда. Звестак аб іх захавалася мала.

---

[4] У некаторых дакументах яны згадваюцца як бароны, але ў справе аб паходжанні роду пацвярджэнняў гэтаму тытулу няма.

Амалія-Ганна нарадзілася 21 верасня 1841 г. у маёнтку Сноў і была ахрышчана ў той жа дзень у Варанчанскай рымска-каталіцкай царкве святаром Леанардам Патоцкім. 7 лютага 1843 г. нарадзіўся і 15 сакавіка 1843 г. у Ішкальдскім прыходскім касцёле ксяндзом Ігнацієм Дзішкіневічам быў ахрышчаны Квінцініум-Антон-Канстанцін [6; арк. 19]. Азднячым факт хрышчэння дзяцей менавіта ў касцёле, а не ў лютэранскай царкве. Гэты факт датычыцца таксама і дзяцей Канстанціна і можа сведчыць пра змену Гартынгамі веравызнання.

У 1889 г. Іосіф, Мікалай і Густаў Гартынгі называюцца ўладальнікамі маёнтка Сноў, што на той момант займаў 2 тыс. 989 дзесяцін зямлі [15; с. 283]. Наступны раз браты згадваюцца ў спісе выбаршчыкаў у Дзяржаўную Думу па Навагрудскаму павету за 1912 г. (Густаву належала 896 дзесяцін, Мікалаю — 1075½ дзесяцін, Іосіфу — 1039½ дзесяцін) [16; арк. 186].

Соф'я і Эльфрыда Гартынгі разам з братам Іосіфам падалі прашэнне ў Дэпартамент герольдыі (1889) з мэтай пацвердзіць сваё паходжанне ад бацькі Густава [6; арк. 38]. Сёстры называюцца ў прашэнні замужнімі. Першая была ў шлюбе за Валадковічам і пражывала ў маёнтку Іваньск Лепельскага павета Віцебскай губерні. Другая — замужам за Сялявай, пражывала ў маёнтку Павулле Лепельскага павета той жа губерні.

Канстанцін-Іван Гартынг (1821–1891) адзначыўся бліскучай вайсковай кар'ерай у адрозненне ад старэйшага брата. За 10 гадоў, праведзеных у амаль бесперапынных вайсковых кампаніях, Канстанцін даслужыўся ад прапаршчыка ў пяхотным палку графа Забалканскага да падпалкоўніка ў рэзервовым батальёне Азоўскага пяхотнага палка. За гэты час ён таксама праходзіў службу ў гусарскім палку князя Вітгенштэйна (1840–1844 гг.) і пяхотным палку герцага Вілінгтана (1844–1848 гг.).

10 кастрычніка 1843 г. Канстанцін пабраўся шлюбам з Юзэфай Антонаўнай Несялоўскай, сястрой жонкі Густава Людвікі. 29 снежня 1849 г. выйшаў у адстаўку па хваробе [6; арк. 17 адв.], а 27 кастрычніка наступнага года выкупіў у маці і братоў сваёй жонкі маёнтак Целякова з вёскамі Целякова, Пяшчанкай, Аляхноўшчынай, Ялоўкай і Гарбатамі. Аб гэтым факце сведчыць тытульны ліст рэвізскай сказкі маёнтка Целякова, што складалася 28 кастрычніка 1850 г. [17; арк. 844]. Пацвярджае дадзены факт і справа аб уводзе ва ўладанне маёнткам падпалкоўніка К. Гартынга, што захавалася ў фондзе Ігуменскага земскага суда. Даверанай асобай з боку Несялоўскіх падчас гэтай здзелкі быў родны брат Канстанціна Густаў Гартынг. Маёнтак быў прададзены за 46 тыс. рублёў срэбрам [18; арк. 2 адв.].

Маёнтак Дукора ў тым жа Ігуменскім павеце Канстанцін і Юзэфа Гартынгі набылі 21 чэрвеня 1874 г., згодна купчай ад пані Леакадзіі

Сенажацкай, адной з трох дачок маршалка шляхты Ігуменскага павета і кавалера Мальтыйскага ордэна Лявона Ашторпа (1786–1851). Пэўны час сям'я жыла ў Целякове, затым у Дукоры. Найбольш значнай стацցёй прыбытку ў парэформеннай беларускай вёсцы з'яўлялася ўтрыманне корчмаў, што давала панскай гаспадарцы значныя дывідэнды. Па дадзеных за 1876 г., гадавы прыбытак з карчмы ў Целякове — 120 руб., з вадзянога млына ў Дукоры — 1500 руб., з трох корчмаў у Дукоры — 980 руб. [14; с. 36].

Паводле пэўнай інфармацыі, Канстанцін Гартынг падтрымліваў паўстанне 1863–1864 гг., за што яму пагражала канфіскацыя маёнткаў, аднак дзякуючы грамадскаму ўплыву жонкі Юзэфы справу ўдалося замяць [8, s. 59]. Маёнткі Дукора і Целякова перажывалі ў гэты перыяд сваё адраджэнне і атрымалі пры Гартынгах новую вядомасць. Раман Афтаназі падае нам такое апісанне палацава-паркавага комплексу ў Дукоры: «Палац меў двухрадную калідорную планіроўку з парадной залай у цэнтры (потым прыстасаваны для двухмаршавай лесвічнай клеткі). У час Гартынгаў на першым паверсе размяшчалася больш за дзесяць жылых пакояў» [8, s. 60].

За апісаннем палаца даецца апісанне парку і пабудоў: «Палац стаяў сярод старога парку, які разам з садам і гаспадарчымі будынкамі займаў плошчу каля 40 га. Яго акружаў роў, які, верагодна, застаўся ад абарончых умацаванняў старажытнай сядзібы ці замка. Парк перасякала шырокая дарога ўздоўж дома, якая адным канцом выходзіла да Ігумена, другім — да Смілавіч. З боку Смілавіч узведзена арачная мураваная, арыгінальная па кампазіцыі ўязная брама, завершаная высокай чатырохграннай вежай са шпілем, на якім развявалася гербавая харугва… Па абодва бакі дарогі стаяў шэраг гаспадарчых будынкаў: стайні, кухня, карэтная, жыллё дваровых. Перад палацам цягнулася адкрытая прастора з некалькімі ёлкамі. З тыльнага боку дома ліпавыя і кляновыя алеі абмяжоўвалі ўчастак фруктовага саду. Невялікая частка парка, вытрыманая ў пейзажным стылі, з сажалкай, цягнулася перад палацам. Парк упрыгожвала дэкаратыўная скульптура. У 1912 г. сярод парку пастаўлена новая капліца, задуманая як пантэон для ўсіх веравызнанняў рода Гартынгаў: пратэстанцкага, каталіцкага і праваслаўнага» [8; s. 63].

Сядзіба і палацава-паркавы комплекс Гартынгаў у Целякове вядомы менш. Даследаванне гэтай тэматыкі не атрымала значнага асвятлення ў працах па гісторыі палаца-паркавага будаўніцтва ў Беларусі. Сядзібны комплекс складаўся з двухпавярховага панскага дому, а таксама з парку, што размяшчаўся за ім. Перад палацам знаходзілася штучная сажалка. У склад комплекса ўваходзіў таксама шэраг гаспадарчых пабудоў, з якіх захаваўся складзены з каменя свіран (18×9). Вуглы яго аздоблены рустам, а ўваходы маюць лучковыя завяршэнні.

Канстанцін пакінуў сыноў: Антона, Эдуарда і Станіслава. Гусарскі афіцэр Антон-Густаў-Мікалай Гартынг, жанаты на Вандзе Дорыя-Дзерналовіч, атрымаў ва ўладанне Дукору, дзе ў адпаведнасці з новым напрамкам у мастацтве правёў грунтоўны рамонт і перабудову палаца, а таксама змяніў аблічча парку. Целякова было перададзена па спадчыне Эдуарду-Паўлу-Іаану Гартынгу (г. н. 1850), жанатаму на Элізе з Любанскіх. Аб ім вядома не шмат. Паводле вуснай інфармацыі, сабранай аўтарам у ваколіцах Целякова, ён карыстаўся аўтарытэтам і павагай сярод суседзяў і сялян. Памёр памешчык напярэдадні рэвалюцыі і быў пахаваны ў Целякове на ўскраіне могілак, у спецыяльна пабудаванай пахавальні, якая магла зрабіцца месцам апошняга спачыну і для наступных пакаленняў Гартынгаў — уладальнікаў Целякова. У 30–40 гг. XX ст. яна была знішчана [5].

Пасля заўчаснай смерці Антона Гартынга Дукора адышла да яго брата Станіслава. Палкоўнік Станіслаў Гартынг (пам. у 1913) з'яўляўся выхаванцам Мікалая II і спадзяваўся бачыць у сядзібе цара. Таму ў палацы была адмысловая царская зала, дзе з паркета былі выкладзеныя малюнкі раслін і жывёлінаў трапічнага лесу, а столь распісана вобразамі міфалагічных герояў. Адна са сценаў залы была люстраной, на іншых віселі палотны беларускіх, рускіх і замежных майстроў, сярод якіх былі працы Ф. Смуглевіча і Я. Дамеля. З чатырнаццаці карцінаў Дамеля, які быў блізкім сябрам Лявона Ашторпа, для агляду былі вылучаныя дзве: «Павел, які вызваляе з вязніцы Касцюшку» і «Аляксандр, які падпісвае ў Вільні ў 1812 г. амністыю». У 1919 г. палотны былі вывезеныя ў Варшаву і ўвайшлі ў склад польскіх музейных збораў [19; с. 199]. Станіслаў пакінуў пасля сябе дачку Марыю (ад першага шлюбу) і сына Георгія (г. н. 1900, ад другога шлюбу з Аляксандрай Уладзіміраўнай Хлебнікавай), якія на 1914 г. з'яўляліся ўласнікамі 950 дзесяцін зямлі ў маёнтку кожны [20]. У 1918 г. апошнія Гартынгі з гэтай галіны пакінулі Беларусь.

Як згадвае Раман Афтаназі, нягледзячы на тое, што бацькі лічылі сябе рускімі, Георгі Гартынг да канца жыцця лічыў сябе палякам, хоць польскую мову ў параўнанні з рускай і французскай ведаў кепска. Падчас II сусветнай вайны ён зарабляў на жыццё, працуючы ў Францыі экскурсаводам [8; s. 65].

Акрамя гэтага, у сям'і Канстанціна і Юзэфы Гартынгаў было дзве дачкі. Анатолія выйшла замуж за Густава Броэль-Плятэра, уладальніка

---

[5] Інфармацыя аб Эдуардзе Гартынгу і Целякоўскай сядзібе апублікавана на падставе ўспамінаў жыхароў в. Цялякава Уздзенскага р-на Мінскай вобл. (Г. П. Барталевіч, В. А. Зяньковіч, Я. В. Стрыгельская, Л. М. Стэсік), сабраных у чэрвені–ліпені 2007 г.

маёнткаў Гельваны і Борткушкі. Беата-Марыя ў першым шлюбе была замужам за дваюрадным братам Мікалаем, у другім — за Міхаілам Пратасевічам.

Апошні з трох сыноў Марціна — Мікалай-Якаў-Людовік (г. н. 1823) зрабіў бліскучую кар'еру на дзяржаўнай службе. Пасля сканчэння імператарскага Царскасельскага ліцэя з 6 лютага 1843 г. знаходзіўся на пасадзе чыноўніка 9 класа 3 Дэпартамента дзяржаўных маёмасцяў, 1 кастрычніка 1844 г. быў прызначаны старшым памочнікам столаначальніка. З 6 лютага 1847 г. — калежскі асэсар, з 9 красавіка 1847 г. — камер-юнкер, з 24 снежня 1847 г. — памочнік справавода і бібліятэкар вучонага камітэта Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў.

15 красавіка 1849 г. узнагароджаны чынам надворнага радцы, 18 красавіка 1850 г. зацверджаны на пасадзе справавода вучонага камітэта. З 5 красавіка 1852 г. — калежскі радца, з 25 снежня 1852 г. выконваў абавязкі начальніка аддзялення Дэпартамента сельскай гаспадаркі, з 15 красавіка 1855 г. знаходзіўся на пасадзе стацкага радцы, у 1876 г. узгадваецца як тайны радца. Жонкай Мікалая была (з 20 верасня 1853 г.) Любоў Аляксандраўна Трыгіятная. У Санкт-Пецярбурзе яму належалі два дамы ў Ліцейнай частцы горада па вул. Захар'еўскай (№ 606/621) [6; арк. 18].

10 снежня 1868 г. па купчай крэпасці Мікалай Гартынг набыў маёнткі Калодна, Цмень і Рухча ў Пінскім павеце (усяго 10 тыс. 611 дзесяцін). Пражываючы ў Пецярбургу, ён не мог самастойна кіраваць імі, таму ў першым быў пастаўлены ўпраўляючы, у другіх гаспадарылі арандатары. Прыбытак ад вінакурнага завода штогод складаў 300 руб. [14; с. 36].

Адным з паказальнікаў памяці аб пэўнай дваранскай сям'і ў мясцовасці, якой яна валодала, з'яўляецца адбітак у мясцовай тапаніміцы. Так, небеспадстаўна можна меркаваць, што фальварак Канстанцінава, які ўпершыню згадваецца ў межах маёнтка Целякова на пачатку XX ст., названы Эдуардам Гартынгам у гонар бацькі.

Верагоднай застаецца прыналежнасць да гэтага роду вядомага ў свой час прыродазнаўца з Ратэрдама Пятра Гартынга (1812–1885), прафесара мікраскапічнай анатоміі і фізіялогіі раслін Утрэхтскага універсітэта [21; s. 532].

Да пачатку XX ст. многія Гартынгі змянілі лютэранскае веравызнанне на каталіцкае альбо праваслаўнае. Нацыянальная ідэнтычнасць прадстаўнікоў роду была рознай. У асноўным яны лічылі сябе палякамі альбо рускімі. Такая асіміляцыя была цалкам характэрнай для родаў замежнага паходжання, што пражывалі на тэрыторыі Расійскай імперыі болей чым два пакаленні. Замацаваўшыся на пазіцыях расійскага дваранскага роду, Гартынгі аказалі значны ўплыў на падзеі ваенна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага характару, што мелі месца ў краіне.

## Крыніцы і літаратура

1. Елинская М. М. Источники о дворянских родах западноевропейского происхождения в белорусских губерниях конца XVIII – начала XX в.: диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук. Мн., 2005.
2. Валахановіч А. І. Графы фон Гутэн Чапскія на Беларусі. Мн., 2003.
3. Хурсік В. У. Род Офенбергаў у гісторыі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 6. С. 38–45.
4. Елінская М. М. О'Руркі, графы ірландскія на Беларусі // Беларусь – Ірландыя. Матэрыялы навуковага семінара «Беларуска-ірландскія гістарычна-культурныя сувязі». Мн., 1999. № 14.
5. НГАБ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 508. Арк. 183–189.
6. Там жа. Воп. 2. Спр. 636.
7. Neubeder O. Grobes mappen bilder lerifon. Der burgerlichen gefchlechter Deuttchlands ofterreichs und der ochmeiz Dechtermunz Declog. Augsburg. 1997.
8. Aftanazy R. Wojewodztwa minskie, mscislawskie, polockie, witebskie. 1992. S.58–64.
9. Русский биографический словарь (репринтное воспроизведение) / Гааг-Гербель. М., 1991.
10. Там же / Суворова-Ткачев. М., 1999.
11. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор'ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава. Мн: ВП «Экаперспектыва», 1998.
12. mirslovarei.com/content_beo/Lamsdorf-Lambsdorf-7831.
13. НГАБ. Ф. 1595. Воп. 2. Спр. 2087.
14. Список землевладельцев Минской губернии за 1876 г.
15. Список землевладельцев Минской губернии за 1889 г.
16. НГАБ. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 34.
17. Там жа. Ф. 333. Воп. 9. Спр. 647.
18. Там жа. Ф. 160. Воп. 1. Спр. 259.
19. Кулагін А. М. Па колішніх маёнтках // Страчаная спадчына. Мн., 1993. С. 195–199.
20. Список лиц, владеющих в Минской губернии имуществом и имеющих право участвовать в земских избирательных собраниях для выбора гласных на трехлетие с 1914 г. / Список по Игуменскому уезду, форма № 1. С. 1.
21. S. Olgenbranda Encyklopedia Powszeczna. T. VI. Warszawa. 1900.

*З. Л. Яцкевіч*

# Малы гербоўнік Рагачоўскай шляхты

Дадзенай публікацыяй мы працягваем традыцыю друкавання гербоўнікаў і іх фрагментаў [1, 4–6]. У шостым нумары «Архіварыуса» надрукавана трынаццаць радаводаў шляхты Рагачоўскай правінцыі [2], якая як адміністрацыйная адзінка пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772–1776 гг. знаходзілася ў складзе Магілёўскай губ. (гэтая тэрыторыя раней уваходзіла ў склад Рэчыцкага пав.) [3].

Дакументы, якія сталі падставай для гэтага даследавання, былі створаны падчас «праверкі» мясцовай шляхты, якая мусіла даказваць сваё «дваранскае паходжанне» перад новымі ўладамі. Менавіта ў земскіх павятовых і правінцыйных судах былі зафіксаваны пратакольныя вывады разгляду мясцовай шляхты. На сённяшні дзень у НГАБ захоўваюцца ўсяго 7 спраў Рагачоўскага земскага суду (і толькі тры з іх тычацца часу іcнавання правінцыі) [8]. На падставе дадзеных крыніц і былі падрыхтаваны 70 радаводаў шляхты Рагачоўскай правінцыі [7, 9], частку якіх мы прапаноўваем увазе чытача. Методыка апрацоўкі дакументаў і схема апісання засталіся традыцыйнымі для гербоўнікаў падобнага кшталту. Да вышэйзгаданага пратакола дадавалася інфармацыя, знойдзеная ў іншых крыніцах. Прадстаўнікі роду, якія рабілі вывад, у тэксце выдзелены курсівам.

Умоўныя скарачэнні:

арк. — аркуш
Арш. — Аршанскі гербоўнік
в. — вёска
вак. — ваколіца
ваяв. — ваяводства
Віц. г. — Віцебскі гербоўнік
ВКЛ — Вялікае княства Літоўскае
воп. — вопіс
г. — горад
губ. — губерня
ДДС — Дваранскі дэпутацкі сход
ж. — жонка
засц. — засценак
кар. — кароль, каралеўскі
кн. — князь
кс. — ксёндз
маёнт. — маёнтак
мяст. — мястэчка
НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
Нав. г. — Наваградскі гербоўнік
п. — пан, пані
пав. — павет
РК — радаводная кніга
р. — рака
с. — сяло
спр. — справа
ст. — стагоддзе
стар. — староства
ур. — уроджаны
ф. — фонд
фальв. — фальварак
ч. — частка
ЯКМ — яго каралеўскай міласці
Pr. — пратапласта
» — беспатомны

### *14. Горскія* * *герба «Побаг»*

Паходзілі з Трэмбавельскай зямлі, адкуль выводзіўся іх родапачынальнік, які прыбыў на вайсковую службу ў Рэчыцкі пав. У вывадзе даюцца таксама вытрымкі аб Горскіх герба «Побаг» і апісанне апошняга з «Гнязда цноты» Б. Папроцкага.

Рг. Ян, скарбнік трэмбавельскі, таварыш харугвы Рэчыцкага пав., 02.10.1723 г. набыў маёнт. Брылёва ў Гомельскім тракце і парафіі ў Паўла Гераніма Келчэўскага, на той час падсудка рэчыцкага. Гэты факт быў зафіксаваны (06.02.1725 г.) у Рэчыцкім гродскім судзе, а таксама (17.10.1731 г.) у Галоўным Трыбунале ВКЛ. Ян ажаніўся з Петранэляй з Вішчынскіх і меў з ёю двух сыноў — *Франца* і *Пятра*. Ян і Петранэля набылі за 400 злотых 30.12.1741 г. у прасвітара царквы Св. Троіцы ў Гомлі Пятра Цітовіча 1/3 частку маёнт. Сялец, які знаходзіўся ў Гомельскай парафіі. Дадзены акт продажу быў зафіксаваны 31.01.1742 г. у Магілёўскім магістраце **.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 08.10.1773 г.

* У дакументах XVIII ст. і ранейшых ужываецца форма прозвішча Горскія, у XIX ст. у польска- і рускамоўных выданнях ужываецца пераважна ўжо польская форма Гурскія.

** НГАБ. Ф. 1817. Воп. 1. Спр. 82. Арк. 22–22 адв.

### *15. Грушэцкія герба «Любіч»*

Паходзілі з Холмскай зямлі і Падляшша.

Рг. Марцін меў сына Стэфана, які пераехаў у Браслаўскі пав., дзе ажаніўся з п. Хілінскай. Пакінуў сыноў Мікалая, Базыля, Казіміра і Антона. Апошні (07.05.1719 г.) ажаніўся з Катарынай Кучынскай, за якой атрымаў у пасаг частку маёнт. Малынічы ў Рэчыцкім пав. ад Міхала і Марыяны, ур. Беразецкай, Кучынскіх, што было зафіксавана ў Рэчыцкім гродскім судзе падчас лютаўскіх рочкаў. У Антона былі тры сыны: *Андрэй*, гараднічы старадубаўскі, Ян, езуіт, і *Станіслаў*. Іх маці актыкавала (30.10.1773 г.) у Рагачоўскіх земскіх кнігах маніфест аб знішчэнні пажарам 1756 г. іх двара ў маёнт. Малынічы. Андрэй разам з іншай шляхтай Рэчыцкага пав. удзельнічаў у паспалітым рушэнні 1764 г. пад Рагачовам, што было зафіксавана ў пасведчанні, выдадзеным (03.10.1765 г.) п. Дзерналовічам, харужым рэчыцкім.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 19.02.1777 г. , Магілёўскім ДДС — 20.03.1805 г. з аднясеннем да 1 часткі радаводнай кнігі. Гэта было зроблена па прашэнню шляхціча Рэчыцкага пав. Антона сына Андрэя Г.

### *16. Грыбоўскія герба ўласнага* [*]

Паходзілі з Аршанскага пав., адкуль родапачынальнік пераехаў у Рэчыцкі пав.

Рг. Ян, набыў частку маёнт. Жабіна ў Рэчыцкім пав. (18.04.1678 г.) у п. Грышкі Цішчанкі Курбацкага [**], што было актыкавана (28.04.1678 г.) у судзе Чачэрскага замка пры Мікалаю Станіславе Кісялю, падстаросце чачэрскім, зацверджана (15.03.1699 г.) пры п. Тодару з Кастраўца Кастравіцкаму, падстаросце чачэрскаму, а таксама (11.10.1705 г.) у Рэчыцкім гродскім судзе. Пасведчанне, выдадзенае (15.09.1698 г.) і прызнанае на ўрадзе Чачэрскага замка з подпісам і пячаткай Мікалая Яна Сілівонскага, гараднічага чачэрскага, актыкавана на кастрычніцкіх рочках Рэчыцкага гродскага суда (1754 г.) .

Ян меў сыноў Самуэля» і Ціхана. Апошні пакінуў сыноў Самуэля, Мікалая, Андрэя», Пятра» і Яна, якія ўзгаднілі свае непаразуменні з п. Габрыэлем, Данілам, Нестарам, Апанасам, Хамой і Іванам Курбацкімі наконт грунтаў падчас сумеснага выезду на месца, што было пісьмова засведчана (16.05.1756 г.). *Ян*, сын Ціхана, пакінуў сына Паўла; Самуэль — Емяльяна, Яна і Мікалая; Мікалай — Яна, Цімафея, Міхала, Івана і *Рыгора*. Апошні быў непісьменны і паставіў крыжыкі замест подпісу.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 16.10.1773 г.

---

[*] У справе каляровы малюнак герба і апісанне яго па Папроцкаму, але без назвы. Выява герба паводле гербоўніка Хшаньскага адпавядае гербу «Грыбоўскі».

[**] Другі раз у справе называецца імя Якуб К., магчыма, брат Грышкі К.

### *17. Грынкевічы герба «Наліўка»*

Паходзілі з Менскага ваяв. Прадставілі шэраг дакументаў, у тым ліку выпіс (28.01.1777 г.) з дэкрэта вывадовага свайго роду з Галоўнага земскага суда Магілёўскай губ. (14.07.1773 г.), а таксама пасведчанне ад сваякоў і шляхты Менскага ваяв. аб шляхецкім паходжанні, актыкаванае (07.11.1775 г.) у Менскім земскім судзе праз стрыечнага брата тых, хто выводзіліся, ксяндза Ігната Г., вікарыя Краснасельскага касцёла.

Рг. Сымон, зямянін Менскага ваяв., дзе валодаў спадчыннымі маёнткамі, якія пакінуў сваім сынам Аляксандру і Яну згодна выпісу з хроснай метрыкі, выдадзенай ксяндзом, краснасельскім дэканам Радаманскім (верагодна, Радашкоўскім. — З. Я.). Аляксандр і ягоныя нашчадкі засталіся ў родавых маёнт., у той час як Ян (нар. 05.01.1675 г.) пераехаў у Рэчыцкі пав. Тут ён ажаніўся з Настассяй з Драбышэўскіх,

за якой узяў у пасаг вак. Сапагі, аб чым засведчыў запіс ад Эліяша Драбышэўскага пад датай 25.01.1722 г. У Яна і Настассі быў сын Антон, які, паводле дэкрэту, меў справы з Пшэздзецкім, пісарам ВКЛ, і пп. Кельчэўскімі, што было актыкавана (15.05.1751 г.) у Рэчыцкім гродскім судзе. Ягоныя сыны *Стэфан, Юзаф і Рыгор* *, спадчыннікі вак. Сапагі.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 14.07.1773 г.

* Пры вывадзе іх прадстаўляў патрон Станіслаў Князевіч, ротмістр аршанскі.

### *18. Губарэвічы* *

Пры вывадзе прадставілі шмат разнастайных дакументаў, у тым ліку аб падзеле (10.02.1588 г.) паміж мяркулаўскімі баярамі і шляхтай грунтаў Лужанскіх з Крыштапам Зяновічам, старостам чачэрскім, што было затым актыкавана ў судах задворных асэсарскіх (04.03.1600 г.); запіс угодлівы паміж Губарэвічамі, Жлобамі, Якімовічамі, Нестаровічамі, Курбацкімі, Лашкевічамі і іншымі сваіх спадчынных уладанняў у Вараноўшчыне, Жабіне або Лужках і Аляксандрам Дажбогам Сапегам, старостам чачэрскім і аршанскім, што было запісана (30.03.1630 г.) у актах Чачэрскага замка; ахоўны ліст (23.04.1679 г.) ад кар. Яна III для Губарэвічаў і інш. шляхты Рэчыцкага пав.; прывілей кар. Яна III (23.04.1689 г.) на маёнт. Вараноўшчына і зямянам, дзе згадваецца Макар Губарэвіч (?), а таксама дэкрэт задворнага асэсарскага суда, датаваны 15.01.1752 г.

Рг. Мішка Губарэвіч, разам з Максімам Іванавічам, згодна прывілею (16.03.1563 г.) кар. Жыгімонта-Аўгуста, атрымаў пяць земляў Пустоўскіх: Пятроўшчыну, Здзікоўшчыну, Трышкаўшчыну, Крупаедаўшчыну і Андрызачыншчыну ў водрубе Лужанскім Рэчыцкага пав., якія пакінуў сыну Гардзею. Апошні меў сына Марка, у якога быў сын Пракоп. Пракоп пакінуў трох сыноў — Яна, Тамаша›› і Лаўрына. Апошні меў сына Яна, які прадаў палову бацькоўскага маёнтка Яну Маліноўскаму, канюшаму Рэчыцкага пав., і сам з’ехаў у Каралеўства Польскае на Украіну.

У Яна, сына Пракопа, былі два сыны — Лявон і Якуб. У Якуба — Сымон і *Базыль* **. У Лявона — Рыгор і Тодар.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 16(18).10.1773 г.

* Герб не пазначаны.

** Падпісаў акт генеалогіі трыма крыжыкамі.

### *19. Дзерналовічы герба «Любіч»*

Паходзілі з Аршанскага пав.

Рг. Ян, валодаў спадчынным маёнт. Тарноў, аб чым засведчыў выпіс прывілея (26.08.1658 г.) кар. Яна-Казіміра з Метрыкі ВКЛ (24.10.1754), які пакінуў сынам Даменіку, падстолію смаленскаму, і Міхалу. Апошні меў трох сыноў: Адама», Людвіга і Пятра з сынамі Мацеем і Ваўжынцам.

Дамінік, сын Яна, (24.12.1678 г.) набыў маёнт. Шэрсцін Рэчыцкага пав. у Яна Уладзіслава Тарастоўскага, рэферэндара ВКЛ, аб чым засведчыў выпіс з Метрыкі ВКЛ (26.09.1758 г.). У Дамініка былі сыны: Антон», езуіт, Ян», скарбнік Рэчыцкага пав., і Францішак, стражнік Аршанскага пав., затым суддзя гродскі рэчыцкі. Браты Ян і Францішак (11.07.1733 г.) падзялілі паміж сабою бацькоўскія ўладанні, што пазней было актыкавана ў Галоўным Трыбунале ВКЛ. Францішак пакінуў сваю маёмасць сыну *Юзафу Лявону Дарыю* [*], харужаму і палкоўніку Рэчыцкага пав.[**]

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 02.03.1777 г.

---

[*] Прадстаўляў род пры вывадзе.

[**] Сын Лявона-Юзафа Д. , маршалка Рагачоўскага пав. і кавалера ордэна Св. Станіслава 1 класа, Вінцэнт быў прызнаны ў дваранстве на Магілёўскім ДДС з аднясеннем да шостай часткі радаводнай кнігі (21.01.1821 г.), аб чым (23.02.1823 г.) атрымаў дыплом, а таксама генеалагічнае дрэва роду Д. герба «Любіч», дзе пазначаны 22 чалавекі і 9 пакаленняў.

### *20. Канасевічы герба «Тапор»*

Паходзілі з Кіеўшчыны.

Рг. Дамінік, валодаў спадчынным маёнткам у Житомірскім пав. Кіеўскага ваяв., пакінуў сына Аляксандра [*], які меў сыноў: Міхала», Пятра» і Антона. Апошні з іх меў сына *Базыля* [**], які набыў маёнт. Мутневічы ў Рагачоўскай правінцыі, дзе ў 1766 г. згарэлі ўсе дакументы. Базыль атрымаў пасведчанне аб шляхецкім паходжанні ад свайго роду, які пражываў у вак. Давыдаўка Жытомірскага пав., датаваны (15.11.1773 г.) і актыкаваны (18.11.1773 г.) у Жытомірскім гродскім судзе.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 28.02.1775 г.

---

[*] Згодна тэстамента актыкаванага таксама атрыманага 13.11.1699 г. у магілёўскім магістраце валодаў Аляксандр К. маёнт. Верамйкавічы Рэчыцкага пав., які на той час трымаў у заставе Міхал Курака.

[**] Базыль К. падпісаў дадзены дакумент.

### *21. Стралка-Канюшэўскія герба «Стралка»*

Паходзілі з Лідскага пав., дзе таксама, як і ў Пінскім пав., валодалі спадчыннымі маёнткамі.

Рг. Стэфан, які меў трох сыноў: Лявона>> (нежанаты), бенедыктына Тамаша і Ігната. Апошні пакінуў двух сыноў — Бенедыкта і Аляксандра, пяць сыноў якога жылі ў каралеўстве Польскім. У Бенедыкта былі тры сыны — Станіслаў, Юзаф і Антон. *Юзаф* доўгі час служыў у харугве знаку Пяцігорскага паручнікам, дзе кіраваў асобнай камандай у Чачэрску, затым атрымаў прывілей кар. Аўгуста III на ўрад чашніка смаленскага. Дадзены прывілей быў канфірмаваны (23.04.1773 г.) і актыкаваны ў Рагачоўскай земскай канцылярыі (19.10.1773 г.). Юзаф валодаў маёнт. Бердыж у Чачэрскім тракце Рагачоўскай правінцыі.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 22.10.1773 г. і 27.02.1775 г.

### *22. Караткевічы герба «Корвін»*

Шляхецкі вывад зроблены родам К. у Магілёўскім галоўным земскім судзе ў 1773 г. На гэты ж вывад спасылаліся ўсе тры адгалінаванні роду К. пры прызнанні ў дваранстве Мінскай губ., прычым два з іх актыкавалі. У той жа час радавод вельмі заблытаны, асабліва ў XVI–XVII стст. Пытанні выклікаюць нават сваяцкія сувязі тых, хто выводзіўся ў 70-х гг. XVIII ст. у Магілёўскай і Рагачоўскай правінцыях. У сувязі з незахаванасцю архіва Магілёўскага ДДС гэтыя пытанні не ўдалося высветліць нават пры дапамозе дакументаў Менскага ДДС. Да таго ж неабходна згадаць, што ў Рагачоўскіх актавых кнігах захавалася ўсяго 1,5 аркуша з вывадовага пратаколу, які сканчаецца на прывілеі кар. Жыгімонта-Аўгуста 1546 г. Таму мы паспрабавалі зрабіць толькі накід радаводу гэтага старажытнага беларускага шляхецкага роду.

Рг. Даніла, атрымаў прывілей кар. Жыгімонта-Аўгуста (19.01.1546 г.) на дзве зямлі Пустоўскія, Раманоўшчыну і Лятаўшчыну ў Чачэрскім тракце, у вечнае валоданне. Гэтыя ж уладанні, згодна прывілею (26.09.1625 г.), атрымаў Геранім Юдыцкі, падкаморы рэчыцкі. Аднак паводле дэкрэта задворнага асэсарскага суду (30.03.1627 г.), які атрымалі Васіль, Пётр і Даніла К., Лятаўшчына і Раманавічы былі вернуты К. Сярод прадстаўнікоў роду К. можна вылучыць Самуэля, сына Майсея, які, згодна патэнту (30.10.1651 г.), быў ротмістрам казацкай харугвы ВКЛ і з'яўляўся паслом на суды гетманскія. Разам з іншай шляхтай Чачэрскага тракту ліст-рэскрыпт кар. Яна III у сувязі з судовай справай з Завішамі атрымаў (03.03.1679 г.) Канстанцін, сын Марціна-Андрэя, які працаваў палестрынтам метрыкі ў Галоўным трыбунале ВКЛ.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 14.02.1777 г.

### *23. Келчэўскія герба «Абданк»*

Паходзілі з Ломжынскай зямлі Каралеўства Польскага.

Рг. Станіслаў, валодаў маёнт. Старыя Келчы ў Лахаўскай парафіі Каменскага пав. Ломжынскай зямлі, які пакінуў свайму сыну Яну Міхалу, скарбніку ломжынскаму. Ян Міхал падчас вайны пераехаў у Рэчыцкі пав., дзе набыў маёнт. Брылёва і Сеўрукі ў Гомельскай парафіі, якія, падзяліўшы на роўныя часткі, пакінуў сваім сынам: Міхалу, Аляксандру» і Паўлу. Дадзены факт Ян Міхал засведчыў у сваім тэстаменце (25.07.1677 г.), які быў актыкаваны (04.08.1672 г.) у Рэчыцкім гродскім судзе.

Павел меў сыноў: Міхала, пісара гродскага рэчыцкага, і Караля», пісара земскага рэчыцкага. У Міхала былі сыны: Якуб», Ян, абозны, затым стольнік Рэчыцкага пав., і *Самуэль*[*], стражнік рэчыцкі, у якога былі сыны Павел і Францішак. У Яна, згодна кантракту (25.08.1731 г.), п. Сымон Смяноўскі, зямянін Каленскага пав., арандаваў спадчынны маёнт. Старыя Келчы, што было актыкавана ў актах гродскіх Каленскага пав. Ян пакінуў сыноў Антона, суддзю земскага рэчыцкага, і Ігната.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 25.10.1773 г.

---

[*] Ён і падпісаў дадзены акт.

### *24. Клімовічы*[*]

Прадставілі шэраг разнастайных дакументаў: ліст упамінальны (1729 г.) кар. Аўгуста II да п. Мікалая Красінскага, старосты гомельскага, наконт маёнт. Клімовічаў — Цярэшкавічы, квіты аб аплаце падаткаў і правіянту (27.10.1706, 07.08.1707, 19.01.1708, 13.10.1709, 07.12.1711 гг.).

Рг. Клім Тэрэніцкі, валодаў маёнт. Хаяцічы ў межах Маларосіі (Украіна), які набыў у п. Яна Важынскага, і маёнт. Цярэшкавічы ў Гомельскім тракце Рэчыцкага пав. — у п. Шпана, што было зафіксавана ў актах Гомельскага замка ў 1699 г. Гэтыя ўладанні Клім пакінуў сваім сынам Юзафу і Клеменсу. Апошні меў сыноў: Мацея, Аляксандра, Яна, Ваўжынца і Хведара». У Юзафа былі чатыры сыны: Карп», Юрый», Рыгор і Міхал, аб чым засведчыў маніфест (24.03.1699), актыкаваны ў Рэчыцкім гродскім судзе на п. Тамаша з Красна Красінскага, стольніка цэханоўскага, старосты гомельскага і прапойскага, дзе ў прыватнасці,

згадваецца абрабаванне маёнт. Цярэшкавічы, забойства і ўтапленне Яна і Тодара Клімовічаў.

Першы сын Клеменса Мацей пакінуў сына Базыля, другі сын Аляксандр — сем сыноў: Базыля, Цімоха, Лукаша, трох Тодараў і Атаназія. Трэці сын Ян — Мацея, чацвёрты Ваўжынец ці Лаўрэн — сына Герасіма. Аб чарговым разрабаванні маёнт. Цярэшкавічы жаўнерамі кампутовымі сведчыць дакумент, выдадзены Лаўрэну, Мацею, Базылю і Тодару К. праз Тамаша Красінскага, старосту гомельскага, і сына яго Мікалая, якi быў занесены ў кнігі Рэчыцкага гродскага суда (13.12.1710 г.).

Выводзіліся *Тодар* і *Андрэй Клімовічы* (якія падпісаліся шасцю крыжыкамі).

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 15.10.1773 г. і Магілёўскім ДДС — 27.02.1808 г. з аднясеннем да 6 ч. РК.

* Герб не пазначаны, але паводле спраў аб дваранскім паходжанні Клімовічы карысталіся гербамі «Ляліва», «Ястрабец» і «Ясенчык».

### *25. Корзуны герба «Кот марскі» зменены* *

Пры вывадзе прадставілі шмат дакументаў, якія не тычыліся дадзенай галіны роду Корзунаў, паводле якіх, згодна каралеўскім прывілеям ад кар. Уладзіслава Ягайлы, Казіміра, Аляксандра, Вітаўта, Жыгімонта I і Жыгімонта-Аўгуста, яны валодалі шматлікімі ўладаннямі ў Смаленскім, Кіеўскім, Наваградскім і Мсціслаўскім ваяв. Найперш права на валоданне зямлёю Пустоўскай у стане Іваноўскім, якая называлася Ражкоўская Слабада, з дванаццацю службамі ў Северскім пав., Будзінічах і Валюнах з чатырнаццацю аселымі людзьмі ў Смаленскім ваяв. (08.01.1437 г.) было актыкавана (20.12.1522 г.) на рочках гродскіх менскіх і выдадзена (14.05.1772 г.) п. Ерамею Стрылінічу Корзуну, сыну кіеўскага ваяводы.

Прывілей кн. Юрыя (?) Юр'евіча Слуцкага (08.05.1555 г.) таксама быў прадстаўлены зямянам Браслаўскага пав. Стэфану, Івану, Марціну, Дарафею і Іванцу К. на ур. Жукаў Востраў, што было пацверджана (16.06.1563 г.) кар. Жыгімонтам Аўгустам і актыкавана (28.02.1737 г.) у Оўруцкім гродскім судзе. Ілля К. судзіўся з п. Васілём Загорскім, што зафіксавана (15.11.1615 г.) у Старчыцкім гродскім (або замкавым) судзе, а затым у Слуцкім галоўным судзе. Сільвестр і Юстына з Маскевічаў К., чашнікі старадубаўскія, актыкавалі маніфест аб тым, што родавыя паперы К. згарэлі (20.05.1739 г.) разам з маёнт. Ляскова Мсціслаўскага ваяв., у Мсціслаўскім гродскім судзе (29.04.1747 г.), затым у Галоўным Трыбунале ВКЛ (24.02.1748 г.). Акрамя гэтага згадалі актыкацыю ў Ашмянскім гродскім судзе, квіт аб удзеле ў паспалітым рушэнні пад Алкенікамі (15.07.1765 г.) Яну Юрыю К., а таксама яшчэ два квіты аб

аплаце падымнага падатку са спадчыннага маёнт. Рашава Менскага ваяв.

Рг. Цімафей, згодна дэкрэту ад 01.06.1668 г., сябра соймавай камісіі, якi заносiў скаргi шляхты аб уладаннях, захопленых Маскоўскай дзяржавай у Смаленскiм ваяв., меў сыноў Яна i Вiктара. Апошнi пакiнуў сыноў Станiслава››, Стэфана››, Казiмiра, Мiхала i Яна, якi, у сваю чаргу, пакiнуў *Мiкалая, Яна, Мацея, Тодара* i *Базыля*. У Мiхала, сына Вiктара, былi сыны — *Iгнат* i *Мiхал*, у Казiмiра — *Антон* ** i *Мiхал*.

Ян, сын Цiмафея, меў сыноў Яна››, Мiхала››, Сымона i Якуба. Апошнi пакiнуў шэсць сыноў — Базыля, Юр’я, Андрэя, Мацяша, Францiшка i Iяхiма. У Сымона былi сыны — Бенедыкт, Антон, Пётр i Тадэвуш.

Генеалогiя роду была актыкавана 30.10.1773 г. i 02.11.1773 г.

Вывад прызнаны ў дваранстве земскiм судом Рагачоўскай правiнцыi 27.02.1775 г. ***

---

* Згодна малюнку, што быў змешчаны ў вывадзе, а таксама «Гербоўнiку» А. Банецкага.

** Ён прадстаўляў род.

*** Экстракт дадзенага дакумента быў выдадзены 07.01.1795 г.

### *26. Корвiн-Красiнскiя (Корвiн з Краснага Красiнскiя) герба «Сляпы воран»*

Рг. Станiслаў, ваявода плоцкi, меў сына Андрэя, палкоўнiка Смаленскага ваяв., якi пакiнуў трох сыноў: Яна››, Базыля››, харужага смаленскага, ды Мiхала. Базыль К. спачатку трымаў лясніцтва Чахецкае ў Кобрынскай эканомii, гэтае наданне засведчыў лiст-прывiлей кар. Яна-Казiмiра, датаваны 15.?.1667 г., да падскарбiя ВКЛ. Акрамя гэтага Базыль, паводле кансэнсу (дазволу) ад кн. Мiхала Радзiвiла, падканцлера i гетмана польнага ВКЛ (28.03.1678 г.), атрымаў арэндавы кантракт на тры гады за 54 тыс. злотых на Гомельскае i Прапойскае староствы.

Сын Станiслава Мiхал пакiнуў сына Тамаша, стольнiка цэханоўскага, якi згодна кансэнсу Яна III (01.09.1682 г.), набыў у кн. Катарыны, ж. Дамiнiка Мiкалая Радзiвiла, падканцлера ВКЛ, Гомельскае i Прапойскае староствы, што было ўнесена (03.04.1683 г.) у акты Метрыкi ВКЛ. Акрамя гэтага кн. Катарына Радзiвiл выдала iнтрамiсiю (20.10.1683 г.) на вышэйзгаданыя староствы, якiмi Тамаш К. валодаў каля трыццацi гадоў.

Гомельскае i Прапойскае староствы Тамаш перадаў (20.01.1713 г.) свайму сыну Мiкалаю, што пацвердзiў двойчы (17.01.1716 г. i 19.06.1717 г.). Апошнi дакумент аб зацвярджэннi староставаў быў занесены ў актавыя кнiгi Мазырскага земскага суда. Гэты факт засведчылi таксама лiст да падскарбiя ВКЛ (20.03.1716 г.), лiст ад падскарбiя ВКЛ,

датаваны 19.12.1716 г., аб пацвярджэнні надання дваранам ЯКМ, яшчэ адзін ліст аб наданні дваранам ЯКМ і інтрамісія вознага пад датай 15.06.1717 г. Тамаш К. таксама перадаў сыну Мікалаю свае дэпутацкія, пасольскія і дырэктарскія функцыі ад Мазырскага пав. на сойміку каралеўскім і рэгенцкім у Рэчыцкім пав., аб чым засведчыў крэдэнс (03.02.1716 г.) Мазырскага пав. Згодна лаўдума (1727 г.) і інструкцыі (19.08.1720 г.), ад шляхты Рэчыцкага пав. Мікалай абіраўся паслом і дырэктарам ад гэтага пав. на соймік рэляцыйны.

Як засведчылі хросныя метрыкі са Слуцкага касцёла, у Мікалая К. нарадзіліся тры сыны — Багуслаў (*1723 г.), Тамаш (*1725 г.) і Ян (*1728 г.). Выводзіўся *Багуслаў*, які валодаў на ленным праве графствам Яроміна ў Гомельскім тракце Рэчыцкага пав.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 15.10.1773 г.

## *27. Куракі* *

Прадставілі шэраг дакументаў аб валоданні спадчынным маёнт. Верамейкі, а менавіта, чатыры квіты паборавыя (за перыяд ад 1669 да 1680 г.), два квіты пагатоўнага (18.06.1676 г.; 25.06.1677 г.), два квіты папісовыя (30.09.1671 г.; 29.09.1681 г.), а таксама дэкрэты асэсарскага суда ВКЛ (15.01.1752 г.; 23.09.1761 г.).

Рг. Хведар, згодна каралеўскаму мандату (15.05.1599 г.) і дэкрэта (04.03.1600 г.), судзіўся ў асэсарскім судзе з п. Крыштапам Зяновічам наконт шкодаў, нанесеных у спадчынным маёнт. Верамейкі, які знаходзіўся ў Рэчыцкім пав. Чачэрскага тракта. Хведар пакінуў трох сыноў: Стэфана››, Лукаша і Аўдзея››, аб чым засведчыла рэляцыя возненская ў Рэчыцкім гродскім судзе (13.09.1625 г.) разам з лістамі ўпамінальнымі п. Аляксандра Дажбога Сапегі, старосты чачэрскага, а таксама кар. Жыгімонта III.

У Лукаша былі сыны: Ян, Самуэль›› і Рыгор. Апошні разам з братамі падчас паўстання Багдана Хмяльніцкага суплікаваў (14.03.1637 г.) наконт рабавання жаўнерамі маёнт. Верамейкі, затым разам з навакольнай шляхтай атрымаў рэскрыпт (03.03.1679 г.) у справе са старостамі чачэрскімі, а таксама дэкрэт асэсарскага суда ВКЛ (16.06.1681 г.) па справе з Аляксандрай Канстанцыяй Завішай, пісаравай ВКЛ. Разам з іншай шляхтай Ян К. (08.04.1683 г.) атрымаў універсал п. Казіміра Сапегі, ваяводы віленскага, гетмана польнага ВКЛ, да афіцыйных вайсковых асобаў аб рабаваннях маёнткаў, у тым ліку і Верамеек.

Ян, сын Лукаша, меў сына Андрэя і ўнукаў: Стэфана, Аляксандра, Яна і Мікалая. У апошняга былі сыны: Базыль і Міхал, у Яна — Марцін і Рыгор, у Аляксандра — Стэфан. Стэфан, сын Андрэя, пакінуў Базыля, Данілу, Максіма і Якуба.

Рыгор, сын Лукаша, меў сыноў Міхала і Рыгора, у якога былі сыны Тамаш і Тодар. Апошні пакінуў *Яна* і *Рыгора*. Міхал, сын Рыгора, меў сыноў: Данілу, Пятра, Базыля, Якава, Стэфана і Рыгора. Апошні меў сыноў Базыля і Аляксея. Даніла, сын Рыгора, пакінуў Лявона, Марціна, Пятра, Ціхана і Стэфана. Пётр, сын Рыгора, пакінуў Яна, Апанаса, Тодара і Лявона. Базыль, сын Рыгора, — Яна, Сымона, Анісіма і Якуба.

Генеалогія была актыкавана 19.10.1773 г.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 25.02.1775 г.

---

* Герб не пазначаны.

### *28. Курбацкія герба «Бланкенштэйн»*

Пры вывадзе прадставілі шмат разнастайных дакументаў аб валоданні зямлёю, у тым ліку дэкрэт асэсарскіх судоў ВКЛ (03.01.1752 г.).

Рг. Аўдзей, згодна прывілею кар. Стэфана Баторыя (25.02.1586 г.), атрымаў зямлю ў в. Лужкі–Жабіна, што было зафіксавана ў актавых кнігах Чачэрскага замкавага суда. Аб судовых спрэчках наконт гэтых уладанняў з чачэрскім старостай Крыштапам Зяновічам сведчыць мандат (15.05.1599) на суды задворныя асэсарскія, а таксама пленіпатэнцыя, актыкаваная (19.03.1600 г.) на гродскім земскім судзе Рэчыцкага пав., ад п. Андрэя Хадаркевіча, Ждана Манкевіча і іншай шляхты Рэчыцкага пав. Згодна тэстаменту свайго цесця Івана Арцюховіча Аўдзей Курбацкі стаў уладальнікам дзвюх частак грунту Неўровічызны і Губарэвічызны ў сяле Лужэнскім. Дадзены дакумент на права валодання быў пацверджаны ў тэстаменце (30.08.1652 г.) Яцка Арцюховіча (магчыма, брата Івана Арцюховіча), дзе, у прыватнасці, згадвалася, што Нероўвічызна і Губарэвічызна былі набыты ў Івана Савастыяніча.

Аўдзей пакінуў двух сыноў — Сымона›› і Пятра, які, паводле ліста (26.04.1619 г.), судзіўся з п. Уельскімі (Уейскімі), дзяржаўцамі Расошыцкімі, наконт яза Пузырка на р. Сож, які належаў да маёнт. Лужок-Жабіна. Па ўгодліваму запісу (13.03.1636 г.) адбыўся падзел уладанняў Лужка-Жабіна, Енцаў і Вараноўшчыны паміж Пятром і Сямёнам Курбацкімі, Жлобамі і Губарэвічамі. Пётр меў сына Гапона, які пасля смерці бацькі атрымаў канфірмацыйны прывілей кар. Уладзіслава IV на маёнт. Жабіна.

У Гапона былі чатыры сыны — Ян››, Якаў, Хведар›› і Рыгор, аб чым засведчыў шэраг дакументаў, а менавіта, квіт аплаты падымнага (25.03.1650, 1690, 19.10.1691, 09.02.1698, 17.02.1702 гг.), а таксама попісы павятовай харугвы (1679 г., 12.09.1681 г.). Якаў меў сына Мацея, у якога была дачка.

Рыгор, сын Гапона, пакінуў шэсць сыноў — Якава, Цімоха, Пархома, Хведара, Самуэля і Ціта. Апошні меў сына Нестара *, Якаў — Данілу, Пархом — Яна, Хведара і Пятра. Хведар, сын Рыгора, пакінуў трох сыноў — Апанаса, Тамаша і Івана. Самуэль, сын Рыгора, меў сына *Габрыэля* **. Габрыэль Самусевіч (магчыма, Самуэлевіч), Нестар Цітавіч, Барыс, Ян і Іван Апанасавічы, Пракоп Янавіч, а таксама Пётр і Якаў Курбацкія атрымалі выпіс аб прызнанні ў дваранстве (28.02.1775 г.).

Прызнаны ў дваранстве (15.10.1773 г.; 3.02.1777 г.) Магілёўскім Галоўным земскім судом.

* 12.05.1799 г. шляхціч Рагачоўскага пав. Пётр, сын Нестара, падаў 13 дакументаў і просьбу аб прызнанні ў дваранстве ў Магілёўскі ДДС, але ў 1823 г. яны вернуты.

** Габрыэль, названы сынам Самусея, падпісаўся пры вывадзе трыма крыжыкамі; па ягонай просьбе падпісаўся Канстанцін Караткевіч.

### *29. Чэмеса-Куроўскія герба «Сшанява»*

Паходзілі з Берасцейшчыны.

Прадставілі шмат розных дакументаў аб валоданні спадчынным маёнт. Хойнікі, пачынаючы з часоў кар. Жыгімонта III.

Рг. Рыгор, валодаў спадчынным маёнт. Хойнікі ў Пружанскай парафіі Берасцейскага ваяв., меў сыноў Якуба, ксяндза-плябана, і Фабіяна. Апошні, спадчынны ўладальнік маёнт. Хойнікі, ажаніўся з Геленай Лышчынскай з Лышчыц, за якой атрымаў у пасаг бацькоўскі маёнт. (магчыма, Лышчыцы), але меў шмат праблем са шваграмі Марцінам, Казімірам і Станіславам Лышчынскімі. Аб гэтым засведчыў дэкрэт кантумацый Берасцейскага гродскага суда (08.08.1661 г.), падпісаны прэзэнтам гэтага суда п. Копцем, ваяводам полацкім, старостам юрборскім. У Фабіяна і Гелены былі сыны: Андрэй», Пётр і Уладзіслаў, які ажаніўся з Тадорай, ур. Заляцела, ды меў толькі дачок. Уладзіслаў меў судовыя справы наконт маёнт. Хойна з п. Галэнскімі і інш. суседзямі, што было зафіксавана ў кантумацыйным дэкрэце (11.09.1722 г.) з Берасцейскага гродскага суда.

Пётр, сын Фабіяна, пакінуў *Андрэя* і *Яна*, якія валодалі маёнт. Навінкі і Цярэшкавічы ў Гомельскай парафіі Рэчыцкага пав. Ян меў сыноў *Францішка* * і Юзафа, *Андрэй* ** — дачку Апалонію.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 31.12.1773 г.

* Шляхціч Беліцкага пав. Францішак, сын Ігната, герба «Сшэнява» атрымаў генеалогію і дыплом аб прызнанні ў дваранстве.

** Падпісаў акт генеалогіі Магілёўскай губ. з аднясеннем да 6 часткі РК.

### *30. Кучынскія герба «Сляпы воран»*

Паходзілі з Падляшша. Представілі шэраг дакументаў аб аплаце падаткаў з маёнт. Малынічы.

Рг. Уладзіслаў, пераехаў у Рэчыцкі пав., дзе набыў маёнт. Шмакі, які пакінуў сыну Пятру. Міхал, сын Пятра, ажаніўся з Марыянай Беразецкай і атрымаў у пасаг частку маёнт. Малынічы Рэчыцкага пав. З-за гэтага маёнт. меў шэраг судовых працэсаў з Мікалаем Маліноўскім у Рэчыцкім гродскім судзе пад датамі 30.08.1713 г. (дэкрэт 05.10.1713 г.), 05.02.1715 г. (ліст заручны 07.02.1715 г.). 05.09.1730 г. Міхал і Марыяна К. пакінулі (25.02.1743 г.) маёнт. Малынічы свайму сыну *Марціну* *, што было актыкавана (09.02.1746 г.) у кнігах Рэчыцкага гродскага суда. Марцін служыў у павятовай харугве, аб чым засведчыў універсал п. Дзерналовіча, харужага рэчыцкага, выдадзены (1764 г.) пад Рагачовам, ён прадставіў таксама квіт аб аплаце падаткаў ад 03.10.1765 г. У Марціна былі тры сыны — *Ян, Міхал* і *Мікалай*.

Прызнаны ў дваранстве земскім судом Рагачоўскай правінцыі 25.10.1773 г.

* Падпісаў акт генеалогіі.

### *31. Ласоўскія герба «Прус II»*

Паходзілі з Полацкага ваяв. Прадставілі шэраг дакументаў, у тым ліку выпіс ад 18.02.1777 г. з дэкрэта выводовага аб паходжанні рода. Ад 14.07.1773 г. — з Галоўнага суда Магілёўскай губ.

15. Крючков А. А. Новые полимеризующиеся ртутьорганические фунгициды / А. А. Крючков, Т. А. Биткина, Н. Ф. Чернов, Н. Г. Моисеева, Н. Б. Гурова, Л. П. Петрова / Биоповреждения и защита материалов биоцидами; под ред Б. В. Бочарова [и др.]. М., 1988. С. 51−55.
16. Лугаускас А. Ю., Микульскене А. И., Шляужене Д. Ю. Каталог микромицетов — биодеструкторов полимерных материалов. М.: Наука, 1987. 344 с.
17. Методы экспериментальной микологии / Под ред. В. И. Билай. Киев: Наук. думка, 1973. 551 с.

18. Нюкша Ю. П. Биологическое повреждение бумаги и книг. СПб., 1994, 233 с.
19. Нюкша Ю. П. Вопросы грибостойкости книг и документов // Проблемы биологических повреждений и обрастаний материалов, изделий и сооружений. М.: Наука, 1972. С. 71–78.
20. Нюкша Ю. П. Действие на бумагу продуктов обмена веществ грибов // Проблемы биологических повреждений и обрастаний материалов, изделий и сооружений. М.: Наука, 1972. С. 51–54.
21. Нюкша Ю. П. Особенности формирования микрофлоры бумаги, находящейся в организованном хранении // Актуальные вопросы биоповреждений. М.: Наука, 1983. С. 102–125.
22. Нюкша Ю. П. Причины поражаемости и грибостойкости бумаги // Микроорганизмы и низшие растения — разрушители материалов и изделий. М.: Наука, 1979. С. 217–224.
23. Нюкша Ю. П. Условия образования сообществ грибов на бумаге // Микроорганизмы и низшие растения — разрушители материалов и изделий. М.: Наука, 1979. С. 215–217.
24. Покровская Ю. В. Микромицеты на документах в библиотеках, архивах и музеях: Автореф. дисс. … канд. биол. наук. СПб., 1995. 25 с.

# Постаці архівістаў

*А. М. Латушкін*

## Архівісты Нясвіжскага архіва XVII – першай паловы XX ст.

Дадзены артыкул — працяг распачатай у папярэднім нумары публікацыі біяграфічнага слоўніка архівістаў [1], складзенага аўтарам у выніку падрыхтоўкі кандыдацкай дысертацыі «Нясвіжскі архіў Радзівілаў у канцы XVIII – першай палове XX ст.».

**Вабэ Марцін** (? – не раней 1786 г.), згадваецца як памочнік пры архівісце А. Калакуцкім у 1759, 1760, 1767, 1775 гг., паручнік і ад'ютант гарнізона Міхала Казіміра Радзівіла. Аб ім, як аб захавальніку Нясвіжскага архіва ў 1775 г., пісаў А. Нарушэвіч (1733—1796). Выконваў абавязкі бібліятэкара. Быў аўтарам каталогаў бібліятэкі Радзівілаў у Нясвіжы, у тым ліку бібліятэкі Якуба Генрыка Флемінга.

*Крыніцы:* Archiwum główny akt dawnych (далей — AGAD). Archiwum Radziwiłłów t. zw. Warszawski (далей AR). Dzial (далей — Dz.) V. Sygnatura (далей — Sygn.) 17 177. Wessel Józef, podstarości ks. nieświeskiego i archiwarjusz archiwu nieświeżskiego, 1739–1782 rr. S. 176, 190; Lietuvos valstybinio istorijos archyvas (Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы, далей — LVIA). Фонд 1280. Оп. 1. Д. 114. Материалы по делу Прокуратории Радзивилловской масы с бывшим несвижским библиотекарем Квятковским К. по обвинению последнего в присвоении книг, рукописей и др. исторических ценностей 1809–1837 гг. С. 15 адв.–16; Jankowski R. Burzliwe losy Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 r. // Miscellanea historico-archivistica. 2000. T. 11. S. 54–55, 57–58.

**Вайніловіч Лявон**, у 1817 г. (не пазней 11 верасня) прызначаны Генеральным архівістам Пракураторыі Радзівілаўскай масы. Працаваў

---

[1] Латушкін А. М. Архівісты Нясвіжскага архіва XVII – першай паловы XX ст. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 6. Мн.: БелНДІДАС, 2008. С. 278–285.

у Нясвіжскім архіве да ліпеня 1818 г. Па распараджэнні Пракуратары рыхтаваў і перасылаў у Вільню дакументацыю для маёмасна-гаспадарчых і судовых спраў. Яго памочнікамі былі Я. Дмухоўскі, Д. Свярчэўскі, А. Свярчэўскі, Ю. Вілямоўскі, Р. Сымановіч, Сыцько, Б. Багдановіч, Л. Баяноўскі. У Вільні дакументы прымаў Р. Сымановіч. Л. Вайніловіч адшукаў у нясвіжскіх дамініканцаў і вярнуў у архіў матэрыялы, страчаныя ў 1812 г.: пераплеценыя ў кнігі манускрыпты, літаратуру, рэестры Метрыкі ВКЛ перыяду да і пасля 1569 г. (з выбаркай прывілеяў на ўладанні і пасады Радзівілам).

*Крыніцы:* Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 694. Воп. 1. Спр. 411. Інструкцыя архівістам аб вядзенні і ўпарадкаванні архіва; справаздачы архівістаў і перапіска з імі. Вопісы архіўных дакументаў, 1736–1892 гг. Арк. 22; Спр. 412. Вопіс архіўных дакументаў і спісы польскіх, замежных газет і часопісаў, перададзеных з Нясвіжскага архіва ў Берлін. Інвентарны вопіс Нябораўскага архіва. Частка дакладной запіскі архівістаў Шылановіча і Форстэра аб стане архіва, 1745–1904 гг. Арк. 12–13; Спр. 431. Рапарты загадчыка Нясвіжскага архіва Л. Вайніловіча генеральнаму пракуратару Залескаму, люты–ліпень 1818 г.

**Валіцкі Аляксандр-Іван** (27 студзеня 1826 – 1 (13) чэрвеня 1893), архівіст, навуковец, кампазітар, літаратар. Паходзіў з роду Валіцкіх герба «Лада» («Ладзе»), што ўзнік у Польшчы і вядомы па некаторых звестках з 1248 г. — часоў панавання караля Баляслава Сарамлівага. Па легендзе прадстаўнікі роду ўдзельнічалі ў Грунвальдскай бітве 1410 г., пасля якой некаторыя з іх перасяліліся ў ВКЛ. Пратапласт дадзенай галіны — Аўгустын.

Бацькам Аляксандра быў Фердынанд Валіцкі, маці — Тэрэзія Мацвееўна Высоцкая. А. Валіцкі далучаны да шляхецтва пастановамі Мінскага Дваранскага дэпутацкага сходу ад 31 снежня 1832 г. і 2 снежня 1852 г., зацверджаны Указам Сената ад 31 кастрычніка 1854 г. за № 8981. У 1845–1848 гг. навучаўся на першым аддзяленні філасофскага факультэта Харкаўскага універсітэта, аднак скончыў толькі тры курсы. На працягу васьмі гадоў займаўся прыватным (?) выкладаннем розных навук: пераважна польскай мовы і літаратуры ў Мінскай губерні. Па некаторых звестках, у канцы 1856 г. планаваў заняць пасаду настаўніка польскай мовы.

На 1850 г. пражываў у Навагрудскім пав., магчыма, у Слуцку, пазней у Вільні, Варшаве (на 1867 г. — па вуліцы Злотай, дом № 1440 А), дзе працаваў рэдактарам часопіса (1870 г.). На 1879 г. жыў у Мінску (вуліца Захар’еўская, у доме, дзе размяшчалася кніжная крама С. Ф. Савіцкай). Жонка — Алена Францаўна Узлоўская.

Архівіст Нясвіжскага архіва з 1890 г. да 20 мая 1893 г. Польская спецыялізаваная прэса пісала: «Архівістам ардынацкіх збораў

Радзівілаў у Нясвіжы прызначаны А. Валіцкі, шаноўны і заслужаны аўтар «Нашых памылак у мове і пісьме» і шматлікіх іншых навукова-літаратурных прац і даследаванняў. Як мы ўласна даведаліся, ужо ў найбліжэйшым часе выбывае на месца свайго прызначэння для прыняцця даверанай яму ганаровай пасады» [2]. Нягледзячы на тое, што раней А. Валіцкі не быў звязаны з падобным відам прафесійнай дзейнасці, ён дакладна ўяўляў галоўныя абавязкі і сэнс працы архівіста, аб чым пісаў: «Дзейнасць архівіста павінна весціся ў двух накірунках. Першы — сістэматычнае ўпарадкаванне ўсіх аддзелаў архіўных матэрыялаў, а ў наступную чаргу — утрыманне іх у пастаянным парадку» [3]. Згодна са справаздачай аб дзейнасці за 1891–1892 гг. А. Валіцкі займаўся ў асноўным такімі відамі працы, як апісанне і ўпарадкаванне дакументаў, выкананне запытаў даследчыкаў, падрыхтоўка для іх копій архіўных дакументаў. Аб тым, ці знаходзілася бібліятэка ў сферы абавязкаў А. Валіцкага, як гэта было пры яго папярэдніку Б. Завадскім, дадзеных няма. Згодна з паведамленнямі архівіста, збор не быў упарадкаваны, адсутнічалі ці былі згубленыя каталогі да шмат якіх важнейшых аддзелаў, напрыклад, аддзела адміністрацыйных папер Нясвіжскай і Алыцкай ардынацый.

А. Валіцкі інтэнсіўна супрацоўнічаў з даследчыкамі, якім дапамагаў у пошуку і капіраванні матэрыялаў архіва. У спіс такіх навукоўцаў уваходзяць: С. Пташыцкі (дакументы па роду Дэспатаў-Зяновічаў), А. Краўскар (40 аркушаў копій карэспандэнцыі з Крыштафам Радзівілам, якая адносілася да біяграфіі Крыштафа Арцішэўскага), А. Прахаска (80 аркушаў копій лістоў Сапегаў), Я. Плябанскі (40 аркушаў карэспандэнцыі Крыштафа Радзівіла з яго дваранінам, пісьменнікам Даніэлем Набароўскім для напісання біяграфіі апошняга). Навуковае выкарыстанне архіва з'яўлялася, па меркаванню А. Валіцкага, асноўным сэнсам іх існавання: «Стваральнікі ўсіх архіваў, якія ахвяруюць на дадзеную справу столькі намаганняў і сродкаў, не робяць гэтага бяздумна, дзеля ўласнага славалюбства або дагаджэння свайму капрызу, не пераўтвараюць гэта ў «спорт», накшталт збірання парцэляну ці паштовых марак. Яны накапляюць і зберагаюць каштоўныя дакументы толькі з мэтай уратаваць іх ад знішчэння і перадаць на карысць навуцы, а такім шляхам — дапамагчы ў высвятленні шматлікіх заблытаных пытанняў гісторыі, многіх яе сумніўных ці цёмных месц» [4].

---

[2] Przewódnik bibliograficzny. Miesięcznik dla wydawców, księgarzy, antykwarzów, jako też czytających i kupujących książki. 1890. R. 13. № 5. 1 maja.

[3] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 411. Інструкцыя архівістам аб вядзенні і ўпарадкаванні архіва; справаздачы архівістаў і перапіска з імі. Вопісы архіўных дакументаў, 1736–1892 гг. Арк. 9.

[4] Там жа.

Заслугай архівіста з'яўляецца і тое, што ў канцы 1892 г. ім была ініцыявана справа вяртання ў Нясвіжскі архіў матэрыялаў Вітгенштэйнаў са Слуцка, якія раней належалі Радзівілам.

*Крыніцы:* НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 468. Справа аб дваранскім паходжанні рода Вечар-Шчарбовічаў XIX – пачатак XX ст. Арк. 276–277 адв.; Ф. 694. Воп. 1. Спр. 411. Інструкцыя архівістам аб вядзенні і ўпарадкаванні архіва; справаздачы архівістаў і перапіска з імі. Вопісы архіўных дакументаў, 1736–1892 гг. Арк. 9; Polska Biblioteka Narodowa (Нацыянальная Бібліятэка Польшчы, далей — BN): Rękopis 2977. Korespondencja Aleksandra Walickiego z lat 1844–1893. Litery U–Z, XIX w.; Rękopis 2978. Korespondencja Aleksandra Walickiego z lat 1844–1893. Listy do osób niezidentyfikowanych oraz druki, XIX w.; Rękopis 2979. Korespondencja Aleksandra Walickiego z lat 1844–1893. Bruliony listów Aleksandra Walickiego, XIX w. S. 9–10; Rękopis 9067. Część 2. Tuhan-Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969. S. 85. Przewódnik bibliograficzny. Miesięcznik dla wydawców, księgarzy, antykwarzów, jako też czytających i kupujących książki. 1890. R. 13, № 5. 1 maja; Archiwum domu Sapiehów / oprac. A. Prochaska. Lwów: nakład rodyiny, 1892. T. 1: Listy z lat 1575–1606. S. XIV; Кісялёў Г. В. Валіцкі Аляксандр // Энцыкл. гісторыі Беларусі. Мн.: БелЭн, 1993–2003. Т. 2: Беліцк–Гімн. 1994. С. 208.

**Вілямоўскі Юльян Браніслаў**, з 1817 г. памочнік архівіста Генеральнага архіва Радзівілаўскай масы Л. Вайніловіча. Да чэрвеня–ліпеня 1818 г. працаваў у архіве Радзівілаў у Нясвіжы. Разам з іншымі памочнікамі Я. Дмухоўскім і Д. Свярчэўскім займаўся падрыхтоўкай патрэбных справаводчых папер Радзівілаўскай камісіі і Пракуратарыі і перасылкай іх у Вільню. У чэрвені–ліпені 1818 г. архіў быў цалкам перавезены туды. Ю. Вілямоўскі быў уключаны ў яго штат у якасці памочніка архівіста. Некалькі месяцаў займаў пасаду загадчыка архіва пасля звальнення 1 сакавіка 1823 г. А. Ёдкі. Разам з памочнікам архівіста В. Грыневічам 19 верасня 1823 г. падрыхтаваў для канцылярыі Суда Радзівілаўскай камісіі «Рэестр прывілеяў па справе аддзялення ардынацкіх уладанняў». Пасля вяртання А. Ёдкі на пасаду загадчыка архіва 24 лютага 1824 г. непасрэдны нагляд за архівам у асноўным застаўся ў кампетэнцыі Ю. Вілямоўскага. У яго захоўваліся ключы ад архіва. Памёр паміж 24 лютага 1824 г. і 15 мая 1829 г.

*Крыніцы*: НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 411. Інструкцыя архівістам аб вядзенні і ўпарадкаванні архіва; справаздачы архівістаў і перапіска з імі. Вопісы архіўных дакументаў, 1736–1892 гг. Арк. 22–23, 25 адв.; Там жа. Спр. 412. Вопіс архіўных дакументаў і спісы польскіх, замежных газет і часопісаў, перададзеных з Нясвіжскага архіва ў Берлін. Інвентарны вопіс Нябораўскага архіва. Частка дакладной запіскі архівістаў Шылановіча і Форстэра аб стане архіва, 1745–1904 гг. Арк. 25; Там жа. Спр. 420. Перапіска нясвіжскага архівіста Сымановіча з Генеральнай пракуратарыяй і інш. Вопісы архіўных

дакументаў, здадзеных у архіў і выдадзеных, 1806–1846 гг. Арк. 46 адв., 48; Там жа. Спр. 438. Справаздачы аб стане Нясвіжскага архіва і аб рабоце ў ім даследчыкаў з Пецярбурга і Вільні (са звесткамі па гісторыі архіва). Справаздача аб працы бібліятэкі архіва, 1853–1886 гг. Арк. 7 адв.

**Вэсэль Язэп** (у крыніцах сустракаецца некалькі варыянтаў напісання прозвішча: Вэтшэль, Вэшэль, Вэтсэль; варыянту «Вэсэль» перавага аддадзена як напісанню, якое ўжывалася ва ўласных подпісах). Нарадзіўся каля 1700 г., займаў пасаду нясвіжскага падстарасты. У 1725 г. — «дырэктар бяльскіх архіваў». Архівіст архіва ў Жулкеве ў 1740–1742 гг. (памочнікі — Катэлевіч, Крыніцкі, Хлебка), які разам з іншай маёмасцю перайшоў Радзівілам ад роду Сабескіх. Адначасова падскарбі на фабрыцы ў Жулкеве. Адыграў пэўную ролю ў спрэчках Міхала Казіміра Радзівіла і сандамірскага ваяводы Яна Тарлы за жулкеўскія ўладанні Сабескіх — выконваў выведачныя функцыі (дастаўляў князю інфармацыю аб сандамірскім ваяводзе); захоўваў архіў: прадухіліў крадзеж дакументаў памочнікам Катэлевічам, які верагодна дзейнічаў у інтарэсах Яна Тарлы.

З 1742 г. — архівіст у Нясвіжы (па дадзеных Р. Янкоўскага — з красавіка 1741 г.). Памочнікі: Навасялецкі, Піражынскі, Савіцкі, Здановіч, Заморскі. Распачаў грунтоўную інвентарызацыю збору. Склаў вопісы важнейшых комплексаў дакументаў, куды ўвайшлі прывілеі, што тычыліся роду Радзівілаў (1743 г.), прывілеі, нададзеныя ВКЛ і пацверджаныя каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Аўгустам (1744 г.), і інш. Стварыў «капіярый» старажытных дакументаў роду, даследаваў генеалогію Радзівілаў.

Выконваў абавязкі бібліятэкара замкавай бібліятэкі (згадваецца на гэтай пасадзе з 1742 г.). Займаўся ўпарадкаваннем кніг, прыёмам і апрацоўкай іншых бібліятэк Радзівілаў, якія далучаліся да нясвіжскага збору (бібліятэка з Бялай, 1746 г.). Арганізоўваў працу аднооўленай Нясвіжскай друкарні (1750 г.), рыхтаваў да выдання зборнік «Corpus juris Militaris». Выконваў ролю настаўніка («дырэктара») дзяцей Міхала Казіміра Радзівіла і Уршулі з Вішнявецкіх.

Пакінуў пасаду паміж 1755–1759 гг. Меў сына Язэпа.

*Крыніцы:* AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 17 177. Wessel Józef, podstarości ks. nieświeskiego i archiwarjusz archiwu nieświeżskiego, 1739–1782 гг. S. 7–8, 10, 63–64, 86–89, 91–92, 94–96, 122–123, 166, 168, 176, 190; Там жа, Dz. XXVII. Sygn. 26. Regestr przywilegiów litewskich 1744 г.; Там жа. Sygn. 29. Lustracja archiwów zamku nieświeżskiego 1755 г.; BN: Rękopis 9067. Część 2. Tuhan-Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969. S. 85.; Радзівіл Ф. Выбраныя творы: перакл. з пол. і фр. / Ф. Радзівіл; уклад. С. Кавалёў. Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2003. С. 365; Jankowski R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum

Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 2(18). S. 35; Jankowski R. Prace inwentaryzacyjne w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 3(19). S. 44–45; Jankowski R. Burzliwe losy Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 r. // Miscellanea historico-archivistica. 2000. T. 11. S. 39–40; Stępniak W. Archiwum Warszawskie Radziwiłłów a program UNESCO «Pamięć świata» // Miscellanea historico-archivistica. 1997. T. 7. S. 8.

**Вэсэль Язэп** (малодшы), падстараста гродскі (нясвіжскі?), сын архівіста Я. Вэсэля. Польскі даследчык В. Куля сцвярджаў, што ў маладосці замяняў бацьку на пасадзе архівіста. У 1752 г. прызначаны Міхалам Казімірам Радзівілам кіраўніком прац па стварэнню суконнай мануфактуры ў Нясвіжы. Пазней займаў пасаду ўпраўляючага мануфактурай. Быў абвінавачаны ў злоўжываннях і крадзяжах. У 1755 г. звольнены і заключаны ў турму. Агульная сума страт, нанесеных ім гаспадарцы Радзівілаў, склала 3503 пол. зл. 19 грошаў. Пазней здолеў вярнуць давер князя, служыў рэвізорам.

*Крыніцы:* Kula W. Manufaktura sukienna Radziwiłłów w Nieświeżu // Roczn. dziejów społecz. i gosp. 1947. T. 9. S. 11–21.

**Вярсоцкі**, у 1886—1887 гг. пры архівісце Б. Завадскім у складзе групы нанятых пісцоў капіраваў дакументы для Румынскай Акадэміі навук у Бухарэсце па замове Г. Біяну, прафесара і бібліятэкара акадэміі. Пасля выканання працы, верагодна, быў звольнены.

*Крыніцы*: AGAD. AR. Dz. XXVII. Sygn. 102. «Gławnoje uprawlenije dziełami Jego Sijatelstwa Kniazia Antona [Wilgelma] Radziwiłła (1833–1904). Dzieło otnosiaszczejesia k wydannym iz Nieswiżskogo Archiwa kopii raznych G [ru] nu Bijanu dla Rumunskoj Akademii», 19.09.1886–24.11.1887. S. 77–78.

**Гановіч Ян**, архівіст і бібліятэкар пры нясвіжскім ардынату Аляксандры Людвіку Радзівіле (1594–1654), аўтар падрабязнага вопісу архіва 1650 г., бібліятэкі 1651 г. Вопіс 1650 г. ахопліваў увесь склад.

*Крыніцы:* AGAD. AR. Rękopisy biblioteczne. Sygn. VIII–16. Zebranie przywilejów, praw i spraw rożnych… J. Hanowicz, 1650 r.; Jankowski R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 2(18). S. 35; Jankowski R. Prace inwentaryzacyjne w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 3(19). S. 44; Jankowski R. Burzliwe losy Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 r. // Miscellanea historico-archivistica. 2000. T. 11. S. 39.

**Галынскі,** на 17 верасня 1939 г. — намеснік дырэктара архіва Радзівілаў у Нясвіжы. Пасля падзей верасня 1939 г., падчас арганізацыі

вывазу архіва і бібліятэкі ў Мінск Галынскі разам з дырэктарам архіва Іовічам інфармавалі савецкія ўлады і, у прыватнасці, супрацоўнікаў АН БССР па пытаннях складу, інвентарызацыі і месцазнаходжання дакументаў.

*Крыніцы:* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 4. Воп. 27. Спр. 364. Нарыс Нясвіжскага архіва (пераклад з польскай мовы) 1941 г.

**Ганчаровіч,** на пачатку 1860-х гг. падчас працэсу падзелу Нясвіжскага архіва паміж Радзівіламі і Вітгенштэйнамі займаў пасаду памочніка архівіста з месячным заробкам 20 рублёў. Згодна з дадзенымі Б. Таўрагінскага, памочнік архівіста Р. Сымановіча. У абавязкі ўваходзілі: капіраванне дакументаў, інвентарызацыйная праца.

*Крыніцы*: НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 417а. Асабістыя дакументы архіварыуса Нясвіжскага архіва Сымановіча, 1794–1873 гг. Арк. 4; BN. Rękopis 9067. Część 1. Tuhan-Taurogiński B. Geneza powstania Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1955. S. 37.

**Гафаукс дэ (de Goffaux, de Gouffoux) Афрыканус Ганорыс**, архівіст Нясвіжскага архіва ў 1721–1741 гг. Аўтар такіх рэестраў, як «Рэестр прывілеяў і розных папер публічных як Каралеўства Польскага, так і ВКЛ, складзены наноў…», 1721 г.; «Рэестр прывілеяў Цэсараў Іх Міласцей, а таксама каралёў польскіх, дадзеных на пасады розныя Князям Іх М(ілас)цям Радзівілам. Таксама і тэстамэнтаў Князёў Іх М(ілас)цей Радзівілаў», Бяла, 1722 г. У рэестры 1721 г. упершыню занатаваныя акты уній Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага. 31 студзеня 1747 г. уступіў на пасаду «сакратара французкага» пры двары падчашага ВКЛ Гераніма Фларыяна Радзівіла тэрмінам на 10 год. У 1763 г. — камандуючы гарнізонам і замкам у Слуцку.

*Крыніцы:* AGAD. AR. Dz. V. Sygn. 4388. Goffoux Aleksander, chorąży garnizonu fortecji Słuckiej i archiwariusz, 1734–1763 rr. S. 210; Там жа. Dz. XXI. Sygn. G 45. Goffoux A. H. de, sekretarz do interesów zagranicznych. Dekłaracja pełnienia obowiązków korespondenta w koncelarii księcia i kwit na pieniądze, 1739, 1747 rr. S. 3; Там жа. Dz. XXVII. Sygn. 14. Regestr przywilejów dawnych 1721–1722 rr. S. 15. BN Rękopis 9067. Część 2; Tuhan-Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969. S. 85; Jankowski R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 2(18). S. 35; Jankowski R. Prace inwentaryzacyjne w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 3(19). S. 44; Jankowski R. Burzliwe losy Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 r. // Miscellanea historico-archivistica. 2000. T. 11. S. 39–40.

**Гісберт-Студніцкі Вацлаў**, дырэктар Дзяржаўнага архіва ў Вільні ў 1930-я гг. З красавіка 1943 г. па загаду акупацыйных улад быў прызначаны архівістам Нясвіжскага архіва Радзівілаў (той яго часткі, што да 1939 г. заставалася ў Нясвіжы і ў 1941 г. была перавезена ў Мінск, другая частка архіва захоўвалася ў Варшаве). Згодна з дадзенымі К. І. Казака, В. Гісберт-Студніцкі вясной 1942 г. заняў пасаду «кіраўніка архіваў Мінска». Па некаторых звестках, у Мінск быў перавезены і Дзяржаўны архіў з Вільні.

З архіваліямі Радзівілаў быў знаёмы, бо яшчэ да вайны падтрымліваў цесныя сувязі з архівам Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў у Варшаве. У 1936 г. паміж дадзенай установай і Дзяржаўным архівам у Вільні было заключана пагадненне аб абмене літаратурай (дуплетнымі экзэмплярамі бібліятэк, архіўнымі публікацыямі). Напачатку галоўным яго абавязкам як архівіста мінскай часткі архіва было ўпарадкаванне дакументаў, пазней іх падрыхтоўка да вывазу на Захад. Некаторы час В. Гісберт-Студніцкі пражываў пры архіве (у будынку галоўнага корпуса АН БССР). Разам з супрацоўнікамі Гістарычнага архіва ён на працягу некалькіх месяцаў займаўся разборам спраў Нясвіжскага архіва. Нягледзячы на тое, што В. Гісберт-Студніцкі добра ведаў склад архіва, справа рухалася павольна. Праца па падрыхтоўцы была цяжкая, бо заключалася ў тым, што нясвіжскія акты былі перамешаны з актамі Дзяржаўнага архіва з Вільні і з дакументамі АН, якія таксама захоўваліся ў Гістарычным архіве. Акрамя таго, праца па разбору актаў і складанню вопісаў тармазілася па прычыне палеаграфічных цяжкасцей некаторых актаў, таксама адсутнічалі дапаможнікі па перакладу, датаванню, лакалізацыі актаў і інш. В. К. Навакоўскі, дырэктар Дзяржархіва ў Мінску, быў не задаволены дзейнасцю В. Гісберт-Студніцкага і наракаў на яго бяздзейнасць.

У чэрвені–жніўні 1943 г. было закончана ўпарадкаванне дакументаў, складзены вопісы старажытных грамат і каралеўскіх прывілеяў за перыяд Рэчы Паспалітай. Працягвалася праца па ўпарадкаванню метрычнага фонду, нумараваліся старонкі метрычных кніг, складаліся каталогі. У чэрвені 1944 г. архіў быў вывезены гітлераўцамі.

*Крыніцы:* НГАБ. Справа Ф. 694 «Радзівілы, князі». Т. 1; НАРБ. Ф. 4. Воп. 27. Спр. 364. Нарыс Нясвіжскага архіва (пераклад з польскай мовы) 1941 г. Арк. 28–31; Там жа. Ф. 249. Воп. 8. Спр. 5. План вывазу дакументаў ЦДГА БССР і Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці нямецка-фашысцкімі акупантамі 1943–1944 г. Арк. 2, 45; AGAD. AR. Dz. XXVII. Sygn. 107. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z 1936 r. S. 79, 81; Там жа. Sygn. 108. Oryginały listów otrzymywanych i bruliony wysyłanych z 1937 r. S. 3; Козак К. И. Архивы Беларуси в годы Великой Отечественной войны: формы и состояние // Беларуска-польскія архіваліі: стан і перспектывы: матэрыялы другой бел.-польск. канф. архівістаў, Мінск, 10–11 кастрычніка 2001 г. / Бел. таварыства архівістаў; склад. і навук. рэд. К. І. Козак. Мн., 2003. С. 18–21.

**Грыневіч Вінцэнт**, на 1823 г. з'яўляўся архівістам з боку нясвіжскага ардыната Антонія Радзівіла пры Генеральным архіве Радзівілаўскай масы ў Вільні. Працягваў працу па ўпарадкаванні ардынацкай часткі архіва, якую распачаў у 1817 г. архівіст Д. Букоўскі. Разам з архівістам Пракураторыі Ю. Вілямоўскім 19 верасня 1823 г. ім быў падрыхтаваны для канцылярыі Суда Радзівілаўскай камісіі «Рэестр прывілеяў па справе аб аддзяленні ардынацкіх уладанняў», дапоўнены 20 снежня 1823 г. Яго аўтарству належаць таксама «Сумарыуш прывілеяў, што захоўваюцца ў Галоўным архіве князёў Радзівілаў, складзены ў 1824 г.». В. Грыневіч кантраляваў і правяраў працу над інвентаром выбаркі дакументаў «Нясвіж з прылеглымі ўладаннямі ў перыяд пасля Кішкаў». Ён, відаць, працаваў яшчэ ў 1826 г. Па дадзеных Р. Янкоўскага, як архівіст на 19 верасня 1823 г. вядомы таксама Ян Грыневецкі, які, верагодна, з'яўляецца той жа асобай.

*Крыніцы:* НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 411. Інструкцыя архівістам аб вядзенні і ўпарадкаванні архіва; справаздачы архівістаў і перапіска з імі. Вопісы архіўных дакументаў, 1736–1892 гг. Арк. 23, 25 адв.; Там жа. Спр. 412. Вопіс архіўных дакументаў і спісы польскіх, замежных газет і часопісаў, перададзеных з Нясвіжскага архіва ў Берлін. Інвентарны вопіс Нябораўскага архіва. Частка дакладной запіскі архівістаў Шылановіча і Форстэра аб стане архіва, 1745–1904 гг. Арк. 25; Там жа. Спр. 438. Справаздачы аб стане Нясвіжскага архіва і аб рабоце ў ім даследчыкаў з Пецярбурга і Вільні (са звесткамі па гісторыі архіва). Справаздача аб працы бібліятэкі архіва, 1853–1886 гг. Арк. 7 адв.; AGAD. AR. Dz. XXVII. Sygn. 56. Regestr przywilejów. Hryniewicz W., 19.09.1823. S. 39. BN. Rękopis 9067. Część 2; Tuhan-Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969. S. 85; Jankowski R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 2(18). S. 36; Jankowski R. Prace inwentaryzacyjne w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 3(19). S. 46; Jankowski R. Burzliwe losy Archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 r. // Miscellanea historico-archivistica. 2000. T. 11. S. 65.

**Гэкер**, першы з вядомых архівістаў Нясвіжскага архіва. Служыў пры другім нясвіжскім ардынаце князю Яне Юрыі Радзівіле ў 1616–1625 гг. Вядомы як аўтар вопісаў Нясвіжскага архіва і бібліятэкі (1619 г.), інвентара «Двара і вёскі Гарадзейскай» 1623 г. Створаны ім вопіс архіва захоўваў сваё практычнае значэнне да 1650-х гг.

*Крыніцы:* AGAD. AR. Rękopisy biblioteczne. Sygn. VIII–16. Zebranie przywilejów, praw i spraw rożnych… J. Hanowicz, 1650 г. Арк. 19, 52, 70, 163, 193, 279, 323–324, 328.; Jankowski R. Archiwiści i instrukcje archiwalne napisane dla nich w Archiwum Głównym Radziwiłłów w Nieświeżu // Archiwista Polski. 2000. № 2(18). S. 35.

# Хроніка і бібліяграфія

*Л. М. Лисова*

## 2008 ГОД — ХРОНИКА ЮБИЛЕЙНЫХ ТОРЖЕСТВ

Национальный исторический архив Беларуси встретил свой 70-летний юбилей большими успехами. За прошедший период он стал одним из крупнейших архивных учреждений республики, хранителем государственной части документов Национального архивного фонда Республики Беларусь за период с XIV в. до начала XX в. в объеме более миллиона дел. В центре внимания архива находятся вопросы обеспечения сохранности документов, их учета, а также усовершенствования научно-справочного аппарата к ним как условия успешного использования ретроспективной информации.

Для примера с 2001 по 2007 гг. отреставрировано 798 800 листов, переплетено 6330 дел, проведено выявление особо ценных дел и создан страховой фонд в количестве 1 103 470 кадров, закартонировано 29 634 дела.

В соответствии с отраслевой «Программой по сохранению архивного документального наследия — составной части информационных ресурсов общества на 2003–2010 гг.» осуществлено техническое переоснащение архива с привлечением новых технологий и технических средств. Созданы цифровые копии наиболее часто используемых и особо ценных дел фонда «Радзивиллы, князья», пергаментных грамот XIV–XVII вв. и документов других фондов. Произведен перевод информации с микрофотокопий в электронный вид на документы XVI в. (более 200 тыс. листов).

Проводится создание и усовершенствование научно-справочного аппарата к документам XIV–XVIII вв., имеющим палеографические особенности, к документам фонда «Радзивиллы, князья» на немецком, французском, польском, итальянском и латинском языках, усовершенствование описей фондов «Витебское губернское правление», «Витебская казенная палата» периода Российской империи второй половины XVIII – начала XX в.

Усовершенствуются описи фондов, используемых в ходе генеалогического поиска, религиозных учреждений Витебской, Минской и Могилевской губерний. Проведено описание более 2000 метрических книг церквей, костелов, синагог за 1848–1938 гг., поступивших из областных архивов и органов ЗАГС Брестской, Витебской, Минской, Могилевской областей. Для использования научно-справочного аппарата на уровне современных требований создается автоматизированная система поиска информации.

С 2001 г. архивом основаны и изданы справочник «Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII стст.» (1–2 выпуски), сборники «Архіварыус» (1–6 выпуски), «Гербоўнік беларускай шляхты», т. 1–2; изданы справочники «Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917)», «Фонды Национального исторического архива Беларуси», сборник «Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44 (1559–1566)» и др., в связи с чем расширена информационная база об источниках по истории Беларуси и специальным историческим дисциплинам.

Перевыполнены по сравнению с прогнозируемыми показатели по использованию документов за 2001–2007 гг.: проведено 125 радио- и телепередач, организовано 119 экскурсий, исполнено 7263 тематических (биографических), 662 генеалогических запроса, опубликовано 229 статей и подборок документов, подготовлено 20 выставок документов.

В 2001–2007 гг. в читальном зале архива работали более 3000 исследователей: ученые Института истории Национальной Академии наук Беларуси, преподаватели и студенты высших учебных заведений, работники музеев, краеведы. Только в 2007 г. зарегистрировано 5180 посещений читального зала, выдано 12 595 дел, 8030 микрофильмов, 3408 описей.

За значительный вклад в развитие архивного дела, сохранение документов по истории Беларуси XIV – начала XX в., организацию их всестороннего использования в интересах науки, научно-исследовательскую работу по актуальным вопросам истории Беларуси, архивоведения, археографии, специальным историческим дисциплинам архив награжден Почетной грамотой Совета Министров Республики Беларусь (постановление от 2 июля 2008 г. № 986).

К юбилею архивом выпущены сборники «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі — скарбніца дакументальнай спадчыны. 1938–2008», 6-й выпуск сборника научных сообщений и статей «Архіварыус», в котором опубликовано 22 статьи сотрудников архива.

Подготовлены информационные радио- и телевизионные выпуски (каналы «Лад», ОНТ, СТВ), опубликованы интервью и статьи во многих периодических изданиях (газеты «Комсомольская правда в Белоруссии»,

«Вечерний Минск», «Народная газета», «Республика», «СБ «Беларусь сегодня», «Минский курьер»), в журналах «Архівы і справаводства», «Беларускі гістарычны часопіс».

С использованием уникальных документов из фондов архива Республиканским унитарным предприятием почтовой связи «Белпочта» изготовлен сувенирный почтовый конверт, посвященный 70-летию архива. На веб-сайт «Архивы Беларуси» подготовлена виртуальная выставка «Достояние республики», посвященная 70-летию НИАБ, также подготовлены фотовыставки в здании НИАБ и в Минской центральной городской библиотеке им. Янки Купалы.

В ознаменование 70-летия архива 8–9 июля 2008 г. были проведены юбилейные торжества. 8 июля состоялась научно-практическая конференция «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: гісторыя і сучаснасць», на которой с приветственным словом выступил директор Департамента по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь В. И. Адамушко. С интересом был выслушан доклад директора НИАБ А. К. Голубович. Также озвучены 40 докладов и сообщений представителей архивных, научных, музейных и других учреждений страны.

Работа конференции была организована по двум секциям: секция 1 «Архіўная справа ў Беларусі XIV – пачатку XX ст. Навуковае выкарыстанне дакументаў НГАБ» (руководители секции доктор исторических наук, главный научный сотрудник Института истории НАН Беларуси Г. Я. Голенченко и заведующий отделом публикации документов НИАБ Д. Л. Яцкевич); секция 2 «Нацыянальны архіўны фонд Рэспублікі Беларусь: стан, праблемы, перспектывы» (руководители секции кандидат исторических наук, заместитель директора БелНИИДАД С. В. Жумарь и заместитель директора НИАБ Л. М. Лисова). Вопросы и проблемы, поднятые на конференции, нашли свое место на страницах сборника материалов «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: гісторыя і сучаснасць».

9 июля в архиве состоялась экскурсия, на которой присутствующим были продемонстрированы документальные сокровища Республики Беларусь, хранящиеся в Национальном историческом архиве Беларуси.

Затем состоялась презентация юбилейного сборника «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі — скарбніца дакументальнай спадчыны. 1938–2008», шестого выпуска сборника научных статей и сообщений «Архіварыус» и других трудов архива, изданных за последнее десятилетие. На презентации присутствовали и выступали члены авторского коллектива, ветераны архива, приглашенные гости, представители телевидения. Вел презентацию заведующий отделом публикации документов Д. Л. Яцкевич, который, как и все ее участники, отметил, что сборник

является важной вехой в 70-летней истории архива. Подведены итоги вклада архива в развитие науки, подготовку нового кадрового потенциала, возвращение исторической памяти о судьбах поколений.

Оценивая вложенные в подготовку сборников и справочников усилия, директор архива А. К. Голубович подчеркнула, что сборник «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Скарбніца дакументальнай спадчыны. 1938–2008 гг.» — это первое издание, посвящённое архиву. В нем отражена история становления, а также судьбы документальных собраний Виленского и Витебского архивов древних актов. Сложным оказалось написать историю довоенного периода, т.к. практически отсутствуют документы «могилевского периода». Период становления архива с 1963 по 1990 гг., после переезда в Минск, имел свою специфику. В этот период архив достиг больших профессиональных результатов, которые поддерживают архивисты, работающие в последние десятилетия.

Научный редактор юбилейного сборника доктор исторических наук Ю. Н. Бохан и автор раздела о предшественниках архива — Виленском и Витебском центральных архивах древних актовых книг — кандидат исторических наук М. Ф. Шумейко отметили высокий научный уровень подготовленных материалов. Почетный председатель общественного объединения «Международная ассоциация белоруссистов» А. И. Мальдис сказал о важности издания для изучения истории архивного строительства в Беларуси и популяризации труда белорусских архивистов.

Заместитель директора БелНИИДАД В. В. Федосов оценил успех архива при выработке концепции сборника: освещены и современное состояние архива, и исторические этапы его становления и развития, а заведующие отделами Т. С. Михеёнок и В. А. Ходина показали опыт подготовки статей, посвященных каждому отделу, а также биограмм сотрудников.

Бывший заместитель директора ЦГИА БССР Э. Л. Козловская поблагодарила участников авторского коллектива за проделанную работу по сбору материалов об архиве и о его 70-летнем пути, а также за то, что сборник написан на «роднай мове».

Была отмечена заслуга отдела публикации документов, возглавляемого Д. Л. Яцкевичем, в подготовке справочников и сборников, изданных архивом.

Самым ответственным и приятным мероприятием явилось торжественное собрание с участием представителей организаций и учреждений, которое своим докладом «Национальный исторический архив Беларуси: история и современность» открыла директор А. К. Голубович в зале Минского государственного дворца детей и молодежи.

От имени Министерства юстиции Республики Беларусь архив поздравили и вручили награды удостоенным работникам министр

В. Г. Голованов и директор Департамента по архивам и делопроизводству В. И. Адамушко. Поздравительные речи огласили председатель Национальной комиссии Республики Беларусь по делам ЮНЕСКО В. Г. Счастный, Чрезвычайный и Полномочный Посол Украины в Республике Беларусь И. Д. Лиховый, директор Института истории Национальной Академии наук Беларуси А. А. Коваленя.

В этот день в зале звучали поздравления директоров республиканских архивов и архивных учреждений, которые сопровождались вручением приветственных адресов и памятных подарков: Национального архива Республики Беларусь В. Д. Селеменева, Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно Т. Ю. Афанасьевой, Белорусского государственного архива кинофотофонодокументов В. В. Баландина, Белорусского государственного архива-музея литературы и искусства А. В. Запартыко, Белорусского государственного архива научно-технической документации А. М. Запартыко, Белорусского научно-исследовательского института документоведения и архивного дела А. Е. Рыбакова, Белорусского научно-исследовательского центра электронной документации В. Л. Носевича, Центральной лаборатории микрофильмирования и реставрации документов И. В. Силина.

В торжествах приняли участие и выступили с поздравлениями начальник Главного управления юстиции Витебского облисполкома В. В. Пранник и директор Государственного архива Витебской области Т. М. Свистунова, начальник отдела по архивам и делопроизводству Управления юстиции Минского облисполкома А. В. Филиппова и директор Государственного архива Минской области Е. В. Кушнова, начальник отдела по архивам и делопроизводству Управления юстиции Гомельского облисполкома П. М. Лапицкий и директор Государственного архива Гомельской области П. М. Черный, начальник отдела по архивам и делопроизводству, юридической экспертизе и административным процедурам Главного управления юстиции Могилевского облисполкома К. П. Крупенькин и директор Государственного архива Могилевской области П. И. Шевчик, директор Государственного архива Гродненской области Л. И. Юнина и директор Государственного архива Брестской области А. Г. Карапузова.

Много хороших поздравительных слов прозвучало в выступлениях Почетного председателя общественного объединения «Международная ассоциация белорусситов» А. И. Мальдиса, декана исторического факультета Белорусского государственного университета С. Н. Ходина, заведующего сектором по архивам и делопроизводству Главного управления юстиции Минского горисполкома Е. В. Позняк, заместителя главного редактора журнала «Архивы и делопроизводство» В. В. Адамчика, председателя Минской городской организации профсоюза работников государственных и иных учреждений Т. М. Дубининой.

О сотрудничестве с архивом говорили заведующий кафедрой Белорусского государственного экономического университета, доктор исторических наук Ю. Н. Бохан и профессор БГЭУ, доктор исторических наук З. В. Шибеко, кандидат исторических наук В. Ф. Голубев, заместитель директора Национального художественного музея Республики Беларусь Н. М. Усова, заведующая филиалом Национального художественного музея Республики Беларусь «Дом Ваньковичей» Н. В. Сычева, заместитель директора Национального музея истории и культуры Беларуси Л. И. Балавнева. С юбилеем архив поздравили заместитель директора Национальной библиотеки Беларуси Л. Г. Кирюхина, исследователь истории семьи и рода А. В. Чебоганов, адвокаты, члены Президиума Белинюрколлегии Д. М. Наумик, С. В. Комиссарова.

За всеми достижениями стоят конкретные люди. С почетом встречали архивисты ветеранов архива, принявших участие в торжествах: Е. И. Барановского, Э. М. Савицкого, С. И. Павлович, А. К. Титова, Э. Л. Козловскую, Т. Е. Леонтьеву, Н. Н. Левчик, А. А. Станкевич, Е. И. Юцевич, И. И. Петрашевич и др.

Директору А. К. Голубович в честь 70-летия архива вручен нагрудный знак Министерства юстиции Республики Беларусь «За адзнаку» II степени. Главный архивист отдела научного использования документов и информации В. Н. Денисов награжден Почетной грамотой Совета Министров Республики Беларусь. Почетной грамотой Министерства юстиции Республики Беларусь награждена заместитель директора Л. М. Лисова, благодарность министра объявлена заведующей отделом информационно-поисковых систем Г. Е. Акулович и главному палеографу отдела древних актов А. Ф. Александровой. Нагрудным знаком Департамента по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь «Ганаровы архівіст Беларусі» награждены заведующая отделом обеспечения сохранности документов и фондов Г. Н. Кутукова, заведующая отделом древних актов О. В. Бобкова, главный архивист отдела научного использования документов и информации С. А. Рыбчонок, ветеран архива, с 1986 по 2002 гг. заведующая отделом обеспечения сохранности документов и фондов А. А. Станкевич. За многолетний добросовестный труд, высокий профессионализм, большой вклад в развитие архивной службы Республики Беларусь пять сотрудников награждены Почетной грамотой Департамента по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь — это главный бухгалтер Р. Ф. Бабич, заведующий отделом публикации документов Д. Л. Яцкевич, ведущий научный сотрудник отдела обеспечения сохранности документов и фондов С. Я. Трацевская, архивист 2 категории этого же отдела Г. В. Барсукова, ведущий научный сотрудник отдела научного использования документов и информации И. Л. Вернер.

Ряду работников архива за добросовестный труд, высокий профессиональный уровень в области научно-исследовательской работы по актуальным вопросам истории Беларуси, создания автоматизированных информационно-поисковых систем, создания и усовершенствования научно-справочного аппарата к документам по истории Беларуси XIV – начала XX в., обеспечения сохранности и организации использования документов Национального архивного фонда Республики Беларусь в интересах науки и общества была вручена Почетная грамота директора архива, в том числе: заведующей отделом научного использования документов и информации В. А. Ходиной, главному архивисту М. И. Блашковой, архивисту II категории Л. Д. Гусаковой, заведующей отделом автоматизированных архивных технологий Т. С. Михеёнок, главному архивисту отдела информационно-поисковых систем Т. Н. Котик, главному архивисту отдела обеспечения сохранности документов и фондов С. Н. Хлябич, архивистам II категории Т. В. Елисеевой, Н. Н. Алипченко, главным архивистам отдела древних актов Н. А. Барсуковой, И. М. Бобер, ведущему научному сотруднику А. А. Лашкевичу, главному инженеру И. К. Парабковичу, технику II категории Н. М. Трубникову, уборщице служебных помещений В. И. Тулице, ветерану архива Т. Е. Леонтьевой. Благодарность за добросовестный труд и большой вклад в развитие архива объявлена И. В. Покрасенко, А. Е. Горшковой (отдел обеспечения сохранности документов и фондов), Д. В. Лисейчикову, А. Л. Гривенёву (отдел информационно-поисковых систем), О. Х. Коноваленко, В. Л. Козлову (отдел научного использования документов и информации), В. В. Пахомовой (отдел публикации документов), Г. М. Брегеру (отдел древних актов), О. Л. Сидельниковой, Т. А. Новицкой, Н. Ф. Харьяновой (отдел автоматизированных архивных технологий), Л. К. Матус (административно-хозяйственный отдел), Т. А. Матук (ведущий бухгалтер).

В эти дни 70-летние юбилеи отметили еще четыре архивных учреждения — Государственные архивы Витебской, Гомельской, Минской и Могилевской областей. Администрация НИАБ от имени коллектива искренне поздравила своих коллег, которые убедительно продемонстрировали, что ценность и значимость архива зависит от всех работников, кто с чувством личной ответственности посвящает свою жизнь и труд благородному делу — делу сохранения документальных материалов по истории белорусского народа.

Торжества показали, что архивисты настроены продолжать приумножение достижений, знаний и практических навыков работы с документами, приобретенных за прошедший период деятельности Государственной архивной службы Республики Беларусь.

***Кривонос Ф.**, священник. У Бога мёртвых нет. Неизвестные страницы из истории Минской епархии (1917–1939 годы). Мн.: МФЦП, 2007. 240 с.: ил.*




Кніга святара Ф. Крываноса, адмыслоўца, які займаецца праблемамі рэпрэсіяў супраць праваслаўнай царквы ў Беларусі ў ХХ ст. з боку Савецкай улады і ўвекавечанні памяці загінуўшых святароў і міранаў, выйшла накладам 3000 асобнікаў. Дадзеная праца знаходзіцца цалкам у рэчышчы навуковых інтарэсаў і дзейнасці аўтара, які на працягу шматлікіх гадоў займаецца асвятленнем дадзенай праблематыкі.

Чарговая кніга прысвечаная падзеям, якія адбываліся ў Мінскай епархіі ў 1917–1939 гг., і ў асноўным сканцэнтраваная на рэпрэсіях супраць праваслаўнага духавенства. Яна складаецца з уводзінаў, пяці раздзелаў, заключэння і бібліяграфіі. Ва ўводзінах аўтар раскрывае мэты працы, паказвае яе актуальнасць, сцісла характарызуе выкарыстаныя крыніцы і літаратуру. У першым раздзеле коратка падаецца інфармацыя пра становішча і развіццё праваслаўнай царквы напярэдадні 1917 г., характарызуецца стан Мінскай епархіі падчас рэвалюцыйных падзей, нямецкай і польскай акупацыі. Другі прысвечаны разгляду прычын і разгортванні кампаніі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей, якая праводзілася Савецкай уладай у 20-я гг. ХХ ст., стварэнні Беларускай мітраполіі ў 1922 г. і пачатку супрацьстаяння прыхільнікаў патрыярха Ціхана з абнаўленцамі, якія стварылі паралельную царкоўную структуру, падтрыманую бальшавікамі. Трэці раздзел працягвае тэму царкоўнага супрацьстаяння, а таксама распавядае аб ганеннях на мітрапаліта Мельхіседэка. У чацвёртым паказваецца гісторыя стварэння Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, раскрываюцца адносіны да яе праваслаўнага духавенства, характарызуецца царкоўнае становішча пасля 1927 г. Пяты — найбольш значны (складае палову кнігі), раздзел апавядае аб масавых рэпрэсіях супраць праваслаўнага кліра і міранаў у 1929–1939 гг. У заключэнні Ф. Крываннос робіць высновы па раздзелах.

Пры напісанні кнігі аўтар выкарыстаў шматлікую літаратуру, якая тычыцца царкоўнага жыцця ў даваенны перыяд, матэрыялы перыядычнага друку, прычым як сучаснага, так і тагачаснага, а таксама значнае кола

архіўных крыніц. Большасць архіўных дакументаў узята з беларускіх архіваў, у тым ліку і мала даступных сучасным даследчыкам. Так, першы раздзел заснаваны на звестках, запазычаных, галоўным чынам, з Мінскіх епархіяльных ведамасцей за 1917–1920 гг.

Палітыку Савецкай улады ў адносінах да царквы раскрываюць матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці. Дакументы фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі дазваляюць разгледзець становішча праваслаўнай царквы ў 20-я – пач. 30-х гг. XX ст. Асобна трэба адзначыць фонд Беларускага абнаўленчага сінода, дакументы якога ў найбольшай ступені характарызуюць становішча ўнутры праваслаўнай царквы ў Беларусі (становішча прыходаў, узаемаадносіны ціханаўцаў з абнаўленцамі, узнікненне Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і інш.). Абставіны рэпрэсіяў супраць прадстаўнікоў праваслаўнай царквы яскрава паказваюць следчыя справы, заведзеныя на духавенства і міранаў, з Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь, з архіваў УКДБ Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

Асобна можна вылучыць прыватны архіў Ф. Крываноса, які пачаў складвацца ў выніку дзейнасці святара ў 90-я гг. XX ст. па збору дадзеных аб прадстаўніках праваслаўнай царквы, якія пацярпелі ад рэпрэсій. Гэты архіў складаецца з дакументаў прыходаў, успамінаў, лістоў родных і блізкіх ахвяраў рэпрэсій (апошнія крыніцы займаюць асноўную частку пятага раздзела).

Невялікую колькасць дакументаў аўтар узяў з архіваў Расійскай Федэрацыі. Гэта пераважна следчыя справы на высланых святароў Мінскай епархіі. Архіў Мінскага Епархіяльнага Кіраўніцтва аўтар выкарыстаў для асвятлення пэўных момантаў жыцця і дзейнасці святароў.

Дадзеная праца Ф. Крываноса, хоць і анатуецца як духоўна-асветніцкае выданне, адрасаванае, галоўным чынам, вернікам, але, на нашу думку, будзе цікавым і для навукоўцаў, якія займаюцца пытаннямі, звязанымі з гісторыяй праваслаўнай царквы ў Беларусі ў XX ст. Акрамя таго, у кнізе выкарыстаны багаты архіўны матэрыял, які ўдала дапаўняецца фотаздымкамі святароў (узятых у тым ліку і са следчых спраў КДБ, а таму мала даступных).

*І. А. Вішнеўскі*

***Феодор Кривонос*** *(священник). Белорусская Православная Церковь в XX столетии: спецкурс лекций для Минской Духовной Семинарии. Мн.: ВРАТА, 2008. 255 с.*




Увосень 2008 г. выйшла ў свет кніга святара Ф. Крываноса «Белорусская Православная Церковь в XX столетии: спецкурс лекций для Минской Духовной Семинарии». У пэўнай ступені гэтая праца з'яўляецца працягам даследавання тэмы, якая яшчэ нядаўна ўзнята беларускімі царкоўнымі гісторыкамі і атрымала актыўнае развіццё на пачатку XXI ст.

У якасці рэцэнзентаў выступілі прафесар Мінскай Духоўнай акадэміі і духоўнай семінарыі протаіерэй Віталь Антонік і дацэнт Інстытута тэалогіі БДУ протаіерэй Сяргей Гардун, што падкрэслівае духоўна-асветніцкую ролю выдання.

Кніга складаецца з уводзінаў, дзесяці лекцый, заключэння, бібліяграфіі і дадатку. У першай лекцыі ў агульных рысах падаецца становішча праваслаўнай царквы ў Беларусі ў пачатку XX ст., паасобку разглядаецца кожная епархія. Другая распавядае пра становішча царквы ў перыяд Першай сусветнай вайны, нямецкай і польскай акупацый Беларусі да сакавіка 1921 г., адлюстроўвае змены, якія крануліся царквы пасля Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Трэцяя лекцыя асвятляе антырэлігійную палітыку Савецкай улады ў 1920–30-я гг., абнаўленчы раскол і ўтварэнне Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Становішчу праваслаўнай царквы ў Заходняй Беларусі падчас уваходжання апошняй у склад Польшчы, палітыку польскіх уладаў, а разам з тым і наступствам уз'яднання БССР у 1939 г. для царквы прысвечаны чацвёртая і пятая лекцыі. Шостая адлюстроўвае дзейнасць праваслаўнай царквы ва ўмовах нямецкай акупацыі. У сёмай лекцыі распавядаецца пра поспехі і цяжкасці аднаўлення царкоўнага жыцця ў пасляваенны перыяд, адноснай нармалізацыі стасункаў царквы з Савецкай уладай. Пагаршэнне становішча праваслаўнай царквы пры Хрушчове, асвятленне гісторыі Мінскай епархіі ў 1960–80-я гг. і характарыстыка яе кіруючых іерархаў (больш падрабязна аўтар спыняецца на асобе мітрапаліта Філарэта) адлюстроўваюцца ў восьмай і дзевятай лекцыях. Апошняя дазваляе ўбачыць стан сучаснай Беларускай праваслаўнай царквы, асноўныя падзеі 1990–2000-х гг. У дадатку, які ўяўляе сабой

публікацыю фрагмента з «Монастырского дневника» архімандрыта Антонія (Мельнікава), апісваюцца падзеі, звязаныя з закрыццём у 1963 г. Мінскай духоўнай семінарыі.

Пры напісанні працы Ф. Крыванос выкарыстоўваў беларускія, расійскія, у меншай ступені літоўскія і польскія даследаванні. Прыводзіцца значнае кола літаратуры, што выдавалася з сярэдзіны 1990-х гг. па сённяшні час. Аўтар звяртаецца не толькі да работ, звязаных з гісторыяй непасрэдна праваслаўнай царквы, але і да агульных даследаванняў, з дапамогай якіх больш падрабязна асвятляюцца некаторыя падзеі і аспекты. Ён таксама звярнуў увагу на дыпломныя працы выпускнікоў Мінскай духоўнай семінарыі, на падставе якіх даў характарыстыку некаторым найбольш вядомым царкоўным дзеячам. Прыведзены ў кнізе і некаторыя матэрыялы царкоўнага перыядычнага друку. Так, царкоўнае жыццё ў першай трэці ХХ ст. асвятляюць такія выданні, як «Минские Епархиальные Ведомости», «Полоцкие Епархиальные Ведомости», «Вестник Виленского православного Св.-Духовского братства» і інш.

У сваёй працы Ф. Крыванос выкарыстоўвае і архіўныя крыніцы. Пры прывядзенні статыстычных дадзеных і характарыстыцы становішча царквы аўтар бярэ дакументы Цэнтральнага Камітэта КПБ (Ф. 4), Цэнтральнага савета Саюза ваяўнічых бязбожнікаў БССР (Ф. 261), Беларускага рэспубліканскага савета прафесійных саюзаў (Ф. 265), Упаўнаважанага Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры СМ СССР па БССР (1944–1965) (Ф. 951) і Упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ БССР (1944–1965) (Ф. 952) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Абставіны царкоўнага расколу ў 1920-я гг. і рэпрэсій супраць духавенства раскрываюцца пры дапамозе дакументаў абнаўленчага Сінода (Ф. 2786) Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, следчых спраў Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь, архіваў УКДБ па Віцебскай і Гродзенскай вобласцях. Невялікую, але разам з тым цікавую частку крыніц складаюць дакументы Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі і Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. Гісторыю праваслаўнай царквы ў другой палове ХХ ст. аўтару дапамагае ілюстраваць зборнік дакументаў «Православная церковь на Витебщине (1918–1991)», выдадзены ў 2006 г. Асобна можна вылучыць архіў аўтара, што склаўся ў выніку дзейнасці апошняга. Ён збіраў дадзеныя аб прадстаўніках праваслаўнай царквы, якіх закранулі рэпрэсіі. Асабліва шырока выкарыстаны ўспаміны сведкаў.

Кніга Ф. Крываноса «Белорусская православная церковь в ХХ столетии» з'яўляецца першым вопытам абагульнення гісторыі праваслаўнай царквы ў Беларусі дадзенага перыяду. Не прэтэндуючы на паўнату інфармацыі, ён імкнуўся адлюстраваць асноўныя перыяды, падзеі і

ахарактарызаваць найбольш выбітныя асобы ў гісторыі праваслаўнай царквы. Праца дазваляе глянуць на гістарычныя падзеі вачыма царкоўных сведак.

Разам з тым нельга не заўважыць і некаторыя недахопы. Хаця Ф. Крыванос і ўпэўнівае чытача ў сваіх імкненнях зыходзіць з «беспристрастно-научных позиций», ідэалагічная нейтральнасць аўтара выклікае сумненні. Ён не закранае супярэчлівых тэм для сучаснай праваслаўнай царквы. Выкрываючы ролю бальшавікоў у здзяйсненні абнаўленчага расколу, Ф. Крыванос не падае інфармацыі пра удзел АДПУ ў стварэнні аўтакефальнай царквы ў 1927 г. Абыходзіць ён і некаторыя пытанні з гісторыі аўтакефальнай царквы падчас нямецкай акупацыі, увогуле не згадвае аб яе дзейнасці пасля вайны і ў замежжы ў другой палове XX ст. Нельга не заўважыць яго асабістае стаўленне ў ацэнцы царкоўных асоб і падзей. Прыводзячы станоўчую ацэнку такім дзеячам, як Мельхіседэк, Панцейлеймон Ражноўскі, Ф. Крыванос падае адмоўную ацэнку альбо толькі агульныя звесткі пра дзеячаў абнаўленчай і аўтакефальнай цэркваў. Крытыкуючы апошніх, аўтар разам з тым фактычна не закранае праблемы праваслаўнай царквы (напрыклад, пры характарыстыцы царквы ў 1900–1914 гг. толькі ў агульных рысах згадваюцца недахопы сінадальна-кансісторскай сістэмы). У нязначнай ступені ім выкарыстаны комплекс архіўных крыніц. Так, акрамя фонду абнаўленчага Сінода (толькі адна справа), не звярнуў увагі на дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, якія дапамаглі б падрабязней асвятліць становішча праваслаўнай царквы ў пачатку XX ст. Тое ж самае можна казаць і пра НАРБ, дакументы якога дапамаглі б разгледзець стан царквы асабліва ў 1941–1944 гг.

Кніга Ф. Крываноса «Белорусская Православная Церковь в XX столетии» уяўляе цікавасць не толькі для студэнтаў духоўных навучальных устаноў, але і для шырокага кола чытачоў. Для навукоўца дадзеная праца будзе мець карысць, дзякуючы прыведзеным у ёй крыніцам і гістарыяграфіі.

*І. А. Вішнеўскі*

***Гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта*** *(1913–1940 гг.): дакументы і матэрыялы / Аўт.-склад.: А. Р. Агееў, К. М. Бандарэнка, В. П. Клімковіч; пад агульн. рэд. К. М. Бандарэнкі. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2008. 216 с.*



У 2008 г. пабачыў свет зборнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі такой вядомай установы, як Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова. Зборнік ахоплівае перыяд ад часу ўзнікнення ў 1913 г. Магілёўскага настаўніцкага інстытута да 1940 г., апошняга перадваеннага года, па якім аўтарам-складальнікам давялося адшукаць дакументы.

Выданне падрыхтавана калектывам Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (МДУ) на чале з рэктарам К. М. Бандарэнкам і выкладчыкам А. Р. Агеевым. У суаўтарстве з імі выступае дырэктар Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці В. П. Клімковіч. Зборнік надрукаваны пры падтрымцы Міністэрства адукацыі РБ і Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці.

Як пазначана ў прадмове да выдання, яго аснову склалі крыніцы дзяржаўных архіваў Беларусі, а менавіта Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) — 10 дакументаў, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) — 1, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМВ) — 41, Дзяржаўных архіваў Гомельскай (ДАГВ) — 6 і Магілёўскай абласцей (ДАМВ) — 1. Прадстаўлены 4 дакументы з музея Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта.

Сярод газет выкарыстаны: «Савецкая Беларусь» — 2 артыкулы, «Камунар Магілёўшчыны» — 1 артыкул. Адзін дакумент узяты са «Сборника законов Белорусской ССР и указов Президиума Верховного Совета БССР 1938 г.».

На пачатку выдання асобным раздзелам пададзена гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта на розных этапах яго існавання. Згодна з колькасцю назваў гэтай установы такіх этапаў вылучаецца дзесяць. Неаднаразовая змена найменняў фактычна адлюстравала тыя грамадска-палітычныя і культурныя працэсы, што адбываліся ў Беларусі ў ХХ ст.

Самым вялікім з'яўляецца раздзел, прысвечаны дакументам і матэрыялам. Як адзначаюць складальнікі, дадзеныя крыніцы падаюцца ў

храналагічным парадку на мове арыгінала з захаваннем асаблівасцей правапісу і афармлення дакументаў. Пасля кожнага з іх змешчана спасылка на месца захавання з пазначэннем арыгіналаў і копій. У прадмове да выдання пазначана, што «пры немагчымасці дакладнай дацiроўкі ўстанаўлівалася прыблізная дата, якая вызначалася па змесце дакумента». У якасці заслугі складальнікаў можна адзначыць стварэнне паказальніка імёнаў да выдання. У зборніку таксама прадстаўлены спіс скарочаных слоў, зроблены пералік дакументаў (усяго 67).

Неабходна заўважыць, што само выданне больш нагадвае своеасаблівы люстраны (факсімільны) адбітак дакументаў, аднак з наяўнасцю некаторых рэдактарскіх правак. Так, нечытабельныя месцы пазначаліся спецыяльнымі знакамі (*).

На жаль, аўтарамі не выкарыстаны артыкул З. Л. Яцкевіча ў часопісе «Адукацыя і выхаванне» [1], дзе аўтарам разглядаюцца факты па гісторыі навучальных устаноў горада з 1578 па 1916 г. Акрамя гэтага на падставе дакументаў НГАБ змяшчаюцца і некалькі фактаў з гісторыі арганізацыі ў Магілёве ўласнага універсітэта, якое актыўна распачалося ў 1916 г.

У фондзе НГАБ па Магілёўскаму настаўніцкаму інстытуту (Ф. 2258) захоўваецца 45 спраў, з якіх у зборніку выкарыстаны пяць (Спр. 6, 21, 22, 28, 39). Яны, на думку складальнікаў, найбольш поўна характарызуюць абставіны ўзнікнення, існавання і дзейнасці ўстановы ў перыяд з 1913 па 1917 гг. Аднак неабходна заўважыць, што для комплекснага даследавання гісторыі дадзенай праблемы ў будучым неабходна карыстацца і іншымі дакументамі згаданага фонду.

Падсумоўваючы, можна зрабіць выснову аб тым, што апублікаваныя ў выданні архіўныя крыніцы дастаткова поўна паказваюць асаблівасці навучальнага працэсу і выхаваўчай работы, кадравай палітыкі і навуковай дзейнасці, стан матэрыяльнай базы і іншыя аспекты жыццядзейнасці навучальнай установы.

Дадзенае выданне прадстаўляе сабой фактычна першы зборнік дакументаў, падрыхтаваны на Магілёўшчыне з удзелам архіўных устаноў рэгіёна.

Зборнік, безумоўна, будзе карысным і цікавым для навукоўцаў, краязнаўцаў, студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, усіх, хто цікавіцца гісторыяй педагагічнай адукацыі на Магілёўшчыне.

*В. В. Урублеўскі*

---

[1] Яцкевіч З. Л. Аднавіць забыты гонар, альбо колькі старонак з гісторыі адукацыі на Магілёўшчыне // Адукацыя і выхаванне. Мн., 1994. С. 37-41.

***Лисенко С., Чернецький Є.*** *Правобережна шляхта (кінець XVIII – першая половина XIX ст.). Список шляхти Волинської, Київської та Подільської губерній, дворянські права якої перевірила Центральна ревізійна комісія. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський, 2002 (1-е вид.); 2007 (2-е вид.).*

***Легітимована правобережна шляхта*** *(кінець XVIII – середина XIX ст.) / Уклад.: С. Лисенко, Є. Чернецький. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський, 2006. Т. 2–5.*







Даследаванне шляхецкай генеалогіі аказвае значны ўплыў на разгляд пытанняў генеалагічнага, гісторыка-дэмаграфічнага і юрыдычнага характару. Анатуемыя выданні прысвечаны генеалогіі шляхты Правабярэжнай Украіны канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. Іх аўтары, Сяргей Лысенка і Яўген Чарнецкі, адзначыліся значнай колькасцю прац, прысвечаных дадзенай тэматыцы, што дазволіла ім назапасіць вялікую колькасць разнастайнай інфармацыі па гісторыі і генеалогіі. Першым з выдадзеных імі даведнікаў варта адзначыць наступны — «Правабярэжная шляхта (канец XVIII – першая палова XIX ст.). Спіс шляхты Валынскай, Кіеўскай і Падольскай губерняў, дваранскія правы якой праверыла Цэнтральная рэвізійная камісія». Дадзенае выданне пабачыла свет у рамках выдавецкага праекта «Шляхта Украіны» і скіравана на даследаванне «легітымаванай» (зацверджанай) Сенатам Расійскай імперыі шляхты.

Даведнік прадстаўляе грунтоўны спіс шляхецкіх прозвішчаў з пазначэннем месца выводу (губерні); даты разгляду справы Цэнтральнай рэвізійнай камісіяй (камісія, якая склікалася для праверкі дзеянняў ДДС); даты адпраўлення справы да часовай прысутнасці Герольдыі альбо да іншай установы з пазначэннем яе нумару. Аднак у спісе не пазначаецца частка радаслоўнай

кнігі, куды заносіўся зацверджаны род. Усяго спіс у алфавітным парадку ахоплівае 19 042 дваранскія роды, якія пражывалі на абшарах Кіеўскай, Валынскай і Падольскай губерняў і чые дваранскія правы разглядаліся Цэнтральнай рэвізійнай камісіяй. Перад спісам выкладзены тэарэтычныя аспекты пытання гісторыі правабярэжнай шляхты з 1793 па 1845 гг., працэсы далучэння яе да расійскага дваранства, юрыдычнага і палітычнага «разбору шляхты». Асвятляецца гісторыя існавання і функцыянавання Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. Аналагам дадзенага выдання можа з'яўляцца «Спіс зацверджанай шляхты ў губернях Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Смаленскай і Віцебскай» [1].

Аб значнай практычнай каштоўнасці і актуальнасці даведніка «Правабярэжная шляхта» сведчыць яго перавыданне і замена вокладкі з мяккай на цвёрдую. У другім, дапрацаваным выданні, у процівагу першаму, падаецца карта адміністрацыйнага падзелу Правабярэжнай Украіны (на сярэдзіну XIX ст.).

Часткова ўся прадстаўленая вышэй інфармацыя была выкарыстана пры напісанні даследавання, прысвечанага спісам зацверджанай шляхты Кіеўскай і Валынскай губерняў.

Унутраная структура даведніка «Легітымаваная правабярэжная шляхта (канец XVIII – сяр. XIX ст.)» складаецца з наступных раздзелаў: прадмовы да спісу, спісу скарачэнняў, карты адміністрацыйнага падзелу губерні і ўласна спісу зацверджанай шляхты. Шырокі спектр інфармацыі па шляхце Валынскай губерні выклікаў з'яўленне трох тамоў, прысвечаных ёй.

Спіс зацверджанай шляхты Кіеўскай губерні (Т. 2) змяшчае інфармацыю аб 3000 шляхецкіх родаў, што зацвярджаліся Кіеўскім дваранскім дэпутацкім сходам як расійскае дваранства. У адпаведным спісе шляхты па Валынскай губерні (Т. 3–5) пададзены звесткі аб 7500 дваранскіх родах, зацверджаных Валынскім дваранскім дэпутацкім сходам.

Інфармацыя па кожным родзе падаецца ў пяці пунктах. Першы пункт (не пазначаны лічбай) змяшчае прозвішча шляхецкага роду. Аўтарамі падаюцца ўсе варыянты прозвішча, што ўжываліся ў дакументах, у т. л. тыя, што маглі з'яўляцца памылкай дробнага чыноўніка пры перапісванні ці ўкладанні. Пры наяўнасці родавага прыдомка падаваўся і ён (напр.: «Літинські пр. Піскрович»). Прозвішчы ў спісе разам з прыдомкамі маглі ўключаць таксама і ўказанне на месца паходжання роду (напр.: «з Вишполя Вишпольські пр. Міхайлевич»). Дадзеныя формы прозвішчаў звычайна ўжываліся ў спісах дакументаў, прадстаўленых шляхтай для зацвярджэння. Аўтары разглядаюць згаданую з'яву як

[1] Spis szlachty wylegitymowanej w guberniach Grodzienskiey, Minskiej, Mohylewskiey, Smolenskiey i Witebskiey. Opracowali: S. Dumin, S. Górzyński. Warszawa, 1992.

своеасаблівы культурны пласт гістарычнай інфармацыі аб пэўным родзе.

Другі пункт інфармуе пра запіс шляхецкіх родаў падчас рэвізій з пазначэннем года правядзення рэвізскай сказкі, населенага пункта, дзе пражывала шляхта, і павета, да якога яна адносілася. У выпадках, калі пэўны род быў запісаны па рэвізіі за межамі той губерні, якой прысвечана выданне, пазначалася назва губерні, намесніцтва, вобласці. У дужках запісаны статус роду, робіцца пазнака аб адсутнасці ці памылковасці звестак пра яго ў рэвізіі (напр.: «чиншова шляхта; помилково не записані»).

Трэці пункт пазначае павет, з якога было накіравана прашэнне ў Дваранскі дэпутацкі сход з мэтай зацвярджэння ў шляхецкай вартасці. Калі пастаноў ДДС было некалькі, і іх задаволілі на падставе прашэнняў, пададзеных з розных паветаў, то апошнія падаваліся ў храналагічным парадку і пазначаліся лацінскімі літарамі. Тое самае датычылася і тых выпадкаў, калі прашэнні падаваліся родам, прадстаўнікі якога пражывалі ў розных паветах. У такіх выпадках паветы пазначаліся ў паслядоўнасці іх фіксацыі ў дакументах.

У чацвёртым пункце змешчана інфармацыя адносна зацвярджэння родаў у дваранстве паводле загадаў Герольдыі. Звесткі па легітымацыі ўключалі дату зацвярджэння і нумар часткі дваранскай радаводнай кнігі, куды заносіўся род. Зацвярджэнняў магло быць і некалькі, прычым у розных паветах ці губернях. У гэтым выпадку захоўваецца храналагічны прынцып папярэдняга пункту, з указаннямі, па якіх губернях, намесніцтвах, абласцях адбываліся рашэнні ДДС.

У пятым пункце змяшчаюцца спасылкі на архіўную ўстанову, фонд, вопіс, справу і аркушы, з якіх была ўзята інфармацыя. Асноўнымі ўстановамі–захавальнікамі патрэбнай у даследаванні інфармацыі з’яўляліся: Дзяржаўны архіў Кіеўскай вобласці, Дзяржаўны архіў Жытомірскай вобласці і Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Кіеве.

У якасці пэўнага недахопу можна адзначыць, што аўтарамі не падаецца інфармацыі адносна шляхецкіх гербаў, якія могуць служыць своеасаблівым дапаможным элементам пры ідэнтыфікацыі роду. Дадзены факт неабходна звязаць са складанасцю і спецыфічнасцю пытання геральдыкі правабярэжнай шляхты канца XVIII – пачатку XIX ст.

Для вызначэння комплексу выкладзенай вышэй інфармацыі аўтарамі прымяняецца тэрмін «радаграма», якую можна разглядаць як інфармацыю аб родзе, пададзеную ў форме энцыклапедычнай даведкі.

У ліку вартасцяў працы неабходна назваць арыгінальны падыход да размяшчэння інфармацыі па кожным шляхецкім родзе ў выглядзе устойлівай падрабязнай схемы. У выдання маецца значная крыніцазнаўчая база, што ўключае інфармацыю аб правабярэжнай шляхце згадана-

га вышэй перыяду. Да шэрагу апрацаваных аўтарамі крыніц адносяцца: матэрыялы Кіеўскага і Валынскага дваранскіх дэпутацкіх сходаў, рэвізскія сказкі 1795, 1811, 1816 і 1834 гг., а таксама пастановы ДДС і загады Герольдыі аб зацвярджэнні ў дваранстве.

Дадзеныя даведнікі значна паляпшаюць працэс даследавання гісторыі і генеалогіі шляхецкага стану Правабярэжнай Украіны і з'яўляюцца карыснымі пры практычным стварэнні радаводаў украінскага дваранства. Можна спадзявацца, што прыклад украінскіх гісторыкаў у складанні спісаў шляхты будзе з часам успрыняты і замежнымі даследчыкамі, у тым ліку з Беларусі, Польшчы і Расіі.

*В. В. Урублеўскі, З. Л. Яцкевіч*

***Правобережний гербівник** / Уклав Є. Чернецький. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський, 2006. Т. 1; 2007. Т. 2; 2007. Т. 3.*




Паглыбленае даследаванне генеалагічнай тэматыкі на прыкладзе шляхты асобнай мясцовасці павінна адбывацца шляхам пераходу ад агульнага да канкрэтнага ці наадварот, у адпаведнасці з метадамі, якія выкарыстоўвае аўтар. У аснову зборніка Яўгена Чарнецкага «Правабярэжны гербоўнік» пакладзены менавіта прынцып пераходу ад агульнага (спісы шляхты) да канкрэтнага (энцыклапедычныя даведкі да абраных родаў). Выданне на сёння складаецца з трох тамоў, якія прысвечаны шляхце, што ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. пражывала ў белацаркоўскіх маёнтках графаў Браніцкіх (т. зв. Белацаркоўскае графства), і іх суседзяў (у межах Васількаўскага, Таращанскага і Звенігародскага паветаў Кіеўскай губерні).

Першы том змяшчае інфармацыю пра прозвішчы, гербы і месцы пражывання шляхты. Том складаецца з уступу, спісу скарачэнняў, тлумачэнняў да спісу, уласна спісу шляхты, пераліку гербаў і родаў, спісу крыніц і літаратуры, адміністрацыйнай карты даследуемай тэрыторыі (на сярэдзіну XIX ст.), геаграфічнага паказальніка.

Інфармацыя пра род у спісе падаецца па наступных пазіцыях: 1) родавае прозвішча на украінскай мове; 2) напісанне прозвішча на польскай і рускай мове згодна з крыніцамі і гербоўнікамі (у дужках); 3) назва герба і родавы прыдомак; 4) звестка пра год і месца пражывання

ў пэўным павеце; 5) звесткі пра паходжанне роду згодна з гербоўнікамі. У квадратных дужках пазначаны скарочаныя варыянты крыніц і літаратуры, якія тлумачацца ў дадатку «Скарачэння спісаў і літаратуры». У тлумачэннях да спіса аўтар падкрэслівае, што «у ведамасцях пра месцы пражывання шляхты могуць змяшчацца дадзеныя пра розныя роды, зведзеныя пад адной пазіцыяй у спісе». Усяго такіх пазіцый 3500.

Пасля спіса прозвішчаў размешчаны выявы гербаў (усяго 152), якімі карысталіся прадстаўнікі шляхецкіх родаў з пазначаных вышэй паветаў. Пералік гербаў і родаў змяшчае ў сабе наступныя пазіцыі: 1) назву герба на ўкраінскай мове; 2) назвы гербаў у дужках на польскай мове; 3) спіс родаў, якія гэтымі гербамі карысталіся.

Дадзеныя «ведамасці», як іх называе аўтар, створаны на падставе шырокага кола крыніц і літаратуры, ужытых у даследаванні. Пры працы над спісамі ён карыстаўся архіўнай інфармацыяй з фондаў Дзяржаўнага архіва Кіеўскай вобласці і Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны ў Кіеве. Аўтарам выкарыстаны дадатковыя рэвізскія сказкі аб шляхце за 1800 г. (Васількаўскі і Звенігародскі паветы), імянныя ведамасці аб беспамесным і бясчынавым дваранстве за 1811 г. (Васількаўскі павет), дадатковы спіс аб аднадворцах і грамадзянах за 1833 г. (Таращанскі павет) і г. д. Выкарыстаны і навуковыя публікацыі, сярод якіх неабходна адзначыць уласную працу Яўгена Чарнецкага «Шляхта Васількаўскага павета Кіеўскай вобласці ў спавядальных ведамасцях праваслаўных храмаў пачатку XIX ст.» (Белая Царква, 1999), а таксама перавыданне вядомай працы Юрыя Дуніна-Баркоўскага «Спіс прозвішчаў шляхты польскай» (Варшава, 1997).

Другі і трэці тамы выдання прысвечаны канкрэтнай інфармацыі па гісторыі пэўных дваранскіх родаў Кіеўскай губерні. Другі складзены на падставе выпісак з пратаколаў №№ 1–375 пасяджэнняў спецыяльнай камісіі, створанай для кантролю Кіеўскага дваранскага дэпутацкага сходу, якія адбыліся ў 1838 г. і былі прысвечаны разгляду часткі легітымацый за 1801–1804 гг. Падчас працы над выданнем была выкарыстана інфармацыя з гербоўнікаў і публікацый XIX – пачатку XX ст. Трэці складзены на падставе пратаколаў №№ 1–188, 376–711 пасяджэнняў той жа камісіі, якія адбыліся ў 1838–1839 гг. і былі прысвечаны разгляду часткі «легітымацый» (зацвярджэнняў у дваранстве) за 1802–1810 гг.

Другі том змяшчае важную інфармацыю ад аўтара, якая асвятляе становішча архіўнай справы на Украіне і разглядае факт выдання гербоўніка як крок, накіраваны на надзейнае і доўгачасовае зберажэнне архіўнай генеалагічнай інфармацыі.

Энцыклапедычныя даведкі па родах у даследаванні называюцца нататкамі. Нататкі пра легітымаваную шляхту Кіеўскай губерні змяшчаюць

наступныя звесткі па кожным родзе: 1) прозвішча на ўкраінскай мове і герб; 2) прозвішча роду на рускай мове арыгінала; 3) час зацвярджэння ўказам Сената з пазначэннем месца пражывання і часткі радаводнай кнігі, куды род быў унесены; 4) інфармацыю аб найдаўнейшым дакуменце ў справе аб дваранскім паходжанні роду; 5) спасылку на месца захоўвання крыніцы з вышэйзгаданай інфармацыяй. У канцы выдання змешчаны пералік гербаў і родаў, падаецца карта адміністрацыйнага падзелу Правабярэжнай Украіны, а таксама змешаны (геаграфічны, імянны, прадметны) паказальнік на ўкраінскай мове і спіс шляхецкіх прозвішчаў на польскай. Далей у выданні пададзены спіс скарачэнняў і нарэшце ўласна спіс родаў з пазначэннем іх гербаў. Да нататкаў даюцца тлумачэнні.

Па сваёй структуры трэці том мала чым адрозніваецца ад другога. Выключэнне складае цікавы артыкул аўтара адносна «гербавай памяці» дробнай шляхты Правабярэжжа Украіны ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст., дзе аналізуецца працэс заняпаду шляхецкай культуры і адмірання функцый родавых гербаў, асабліва ў XVIII ст., што ў шэрагу выпадкаў не дазваляе даведацца аб прыналежнасці пэўнага герба таму ці іншаму шляхецкаму роду.

Выданне «Правабярэжны гербоўнік», па сутнасці, нагадвае «малы гербоўнік шляхты», бо прысвечаны не ўсёй украінскай шляхце, а той яе частцы, што пражывала на правабярэжнай Украіне. Падобнымі выданнямі ў Беларусі з'яўляюцца: «Малы гербоўнік Наваградскай шляхты» [1], «Малы гербоўнік Халопеніцкай шляхты» [2], «Малы гербоўнік Чавускай шляхты» [3] і г. д. Структура 2 і 3 тамоў украінскага выдання нагадвае структуру вышэйназваных беларускіх выданняў.

Неабходна адзначыць вялікую працаздольнасць спадара Чарнецкага ў справе выяўлення, апрацоўкі і публікацыі генеалагічных крыніц, якія маюць вялікую карысць пры біяграфічных і генеалагічных даследаваннях. Акрамя гэтага дадзеная інфармацыя з'яўляецца важнай і ў плане краязнаўчага вывучэння мясцовасці. Карысць даведніка для беларускіх даследчыкаў і аматараў генеалогіі і геральдыкі можа праяўляцца ў тым, што некаторыя шляхецкія роды, пазначаныя ў гербоўніку, маглі паходзіць з Беларусі альбо перасяляцца туды ў пазнейшы час.

«Правабярэжны гербоўнік» будзе карысны ўсім, хто цікавіцца і займаецца згаданымі праблемамі.

*В. В. Урублеўскі, З. Л. Яцкевіч*

---

[1] Гануш А., Леўчык А., Рыбчонак С. Малы гербоўнік Навагрудскай шляхты. Мн., 1997.

[2] Яцкевіч З. Л. Малы гербоўнік Халопеніцкай шляхты. Мн., 1999.

[3] Яцкевіч З. Л. Малы гербоўнік Чавускай шляхты // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 5. Мн.: НГАБ, 2007. С. 222–229.

***Чернецький Є.*** *Правобережна шляхта за російського панування (кінец XVIII – початок XX ст.). Джерела, структура стану, роди. Біла Церква: Від. О. Пшонківський, 2007. 176 с.*




Выданне «Правабярэжная шляхта ў часы расійскага панавання» можна разглядаць як чарговы этап працы аўтара над тэмай даследавання генеалогіі і геральдыкі правабярэжнай шляхты. Падчас падрыхтоўкі дадзенага зборніка аўтар выкарыстаў папярэднія напрацоўкі, прысвечаныя правабярэжнай шляхце. Таму дадзенае выданне з'яўляецца фактычнай апрацоўкай і ўзбагачэннем інфармацыі, прадстаўленай спадаром Чарнецкім у папярэдніх працах.

Зборнік прысвечаны тэрыторыі Васількаўскага і Махніўскага паветаў Кіеўскай губерні; складаецца з уводзінаў, трох раздзелаў і змешанага (геаграфічнага, імяннога і прадметнага) паказальніка.

Першы раздзел прысвечаны крыніцам па генеалогіі Правабярэжжа. Тут разглядаюцца пытанні тыпалогіі крыніц канца XVIII – пачатку XIX ст. адносна наступных праблем: міграцыі дробнай шляхты на Кіеўшчыну, інкарпарацыі шляхты Правабярэжнай Украіны ў расійскае дваранства на прыкладзе дакументаў рода Сумоўскіх (Шумоўскіх) герба «Ястрабец», захавання крыніц па генеалогіі шляхецкіх родаў правабярэжжа ў архівасховішчах Украіны.

Асобная частка раздзела прысвечана структуры, стану і перспектывам даследавання згаданага пытання. У ім разгледжаны наступныя аспекты: праблемы даследавання генеалогіі шляхты; структура генеалагічных крыніц, што знаходзяцца на архіўным захаванні; стан даследавання і перспектывы.

У другім раздзеле разглядаюцца пытанні, звязаныя з вывучэннем гісторыі шляхты Васількаўскага павета на падставе спавядальных ведамасцей пачатку XIX ст. Абмяркоўваюцца праблемы даследавання і паходжання родаў праваслаўнай шляхты, даецца агляд тэрыторыі Васількаўскага павета, змешчаны спіс праваслаўных родаў павета за 1812–1815 гг. У спісе пазначаюцца: прозвішча роду, саслоўе і месца пражывання з пазначэннем назвы парафіі. У раздзеле асвятляецца пытанне паходжання неаседлай шляхты Махніўскага павета, апублікаваны спіс,

у які занесена шляхецкае прозвішча, месца пражывання на 1800 г., пазнака аб геаграфічным паходжанні (напр.: «1795 прийшов з м. Махнівка»).

Трэці раздзел прысвечаны практычнаму разгляду пытанняў генеалогіі на прыкладзе двух родаў: Хаецкіх герба «Любіч» і Пудэлка-Шаняўскіх герба «Юноша». Пазначана гісторыя родаў, узноўленая на падставе спраў вывадовых камісій пры ДДС, і радаводы ў выглядзе пакаленнага роспісу і генеалагічнай схемы.

Дадзенае выданне з'яўляецца фактычна трэцім этапам па даследаванню правабярэжнай шляхты пасля «Легітымаванай правабярэжнай шляхты (Белая Царква, 2006)» і «Правабярэжнага гербоўніка» (Белая Царква, Т. 1. 2006; Т. 2–3. 2007). З аднаго боку тут асвятляюцца тэарэтычныя праблемы, робяцца цікавыя высновы адносна крыніц шляхецкай генеалогіі і структуры стану. З другога боку аўтар звяртае ўвагу на практычныя аспекты пытання: спісы павятовай шляхты, радаводы вызначаных шляхецкіх сем'яў. Усё гэта робіць выданне арыгінальнай формай правядзення генеалагічнага даследавання.

На сённяшні момант у Беларусі няма ў чыстым выглядзе аналагаў дадзенага выдання, але яго пазітыўны вопыт з'яўляецца важным для айчыннай гістарыяграфіі.

Аб тым, што публікацыі Чарнецкага сёння запатрабаваны на Украіне, сведчыць наяўнасць у аўтара фінансавых спонсараў (мецэнатаў). Таксама неабходна падкрэсліць і тое, што многія працы ўкраінскага даследчыка выдаюцца дзякуючы падтрымцы такіх грамадскіх аб'яднанняў, як Белацаркоўскае рыцарскае кола, Таварыства аховы старажытнасцяў Кіеўшчыны, Белацаркоўскі краязнаўчы музей і г. д. Гэтыя факты кажуць аб значнай зацікаўленасці ў падобных навуковых выданнях з боку грамадства.

Зборнік будзе цікавы ўсім, хто займаецца пытаннямі генеалогіі, а таксама гістарычнага краязнаўства, у тым ліку даследчыкам з Польшчы, Беларусі і Расіі.

*В. В. Урублеўскі, З. Л. Яцкевіч*

# Рэзюмэ

**Анішчанка Яўген Канстанцінавіч,** кандыдат гістарычных навук.

*«Спісы шляхты Магілёўскай губерні за 1783–1784 гг.».*

Працягваецца публікацыя спісаў шляхты Магілёўскай губерні, складзеных на падставе матэрыялаў Генеральнага межавання Полацкага і Магілёўскага намесніцтваў і «Эканамічных заўваг» да іх. У артыкуле змешчаны спісы па Магілёўскаму і Рагачоўскаму паветах.

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,** галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ, аспірантка БелНДІДАС.

*«Крыніцы па асабістым складзе духавенства XIX ст. у архіўным фондзе НГАБ “Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя”».*

Аналізуюцца асаблівасці структуры крыніц па пытанні асабістага складу духавенства XIX ст., адзначаецца іх крыніцазнаўчая вартасць. Аўтарам праводзіцца падзел крыніц па ступені інфарматыўнасці.

*«Навукова-даведачны апарат да архіўнага фонду “Мінская рымска-каталіцкая кансісторыя»: гісторыя і сучасны стан»*

Аналізуецца гісторыя Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі, ступень апрацаванасці аднайменнага фонду НГАБ архіўнымі супрацоўнікамі, асвятляюцца асноўныя рысы створанага да яго навукова-даведачнага апарата.

**Вішнеўскі Ілля Аляксеевіч,** студэнт V курса гістарычнага факультэта БДУ.

*«Организация делопроизводства в Белорусской обновленческой церкви в 1922–1935 гг.».*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці вядзення і ўліку справаводчай дакументацыі ў структуры Беларускай абнаўленчай царквы ў 1922–1935 гг., праводзіцца падзел дакументаў па чатырох асноўных групах паводле іх функцыянальнага прызначэння.

*Кривонос Ф. У Бога мёртвых нет. Неизвестные страницы из истории Минской епархии (1917–1939). Мн.: МФЦП, 2007. 248 с. (рэцэнзія).*

Рэцэнзуецца праца святара Ф. Крываноса, якая асвятляе малавядомыя аспекты з гісторыі Мінскай епархіі ў міжваенны перыяд яе існавання.

У рэцэнзіі вызначаюцца асноўныя месцы захавання архіўнай інфармацыі па дадзенай праблеме, адзначаецца яе карысць для гістарычнай навукі.

*Кривонос Ф. Белорусская православная церковь в XX столетии: спецкурс лекций для Минской Духовной Семинарии. Мн.: ВРАТА, 2008. 255 с. (рэцэнзія).*

Рэцэнзія прысвечана курсу лекцый для студэнтаў Мінскай духоўнай семінарыі. У ёй аналізуецца структура даследавання, даецца ацэнка выкарыстаных крыніц, звяртаецца ўвага на слабыя бакі працы.

**Галубовіч Віталь Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры тэорыі і права Гродзенскага філіяла Беларускага інстытута правазнаўства.

*«Пастулаты менскай шляхты на сойм 1646 г.».*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя палажэнні і асаблівасці складання інструкцыі менскай шляхты на сойм 1646 г., копія якой адшукана ў бібліятэцы Польскай Акадэміі навук у Кракаве.

**Гарбачова Вольга Васільеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва гістарычнага факультэта БДУ.

*«Дзейнасць Ігнацыя Дамейкі ў Таварыстве навуковай дапамогі ў Францыі».*

Грунтуючыся на матэрыялах з Польскай бібліятэкі ў Парыжы, аўтар асвятляе аспекты дабрачыннай і культурна-асветніцкай дзейнасці ў эміграцыі вядомага беларускага вучонага і грамадскага дзеяча Ігнацыя Дамейкі. У дадатку публікуецца праект Дамейкі па навучанню эмігрантаў у Парыжскай Цэнтральнай школе мастацтваў і рамёстваў ад 14 сакавіка 1833 г.

**Корсак Вольга Мікалаеўна,** аспірантка кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ.

*«Публікацыя тэстамента Яна Серакоўскага, стольніка гастыньскага».*

Публікуецца тэстамент аднаго зураднікаў ВКЛ — Яна Серакоўскага, адшуканы ў кнігах Менскага земскага суда, праводзіцца яго філалагічны аналіз, дзе разглядаюцца асаблівасці польскай мовы ў землях ВКЛ другой паловы XVIII ст.

**Купрэвіч Таццяна Вітальеўна,** аспірантка лабараторыі мікалогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі.

*«Повреждение архивных документов микроскопическими грибами».*

У артыкуле падрабязна разглядаюцца прычыны пашкоджання папяровых дакументаў мікраскапічнымі грыбамі, прапануюцца метады фізічнай і хімічнай барацьбы з імі.

**Латушкін Андрэй Мікалаевіч,** выкладчык гістарычнага факультэта БДУ.

*«Архівісты Нясвіжскага архіва XVII – першай паловы XX ст.».*

Змешчаны біяграмы 14 архівістаў Нясвіжскага архіва Радзівілаў (на літары «В» і «Г»), сярод якіх найбольшая ўвага нададзена Аляксандру-Івану Валіцкаму.

**Лашкевіч Аляксандр Аляксандравіч,** кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў НГАБ.

*«Аператыўна-следчая праца Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў пачатку XX ст.».*

На падставе матэрыялаў НГАБ апісваецца дзейнасць губернскага жандарскага ўпраўлення ў Мінскай губерні ў галіне палітычнага вышуку і барацьбы з эканамічнай злачыннасцю. Вызначаюцца асноўныя накірункі дзейнасці, прыводзяцца прыклады спраў, якія вяліся супрацоўнікамі ўпраўлення.

**Лісава Ларыса Міхайлаўна,** намеснік дырэктара НГАБ.

*«2008 год — хроника юбилейных торжеств».*

Прааналізаваны дасягненні Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў перыяд з 2001 па 2007 гг. па асноўных накірунках яго дзейнасці. Згаданы найбольш значныя і памятныя падзеі са святкавання 70-годдзя архіва ў 2008 г. Высока адзначаны заслугі яго супрацоўнікаў.

**Міхяёнак Таццяна Сяргееўна,** загадчыца аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій НГАБ.

*«О сходстве и различиях фонда пользования на пленочных и электронных носителях».*

Даецца агульная характарыстыка працэсу стварэння алічбованых электронных копій дакументаў як новага высокаякаснага элемента страхавога фонду НГАБ, паказваецца перавага электронных носьбітаў над плёнкавымі мікрафільмамі, адзначаецца перспектыўнасць дадзенага віду архіўнай дзейнасці, накіраванага на паляпшэнне навуковага выкарыстання дакументаў.

**Несцяровіч Юрый Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археаграфіі БелНДІДАС.

*«Эксплицированное понятие текста и интерпретация термина «текст» в рамках археографии и источниковедения».*

У артыкуле абгрунтоўваецца тэзіс аб неабходнасці дыферэнцыяцыі тэрміна «тэкст» у навуковым дыскурсе, удакладняецца паняцце тэкста, даецца эпістэмалагічны аналіз тэрмінаў «тэкст дакумента» і «тэкст гістарычнай крыніцы» у адпаведнасці з экспліцыраванай трактоўкай тэкста.

**Папко Вольга Мікалаеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры філасофіі і культуралогіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.

*«Крыніцы па гісторыі родукн. Радзівілаў у архіве і бібліятэках Познані (Польшча)».*

У артыкуле апісваюцца крыніцы, адшуканыя ў Дзяржаўным архіве, бібліятэках Рачынскіх і Курніцкай у Познані. Аўтар падае свой падзел дакументаў на чатыры групы.

**Скеп'ян Анастасія Анатольеўна,** навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*«Лісты маладых князёў Алелькавічаў з Італіі».*

Публікуюцца лісты князёў Юрыя і Яна-Сымона Алелькавічаў да сваёй маці княгіні Кацярыны з Тэнчынскіх, выяўленыя аўтарам у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве. У артыкуле даецца ацэнка крыніцазнаўчай вартасці дакументаў.

**Сліж Наталля Уладзіміраўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры мовазнаўчых дысцыплін ПУА «БІП-Інстытут права», гродзенскі філіял.

*«“Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай” як крыніца па гісторыі Гародні».*

На падставе вялікага комплексу крыніц аўтарам характарызуецца крыніцазнаўчая вартасць аднаго друкаванага выдання канца XVII ст., якое мела важнае рэлігійнае значэнне. Шматбакова прааналізаваны стан даследавання праблемы, разнастайная гістарычная інфармацыя, пададзеная ў «Зборы…».

**Смірнова Ірына Юр'еўна,** метадыст аддзела традыцыйнай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

*«Из истории Свято-Николаевской церкви села Неглюбка».*

Даследуецца гісторыя праваслаўнай царквы сяла Няглюбка (з 1761 г. па сённяшні час), што знаходзіцца цяпер у складзе Веткаўскага р-на Гомельскай вобл., падаецца інфармацыя аб унутраным убранні і маёмасным становішчы царквы, яе бібліятэцы, змяшчаюцца падрабязныя звесткі аб святарах і царкоўных служках.

**Снапкоўскі Юрый Мікалаевіч,** старшы навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыйна-пошукавых сістэм НГАБ.

*«Дневник путешествий Э. Гендерсона как источник по истории Беларуси первой четверти XIX в.».*

Артыкул прысвечаны вызначэнню крыніцазнаўчай вартасці кнігі шатландскага місіянера Эбеназара Гендэрсана «Библейские разыскания и странствия по России», якая прадстаўляецца каштоўным комплексам разнастайных звестак, карысных пры даследаванні гісторыі, геаграфіі і этнаграфіі ўсходнеславянскага рэгіёна, у т. л. Беларусі. Адзначаны моцныя і слабыя бакі расійскага выдання кнігі ў 2006 г.

**Урублеўскі Вадзім Валер'евіч,** вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Род галандскіх дваран Гартынгаў на Беларусі».*

У артыкуле прасочаны радавод чатырох пакаленняў дваранскага роду замежнага паходжання, пададзена гісторыя Гартынгаў на Беларусі, адзначаны кар'ерныя дасягненні, сямейныя і маёмасныя адносіны прадстаўнікоў роду.

*Гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (1913–1940 гг.): дакументы і матэрыялы / Аўт.-склад.: А. Р. Агееў, К. М. Бандарэнка, В. П. Клімковіч; пад агульн. рэд. К. М. Бандарэнкі. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2008. 216 с. (рэцэнзія).*

У рэцэнзіі разглядаецца зборнік, прысвечаны гісторыі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта; значная ўвага ўдзелена крыніцам, на падставе якіх было падрыхтавана выданне. Адзначаецца перспектыўнасць даследавання гісторыі педагагічнай адукацыі на Магілёўшчыне.

*Разам з **Яцкевічам З. Л.** (гл. ніжэй): Лисенко С., Чернецький Е. Правобережная шляхта (кінец XVIII – першая половина XIX ст.). Список шляхти Волинськоі, Киівськоі та Подільскоі губерній, дворянські права якой перевірила Центральна ревізійна комісія. Біла Церква: 2002 (1-е вид.), 2007 (2-е вид.); Легітимована правобережна шляхта (кінець XVIII – середина XIX): спеціальні довідники / Укладачи: С. Лисенко, Е. Чернецький. — Біла Церква: Від. О. Пшонківський, 2006. Т. 2–5. (рэцэнзія).*

Рэцэнзуюцца даведнікі украінскіх гісторыкаў С. Лысенкі і Я. Чарнецкага, дзе апублікаваны спісы шляхты Правабярэжнай Украіны канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. Падрабязна аналізуецца структура выданняў, адзначаюцца іх моцныя і слабыя бакі.

***Іх жа**: Правобережний гербівник / Уклав Е. Чернецький. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський. Т. 1. — 2006; Т. 2 — 2007; Т. 3 — 2007. (рэцэнзія).*

Рэцэнзуецца трохтомнае выданне, прысвечанае шляхце, што ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. пражывала ў межах Васількаўскага, Таращчанскага і Звенігародскага паветаў Кіеўскай губерні. Падрабязна разглядаецца структура даведніка. Адзначаецца карысць працы пры правядзенні біяграфічных, генеалагічных і краязнаўчых даследаванняў.

***Іх жа**: Чернецький Е. Правобережна шляхта за російського панування (кінец XVIII – початок XX ст.). Джерела, структура стану, роди. Біла Церква: Від. О. Пшонківський, 2007. 176 с. (рэцэнзія).*

Рэцэнзуецца зборнік, прысвечаны крыніцам па шляхецкай генеалогіі ў межах Васількаўскага і Махніўскага паветаў Кіеўскай губерні. У працы робяцца тэарэтычныя высновы адносна крыніц шляхецкай генеалогіі і структуры стану; звяртаецца ўвага на практычныя аспекты пытання: спісы павятовай шляхты, радаводы шляхецкіх сем'яў. Адзначаецца пазітыўнасць вопыту дадзенага выдання для беларускай гістарыяграфіі.

**Цітоў Анатоль Кірылавіч,** сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.

*«Злотнічныя цэнтры Беларусі (ад даўніх часоў да пачатку XX ст.)».*

Разглядаецца кароткая гісторыя злотніцкага рамяства ў 14-ці гарадах Беларусі, даецца характарыстыка злотніцкіх цэхаў, прыводзяцца урыўкі з цэхавых статутаў, змяшчаюцца біяграфічныя звесткі найбольш вядомых злотнікаў.

**Чарняўскі Фёдар Віктаравіч.**

*«Крыштоф Валадковіч: факты з жыцця і дзейнасці».*

Даследуюцца факты біяграфіі, сямейна-роднасныя сувязі і маёмаснае становішча грамадска-палітычнага дзеяча, ваяводы навагародскага Крыштофа Валадковіча. На прыкладзе жыцця і дзейнасці адной асобы прааналізаваны працэсы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай XVII ст.

**Шумейка Міхаіл Фёдаравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919 гг.)».*

Артыкул прымеркаваны да 100-гадовага юбілею з часу заснавання згаданай установы; асвятляюцца абставіны стварэння і асноўныя напрамкі дзейнасці камісіі, адзначаецца яе ўплыў на развіццё архіўнай, музейнай, бібліятэчнай дзейнасці ў Беларусі.

**Шымукенус Міхаіл Уладзіміравіч,** настаўнік гісторыі ВПК ДСШЭУ г. Магілёва, краязнавец.

*«З гісторыі Троіцкай царквы ў Магілёве».*

Асвятляюцца асобныя моманты з паўсядзённай гісторыі праваслаўнай царквы ў XVI–XIX стст.

**Яцкевіч Зміцер Лявонцьевіч,** загадчык аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Малы гербоўнік Рагачоўскай шляхты».*

Дадзены артыкул прадстаўляе сабой працяг публікацыі звестак па генеалогіі шляхты Рагачоўскай правінцыі. Змешчана інфармацыя пра 20 шляхецкіх родаў, якія пражывалі на згаданай тэрыторыі ў XIX ст. Пазначаецца паходжанне роду, называюцца яго прадстаўнікі, пададзены родавыя сувязі, а таксама займаемыя пасады.

# Змест

**Да 100-годдзя заснавання Віцебскай архіўнай камісіі**

*М. Ф. Шумейко*

Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919) . . . . 3

**I. Архівазнаўства**

*И. А. Вишневский*

Организация делопроизводства
в Белорусской обновленческой церкви в 1922–1935 гг. . . . . . . . . . . . . 12

*Т. С. Михеёнок*

О сходстве и различиях фонда пользования
на пленочных и электронных носителях . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20

**II. Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў**

*В. В. Гарбачова*

Дзейнасць Ігнація Дамейкі
ў Таварыстве навуковай дапамогі ў Францыі . . . . . . . . . . . . . . . . 27

*В. М. Корсак*

Публікацыя тэстамента Яна Серакоўскага, стольніка гастыньскага . . . . 39

*Ю. В. Нестерович*

Эксплицированное понятие текста и интерпретация
термина «текст» в рамках археографии и источниковедения. . . . . . . . 44

*А. А. Скеп’ян*

Лісты маладых князёў Алелькавічаў з Італіі. . . . . . . . . . . . . . . . 55

**III. Крыніцазнаўства**

*Я. К. Анішчанка*

Спісы шляхты Магілёўскай губерні за 1783–1784 гг. . . . . . . . . . . . . 75

*З. В. Антановіч*

Крыніцы па асабістым складзе духавенства XIX ст. у архіўным фондзе
НГАБ «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» . . . . . . . . . . 100

*В. У. Галубовіч*
Пастулаты менскай шляхты на сойм 1646 г. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
*А. А. Лашкевіч*
Аператыўна-следчая праца Мінскага губернскага
жандарскага ўпраўлення ў пачатку XX ст. . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
*В. М. Папко*
Крыніцы па гісторыі роду кн. Радзівілаў
у архіве і бібліятэках Познані (Польшча) . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
*Н. У. Сліж*
«Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі
Студэнцкай» як крыніца па гісторыі Гародні . . . . . . . . . . . . . . . 132
*Ю. Н. Снапковский*
Дневник путешествий Э. Гендерсона как источник
по истории Беларуси первой четверти XIX в. . . . . . . . . . . . . . . . 182

## IV. Гісторыя

*И. Ю. Смирнова*
Из истории Свято-Николаевской церкви села Неглюбка . . . . . . . . . 189
*А. К. Цітоў*
Злотнічныя цэнтры Беларусі (ад даўніх часоў – да пачатку XX ст.) . . . 205
*Ф. В. Чарняўскі*
Крыштоф Валадковіч: факты з жыцця і дзейнасці . . . . . . . . . . . . 221
*М. У. Шымукенус*
З гісторыі Троіцкай царквы ў Магілёве . . . . . . . . . . . . . . . . . . 253

## V. Генеалогія

*В. В. Урублеўскі*
Род галандскіх дваран Гартынгаў на Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . 258
*З. Л. Яцкевіч*
Малы гербоўнік Рагачоўскай шляхты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 267

## VI. Навукова-даведачны апарат, забеспячэнне захаванасці і ўлік дакументаў

*З. В. Антановіч*
Навукова-даведачны апарат архіўнага фонду «Мінская
рымска-каталіцкая кансісторыя»: гісторыя і сучасны стан . . . . . . . . 282

*Т. В. Купревич*
Повреждение архивных документов микроскопическими грибами . . . 288

**VII. Постаці архівістаў**
*А. М. Латушкін*
Архівісты Нясвіжскага архіва XVII – першай паловы XX ст. . . . . . . 302

**VIII. Хроніка і бібліяграфія**
*Л. М. Лисова*
2008 год — хроника юбилейных торжеств. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 311
Рэцэнзіі:
***Кривонос Ф.***, священник. У Бога мёртвых нет. Неизвестные страницы из истории Минской епархии (1917–1939 годы). Мн.: МФЦП, 2007. 240 с.: ил. . . . . . . . . . . . . . . 318
***Феодор Кривонос*** *(священник).* Белорусская Православная Церковь в XX столетии: спецкурс лекций для Минской Духовной Семинарии. Мн.: ВРАТА, 2008. 255 с. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
**Гісторыя Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (1913–1940 гг.):** дакументы і матэрыялы / Аўт.-склад.: А. Р. Агееў, К. М. Бандарэнка, В. П. Клімковіч; пад агульн. рэд. К. М. Бандарэнкі. Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2008. 216 с.. . . . . . . . . . . . . 323
***Лисенко С., Чернецький Є.*** Правобережна шляхта (кінець XVIII – першая половина XIX ст.). Список шляхти Волинської, Київської та Подільської губерній, дворянські права якої перевірила Центральна ревізійна комісія. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський, 2002 (1-е вид.); 2007 (2-е вид.). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 325
**Легітимована правобережна шляхта (кінець XVIII – середина XIX ст.)** / Уклад.: С. Лисенко, Є. Чернецький. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський, 2006. Т. 2–5. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 325
**Правобережний гербівник** / Уклав Є. Чернецький. Біла Церква: Вид. О. Пшонківський, 2006. Т. 1; 2007. Т. 2; 2007. Т. 3. . . . . . . . . . 328
***Чернецький Є.*** Правобережна шляхта за російського панування (кінец XVIII – початок XX ст.). Джерела, структура стану, роди. Біла Церква: Від. О. Пшонківський, 2007. 176 с. . . . . . . . . . . . . 331

**Рэзюмэ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 333

A87 **Архіварыус:** зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 7 / рэд..: Ю. М. Бохан [і інш.]. — Мн.: БелНДІДАС, 2009. — 344 с. — (Серыя «Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»).

Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі падрыхтаваны сёмы выпуск штогодніка «Архіварыус», прысвечаны 100-годдзю з дня заснавання Віцебскай архіўнай камісіі. На яго старонках асвятляецца шырокае кола пытанняў айчыннай гісторыі, архівазнаўства, археаграфіі, крыніцазнаўства і іншых спецыяльных гістарычных дысцыплін. У навуковы ўжытак уводзіцца шэраг новых, раней невядомых дакументаў і фактаў.

Прызначаецца гісторыкам, архівістам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца старонкамі мінулага Беларусі.

**УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]**
**ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41**

**Навуковае выданне**

*Серыя «Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»*

# Архіварыус

Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў

## Выпуск 7

Адказны за выпуск *З. Л. Яцкевіч*
Рэдактар *А. М. Гесь*
Макет, вокладка, камп'ютарная вёрстка *Я. А. Мальдзіса*
Малюнак эмблемы на вокладцы *А.М. Леўчыка*
Карэктары *В. Р. Лук'янава, В. В. Урублеўскі*

Зборнік падрыхтаваны да выдання аддзелам публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Падпісана да друку 5.05.2009. Фармат 60×84 1/16.
Гарнітура Times. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 20,07. Ул.-выд. арк. 20,56.
Тыраж 100 экз. Заказ 394.

Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС).
Вул. Крапоткіна, 55, 220002, г. Мінск.
Ліцэнзія ЛИ № 02330/0133094 ад 30.04.2004 г.

---

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў друкарні ПУП «Ходр» ГА «БелТІЗ».
Вул. Вызвалення, 9, 220004, г. Мінск.
Ліцэнзія ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.2004 г.